ВАЛЧКОВА Аляксандра Яфрэмаўна, н. ў 1900.
ВАРАТНІЦКІ.
ВАСІЛЬЕЎ Сяргей Мікалаевіч, н. 1919.
ВАСІЛЬЕЎ Яўген Мікалаевіч, н. ў 1923.
ВАСЬКОЎСКАЯ Кацярына Іванаўна, н. ў 1911.
ВАСЭР Іда, н. ў 1924.
ВАСЭР Міця, н. ў 1930.
ВАСЭР Поля, н. ў 1923.
ВАСЭР Самуіл (52 гады).
ВАСЭР Сара (38 гадоў).
ВАСЭР Цыля (43 гады).
ВАСЭР Эсфір, н. ў 1925.
ВЕРНЯЧЫХА.
ВЕРХАГЛАЗАЎ Іван Міхайлавіч, н. ў 1923.
ВІТКОЎСКІ Пётр Паўлавіч, н. ў 1909.
ВОЛ Мендэль.
ВЭБЕР Хая (70 гадоў).
ГАЛАВАЧ Іван Гапеевіч, н. ў 1910.
ГАЛКІН Мікалай, н. ў 1923.
ГАНЧАРОВА Марыя Фёдараўна, н. ў 1918.
ГАНЧАРОЎ Панцеляймон Данілавіч, н. ў 1918.
ГАРАВІК Фёдар Якаўлевіч, н. ў 1893.
ГАЎРЫЛАВА Кацярына і 7 членаў яе сям'і.
ГЕНЬКІНА Эта.
ГІНЗБУРГ Шолам Абр.
ГІТЛЕВІЧ Зінаіда Якаўлеўна, н. ў 1893.
ГЛЕБАЎ Аляксандр Уладзіміравіч, н. ў 1910.
ГНЯТКОЎСКІ Васіль Іванавіч, н. ў 1923.
ГОЛДЗІН і трое дзяцей.
ГОРФІНКЕЛЬ, н. ў 1896.
ГРУШЭЦКАЯ Таццяна Альбертаўна, н. ў 1921.
ГРЫМБЕРГ Бася Залманаўна (18 гадоў).
ГРЫМБЕРГ Ганя Залманаўна (16 гадоў).
ГРЫМБЕРГ Груня М., н. ў 1925.
ГРЫМБЕРГ Залман Львовіч.
ГРЫМБЕРГ Люся, н. ў 1926.
ГРЫМБЕРГ Мера Саламонаўна, (50 гадоў).
ГРЫМБЕРГ Соня Залманаўна (14 гадоў).
ГРЫМБЕРГ Х. (45 гадоў).
ГРЫНКЕВІЧ Уладзімір Іванавіч, н. ў 1929.
ГРЫНЬ Васіль.
ГУЗДАНКЕР Марыя Ісакаўна, н. ў 1909.
ГУРЭВІЧ.
ГУЦІН Лёва (10 гадоў).
ГУЦІН Саламон (8 гадоў).
ДАВЫДАВА.
ДВАРАК Дарафей Міхайлавіч, н. ў 1879.
ДВОЕ ДЗЯЦЕЙ (12 і 13 гадоў).
ДВОРКІНА Года.
ДВОРКІНА Юца (60 гадоў) і двое дзяцей.
ДЗЕМЯШКЕВІЧ Алена Мартынаўна, н. ў 1886.
ДЗЕРАВЯНКА.
ДЗІМІДОВІЧ.
ДЗІМІТРАЎ Міхаіл, н. ў 1923.
ДЗМІТРОВІЧ Мікалай, н. 1936.
ДЗМІТРЫЕВІЧ Міхаіл.
ДОЛІНА Ефір, н. ў 1924.
ДОЛІНА Фаня, н. ў 1900.
ДРАПКІН (50 гадоў).
ДРАПКІНА (50 гадоў).
ЕРМАЧКОЎ Міхаіл Лукіч, н. ў 1922.
ЖАНЕЎСКАЯ Матрона.
ЖАНЕЎСКІ Мікалай.
ЖАРЫН А.А.
ЖУКОЎСКАЯ К.С.
ЖУКОЎСКІ Яфім Аляксеевіч, н. ў 1914.
ЖЫГУНОЎ Віктар Іванавіч, н. ў 1924.
ЗАБЛОЦКІ Аляксей, н. ў 1920.
ЗАВАДСКІ Сяргей Георгіевіч, н. ў 1926.
ЗЕЛЯНЕЎСКІ Петр.
ІВАНОЎ Мікалай.
КАВЕЦКІ Аляксей Пятровіч, н. ў 1914.
КАВЕЦКІ Браніслаў Іосіфавіч і 10 членаў сям'і.
КАЖЭЎНІКАВА Года (55 гадоў).
КАЖЭЎНІКАВА Марыя (35 гадоў).
КАЗАРНОЎСКАЯ Э.К. і двое малалетніх дзяцей.
КАЗАРНОЎСКІ І.
КАЛАДЗЕЙСКАЯ Галіна Аляксееўна.
КАЛІНКОВІЧ Міхаіл.
КАНТЭР і 4 члены яго сям'і.
КАПІЛЕВІЧ Залман (60 гадоў).
КАПІЛЕВІЧ Залман.
КАПЫРЫН Канстанцін Рыгоравіч.
КАРОТКІН Леанід Фёдаравіч.

КАСАЙ Васіль Яфімавіч, н. ў 1899.
КАТКОВА.
КЛЮЕВА Ганна Яфімаўна, н. ў 1920.
КРАСНЕР і 5 дзяцей.
КРУЦЫКОЎ Іван Васілевіч, н. ў 1923.
КРЫЛОВА Марфа і 3 члены яе сям'і.
КРЫШТО Ф.Г.
КУДЗЯН Іван Цімафеевіч, н. ў 1916.
КУЗНЯЦОВА Хася, н. ў 1925.
КУЗНЯЦОЎ Ісак, н. ў 1920.
КУР'ЯНАВА Зінаіда Феакцістаўна, н. ў 1925.
КУР'ЯНАВА Юлія Міхайлаўна, н. 1903.
КУР'ЯНАЎ Мікалай Феакцістаўіч, н. ў 1933.
КУР'ЯНАЎ Пётр Рыгоравіч, н. ў 1918.
ЛАБАЦЭВІЧ Ксенія Сцяпанаўна, н. ў 1893.
ЛАВАНЕЦКІ Васіль Лявонавіч, н. ў 1926.
ЛАПАТУХІН Якаў Ісакавіч, н. ў 1928.
ЛАПАТУХІНА Даша Міхайлаўна (55 гадоў).
ЛАТЫШАЎ Цімафей.
ЛАШЧЫК Яўген Сямёнавіч, н. ў 1923.
ЛЕАНОВІЧ Алена Паўлаўна, н. ў 1888.
ЛЕАНОВІЧ Іван Лазаравіч, н. ў 1891.
ЛІСУНОЎ Уладзімір Міхайлавіч, н. ў 1926.
ЛУГАВАЕВА Эта (45 гадоў).
ЛУГАВЕЕВА Ліза (30 гадоў).
ЛЫНДЗЯНОК Міхаіл Цімафеевіч, н. ў 1924.
ЛЮБІМЦАВА Аляксандра.
ЛЯВОНАЎ Васіль Фёдаравіч.
ЛЯХОВІЧ Алена Паўлаўна, н. ў 1884.
ЛЯХОВІЧ Павел Карпавіч, н. ў 1862.
ЛЯХОВІЧ Таццяна Карапаўна, н. ў 1865.
МАЕЎСКАЯ С.П.
МАЗУРА Мікалай Паўлавіч, н. ў 1896.
МАЗЯНКОВА Ніна Карпаўна, н. ў 1929.
МАЗЯНКОЎ Карп Аляксеевіч, н. ў 1899.
МАКАРЭВІЧ Фёдар Рыгоравіч.
МАКАРЭВІЧ Фёдар Ягоравіч, н. ў 1906.
МАКОЎСКІ Аляксандр Віктаравіч, н. ў 1885.
МАЛКІЕЛЬ Давід Залманавіч, н. ў 1885.
МАЛКІЕЛЬ Фаня Давыдаўна, н. ў 1916.
МАРГАЎНІН Рыгор.
МАРКОВІЧ (30 гадоў).
МАРКОВІЧ Софія (70 гадоў).
МЕНДЗЕЛЕВА Л.А., н. ў 1930.
МЕНДЗЕЛЕВА Любоў, н. ў 1896.
МЕНДЗЕЛЕВА С.А., н. ў 1923.
МЕНДЗЕЛЕЎ Арон, н. ў 1888.
МЕРКІН Майсей.
МІКАЛАЕЎ Кадзік, н. ў 1927.
МІКАЛАЕЎ Павел Сямёнавіч.
МІКІЦЁНАК Фёдар Васілевіч, н. ў 1902.
МУРАШКА Матрона Сямёнаўна, н. ў 1891.
МУХІН Уладзімір Яўгенавіч, н. ў 1922.
МУХІНА Надзея Сцяпанаўна, н. ў 1926.
МЯДЗВЕДЗЕВА Аляксандра Усцінаўна, н. ў 1860.
МЯДЗВЕДЗЕЎ Іван Іванавіч, н. ў 1870.
МЯРКУЛАЎ Віктар Васілевіч, н. ў 1923.
НАВІЦКІ Максім Якаўлевіч, н. ў 1905.
НОВІКАЎ Мікалай Емяльянавіч, н. ў 1923.
ПАДАЛІНСКАЯ Вольга.
ПАРАШЭН Мікалай Аляксеевіч, н. ў 1919.
ПІСТАЛЕНКА Фёдар Антонавіч, н. ў 1909.
ПЛІС Гінда (34 гады).
ПЛІС Фалка (60 гадоў).
ПРЫПУЦІН Уладзімір Аляксеевіч, н. ў 1920.
ПУІН Анатоль.
ПУШКОЎСКІ Іван Андрэевіч, н. ў 1899.
РАБЕКА Ганна, н. ў 1922.
РАБІНОВІЧ.
РАБІНОВІЧ (40 гадоў).
РАБІНОВІЧ (40 гадоў).
РАВЯКІНА Ганна Іванаўна, н. ў 1922.
РАГОЗІНА.
РАДЗІВОНЕНКА Вера Ціханаўна, н. ў 1922.
РАДНЕЎСКІ Васіль Іванавіч.
РАЗАРМАН.
РАЙНІС Дора.
РАЙЦЭНА Фаіна Захараўна.
РАМАНАВА Настасся Кузьмінічна, н. ў 1926.
РАМАНОЎСКІ Іван Максімавіч, н. ў 1910.
РАМАНОЎСКІ Міхаіл.
РАМАНОЎСКІ Рыгор.
РАСКІН (40 гадоў).
РАСКІН Барыс (50 гадоў).
РАСКІН Моця, н. ў 1930.
РАСКІНА Геня, н. ў 1923.
РАСКІНА Цыля (42 гады).
РАШЭТНІКАЎ Уладзімір, н. ў 1928.
РОХЛІН Хайм.
РЫСКІН Іцэк, жонка і сын.
РЫТМАН (Гурэвіч) Брайна Хаймаўна, н. ў 1860.
РЫТМАН Ісай Якаўлевіч, н. ў 1850.
РЫЎКІН Сімон, жонка і трое дзяцей.
САВІКАЎ Сяргей Афанасьевіч.
САДАЎНІЧЫ Аляксандр Сцяпанавіч, н. ў 1919.
САДКОЎСКІ Станіслаў, н. ў 1922.
САКАЛОЎСКАЯ Берта (65 гадоў).
САКАЛОЎСКАЯ Марыя (60 гадоў).
САЛОДКІН і 3 члены сям'і.
САЛТЫКОВА Алена Ціханаўна, н. ў 1916.
СВАРСКОЙ Вера (55 гадоў).
СІДАРОВІЧ Настасся.
СІЛАНЦЬЕВА Алена і 4 члены сям'і.
СІНЬКОЎСКАЯ Вера.

СІНЬКОЎСКАЯ Любоў.
СІНЬКОЎСКАЯ Міхаліна.
СОКРЫН.
СТАБРОЎСКАЯ Вера Міхайлаўна.
СУХАДОЛЬСКІ Іван.
СУХАДОЛЬСКІ Канстанцін.
СУХАДОЛЬСКІ Рыгор.
СУШЧАНКОЎ Леанід Мікітавіч, н. ў 1925.
СЯЛЬКОЎСКАЯ Надзея.
СЯМЁНАЎ Георгій Андрэевіч, н. ў 1908.
ТАЛАН Шмуіл Хаймавіч,. н. ў 1884.
ТАМАРКІН Арон (64 гады).
ТАМАРКІН Зіська (80 гадоў).
ТАМАРКІНА Серафіма (55 гадоў).
ТАРАСЕНКА Марыя Іванаўна, н. ў 1918.
ТАРАСКОВІЧ Марыя .
ТАРАСЮК Елісей Еўдакімавіч.
ТАЎГЕР Галіна.
ТАЎГЕР Ніна.
ТАЎГЕР Феня.
ТУМІНОВІЧ Барыс, н. ў 1926.
ФЕЙГІН Барыс.
ФЕЙГІН Ната.
ФІНКІН Павел Абрамавіч.
ФЯДОСЕНКА Фёдар Сямёнавіч, н. ў 1906.
ХАСМАН Арон.
ХАСМАН Іосіф .
ХАСМАН Іта.
ХАСМАН Ліза.
ХАСМАН Марыя.
ХАСМАН Раіса і яе сын.
ХАСМАН Фрума.
ЧАКУН Рыгор, н. ў 1884.
ЧАРНЯЎСКАЯ Зінаіда Максімаўна, н. ў 1924.
ЧАРНЯЎСКІ Максім Данілавіч, н. ў 1887.
ЧАХОЎСКАЯ, н. ў 1914.
ЧЫСА Васіль.
ШАБЕКА Леанід Пятровіч, н. ў 1932.
ШАБЕКА Максім Рыгоравіч, н. ў 1881.
ШАБЕКА Марыя Іосіфаўна, н. ў 1883.
ШАБЕКА Наталля Пракопаўна, н. ў 1905.
ШАГАЛ Абрам і 4 члены яго сям'і.
ШАЙКО Міхаіл Антонавіч, н. ў 1892.
ШАЛОВІЧ Дора, н. ў 1928.
ШАЛОВІЧ Іоха, н. ў 1933.
ШАЛОВІЧ Міша, н. ў 1931.
ШАЛОВІЧ Рахіль, н. ў 1928.
ШАЛОВІЧ Рая (45 гадоў).
ШАЛЮЦІНА Раіса.
ШАЛЮЦІНА Цыля.
ШАМОЦІНА Беба, н. ў 1926.
ШАМОЦІНА Марыя (35 гадоў).
ШАМОЦІНА Раіса, н. ў 1929.
ШАМОЦІНА Рахіль, н. ў 1900.
ШАМОЦІН Самуіл, н. ў 1888.
ШАМОЦІНА Софія, н. ў 1923.
ШАМОЦІНА Цыля, н. ў 1896.
ШАРАЙ Уладзімір Ігнацьевіч, н. ў 1924.
ШАЎЧЭНКА.
ШАЧАНОК Рыгор.
ШЛЯХТАЎ І.С.
ШНЭЙДАР (40 гадоў).
ШНЭЙДАР, н. ў 1926.
ШНЭЙДЭРМАН Б.Д. (54 гады).
ШНЭЙДЭРМАН І.Ш. (55 гадоў).
ШНЭЙДЭРМАН Сара (17 гадоў).
ШНЭЙДЭРМАН Фаня (19 гадоў).
ШУР Марыя.
ШУШКАЎ Міхаіл Іванавіч, н. ў 1901.
ШЧЭРБА Іофан Лявонцьевіч, н. ў 1922.
ШЫРКО Васіль.
ШЭМЕРЭЙ Дзмітрый.
ЭНГЛІН Шэвель .
ЮНЕВІЧ Нэля Сільвестраўна, н. ў 1939.
ЮНЕВІЧ Сільвестр Іосіфавіч, н. ў 1910.
ЮНЕВІЧ Эрнест Сільвестравіч, н. ў 1934.
ЯНКОВІЧ Пётр Сямёнавіч.
ЯНШЫН Рыгор Іванавіч, н. ў 1928.
ЯНШЫНА Матрона Пятроўна, н. ў 1908.
ЯФРЭМЕНКА Сяргей, н. ў 1911.
ЯЦЫН Адам Браніслававіч, н. ў 1922.
ЯШЧУК Мікалай Міхайлавіч, н. ў 1895.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

ПАСЛЯ ВЫЗВАЛЕННЯ АЙЧЫНЫ

Кучы цэглы і пакарожанага металу, пачарнелыя шкілеты будынкаў, сляды пажараў. Такой была Орша ў 1944 г. Адступаючы, гітлераўцы знішчалі ўсё, што маглі. Было разбурана больш за 75 працэнтаў жылых дамоў, сілікатны завод, птушкакамбінат, мясакамбінат, завод «Чырвоны барацьбіт». Замерлі на пуцях паравозы, ад будынкаў станцыі і дэпо засталіся руіны, не дзейнічала сувязь. За час нацысцкага «новага парадку» ад рук акупантаў загінула каля 60 тыс. грамадзян. Горад здаваўся вымерлым.

Нямецка-фашысцкімі захопнікамі за перыяд акупацыі нанесены ўрон Оршы на суму 580,9 млн. рублёў.

«У г. Орша разбурана і спалена 4570 жылых дамоў, 26 культурных дзяржаўных устаноў, 8 фабрык і заводаў, у тым ліку ў чэрвені і ліпені 1944 г. 5 буйных прадпрыемстваў саюзна-рэспубліканскага падпарадкавання, і поўнасцю вывезена ўсё абсталяванне. Акрамя таго, спалена і разбурана 112 500 кв. метраў жылой плошчы.

Пры адыходзе нямецкія акупанты ў чэрвені і ліпені 1944 г. ўзарвалі 7 мастоў, у тым ліку Дняпроўскі высакаводны мост». (З актаў Аршанскай гарадской камісіі садзейнічання ў рабоце Надзвычайнай Дзяржаўнай камісіі па расследаванні і ўстанаўленні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З уліку прычыненага імі ўрону г. Орша, ад 9.9.1944 г.).

Па стане на 17.7.1944 г. ў Аршанскім раёне застаўся 56 851 жыхар, у т.л. сельскага насельніцтва 53 326 чалавек. За 3 гады акупацыі ў раёне поўнасцю разбураны Якаўлевіцкая суконная фабрыка, Копыскі льнозавод, Высокаўскі спіртзавод (пасля вайны яны не адноўлены), Межаўскі спіртзавод, на 96 працэнтаў — БелДРЭС, на 80 працэнтаў — цвіковы завод «Чырвоны Кастрычнік».

У МТС і саўгасах раёна налічвалася 8 трактароў. У калгасах не засталося ніводнай жывёліны. У раёне знішчаны 3182 жылыя дамы, 14 будынкаў сельскіх Саветаў, 2 бальніцы, 9 медпунктаў, 72 школы, 2305 грамадскіх пабудоў. (З «Кароткай эканамічнай характарыстыкі Аршанскага раёна на 17.7.1944 г.»).

Згодна «Звестак аб колькасці грамадзян СССР, якія насільна выгнаны фашысцкімі захопнікамі ў перыяд часовай акупацыі Аршанскага раёна і вярнуліся на радзіму па стане на 1 ліпеня 1945 года» (гэтыя звесткі ідуць з грыфам «сакрэтна») з раёна было выгнана 5259 чалавек, у т.л. 2926 мужчын і 2343 жанчыны, з іх 159 дзяцей. Па стане на 25.1.1946 г. на радзіму вярнулася 3840 чалавек.

Згодна рашэння Аршанскага райвыканкома № 117 ад 5.6.1969 г. «Аб удакладненні дадзеных аб зверствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў у перыяд часовай акупацыі тэрыторыі Аршанскага раёна» ў перыяд 1941—1944 гг. нямецка-фашысцкімі захопнікамі поўнасцю знішчаны 9 населеных пунктаў: Межаўскі сельсавет — вёскі Бортнікава (спалена 10 двароў), Наркоўшчына (спалена 6 двароў), Мальжонкава (спалена 34 двары); Клюкаўскі сельсавет — вёскі Замасточча (спалена 27 двароў), Іванькава (спалена 19 двароў); Арэхаўскі пассавет — вёска Рудня (спалены 34 двары); Браздзетчынскі сельсавет — вёскі Маркавічы (спалена 40 двароў), Чурылава (спалена 60 двароў), Лявонаўка (спалена 70 двароў). Усяго па раёне знішчаны 3311 двароў, з іх у г.п. Копысь — 1128.

За перыяд Вялікай Айчыннай вайны на франтах загінула 5048 чалавек, у партызанах і падполлі — 402. Знішчана мірных жыхароў 8045, у тым ліку 5 тыс. ваеннапалонных. Спалены 192 чалавекі. Выгнана ў нямецкае рабства 2429 чалавек, вярнуліся — 2121.

Але час не чакаў. Аршаншчына ўзнімалася з руін. У Оршы гараджане расчышчалі завалы, засыпалі траншэі, закладвалі падмуркі новых будынкаў — пасля вайны прыгоднымі для эксплуатацыі аказаліся толькі піўзавод і адзін млын.

На працягу 1944 г. адноўлены і пачалі дзейнічаць хлебакамбінат, гарпрамкамбінат, вапнавы завод, ашчадныя касы. Былі адкрыты дзіцячы пакой міліцыі і дзетпрыёмнік-размеркавальнік, магазін для забеспячэння інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, 2 дамы на Чырвонай плошчы перададзены пад гарадскую паліклініку, дом № 7 па вуліцы Леніна — жаночай кансультацыі, дом № 75 па вуліцы Энгельса — тубдыспансеру. Адкрыты дзіцячыя сады: гарсавета — на 75 месц, мясакамбіната — на 50 месц, ільнокамбіната — на 50 месц.

За перыяд з 20.4.1945 г. па 27.4.1945 г. пры аршанскім Асаавіяхіме прайшлі навучанне 39 байцоў-размінёраў. Да непасрэднай работы па размініраванні было прыцягнута 35 чалавек. Работа праводзілася сумесна з вайсковымі часцямі. Было сабрана і знішчана 11 075 выбуховых прылад. За перыяд работ па размініраванні і зборы трафеяў з 27.4. па 1.7.1945 г. на тэрыторыі Оршы ад іх ачышчана 39,2 кв. км.

Першая пасля вызвалення горада сесія гарадскога Савета дэпутатаў працоўных прыняла рашэнне «Аб аднаўленні горада Орша і працоўным удзеле насельніцтва ў аднаўленні горада». Прайшлі некалькі нядзельнікаў па аднаўленні горада. Дапамагалі разбуранай Оршы і жыхары братніх рэспублік. Вайсковая часць № 83 280 пабудавала высакаводны мост цераз р. Аршыца.

Жыллёвае і прамысловае будаўніцтва. Імклівымі тэмпамі развівалася ў Оршы прамысловасць будаўнічых матэрыялаў. Яе галоўным «паўпрэдам» па праву сталі лічыць вытворчае аб'яднанне «Оршабудматэрыялы» з галаўным прадпрыемствам сілікатных вырабаў. Цэхі камбіната, поўнасцю разбураныя ў гады фашысцкай акупацыі, перажывалі сваё другое нараджэнне. Гораду і рэспубліцы, дзе хутка разгортвалася жыллёвае і прамысловае будаўніцтва, патрэбна было ўсё больш і больш будаўнічых матэрыялаў, і аршанскія сілікатчыкі як толькі маглі імкнуліся задаволіць патрэбы будаўнікоў. Паступова горад набывае абрысы сучаснага. Гарсавет прымае рашэнне аб яго забудове.

Для аднаўлення разбуранага фашыстамі горада ў ліпені 1945 г. быў створаны трэці будаўнічы ўчастак віцебскага аблбудтрэста № 8 Міністэрства жыллёвага і грамадзянскага будаўніцтва БССР з аб'ёмам работ 700 тыс. руб. (у старым вылічэнні). Арганізатарам бу-



Аднаўленне насоснай станцыі завода «Чырвоны барацьбіт». 1944 г.

даўнічага ўчастка і яго першым кіраўніком быў Пётр Кірылавіч Іваноў. Па стане на 25.6.1947 г. на тэрыторыі Оршы ў зямлянках і падвальных памяшканнях пражывала 39 сямей, 147 чалавек. Будаўнічым участкам за перыяд з 1946 па 1949 гг. выканана будаўнічамантажных работ у аб'ёме 3,2 млн. руб.

У 1950 г. на базе будучастка арганізавана Аршанскае будупраўленне № 3 з аб'ёмам работ 5088 тыс. руб. Кіраўніком управўлення быў назначаны Мікалай Ільіч Сабельнікаў. За 1950—1951 гг. калектывам гэтага ўпраўлення пабудаваны інтэрнат, школа, маслабаза, 3 жылыя дамы, будынак гаркома партыі, дзіцячы садок, арцель «Камунар». Былі ўзведзены таксама інтэрнат ільнокамбіната, гасцініца і многія іншыя пабудовы. У гэтыя гады будуюцца мікрараёны Чаромушкі па вул. Міру і «Раніца» па вул. Леніна. Шлях да ільнокамбіната перайменаваны ў праспект Тэкстыльшчыкаў.

Мясцовая прамысловасць. Асаблівая старонка ў жыцці пасляваеннай Оршы — узнаўленне дзейнасці ільнокамбіната. Былі разбураны вытворчыя будынкі, не існавала абсталявання. Аднаўленне аршанскага ільнокамбіната праводзілі у 2 чаргі. Тэрмін пуску ў эксплуатацыю 1-й чаргі ў аб'ёме 16 прадзільных ватэраў і 76 ткацкіх станкоў быў запланаваны на 1.6.1945 г.

У 4-м квартале 1944 г. Аршанскаму ільнокамбінату дапамагалі тэкстыльшчыкі Расіі. 58 ткацкіх станкоў перадалі з ільнокамбіната імя Леніна (г. Кастрама), 18 ткацкіх станкоў фабрыка імя Молатава (г. Кастрама), 6 ватэраў сістэмы інжынера Зварыкіна з фабрыкі «Чырвоны кастрычнік» (г. Горкі) і 10 ватэраў сухога прадзення з Казанскага ільнокамбіната. У штаце прадпрыемства было тады 500 тэкстыльшчыкаў — у асноўным жанчыны. На працягу месяца яны ўручную разгрузілі больш за 700 вагонаў і даставілі да месца мантажу тэхналагічнае абсталяванне. Ман-

Выпускнікі арцелі «Калектыўная праца». Барань. 1946.

У ткацкім цэху Аршанскага льнокамбіната.

таж вялі зімой у паўразбураных дрэнна асветленых памяшканнях, якія не ацяпляліся. 10 кастрычніка 1945 г. выйшаў загад наркома тэкстыльнай прамысловасці СССР «Аб часткоўым уводзе ў эксплуатацыю Аршанскага льнокамбіната Галоўільнапрома». А ў 1949 г. камбінат пераўзышоў даваенны ўзровень па выпуску гатовых тканін.

У 1958 г. пачалося будаўніцтва 2-й чаргі камбіната для выпуску тканін бытавога прызначэння: абрусаў, сурвэтак, касцюмна-сукенкавых тканін. У сціслыя тэрміны, за 42,5 месяца пры нарматыве 48 месяцаў, былі завершаны будаўніча-мантажныя работы і ўстаноўлена 20 532 прадзільныя верацяны і 676



Радыёпрыёмнік «Іскра» — першынец радыётэхнічнай прадукцыі завода «Чырвоны Кастрычнік». 1954 г.

ткацкіх станкоў з адпаведным паркам падрыхтоўчага аддзялення.

На пачатку 1959 г. Аршанскі льнокамбінат быў ужо буйным прадпрыемствам па выпрацоўцы мяшочных і ўпаковачных тканін з гадавым выпускам 45,8 млн. кв. метраў.

Паспяхова ішло аднаўленне і станкабудаўнічага завода «Чырвоны кастрычнік». У гады вайны ўсё каштоўнае абсталяванне завода было дэманціравана і вывезена ў г. Благавешчанск Башкірскай АССР. Разам з заводам эвакуіраваліся і спецыялісты.

Пасля вайны ў памяшканні галоўнага корпуса былі ўстаноўлены і змантіраваны станкі грубага і тонкага валачэння, станкі для нарубкі ручнога і машыннага цекса, будаўнічых цвікоў, паліровачныя барабаны і сартавальная машына.

Адначасова вялася работа па падрыхтоўцы кадраў. Аснову калектыву складала моладзь — у асноўным дзяўчаты ва ўзросце ад 15 да 18 гадоў. Абучалі іх непасрэдна каля станка. Першай прадукцыяй завода былі буйнаабутковыя цвікі, ручны і машынны цекс для вытворчасці армейскага рыштунку, салдацкіх ботаў і чаравікаў. Потым тут пачалі выпускаць швейныя машыны. Як і ў перадваенныя гады, у калектыве разгарнуўся рух за ўдарную працу. За дасягнутыя поспехі ў сацыялістычным спаборніцтве ў 1-м квартале 1951 г. завод быў узнагароджаны Чырвоным Сцягам Савета Міністраў БССР.

У 1952 г. прадпрыемства змяніла тэхнічны накірунак і, не спыняючы выпуск швейных машын, пачало выпускаць радыётэхнічныя вырабы. Першымі сярод іх былі рэле «Клён» і «Терн».

У 1954 г. завод датэрмінова асвоіў і выпусціў першыя 10 тыс. батарэйных радыёпрыёмнікаў 3-га класа «Іскра».

У 1955 г. калектыў пад кіраўніцтвам В.М.Безялянскага і А.В.Гарэлава распрацаваў 2 канструкцыі радыёстанцыі для чыгуначнага транспарту. На базе гэтай радыёстанцыі завод стварыў шэраг радыёстанцый для разавых паставак: для металургічнай прамысловасці — радыёстанцыі сувязі разліўшчыкаў металу з машыністам разлівачнага крана, для лясной — радыёстанцыі сувязі машыністаў тралёвачнага механізма з рабочымі, для аператыўнай сувязі на Сусветным фестывалі моладзі ў Маскве — партатыўныя радыёстанцыі, за якія калектыў завода атрымаў шмат удзячных водгукаў ад рэдакцый цэнтральных газет, часопісаў, Усесаюзнага радыё.

Пачалі дзейнічаць таксама завод ацяпляльных катлоў, трактарныя майстэрні, якія пазней ператварыліся ў трактарарамонтны завод. У цэхах завода рабілі капітальны рамонт трактароў, рухавікоў, аўтамабільных каробак перадач, выраблялі корманарыхтоўчыя агрэгаты.

Сельская гаспадарка. Па выніках работы за 1945—46 гг. за паспяховае выкананне сельскагаспадарчых работ і дзяржаўнага плана развіцця жывёлагадоўлі Аршанскаму раёну быў уручаны пераходны Чырвоны Сцяг абкома КП(б)Б і аблвыканкома. Найлепшых вынікаў дасягнулі калгасы «Чырвоны бераг» Пішчалаўскага сельсавета, «Ларынаўка» і «Чырвоны след» Зубаўскага сельсавета.

У калгасе «Чырвоны бераг» калгаснікам выдана на кожны працадзень па 2 кг зерня, 6 кг бульбы, 3,5 кг гародніны і 25 рублёў.

У 1946 г. ў Аршанскім раёне было 305 населеных пунктаў з 13 910 гаспадаркамі. Пасля вызвалення аднавілі сваю дзейнасць 126 калгасаў. У некаторых калгасах ураджайнасць зерневых склала 12—17 ц з гектара, бульбы — 150—155 ц. За 1944—1947 гг. адбудавана 1638 жылых дамоў калгаснікаў.

У 1950 г. праходзіла масавае ўзбуйненне калгасаў. Да ліпеня 1950 г. ў раёне было 126 калгасаў, пасля ўзбуйнення — 35. У гэты час налічвалася 9635 двароў калгаснікаў, працаздольных членаў калгасаў — 13 811, у тым ліку 3733 мужчыны, 8266 жанчын і 2015 падлеткаў. За калгасамі замацавана 69 140 га зямлі, у тым ліку 45 213 — ворнай.

З вялікай цяжкасцю аднаўляліся калгасы. Вось як пісала пра гэта 20 сакавіка 1945 г. газета «Віцебскі рабочы»: «Саўнарком СССР і ЦК ВКП(б) у сваёй пастанове аб плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 г. рэкамендуюць пры недастачы цяглавай сілы выкарыстаць на лёгкіх палявых работах малапрадукцыйных кароў калгасаў і калгаснікаў. Выкананне гэтага пункта пастановы для калгаснікаў Аршанскага раёна будзе адыгрываць значную ролю ў справе правядзення вясенне-палявых работ. Дзякуючы своечасова прынятым мерам па раёну ўжо зараз абучана 270 кароў. Пытанню абучэння кароў асабліва вялікая ўвага ўдзелена ў сельгасарцелі імя Варашылава Высоцкага сельсавета. Тут абучана да работ 23 каровы. У абучэнні кароў актыўны ўдзел прымаюць калгаснікі Паліцы-

Звеннявая па вырошчванню кукурузы А.І.Блашкевіч з калгаса «Адроўка». 1959 г.

на Акуліна і Буракоўскі Фёдар. Імі для абучэння кароў выраблена вупраж, ярма і шоркі. Паспяхова ідзе абучэнне кароў у калгасе Малатнянскага сельсавета і іншых. Пастаўленая перад нашым раёнам задача па прывучэнні кароў да палявых работ будзе выканана».

У 1945 г. ў вучгасе «Бабінічы» створана школа механізацыі. У 1948 г. згодна з пастановай Савета Міністраў СССР школа рэарганізавана ў саўгаснае вучылішча механізацыі, якое рыхтавала кадры для саўгасаў Беларусі — механікаў самаходных камбайнаў, памочнікаў камбайнераў, трактарыстаў, шафёраў. За гады свайго існавання саўгаснае вучылішча падрыхтавала сотні спецыялістаў для сельскай гаспадаркі.

За 15 км ад Оршы на правым беразе Дняпра знаходіцца эксперыментальная база «Вусце» Беларускага навукова-даследчага інстытута земляробства. У час акупацыі Беларусі нямецка-фашысцкімі захопнікамі гаспадарка даследнай станцыі была амаль цалкам знішчана, ворыўныя землі скрозь зараслі пустазеллем.

Адразу ж пасля вызвалення тэрыторыі рэспублікі ў «Вусці» зноў узнавілася даследная работа. Поруч з аднаўленнем разбуранай вайной гаспадаркі прымаліся меры па арганізацыі палявых доследаў і закладцы доўгатэрміновых стацыянараў на дрэвападзолістых сугліністых глебах, падсцілаемых марэнай, характэрных для значнай часткі паўночнаўсходняй зоны Беларусі.

Ужо ў 1946 г. на палях станцыі былі закладзены стацыянарныя доследы па вывучэнні ў севазваротах эфектыўнасці вапнавання, розных відаў і форм мінеральных угнаенняў, прыгатавання і правільнага выкарыстання арганічных угнаенняў, па вывучэнні розных сістэм угнаення ў севазвароце са шматгадовымі травамі. Пачаліся работы і па селекцыі азімага жыта і яравой пшаніцы, вывучэнні бабова-злакавых шматгадовых траў, прыёмаў агратэхнікі вырошчвання канюшыны на насенне і сена.

У 1948 г. былі закладзены стацыянарныя доследы па вывучэнні рацыянальнага чаргавання культур і прадукцыйнасці палявых севазваротаў. Праводзіліся таксама даследаванні па кармавых культурах і іх рацыянальным размяшчэнні ў севазвароце. Працягвалася вывучэнне прыёмаў барацьбы з карнявішчным і корнеадросткавым пустазеллем, паглыбленнем і акультураннем ворыўнага слоя глебы. З 1950 г. праводзяцца доследы па вывядзенні сартоў шматгадовых траў і выяўленні рацыянальных прыёмаў агратэхнікі. У 1953 г. пачата селекцыйная работа па лёне і распрацоўцы прыёмаў агратэхнікі яго вырошчвання.

У 1956 г. ў сувязі з пераводам Інстытута сацыялістычнай сельскай гаспадаркі ў Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР і перайменаваннем яго ў Беларускі навукова-даследчы інстытут земляробства сельскагаспадарчая доследная станцыя была перайменавана ў эксперыментальную базу «Вусце».

Народная асвета. У час акупацыі Оршы гітлераўскімі захопнікамі школьная гаспадарка горада была разбурана. Многія школы акупанты ператварылі ў салдацкія казармы. Яны разрабавалі вучэбныя кабінеты і бібліятэкі.

З першых дзён вайны большасць аршанскіх настаўнікаў і вучняў старэйшых класаў пайшлі на фронт ці ўключыліся ў партызанскую барацьбу.

У 1944 г. пасля вызвалення Оршы ў горадзе было 8 школ. Аднавілі сваю работу настаўніцкі інстытут з 4 факультэтамі, чыгуначны тэхнікум, школа медсясцёр, рамеснае вучылішча льнокамбіната (цяпер ПТВ № 45). Згодна з Пастановай Савета Міністраў Беларускай ССР ад 16.7.1946 г. № 1326 у г. Орша 1.9.1946 г. адкрыта рускае педагагічнае вучылішча.

1 верасня 1950 г. па вул. Свярдлова распачалася 1-я пасляваенная школьная новабудоўля. З 1954 г. працуе СШ № 5, з 1956 — СШ № 12, з 1958 — СШ № 9.

З 1.2.1947 г. па 1.6.1947 г. для школьнікаў — дзяцей загінуўшых воінаў і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны былі выдзелены пайкі, у тым ліку бясплатныя, і арганізаваны гарачыя сняданкі (400 пайкоў, у тым ліку 100 бясплатных). Норма прадуктаў у пайку: 100 г хлеба, 10 г цукру, 20 г мяса, 25 г канцэнтратаў.

У 1950 г. у раёне працавала 446 настаўнікаў (43 з вышэйшай адукацыяй, 280 — з сярэдняй, 21 не мелі сярэдняй адукацыі).

Вялікую ўвагу школы Аршаншчыны надавалі політэхнічнаму навучанню школьнікаў. У школах раёна было абсталявана 54 прадметныя кабінеты, 37 майстэрань, 3 цяпліцы. 60 школ пераведзена на заняткі ў адну змену. На аснове пастановы Савета Міністраў БССР ад 15 сакавіка 1954 г. быў заснаваны Аршанскі вячэрні тэкстыльны тэхнікум, які з 1959 г. працуе па дзённай, вячэрняй і завочнай формах навучання і называецца зараз Аршанскі механіка-тэхналагічны тэхнікум. Яго з'яўленне было абумоўлена наяўнасцю ў горадзе

льнокамбіната — прадпрыемства саюзнага значэння. На льнокамбінаце не хапала тэхнолагаў, майстроў, начальнікаў цэхаў — дасведчаных спецыялістаў у галіне апрацоўкі лёну. Таму ў гэтым тэхнікуме былі адкрыты аддзяленні па спецыяльнасцях: тэхнік-тэхнолаг, ільнопрадзенне, ільноткацтва. Большасць падрыхтаваных спецыялістаў працавала на мясцовым ільнокамбінаце.

У 1947 г. аднаўляецца будынак па вул. Карла Маркса, куды перамяшчаецца школа медсясцёр, заснаваная ў горадзе яшчэ ў 1937 г. У 1955 г. школа медсясцёр рэарганізуецца ў медыцынскае вучылішча з 3 аддзяленнямі — фельчарскім, акушэрскім і медсястрынскім. Праўда, матэрыяльная база на той час не адпавядала таму ўзроўню па падрыхтоўцы спецыялістаў, які задумваўся. Па гэтай прычыне ў жніўні 1958 г. вучылішча было закрыта, адкрылася яно толькі ў 1961 г.

Адразу пасля вызвалення Оршы былі арганізаваны курсы падрыхтоўкі для паступлення ў тэхнікум чыгуначнага транспарту. Першага верасня 1944 г. тут ужо вучылася 320 чалавек.

У 1951 г. аднавіліся заняткі ў дзіцячай школе мастацтваў. Гэта было другое яе нараджэнне. Пачыналі ўсё спачатку. За гэту справу ўзяўся ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, выпускнік Магілёўскага музычнага вучылішча Пётр Раманавіч Лазараў. Школа атрымала новае памяшканне па вул. Мінскай, 11. Першыя педагогі-энтузіясты — Г.Р.Пятроўская, Е.І.Гугель, Р.А.Удовенкаў, С.І.Ляошка і іншыя — шмат зрабілі для аднаўлення школы мастацтваў, падрыхтавалі аснову для далейшага развіцця музычнай адукацыі ў родным горадзе.

У 1944 г. ў разбуранай вайной Оршы адноўлены Аршанскі настаўніцкі інстытут. Ужо ў 1945 г. ў яго бібліятэцы было 2 тыс. кніг, а напачатку 1950-х гг. інстытут стаў сапраўдным навуковым і культурным цэнтрам рэспублікі. Тут былі праведзены 4 тэарэтычныя канферэнцыі і наладжаны 4 экспедыцыі для збору дыялекталагічнага матэрыялу.

У 1956 г. Аршанскае педагагічнае вучылішча было пераўтворана ў індустрыяльна-педагагічнае і пачало рыхтаваць, акрамя настаўнікаў пачатковых класаў, выкладчыкаў працоўнага навучання і чарчэння.

Ахова здароўя. У гады Вялікай Айчыннай вайны фашысты зруйнавалі ўсе бальніцы. Было многа хворых. Людзей падкошвалі сыпны тыф, страўнікава-кішачныя хваробы, дыфтэрыт і інш. Хворых збіралі ў асобных прыватных дамах па вул. Энгельса. Размяшчаліся яны ў асноўным на падлозе. Дапамогу аказвалі ўрачы з ліку ваеннапалонных і сярэдні медперсанал з мясцовых жыхароў. Аднак шмат зрабіць яны не маглі — многія хворыя паміралі. Асабліва пакутавалі дзеці, бязлітасным бічом якіх ў часы акупацыі была дыфтэрыя.

Пасля вызвалення Оршы першаму пасляваеннаму арганізатару аховы здароўя ў горадзе ўрачу Іосіфу Іванавічу Адашкевічу прыйшлося практычна пачынаць усё з нуля. Яму актыўна дапамагалі ўрачы М.К.Стахіеў, А.І.Дзедзінец, С.Я.Нізоўская, Р.І.Васкрасенская, А.Р.Заводчыкава, А.Ф.Емяльяненка, з ліку сярэдняга персаналу — А.Кучура, Д.І.Мяжэвіч, М.К.Антонава, А.Р.Чахоўская, Н.К.Міхневіч і інш. Не хапала ложкаў, бялізны, посуду, інструментарыя. Асвятленне было ад газавай лямпы, ацяпленне — ад часовай печкі-буржуйкі.

Паступова жыццё наладжвалася, умацоўваліся ўстановы аховы здароўя. Неўзабаве

У Аршанскім радзільным доме.

медсанчасць ільнокамбіната налічвала ўжо 400 ложкаў, бальніца імя Сямашкі — 250, чыгуначная бальніца — 275, чыгуначная туберкулёзная — 200. Яны аб'ядноўваліся з паліклінікамі і кансультацыямі, мелі розныя кабінеты і лабараторыі. Пачалі працаваць процітуберкулёзны і скурна-венерычны дыспансеры. Апошні з 1958 г. мае статус міжраённага. Адкрыліся дом дзіцяці на 100 месцаў, дом санітарнай асветы, станцыя хуткай дапамогі. На прамысловых прадпрыемствах працавала больш за 20 пунктаў здароўя, з іх 8 — урачэбных. Аднавіла падрыхтоўку сярэдняга медперсаналу Аршанскае медвучылішча.

З 1956 г. пачаў праводзіцца перапіс дзяцей да 14-гадовага ўзросту. На ўлік было ўзята 6458 чалавек. Дзецям рабіліся масавыя прышчэпкі. У тым жа годзе была зацверджана штатная адзінка загадчыка дзіцячай паліклінікі — ім была прызначана І.Я.Загоскіна. Дзіцячы стацыянар быў пашыраны да 40 ложкаў.

Медыцынскае абслугоўванне насельніцтва арганізоўвалася па так званым участковым і цэхавым прынцыпе — на той час у горадзе налічвалася 45 тэрапеўтычных і педыятрычных участкаў.

Асабліва варта адзначыць намаганні ўрачоў Емяльяненка і Сітняк, якія сталі сапраўднымі арганізатарамі аднаўлення акушэрска-гінекалагічнай службы. Першыя радзільныя ложкі былі адкрыты пры бальніцы імя Сямашкі, а ўжо ў жніўні 1944 г. пры бальніцы імя Варашылава створана радзільнае аддзяленне на 15 ложкаў. Адкрылася жаночая кансультацыя. А неўзабаве колькасць акушэрска-гінекалагічных ложкаў перавысіла даваенную. З году ў год удасканальвалася работа жаночых кансультацый, пашыралася кола іх дзейнасці, павялічваўся штат работнікаў, выпрацоўвалася найбольш аптымальная структура ўчастковай работы ўрача акушэра-гінеколага. Пры кансультацыях сталі стварацца школы мацярынства. Пазней радзільны дом (галоўны ўрач С.М.Сузіна), разам з кансультацыямі пачаў аказваць дапамогу жанчынам не толькі горада, а і суседніх раёнаў.

Па стане на 1.4.1950 г. у сетку медыцынскіх устаноў г. Орша ўваходзілі: бальніца імя Сямашкі на 200 ложкаў, аб'яднаная з гарпаліклінікай № 1, лабараторыя, дзіцячая кансультацыя, малочная кухня, кабінет школьнага ўрача, 5 фельчарскіх пунктаў; бальніца імя Варашылава на 150 ложкаў, паліклініка № 2, 2 урачэбныя пункты — на льнокамбінаце і мясакамбінаце; процітуберкулёзны дыспансер; скурна-венерычны дыспансер; жаночая кансультацыя; санэпідэмстанцыя; малярыйная станцыя; станцыя пералівання крыві.

З 1949 г. ў Оршы на кожныя 1000 чалавек нараджалася 23, а паміралa 6 чалавек.

Культура. У Оршы, у якой на дзень вызвалення заставалася толькі 3 тыс. чалавек, адраджаліся не толькі буйныя прамысловыя прадпрыемствы, школы і бальніцы, а і культурныя ўстановы. 15 снежня 1944 г. была адроджана бібліятэка імя Пушкіна, якая размясцілася ў прыватным доме ў пакоі плошчай 50 м^2. За 9 месяцаў траім штатным супрацоўнікам удалося сабраць 5700 кніг, якія часам даводзілася падшываць, падклейваць і нават узнаўляць тэкст адсутных старонак. Чытачоў было нямала — 775 чалавек. У канцы 1945 г. гарвыканком выдзеліў дадатковыя сродкі на папаўненне кніжнага фонду. Дзякуючы гэтаму і нястомнай працы супрацоўнікаў у 1946 г. ў бібліятэцы было ўжо больш за 10 тыс. кніг, якімі карысталіся 2706 чытачоў. Да свайго 50-годдзя ў 1949 г. бібліятэка атрымала новае памяшканне па вул. Леніна (цяпер фондасховішча гарадскога музейнага комплексу), дзе была абсталявана чытальная зала на 40 месцаў.

У 1946 г. адкрываецца Дом сацыялістычнай культуры (у будынку дзеючага цяпер касцёла св. Іосіфа), праз 3 гады — гарадскі Дом піянераў. У 1954 г. з'явіўся памятны аршанцам драўляны будынак кінатэатра «Піянер».

5 сакавіка 1948 г. выйшла пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні ў Оршы мемарыяльнага музея К.С.Заслонава, а 1 жніўня таго ж года музей быў адкрыты. У 1952 г. ён размясціўся ў цяперашнім будынку, дзе дагэтуль быў Дом піянераў чыгуначнага вузла.

Да сакавіка 1949 г. былі адноўлены і пачалі працаваць: гарадскі Дом культуры, 5 клубаў (імя Кірава на чыгуначным вузле, клуб ільнокамбіната, клуб пажарнікаў, клуб мясакамбіната, клуб завода «Чырвоны барацьбіт»), гарадская і дзіцячая бібліятэкі, 2 прафсаюзныя бібліятэкі (пры клубе імя Кірава і льнокамбіната), 11 школьных і ведамасных бібліятэк, 2 радыёвузлы.

Паводле рашэння гарвыканкома № 65 ад 8.2.1951 г. «Аб ахове помнікаў культуры» да помнікаў культуры г. Орша адносіліся: паравознае дэпо, дзе працаваў К.С.Заслонаў з 1939 па 1941 гады і з лістапада 1942 г. па люты 1943 г.; дом № 7 па вул. Будзённага, дзе

жыў К.С.Заслонаў у гады акупацыі Оршы; дом № 21 па вул. Я.Коласа, дзе К.С.Заслонаў праводзіў падпольныя сходы; вакзальная плошча станцыі Орша-Цэнтральная, дзе пахаваны К.С.Заслонаў; кацярынінская вярста, якая знаходзіцца па вул. Шклоўскай у раёне мясакамбіната; кацярынінская вярста, якая знаходзіцца ў раёне цагельнага завода; замчышча на левым беразе р. Аршыца пры ўпадзенні яе ў р. Днепр.

Транспарт. Да Вялікай Айчыннай вайны Аршанскі тэхнікум чыгуначнага транспарту 8 разоў праводзіў сваіх выхаванцаў на працу па абслугоўванні чыгункі. Выпускнікі тэхнікума забяспечвалі бесперабойную работу транспарту і ў гады вайны. Адразу пасля вайны былі арганізаваны курсы падрыхтоўкі для паступлення ў тэхнікум, і ў першы год пасля вызвалення тут вучылася ўжо больш 300 чалавек — будучых работнікаў чыгуначнага транспарту.

У пасляваеннай Оршы паспяхова развіваўся аўтобусны транспарт. У 1945 г. быў арганізаваны аўтобусны рух у г. Орша па маршрутах: «Горад — вакзал ст. Орша». Для гэтага выдзялялася 3 аўтобусы, якія перавозілі насельніцтва з 7 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы. Па стане на 1.1.1959 г. для абслугоўвання насельніцтва горада выдзелены 33 аўтобусы, 47 легкавых таксі, 47 грузатаксі. На маршрутах штодзённа працавалі 24 аўтобусы. Агульная працягласць маршрутаў складала 41 км.

Гандаль. У 1946 г. ў аршанскім гарпрамкамбінаце былі адкрыты цэхі — харчовы і безалкагольных напіткаў, прадукцыя якіх пастаўлялася ў гандлёвыя кропкі горада.

14.12.1947 г. ЦК ВКП(б) і СМ СССР прынялі пастанову аб правядзенні грашовай рэформы і адмене картак на харчовыя і прамысловыя тавары. У сувязі з адменай картачнай сістэмы ўстаноўлены нормы водпуску хлеба, круп, макароны на аднаго чалавека: у гарадах і рабочых пасёлках хлеба — па 2 кг, круп, макароны — па 1 кг.

На 23.12.1947 г. ў раёне ў наяўнасці была 31 гандлёвая кропка (8 новых, астатнія адноўлены), 3 сталовыя. У 1948 г. гандлёвая сетка Оршы павялічылася на 8 магазінаў, 13 ларкоў, 8 буфетаў.

Спорт. У пасляваенны час у Оршы пачала развівацца фізічная культура. У пратаколе пасяджэння гарвыканкома № 15 ад 10.5.1946 г. запісана: «Прынята рашэнне аб адкрыцці ў г. Орша дзіцячай спартыўнай школы з 15.5.1946 г. на базе 4-й школы на 100 чалавек».

У 1948 г. прынята рашэнне хадайнічаць перад Саветам Міністраў СССР аб аднаўленні работы Аэраклуба ў Оршы, што падрыхтаваў не адну сотню лётчыкаў, многім з якіх прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

За 1950—1951 гг. ў Оршы падрыхтавана 6 спартсменаў I разраду, 86 — II разраду, 556 — III, 257 — юнацкага. Віктар Какора (вучань СШ № 1) устанавіў рэкорд рэспублікі па бегу на 400 м; рэкорд рэспублікі па скачках у вышыню з шастом устанавіў вучань СШ № 1 Клім Бурдзін. У 1951 г. ў горадзе створана 15 футбольных каманд. *С.І.Хорсун.*

Орша. Саракавыя

Пасля пятнаццацігадовага перапынку кастрычніцкай ноччу 1945 года я, дэмабілізаваны салдат, зноў апынуўся на знаёмым па маладосці аршанскім вакзале. Ад празмернасці пачуццяў было не да сну. Уладкаваўшы на вакзале рэчы, я яшчэ да ўсходу сонца накіраваўся ў горад. Ісці трэба было каля трох кіламетраў, палавіну з іх — праз незабудаваную пустку. Пачыналася марозная, празрыстая раніца, бадзёрыла яе свежасць. Выразна акрэслівалася навакольле. Над Задняпроўем, над ларынаўскімі палямі ўздымаўся барвовазалацісты дыск сонца. Прадпрыемствы не працавалі, машыны амаль не хадзілі, са смакам дыхалася свежым, ядраным паветрам. Было ціха і бязлюдна, а на душы — крыху трывожна перад сустрэчай з Оршай.

Хоць я прыкладна ўяўляў, што давядзецца ўбачыць, але панарама, што адкрылася з гары, з белых яўрэйскіх могілак, дзе цяпер новы будынак педвучылішча, узрушыла мяне незвычайна, нават дыханне захапіла: перада мной ляжала... Варшава ў мініяцюры. Толькі разбураную фашыстамі Варшаву я бачыў па частках, а тут перад вачамі быў увесь, як на далоні, горад. Калісьці такі кампактны, шчыльна забудаваны, утульны, цяпер ён меў страшны, фантастычны выгляд. Выпаленыя

пустэчы, руіны курыліся ў бязветраную раніцу слупамі дыму. Гэта бежанцы, што вярнуліся ў родны горад, палілі печкі ў зямлянках, падвалах, у паўразбураных будынках.

Сярод гэтага хаосу разбурэнняў узвышаліся асветленыя косымі прамянямі ранішняга сонца ўцалелыя храмы. Саборны на вуглу вуліц Ленінскай і Камсамольскай, праўда, ужо без сваіх пяці купалаў. Царква Апекі па Музейнаму завулку, на беразе Аршыцы, вышчарбленая асколкамі снарадаў. Званіца манастыра дамініканцаў па Савецкай, касцёл францысканцаў, невялікая царква жаночага манастыра. Шэдэўр храмавай архітэктуры — царква на могілках па Пралетарскай вуліцы. Гэтыя помнікі мінуўшчыны ўстаялі перад вайной, але праз некалькі гадоў былі разбураны. А ў драўляным Задняпроўі ўзвышаліся яшчэ два храмы — Ільінская царква і царква Богаяўленскага манастыра на Куцеінцы, якія былі «памілаваны» і пасля вайны.

Сярод руін пазнаў я і ўцалелыя будынкі рэальнага вучылішча і жаночай прагімназіі, у якіх калісьці выкладалі марксісты-ленінцы Лепяшынскія. Зеўрала пустымі аконнымі праёмамі ўнушальная каробка банка. Непадалёку былі бачны млын і друкарня, угору па Ленінскай — піўзавод, каля падножжа гары, дзе я стаяў, — каробкі станкабудаўнічага завода. Далёка справа віднеліся брудна-шэрыя вытворчыя карпусы і жылыя дамы льнокамбіната. Прама, унізе, угадваўся старажытны, вядомы яшчэ з 16 стагоддзя, аршанскі базар...

Я стаяў, як зачараваны, не маючы сіл адарваць вочы ад гэтай уражлівай, зусім не суцешнай карціны.

Пасля базара і вакзала трэцім па ажыўленасці быў у горадзе тады Дзяржбанк. Гэты вялізны для тагачаснай Оршы будынак, закончаны ў канцы 1920-х гадоў, стаяў з абшарпанымі брудна-шэрымі сценамі, на якіх захаваліся сляды маскіровачнага камуфляжу. У 1945—1946 гадах ён зусім не ацяпляўся. Не дзейнічалі і іншыя камунікацыі, акрамя асвятлення. У будынку размяшчаліся аддзяленні Дзяржбанка і сельгасбанка, упаўнаважаныя камунальнага і гандлёвага банкаў, цэнтральная ашчадкаса. Акрамя таго, тут знайшлі прытулак дзесятка паўтара бяздомных супрацоўнікаў, большасць з сем'ямі, у іх ліку і аўтар гэтых радкоў.

Прыйшоўшы на работу, мы перш за ўсё шукалі, чым бы прапаліць у жалезных печках з трубамі, якія былі выведзены ў форткі. Потым адагравалі замерзлае чарніла. Не хапала мэблі, нават табурэтак. Кожны імкнуўся прыйсці раней за іншых, каб не застацца без табурэткі. У холадзе і голадзе, пры поўнай адсутнасці лічыльнай тэхнікі даводзілася працаваць па дзесяць гадзін у суткі, калі-нікалі і ў нядзелю.

Пасля вайны, як грыбы пасля дажджу, пачалі адраджацца даваенныя і ўзнікаць новыя прадпрыемствы, прамысловыя арцелі, канторы, асабліва дробныя, гаспадарчаразліковыя і бюджэтныя арганізацыі. І кожная, нават дзіцячы садзік, знаходзілася на самастойным балансе з рахункам у банку. Адных калгасаў у раёне было 215. А яшчэ індывідуальныя пазычальнікі, пенсіянеры-адстаўнікі. А абласная кантора завальвала рознымі мудрагелістымі, часта недарэчнымі, заданнямі. Будынак банка гудзеў як растрывожаны вулей.

Пры ўсіх нястачах, холадзе і голадзе мы ўмудраліся весці цікавае, змястоўнае жыццё ў добразычлівым, згуртаваным калектыве.

Адначасова з выкананнем сваіх шматлікіх функцый банк абсталёўваўся, прымаў прыстойнае аблічча, што ў тыя гады было вельмі і вельмі няпроста. Але стараннямі перш за ўсё энергічнага самаадданага ў працы в.а. ўпраўляючага Міколы Усціновіча амярцвелая каробка, дзе ў вайну на першым паверсе была нямецкая стайня, а на другім — майстэрня па ўкладванні парашутаў, неўзабаве ператварылася ў лепшае службовае памяшканне горада.

Аб цяжкім і ў нейкай ступені рамантычным пасляваенным жыцці ў Оршы можна было б напісаць займальную кнігу, але я абмяжуюся толькі асобнымі штрыхамі.

Самым людным месцам горада быў базар, дзе тады гандлявалі не толькі прадуктамі, але і розным барахлом, жывёлай. Якія толькі справы, афёры, ігральныя авантуры, крадзяжы, бойкі і больш сур'ёзныя злачынствы не здараліся тут! Якія каларытныя былі фігуры базарных заўсёднікаў! Гэта быў не проста базар, а вузел эканамічных, сацыяльных і маральных праблем горада і рэгіёна.

Каб «замарыць чарвячка», даводзілася ісці толькі на базар, бо сталовыя абслугоўвалі выключна прымацаваных. За 200-грамовую порцыю хлеба плацілі 10 рублёў, па столькі ж — за катлету падазронага паходжання і за тушаную бульбу з загорнутай у рыззё каструлі. Усяго — трыццаць рублёў...

Марудна і вяла адраджалася і нарошчвала вытворчы патэнцыял дзяржаўная прамысловасць Оршы. Яшчэ больш марудна разгортвалася будаўніцтва, аднаўляліся гарадскія камунікацыі. Не кажу ўжо пра будаўніцтва жылля — яно, акрамя індывідуальнага, наогул не вялося. Затое бурна, энергічна, у адпаведнасці з надзённымі патрабаваннямі, разгортвалася прамысловая кааперацыя. Да 1948 года ў Оршы дзейнічала каля 20 розных па профілю і аб'ёму вытворчасці прамысловых арцелей. Яны адыгрывалі вялікую ролю ў ажыўленні і ўздыме эканамічнага, дзелавога і сацыяльнага жыцця горада, у задавальненні разнастайных патрэб насельніцтва і забеспячэнні яго занятасці. Таварная прадукцыя арцелей рэалізоўвалася нават за межамі Аршаншчыны.

Пасляваенная прамкааперацыя працавала ў асноўным не на фондавай паўнацэннай сыравіне, а на мясцовых рэсурсах, на саманарыхтоўках, утылі. Добра памятаю, што ў той час не было ніводнага наракання ад насельніцтва на кааператыўныя цэны, бо яны не былі такімі разбэшчана «гібкімі», як цяпер.

Прамысловыя арцелі разгортвалі вытворчасць, выконвалі заказы і паслугі і адначасова, хоць і з вялікімі цяжкасцямі, будаваліся гаспадарчым спосабам, павялічвалі вытворчыя плошчы, набывалі абсталяванне. І ўсё гэта не на дзяржаўным фінансаванні, а з уласных накапленняў, абмежаваных сродкаў галіновых абласных саюзаў і доўгатэрміновых пазык Дзяржбанка.

Развіццё кааперацыі спрыяла станаўленню і росту горада, да чаго я меў непасрэднае дачыненне як банкаўскі работнік. Смела падпісваў крэдыты кааперацыі, калі таго патрабавалі інтарэсы справы, абыходзіў не заўсёды адпаведныя здароваму сэнсу інструкцыі. Думаю, што гэта даравальныя мае грахі.

У аршанскай прамкааперацыі былі нястомныя, энергічныя кіраўнікі-арганізатары, у большасці з франтавікоў і партызан. Многіх з іх ужо няма ў жывых, але яны столькі зрабілі для станаўлення горада, што іх імёны не павінны быць забыты. Назаву некаторыя прозвішчы: Строеў, Бляхер, Барысенка, Саўчанка, Цуран, Маркевіч, Сафрановіч, Канановіч, Кучынскі, Каган, Велікоўскі, Жыдзелеў, Росман, Капылоў, Стадлер, Бабкоў, Хутарэцкі. Нялёгкім быў іх хлеб, асабліва на першапачатковым этапе. Напрыклад, Бляхер шыў спецвопратку з тэкстыльных абрэзкаў, якія купляліся не па метражу, а на вагу.

...У першыя пасляваенныя гады мне выпала нялёгкая і няўдзячная місія займацца такой, можна сказаць, заганнай і бессаромнай справай, як спагнанне з калгасаў даваеннай запазычанасці. Вайна паглынула ўсю калгасную жывёлу, знішчыла многа грамадскіх пабудоў, пакінула без тэхнікі, калгасы былі пазбаўлены ўсіх асноўных сродкаў. Але абавязацельствы калгасаў па крэдытах захаваліся. З эканамічнага, палітычнага і проста гуманнага пункту гледжання спагнанне іх з калгасаў, якія і без таго ледзь дыхалі, ніякіх апраўданняў не мела. Наадварот, гаспадаркам трэба было дапамагчы памацнець, а не абяссільваць іх зусім. Але была ўстаноўка з Масквы, з праўлення Дзяржбанка. І я са сваёй службовай стараннасцю за год змог перааформіць на канкрэтныя тэрміны пагашэння амаль усю даваенную запазычанасць калгасаў. І толькі тады падаспела пастанова аб яе спісанні. Гэта быў выпадак, калі я сардэчна шкадаваў, што праявіў такую руплівасць у рабоце... *В.Касперскі.*

Ленінскі прызыў, 1989, 25 студзеня, 1—8 лютага.

У мірнай працы

Орша ў канцы 20 стагоддзя ўяўляе сабой сучасны беларускі горад з прыгожымі вуліцамі і скверамі, буйнымі прамысловымі цэнтрамі, навучальнымі ўстановамі, магазінамі і бальніцамі, з шырокай сеткай аўтамабільных дарог, з буйным чыгуначным вузлом. Менавіта па чыгункі пастаўляюць у іншыя гарады і краіны сваю прадукцыю яе прамысловыя прадпрыемствы. На 1.1.1960 г. ў раёне было 340 населеных пунктаў з насельніцтвам 65 937 чалавек, у тым ліку 4 пасёлкі: Копысь — 1833, Арэхаўка — 4174, Асінторф — 4357, Барань — 3486 чалавек.

Мясцовая прамысловасць. У Оршы знаходзіцца больш за 30 прамысловых прадпрыемстваў. Найбольш буйное — Аршанскі льнокамбінат. Ужо ў 4-м квартале 1963 г. тут была асвоена праектная магутнасць па сутачным выпуску бытавых тканін у колькасці 25,3 тыс. пагонных метраў. У гэтым жа годзе льно-

Станкабудаўнічы завод «Чырвоны барацьбіт». 1982 г.

камбінату, першаму з усіх прадпрыемстваў горада, было прысвоена званне «Прадпрыемства высокай культуры і камуністычнага быту».

У 1966 г. за паспяховае выкананне 7-гадовага плана, стварэнне і выпуск новых тканін камбінат быў узнагароджаны ордэнам Леніна. 57 разоў аршанскія тэкстыльшчыкі перамагалі ў сацыялістычным спаборніцтве. Больш за 5 тыс. тэкстыльшчыкаў удастоена высокага звання «Ударнік камуністычнай працы». Многія рабочыя льнокамбіната датэрмінова завяршылі сваю пяцігодку. Сярод іх была і ткачыха Лідзія Аксёненка, якая заваявала ганаровае права выпрацаваць мільярдны метр аршанскай тканіны.

У студзені 1970 г. пачалося будаўніцтва 3-й чаргі камбіната па выпрацоўцы тонкапалатняных тканін бытавога прызначэння (бялізнавых, сарочачных і касцюмна-сукенчных). 3-я чарга магутнасцю 13 500 прадзільных верацён і 144 ткацкія станкі з гадавым выпускам 710 тыс. высоканумарнога прадзіва і 2 млн. 800 тыс. квадратных метраў тканіны была пабудавана і датэрмінова здадзена ў эксплуатацыю ў 4-м квартале 1973 г., на год раней устаноўленага тэрміну. 1.10.1973 г. да камбіната далучана Аршанская лёнапрадзільная фабрыка «Днепр», якая спецыялізуецца на выпрацоўцы нітак для дывановай прамысловасці Беларусі, 1.1.1975 г. — Арэхаўскі льнозавод, які пачаў пастаўляць камбінату доўгае і кароткае льновалакно. 30.10.1975 г. выкананы план 9-й пяцігодкі па выпуску гатовых тканін. Звыш плана выпушчана 14 млн. квадратных метраў гатовых тканін.

Праца аршанскіх тэкстыльшчыкаў была высока ацэнена. Калектыў узнагароджаны

Ветэраны 350-га стралковага палка, якія вызвалялі Оршу і Аршанскі раён ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 1975 г.

вышэйшай працоўнай узнагародай — ордэнам Леніна, Памятным Сцягам і Ленінскай Юбілейнай Ганаровай граматай ЦК КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Савета Міністраў СССР і ВЦСПС. Гадавы аб'ём рэалізацыі прадукцыі ў 1976 г. склаў больш за 322 млн. руб., выпуск гатовых тканін — 86 млн. 400 тыс. квадратных метраў. Колькасць працуючых на 1 жніўня 1976 г. складала 11 291 чалавек. Усе гэтыя гады калектыў камбіната паспяхова выконваў дзяржаўныя заданні дзякуючы апантаным, улюбёным у сваю справу людзям. Адна з іх — Любоў Паўлаўна Улаховіч. Вось што пісаў пра яе ў газеце «Правда» 28.12.1978 г. Герой Сацыялістычнай Працы, народны пісьменнік Беларусі, віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР Кандрат Крапіва ў карэспандэнцыі «Узыходжанне да вышынь»: «...Кантрасты мінулага і сённяшняга найбольш прыкметны ў простых жыццёвых справах. Памятаю, калісьці мая сястра за пралкай ды за кроснамі праседжвала ўсю зіму, каб выткаць пару дзесяткаў метраў палатна на патрэбу сям'і. А вось ткачыха Аршанскага льнокамбіната, ударніца камуністычнай працы Л.П.Улаховіч, працуючы на шасці станках замест двух па норме, выткала з пачатку пяцігодкі больш за 100 тысяч пагонных метраў жакардавай тканіны, павысіўшы за тры гады вытворчасць працы на 48,5%. І што асабліва цікава, Любоў Паўлаўна дабіваецца поспехаў не толькі на вытворчасці. Яна — актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця, член ЦК КПБ, член Аршанскага гаркома партыі і парткома прадпрыемства. У яе знаходзіцца час і для навучання моладзі сваёй прафесіі. І на сямейныя справы не забылася. Якім разнастайным стала кола заняткаў сучаснай беларускай жанчыны!

А ўсяго Аршанскі льнокамбінат выпускае 88 мільёнаў метраў тканін штогод. Такой лентай можна 2 разы апаясаць зямны шар па экватару...»

За паспяховае выкананне 9-й пяцігодкі калектыў камбіната ўзнагароджаны Памятным знакам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «За працоўную доблесць у дзевятай пяцігодцы» і Пераходным Чырвоным Сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ з занясеннем на Усесаюзную Дошку гонару на ВДНГ СССР.

За пасляваенны перыяд калектыў камбіната (уключна па II квартал 1976 г.) 78 разоў

Прафілакторый Аршанскага камбіната.

выходзіў пераможцам ва Усесаюзным і Рэспубліканскім сацыялістычным спаборніцтве з прысуджэннем класных месцаў і грашовых прэмій.

Камбінат мае добраўпарадкаваны жылы пасёлак на 191 548 квадратных метраў карыснай плошчы (па стане на 1.8.1976 г.), 13 дзіцячых устаноў, медсанчасць, якая аб'ядноўвае 3 бальнічныя стацыянарныя корпусы на 450 ложкаў, паліклініку на 600 наведванняў у суткі, прафілакторый, здраўпункты, піянерскі лагер на беразе Дняпра. Працуюць 2 стадыёны, 3 спартыўныя залы, плавальны басейн. Дзейнічаюць Палац культуры на 600 месцаў, дзіцячы Дом культуры, дзіцячыя пляцоўкі, парк адпачынку з летнім тэатрам, атракцыёнамі, пляжам і лодачнай станцыяй. У пасёлку 3 агульнаадукацыйныя школы, школа рабочай моладзі, магазіны, сталовыя і ўстановы бытавога абслугоўвання.

Асаблівага росквіту прамысловасць Оршы дасягнула ў 1980-я гг. Напачатку 1990-х гг. у сувязі з распадам Савецкага Саюза, калі старыя стасункі з былымі савецкімі рэспублікамі былі страчаны, назіраецца пэўны спад прамысловай вытворчасці — у 1993 г. аб'ём прамысловай прадукцыі горада ўпершыню даў значны спад: каля 13%, і толькі ў другой палавіне 1990-х гг. пачынае расці аб'ём прамысловай прадукцыі. У горадзе з'яўляюцца камерцыйныя банкі, ламбарды, гандлёва-закупачныя і пасрэдніцкія фірмы, заяўляючы аб сабе як аб новым у эканоміцы. Зарэгістраваны кааператыў «Днепр», першае малое прадпрыемства «Садко».

На 1997 г. прырост аб'ёму прамысловай прадукцыі склаў 15,6%, або 522,6 млрд. рублёў. Устойліва працуюць такія прадпрыем-

ствы, як ільнокамбінат, завод «Чырвоны барацьбіт», АТ «Оршабудматэрыялы», хлебакамбінат, мясакамбінат. Больш чым у 2 разы ўзрасла вытворчасць зборнага жалезабетону, у 1,5 раза — сценавых матэрыялаў, на 37% — зварных канструкцый. Выпуск тавараў народнага спажывання ў параўнанні з папярэднім годам перавыкананы на 15,6%. Павялічыўся выпуск трыкатажных і швейных вырабаў, тканін, мэблі, а таксама харчовых тавараў — цэльнамалочнай і нятлустай малочнай прадукцыі, плаўленых сыроў, кандытарскіх вырабаў.

Жыллёвае і прамысловае будаўніцтва. У пачатку 1960-х гг. у Оршы разгортваецца шырокае будаўніцтва, якое вядзе будаўнічы трэст № 23, што створаны ў канцы 1950-х гг. Кіраўніком яго быў Мікалай Цімафеевіч Архіпец, потым міністр прамысловага будаўніцтва БССР. За 1958—63 гг. трэст выканаў аб'ём будаўніча-мантажных работ на 41,3 млн. рублёў.

За 1958—1965 гг. пабудаваны птушкакамбінат, 2-я чарга льнокамбіната. У сувязі з павелічэннем аб'ёма работ паводле загада міністра будаўніцтва БССР ад 14.1.1966 г. ўтвораны будаўнічы трэст № 18. За 1966—70 гг. пабудаваны 102 837 кв. метраў жылля, 4 школы, 7 дзіцячых устаноў, 29 388 пагонных метраў вадаправодных ліній, новыя плошчы заводаў «Чырвоны барацьбіт», швейных машын, кансервавы завод, будынак вузла сувязі, тэкстыльны тэхнікум, радзільны дом, дом адпачынку і інш.

Імклівымі тэмпамі развівалася ў горадзе прамысловасць будаўнічых матэрыялаў. Яе галаўным паўпрэдам па праву сталі лічыць вытворчае аб'яднанне «Оршабудматэрыялы» з галаўным прадпрыемствам сілікатных вырабаў.

Орша. Палац культуры льнокамбіната. 1970 г.

Гораду, рэспубліцы, дзе хутка разгортвалася жыллёвае і прамысловае будаўніцтва, патрабавалася ўсё больш будаўнічых матэрыялаў, і аршанскія сілікатчыкі з разуменнем справы імкнуліся задаволіць патрэбы будаўнікоў. Яны ўдасканальвалі вытворчасць, некалькі разоў паспяхова праводзілі яе рэканструкцыю, пашыралі асартымент прадукцыі. Калі ў 1913 г. на тэрыторыі Беларусі было выраблена толькі 46 млн. штук цэглы, то гадавая магутнасць у 1980-х гг. толькі аднаго Аршанскага камбіната перавышала 100 мільёнаў штук. У гады 10-й пяцігодкі будаўнікі забяспечылі тут датэрміновы ўвод новых магутнасцей, а сілікатчыкі са значным апераджэннем — іх асваенне.

Пачалі працаваць у горадзе і 4 прадпрыемствы, якія выпускаюць зборны жалезабетон. Буйнейшае з іх — камбінат зборных жалезабетонных вырабаў і канструкцый (праектная магутнасць 1240 тыс. кубаметраў у год). Пасля рэканструкцыі ён павялічыў магутнасць на 190 тыс. кубаметраў.

З году ў год расце ў Оршы колькасць жылых забудоў. У 1981 г. ў горадзе было 1087 дамоў, у тым ліку 5- і 9-павярховых — 323, а ў 1997 — 11 201, з іх шматпавярховых — 323. У 1997 г. ўсімі формамі ўласнасці ўведзена ў эксплуатацыю 304 кватэры агульнай плошчай 19 099 квадратных метраў. Жыллё будуецца дзяржаўнымі прадпрыемствамі і арганізацыямі, а таксама жыллёва-будаўнічымі кааператывамі, індывідуальнымі забудоўшчыкамі.

У 1992 г. Беларускім дзяржаўным праектным інстытутам горадабудаўніцтва распрацаваны праект рэстаўрацыі, аднаўлення і выкарыстання гістарычнай забудовы ў горадабудаўнічым ансамблі Оршы да 2010 г. Першы этап разлічаны да 2000 г. Паводле гэтага этапу выкананы работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі, якая прымыкае да этнаграфічнага музея «Млын», пабудаваны новы капітальны мост цераз р. Аршыца.

Будаўніцтва на сяле. З 1962 г. адной з важнейшых задач стала ўсямернае разгортванне жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва на сяле. Планавалася пабудаваць у вёсках Аршаншчыны ў 1962—1965 гг. 1000 жылых дамоў. Неабходна было ажыццявіць паступовы пераход ад будаўніцтва ў сельскай

Орша. Зборачны цэх завода лёгкага машынабудавання. 1970-я гады.

мясцовасці індывідуальных аднакватэрных жылых дамоў да будаўніцтва шматкватэрных добраўпарадкаваных жылых дамоў. Распрацоўваліся праекты планіроўкі ўсіх калгасаў з абавязковым размяшчэннем у цэнтральных сядзібах прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання.

У 1961 г. ў Аршанскім раёне пабудавана 259 жылых дамоў, 9 культурна-бытавых памяшканняў, а за 1-е паўгоддзе 1962 г. пабудавана і знаходзілася ў стадыі будаўніцтва 299 жылых дамоў. У раёне была створана міжкалгасная будаўнічая арганізацыя.

На працягу 1963—1964 гг. былі зацверджаны схемы планіроўкі пасёлкаў калгасаў і саўгасаў, вёсак Пугляі і Чурылава саўгаса «Бабінічы», в. Абухава калгаса «Чырвоная Беларусь», в. Пішчалава калгаса імя Кірава, в. Васькаўшчына калгаса імя Заслонава, населенага пункта Высокае калгаса «Маяк камуны», пасёлка эксперыментальнай базы «Межава» і в. Буда, населеных пунктаў калгасаў імя Энгельса і імя Кутузава, «Ленінскі прызыў», «Сцяг Перамогі». Планавалася спыніць будаўніцтва драўляных дамоў і арганізаваць будаўніцтва цагляных дамоў.

У канцы 1963 г. зацверджана схема планіроўкі культурна-бытавога будаўніцтва Аршанскага раёна да 1970 г. Толькі за 1959—1966 гг. пабудавана 7 сельскіх бібліятэк і 18 клубаў.

Рашэннямі Аршанскага райвыканкома № 91 ад 29.4.1969 г. і Віцебскага аблвыканкома № 15 ад 9.1.1970 г. была зацверджана схема раённай планіроўкі, у якой прадугледжвалася сістэма рассялення на 1970—1985 гг., вызначаны населеныя пункты перспектыўнага і неперспектыўнага развіцця, будаўніцтва і ўпарадкаванне толькі ў перспектыўных населеных пунктах.

Да ліку перспектыўных населеных пунктаў аднесены 103 населеныя пункты.

Усе неперспектыўныя населеныя пункты былі падзелены на 3 групы. Да 1-й групы аднесены 41 населены пункт на 905 гаспадарак, якія падлягаюць ссяленню ў першую чаргу і ў якіх забаранялася якое-небудзь будаўніцтва і капітальны рамонт (Бабінічы, Баякоўшчына, Белая Ферма, Барсукі, Ганышава, Гараўцы, Дрыбіна, Дружба, Іванаўка, Іванькова, Івашкава, Капсына, Камякі, Канавалава, Краснобель, Чырвоны Бераг, Купелка, Кучына, Ляснічыя, Ліпкі, Лісаўскія, Лагі, Людкаўшчына, Мядведнікі, Марозаўка, Масееўка, Асінаўка, Печанка, Пісаршчына, Рудня, Руклі, Слабодка, Сасноўка, Ступавое, Чаркасава, Чарніцы, Чырвоная Ніва).

Да 2-й групы аднесены 82 населеныя пункты, якія маюць больш важнае гаспадарчае значэнне і якія падлягаюць ссяленню праз 12—15 гадоў (вёскі Антонаўка, Дуброўка, Малатынь, Кудаева, Люціны, Новае і Старое Хараброва, Руміна, Свісцёлкі, Харкаўка). У гэтых вёсках забаранялася новае будаўніцтва, але дазвалялася праводзіць капітальны рамонт жылых, культурна-бытавых і вытворчых памяшканняў.

Да 3-й групы аднесены 63 населеныя пункты, у якіх знаходзяцца цэнтры брыгад, фермы (Селякта, Барсукі, Пашына, Татарск, Нарэйкава, 1-я Казловічы, Звёзднае, п. Якаўлевічы і г.д.). Акрамя вёсак да гэтай катэгорыі аднесены 13 чыгуначных раз'ездаў, станцый і

чыгуначных будак. Гэтыя населеныя пункты падлягаюць ссяленню ў трэцюю чаргу (20—25 гадоў). Тут дазвалялася аднаўленне жылога фонду і будаўніцтва будынкаў культурнабытавога прызначэння і неабходных вытворчых пабудоў.

У 1972 г. да перспектыўных пасёлкаў аднесена 48 населеных пунктаў і жылых сектараў калгасаў пры гарадскіх пасёлках, да населеных пунктаў абмежаванага развіцця — 35, а неперспектыўныя раздзяляліся на 3 катэгорыі, якія адпавядаюць рашэнню райвыканкома № 89 ад 29.4.1969 г. за выключэннем населеных пунктаў Старое і Новае Хараброва, Свісцёлкі і Прыдняпроўе, для якіх 2-я катэгорыя заменена на 3-ю. У 1976 г. на Аршаншчыне пражывала 55 тыс. чалавек, з іх калгаснікаў і рабочых дзяржгасаў 20 тыс. (працаздольных — 12 тыс.), работнікаў народнай асветы — 846, працаўнікоў гандлю — 1117, сферы абслугоўвання — 249, будаўнікоў — 640, урачоў — 70, культасветработнікаў — 158, пенсіянераў — 15 378.

Планамерна вырашаецца пытанне ўпарадкавання населеных пунктаў. Толькі за 9-ю пяцігодку (1971—75) пабудавана 730 дамоў, капітальна адрамантавана 3870. За кошт калгасаў і дзяржгасаў пабудаваны 654 кватэры, 8 дзіцячых дашкольных устаноў.

За гады 9-й пяцігодкі пабудаваны за кошт дзяржаўнага капіталаўкладання 4 школы (Юрцаўская, Клюкаўская, Дубніцкая, Бабініцкая). Новую паліклініку атрымала цэнтральная раённая бальніца.

Сельская гаспадарка. У 1962 г. былі складаныя пагодныя ўмовы. Аблвыканком і абком КПБ прынялі пастанову «Аб мерах па выкананні пастановы ЦК КПСС і СМ СССР ад 4.10.1962 г. «Аб навядзенні парадку ў расходаванні дзяржаўных рэсурсаў хлеба». Гэта пастанова абавязвала першых сакратароў гаркомаў і райкомаў КПБ, старшынь гарвыканкомаў і райкомаў узяць у свае рукі кантроль за расходаваннем хлеба з дзяржаўных рэсурсаў, забяспечыць паўсюдную забарону скармлівання жывёле і птушцы хлеба, строга прытрымлівацца нормаў выдачы хлеба і хлебапрадуктаў у адны рукі, праверыць прытрымліванне нормаў пагалоўя жывёлы ў рабочых і служачых. Гэтая пастанова строга выконвалася і на Аршаншчыне.

На працягу 1956—1962 гг. 19 калгасаў з 53 не мелі ў наяўнасці Статута сельгасарцеляў або не кіраваліся ім. У некаторых калгасах была дрэнная працоўная дысцыпліна. «За парушэнні працоўнай дысцыпліны калгаснікаў каралі зняццем працадзён і накладаннем штрафаў. Так, напрыклад, у калгасе «Маяк камуны» на працягу 1962 г. за парушэнне працоўнай дысцыпліны пакараны кожны чацвёрты працаздольны калгаснік, усяго 71 чалавек. Накладанне штрафаў стала масавай з'явай у калгасах раёна». (З даведкі «Аб некаторых пытаннях арганізацыйна-калгаснай работы ў сельскагаспадарчых арцелях Аршанскага раёна». 1963 г.)

У 1965 г. была прынята пастанова ЦК КПБ і СМ БССР «Аб устараненні неабгрунтаваных абмежаванняў асабістай падсобнай гаспадаркі рабочых і служачых» і ўказ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб нормах жывёлы, якая знаходзіцца ў асабістай уласнасці грамадзян, якія не з'яўляюцца членамі калгасаў». У гэтых дакументах калгасам рэкамендавана перагледзець статуты сельскагаспадарчых арцелей у адносінах да нормаў утрымання жывёлы і памераў зямельных участкаў там, дзе яны неабгрунтавана абмежаваны. Для грамадзян, якія не былі членамі калгасаў, устаноўлены нормы жывёлы асабістай уласнасці: 1 карова, 1 свінаматка або 2 свінні для адкорму, 3 авечкі альбо казы. Колькасць птушкі і пчоласем'яў не абмяжоўвалася.

У час сямігодкі (1959—65) сельская гаспадарка лічылася ў раёне асноўнай. Тут працавала 48 сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, у тым ліку 5 саўгасаў. За гады сямігодкі ў сельскай гаспадарцы дасягнуты пэўныя поспехі. Калі ў 1959 г. было атрымана 21 363 тоны зерня, то ў 1965 г. на 19 837 тон больш. На 1303 тоны (81%) больш было выкапана бульбы, на 10 707 тон (22%) малака, на 311 тон (12%) мяса. Была скарочана працягласць рабочага дня, узрасла сярэдняя заработная плата, уведзена пенсіённае забеспячэнне калгаснікаў. З 1966 г. калгасы раёна перайшлі на гарантаваную грашовую аплату працы. На адзін працадзень выдавалася па 2 руб. 57 кап.

За гады 8-й пяцігодкі (1966—70) значных поспехаў дасягнула эксперыментальная база «Вусце». У наступнай пяцігодцы (1971—75) яе здабыткі былі прымножаны. Калі ў 8-й пяцігодцы тут было сабрана 8242 тон зерня, то ў 9-й ужо 14 698 тон, мяса было прададзена дзяржаве 1632 тоны (у мінулай — 758 тон),

малака — 8537 тон (у мінулай — 488 тон). Заработная плата ўзрасла на 16,9%, а прадукцыйнасць працы — на 80%.

У саўгасе выраслі новыя тыпавыя жывёлагадоўчыя памяшканні. На дапамогу жывёлаводам прыйшлі механізмы: падвясныя дарогі, аўтапаілкі, даільныя электрычныя апараты, установка «елачка». Палепшыўся дабрабыт саўгасных працаўнікоў. Над многімі дамамі ўзвышаюцца тэлевізійныя антэны, дзесяткі хлебаробаў маюць уласныя матацыклы. Менавіта такімі прыгадваюцца саўгасы Аршаншчыны са старонак раённай газеты «Ленінскі прызыў» за 1974 г. Заможна жывуць і калгаснікі.

Шмат добрых спраў на рахунку эксперыментальнай базы «Вусце». У гэтыя гады яна спецыялізуецца на вытворчасці насення зерневых і зернебабовых культур, бульбы і шматгадовых траў. Палявыя доследы штогод закладваюцца тут на плошчы 135—140 га.

За апошнія 10—15 гадоў праведзена вялікая работа па павышэнні ўрадлівасці зямель — вапнаванні кіслых глебаў, асваенні рацыянальных севазваротаў, укараненні навукова абгрунтаванай сістэмы ўгнаення, новых, больш прадуктыўных сартоў сельскагаспадарчых культур і меліярацыі зямель. У выніку ў 1971 г. ураджай азімага жыта склаў 40, азімай пшаніцы — 51,9, ячменю — 46,7, аўса — 42,1 цэнтнер з гектара. Усяго зерневых атрымана ў сярэднім 44,9 цэнтнера з гектара. Да канца 9-й пяцігодкі калектыў эксперыментальнай базы паставіў задачу атрымаць 50 цэнтнераў зерня і 300 цэнтнераў бульбы з гектара, значна павысіць ураджай іншых сельскагаспадарчых культур. Калектыў «Вусце» працуе ў асноўным над вытворчасцю элітнага насення. Валавая вытворчасць сартавога насення ў 1971 г. складала: азімага жыта — 4597 цэнтнераў, азімай пшаніцы — 4672, ячменю — 17 520, аўса — 6783 і бульбы — 20 874 цэнтнераў.

Для развіцця жывёлагадоўлі эксперыментальная база «Вусце» мае добрую кармавую падмогу. Створаны культурныя пашы, якія ў пачатку 1970-х гг. займалі 266 га сельгасугоддзяў. Для павышэння прадукцыйнасці гектара ў 1973 г. ўкараняліся новыя прадуктыўныя сарты шматгадовых траў, а ў далейшым прымянялася арашэнне.

У 1971 г. эксперыментальная база «Вусце» налічвала 1468 адзінак пагалоўя, у тым ліку 508 кароў. Валавы надой малака складаў 16 410 л, вытворчасць малака на 100 га сельгасугоддзяў — 624, а мяса — 143 цэнтнера. У 1973 г. эксперыментальная база мела 41 трактар, 15 зернеўборачных камбайнаў, 4 бульбаўборачных, 9 сіласных камбайнаў, 32 аўтамашыны, у тым ліку 19 грузавых. У 1970-я гг. тут пастаянна працавала 500 чалавек, у тым ліку больш за 100 механізатараў.

У 1980-я гг. многія жывёлаводы Аршаншчыны былі ўдастоены высокіх ўрадавых узнагарод. Адна з іх — даярка калгаса імя Кірава Надзея Іванаўна Сянчыла, узнагароджаная ордэнам Працоўнай Славы I ступені за дасягненне высокіх вынікаў у павелічэнні вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі на аснове інтэнсіўных тэхналогій і перадавых метадаў арганізацыі працы.

У пачатку 1990-х гг., пасля распаду Саюза ССР, як і ва ўсёй народнай гаспадарцы, назіраецца пэўны спад і ў сельскай гаспадарцы. Але страчаныя тэмпы паступова нарошчваюцца. У 1997 г. перавышаны трохтысячны рубеж у даярак эксперыментальнай базы «Вусце», у Аршанскай аграфірме ён наблізіўся да чатырохтысячнай адзнакі.

Павялічыўся валавы збор зерня. Сярэдні ўраджай за 1997 г. склаў 28,2 цэнтнера з гектара. Большая частка збожжа вырашчана ў калгасах і саўгасах (88,9%), бульбы і агародніны — у асабістых падсобных гаспадарках (73,5 і 76,2%).

Народная асвета. У 1960-х гг. працягвае развівацца народная асвета. У 1961 г. пасля невялікага перапынку ў Оршы зноў адкрываецца медвучылішча. З 1969 г. навучальную

Орша. Будынак сярэдняй школы № 21.

ўстанову ўзначальваў А.І.Янкоўскі. Менавіта пры ім ствараецца багатая матэрыяльная база, вучылішча перамяшчаецца ў новы будынак па вуліцы Леніна, будуецца інтэрнат. Да 1990-х гг. у горадзе і сельскіх раёнах вобласці патрэба ў медыцынскіх кадрах сярэдняга звяна была задаволена дзякуючы менавіта Аршанскаму медвучылішчу.

У 1964 г. ў сувязі з 20-годдзем вызвалення Аршанскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў піянерскай дружыне Панізоўскай сярэдняй школы было прысвоена імя Героя Савецкага Саюза Сямёна Сільвестравіча Пустэльнікава, піянерскай дружыне Якаўлевіцкай сярэдняй школы імя Героя Савецкага Саюза Івана Якаўлевіча Сержантава.

Паводле пастановы Савета Міністраў БССР № 334 ад 23.7.1964 г. Арэхаўскай сярэдняй школе прысвоена імя Героя Савецкага Саюза Юрыя Васілевіча Смірнова.

У 1973 г. вячэрні тэкстыльны тэхнікум быў перайменаваны ў механіка-тэхналагічны з 7 аддзяленнямі. Тут па-ранейшаму ў асноўным рыхтавалі кадры для льнокамбіната, але з'явіліся і такія спецыяльнасці, як бухгалтарскі ўлік, аператыўная тэхніка і ўлік дзяржбанку.

Каля 40 вучэбных кабінетаў і лабараторый было напачатку 1990-х гг. у Аршанскім тэхнікуме чыгуначнага транспарту. Дыпломы тэхнікума штогод атрымлівалі каля 250 выпускнікоў.

У 1997 г. ў Оршы 26 агульных, 8 базавых, 4 пачатковыя, адна спецыяльная школа-інтэрнат, 32 дашкольныя ўстановы. Закончылася пабудова новай 2-павярховай школы ў Зубрэвічах.

Шмат цудоўных настаўнікаў працуе ў школах Аршаншчыны. Адзін з іх — Андрэй Аляксандравіч Задраеўскі. Педагог-наватар узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За працоўную доблесць».

Бабініцкая агульнаадукацыйная школа — лаўрэат 1-га рэспубліканскага конкурсу «Школьныя гады». Яе дырэктар — В.Ю.Лук'янаў — дэлегат 1-га з'езда настаўнікаў Беларусі. Дваццаць вучняў гэтай школы ўдзельнічалі ў рэспубліканскім конкурсе «Зубраня-98». Сярод удзельнікаў абласных алімпіяд амаль палавіна раённай каманды — з Бабініч.

Культура. На 1.1.1969 г. ў Аршанскім раёне было 44 клубы, 65 масавых бібліятэк, 53 кінаўстаноўкі; 1.1.1988 г. — 16 Дамоў культуры, 24 клубы, 59 бібліятэк, 62 кінаўстаноўкі. Пры ДК і клубах былі створаны 322 калектывы мастацкай самадзейнасці, у тым ліку 19 харавых, 32 танцавальныя, 20 драматычных, якія аб'ядноўвалі 3697 аматараў мастац-

Святкаванне 930-годдзя Оршы.

Кветкі да помніка вызваліцелям. Орша. 9.5.1985 г.

тва. Звання «народных» былі ўдастоены харавыя калектывы п. Высокае, калгаса імя Я.Купалы, райаграпрамтэхнікі.

На 1.1.1998 г. на Аршаншчыне дзейнічае раённы Дом культуры, 18 сельскіх ДК, 46 бібліятэк, 4 музычныя школы. У іх працуе 181 спецыяліст. Дзейнічаюць 3 народныя харавыя калектывы, 15 аматарскіх аб'яднанняў, 163 калектывы мастацкай самадзейнасці.

У кастрычніку 1977 г. ў Ляўках, дзе ў даваенныя часы любіў на сваёй дачы адпачываць народны паэт, быў адкрыты філіял Літаратурнага музея Янкі Купалы, а з 11.10.1982 г. працуе Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Ляўкі». Штогод у дзень нараджэння Купалы ў Ляўках праходзіць Свята паэзіі.

Калі ў 1948 г. ў Аршанскім раёне працавала толькі адна сельская бібліятэка ў Копысі і 16 хат-чытальняў, то ў 1975 г. іх было 77 з кніжным фондам 446 661 экз. У 1978 г. ўсе масавыя бібліятэкі Аршаншчыны аб'яднаны ў ЦБС (цэнтральную бібліятэчную сетку). У 1988 г. бібліятэчная сетка раёна налічвала ўжо 154 бібліятэкі, 50 з іх — сельскія, 104 — перасоўныя.

Радуюць гараджан сваім майстэрствам мастакі, артысты. Разгортваюць сваю дзейнасць майстэрні Мастацкага фонду БССР. Аршанскія майстры кісці стварылі клуб «Рэнесанс». У іх з'явілася магчымасць выстаўляцца — адкрыта выставачная зала. Творчых людзей натхняе гісторыя вызвалення горада. Адкрываецца Памятны знак у гонар вызвалення Оршы (аўтар праекта — В. Ягадніцкі). У Саюз архітэктараў Беларусі прыняты аршанскія архітэктары М.П.Правалінскі, М.А.Сморчак і М.М.Іоська.

Групе мастацкіх калектываў пашчасціла трапіць у пералік народных і ўзорных. Дзіцячы тэатр Палаца культуры льнокамбіната атрымаў званне ўзорнага. Хор Дома культуры машынабудаўнікоў стаў народным. Такое званне прысвоена яшчэ аднаму калектыву ДК — мужчынскаму хору. Узорным стаў танцавальны калектыў «Шчаслівае дзяцінства» Дома культуры машынабудаўнікоў, хор гэтай жа ўстановы «Дружба» і хор дзіцячага Дома культуры льнокамбіната. Аркестр дзіцячага ДК таксама стаў узорным.

У 1992 г. распачата стварэнне гісторыка-культурнага цэнтра горада, які будзе складацца з шэрагу захаваўшыхся помнікаў даўніны. Сёння яны рэстаўрыруюцца. Беражліва аднаўляецца спадчына: будынак Куцеінскага манастыра, узяты пад ахову былы будынак езуіцкага калегіума. Музей гісторыі і культуры горада, адкрыты ў 1992 г., папаўняецца каштоўнымі экспанатамі.

У 1988—1990 гг. працягваліся археалагічныя раскопкі на аршанскім гарадзішчы — іх праводзіла экспедыцыя Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі пад кіраўніцтвам В.М.Ляўко.

Новыя помнікі адкрываюцца на аршанскай зямлі. Гэта мемарыяльная дошка з барэльефам У.Караткевіча на вуліцы, якая носіць яго імя (аўтар барэльефа — Ю.Палякоў). У парку ўстаноўлены помнік пісьменніку. Помнік ахвярам сталінскіх рэпрэсій адкрыты на Кабыляцкай гары. Устаноўлены таксама помнік воінам-афганцам.

Падзеямі ў культурным жыцці горада сталі першая выстава творчага аб'яднання «Аршыца», стварэнне музея разьбяра С.С.Шаўрова, прысваенне звання народнага клубу самадзейных мастакоў «Рэнесанс», танцавальнаму калектыву «Спадчына» Палаца культуры льнокамбіната, духавому аркестру сярэдняй школы № 8. Народнымі сталі таксама жаночы акадэмічны хор і хор ветэранаў вайны і працы гарадскога Дома культуры.

Тэатральны калектыў Дома культуры чыгуначнікаў паставіў спектакль «Канстанцін Заслонаў». У ролі Заслонава — народны артыст СССР Б.В.Платонаў. У летнім тэатры, выступаюць самадзейныя артысты і прафесіяналы.

У ліпені 1967 г. Орша ўрачыста адзначыла сваё 900-годдзе. Юбілей горада быў заўважаны ў рэспубліцы. У часопісе «Нёман» (№ 9 за 1967 г.) надрукаваны нарыс І.Бурсава «Равеснік Мінска». Выдадзены фотаальбом «Орша» з тэкстам У.Корбана. У газеце «Літаратура і мастацтва» надрукавана эсэ Уладзіміра Караткевіча «Рша камен...». Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч у 1956—58 гг. працаваў настаўнікам сярэдніх школ №№ 8 і 3 горада.

У гэтыя гады ў Оршы распачынаецца вялікая археалагічная работа. У 1964 г. беларускі археолаг Г.В.Штыхаў робіць даследаванні аршанскага гарадзішча. У 1965—1968 гг. тут працуе экспедыцыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта пад кіраўніцтвам Ю.І.Драгуна. У Оршы з'явілася гарадское аддзяленне рэспубліканскага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Створана бюро падарожжаў і экскурсій.

Галоўная старонка ў расказах экскурсаводаў — аб подзвігу Оршы ў Вялікай Айчыннай вайне. Работа па ўвекавечанні памяці аб гэтай падзеі працягваецца. Сярэдняй школе № 10 прысвоена імя К.С.Заслонава. На чыгуначным вакзале ўстаноўлены бронзавы скульптурны помнік К.С.Заслонаву (скульптар С.Селіханаў), на доме, у якім ён жыў у 1941—1942 гг., — мемарыяльная дошка.

У 1997 г. сярод дзесяці лепшых музеяў вобласці — музей «Слава настаўніку» аршанскай сярэдняй школы № 3 і музей «Гісторыя роднай вёскі» Барздоўскай школы. У гэтым жа годзе ў Віцебску народны духавы аркестр, ансамбль народных інструментаў, а таксама выхаванка студыі «Рафлезія» Марына Шынкевіч сталі лаўрэатамі фінальных выступленняў абласнога тура Рэспубліканскага конкурсу.

Гандаль. У сакавіку 1960 г. Аршанскі гархарчпрамгандаль быў рэарганізаваны для паляпшэння кіраўніцтва і абслугоўвання насельніцтва горада. Пачалі працаваць гандлёвыя арганізацыі: харчгандаль, прамгандаль, каапгандаль, ваенгандаль. Пасля 1991 г. ў

На адкрыцці выстаўкі мастакоў Драчовых у выставачнай зале. Орша. 1998 г.

рэспублікі акрамя дзяржаўнага гандлю дзейнічае і сістэма камерцыйнага гандлю. З'яўляюцца гандлёва-закупачныя і пасрэдніцкія фірмы.

У 1997 г. аб'ём рознічнага тавараабароту ў гандлі павялічыўся ў параўнанні з папярэднім годам на 5,9%, прадпрыемствамі грамадскага харчавання рэалізавана тавараў на 12,3% больш.

За 1997 г. насельніцтву аказана платных паслуг на суму 34 187 млн. руб., што на 3,9% больш, чым у папярэднім годзе.

Транспарт. Завершана электрыфікацыя чыгуначнага ўчастка Орша—Барысаў. Пачынаецца рэгулярны рух электрапаяздоў з Оршы да Мінска. Будуецца і ўводзіцца ў эксплуатацыю ўчастак дарогі Ленінград—Кіеў—Адэса, што дае магчымасць аб'язджаць Оршу. Рамантуецца і аднаўляецца гарадскі транспарт. *С.І.Хорсун.*

ПЕРШЫНЕЦ БЕЛАРУСКАГА ТЭКСТЫЛЮ

У першае дзесяцігоддзе абвяшчэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў Оршы разгарнулася шырокае будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў. У 1928—37 гг. была ўзведзена і 1-я чарга Аршанскага льнокамбіната — першынца беларускага тэкстылю. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія захопнікі разбурылі камбінат, яму былі нанесены вялікія страты. Аднаўленне камбіната пачалося ў 1944, але ўжо ў 1949 г. выпуск тканін перавысіў даваенны. У 1963 г. пабудавана 2-я, у 1972 г. — 3-я чарга камбіната. У 1973 г. ў яго склад увайшла Аршанская льнопрадзільная фабрыка «Дняпро», якая стала асноўным пастаўшчыком пражы дывановым прадпрыемствам рэспублікі.

З 1990 г. камбінат — арэнднае вытворча-гандлёвае прадпрыемства, вырабляе бытавую, бялізнавую, сукенчана-касцюмную, дэкаратыўную і іншыя тканіны, якія карыстаюцца вялікім попытам не толькі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, але і за яе межамі. У 1997 г. экспарт бытавых тканін у далёкае замежжа (ЗША, Германію, Швейцарыю, Нідэрланды і іншыя краіны) дасягнуў 9,8 млн. м^2.

З-за рэзкага зніжэння вытворчасці льнавалакна сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі на камбінаце таксама зменшыўся агульны выпуск тканін, але ў апошні час становішча выпраўляецца. Цэхі прадпрыемства папаўняюцца новым тэхналагічным абсталяваннем, паляпшаецца быт тэкстыльшчыкаў. У 1997 г. на сродкі Аршанскага льнокамбіната ўзведзены 3 жылыя дамы, у якіх справілі навасельле больш як 150 сем'яў тэкстыльшчыкаў. Мільярды рублёў прадпрыемства выдаткоўвае на ўтрыманне прафілакторыя, піянерскага лагера, Палаца культуры, сталовых для рабочых і іншыя мэты.

Гонар гіганта тэкстыльнай прамысловасці — дружны і працавіты калектыў камбіната. Дарэчы, у першыя гады станаўлення тут працавалі 800—1200 чалавек, цяпер калектыў тэкстыльшчыкаў налічвае больш за 8 тыс. чалавек, 445 працаўнікоў (цяперашніх і былых) удастоены ордэнаў Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Кастрычніцкай Рэвалюцыі і іншых высокіх узнагарод. Ільнокамбінат у 1966 г. быў узнагароджаны ордэнам Леніна. *І.Я.Коган.*

АРШАНСКІ ПЕДАГАГІЧНЫ КАЛЕДЖ

Адна са старэйшых навучальных устаноў Беларусі. З архіўных дакументаў вядома, што на базе педагагічных курсаў 1.10.1921 г. па распараджэнні Віцебскага губвыканкома быў адкрыты Аршанскі педагагічны тэхнікум. Першымі яго навучэнцамі сталі 80 юнакоў і дзяўчат з сялянскіх і рабочых сем'яў. 8.5.1937 г. навучальная ўстанова атрымала назву Аршанскае педагагічнае вучылішча. У даваенны перыяд у ім ішла падрыхтоўка настаўнікаў пачатковых класаў. Больш за 700 спецыялістаў — выпускнікоў вучылішча працавалі ў народнай адукацыі рэспублікі. Многія з іх сталі заслужанымі настаўнікамі, вядомымі дзяржаўнымі дзеячамі, работнікамі культуры. Гэта двойчы Герой Савецкага Саюза маршал І.І.Якубоўскі, пісьменнікі Аляксей Русецкі, Іван Шаўцоў, паэт Іосіф Васілеўскі, кампазітар Я.Я.Касалапаў, вучоныя А.Я.Уцянкоў, Г.А.Галінкевіч, К.А.Бохан і інш. Пасля Вялікай Айчыннай вайны вучылішча працягвала падрыхтоўку настаўнікаў пачатковых класаў, з 1956 г. стала рыхтаваць яшчэ настаўнікаў працы і чарчэння для агульнаадукацыйнай школы. Яно было перайменавана ў Аршанскае індустрыяльна-педагагічнае вучылішча. 1.4.1975 г. паводле загаду Міністэрства асветы БССР навучальная ўстанова была перайменавана ў Аршанскае педагагічнае вучылішча. У 1990 г. ў ім была адкрыта падрыхтоўка па трэцяй спецыяльнасці — дашкольнае выхаванне. У 1974—91 гг. працавала завочнае аддзяленне па пад-

рыхтоўцы настаўнікаў працы і чарчэння. За перыяд з 1921 па 1994 гг. вучылішча дало путёўку ў жыццё амаль 10 тысячам настаўнікаў, якія плённа працуюць у сістэме адукацыі рэспублікі. У 1994 г. Аршанскае педагагічнае вучылішча было пераўтворана ў Аршанскі педагагічны каледж. Каледж — навучальная ўстанова новага тыпу, дзе ажыццяўляецца паглыбленая сярэдняя спецыяльная адукацыя, інтэграваная з агульнай сярэдняй і вышэйшай. У ім вядзецца падрыхтоўка кадраў па трох спецыяльнасцях: дашкольнае выхаванне, выкладанне ў пачатковых класах і працоўнае навучанне. Акрамя асноўнай спецыяльнасці навучэнцы атрымліваюць дадатковую: выкладчык беларускай мовы і літаратуры базавай школы, кіраўнік гуртка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дзіцячай выяўленчай дзейнасці. З 1995 г. пачынаецца падрыхтоўка настаўнікаў пачатковых класаў з дадатковай кваліфікацыяй выхавальніка дашкольных устаноў. У 1995 г. створана навукова-метадычнае аб'яднанне Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут — Аршанскі педагагічны каледж. Гэта аб'яднанне садзейнічае ўдасканаленню падрыхтоўкі і выкарыстання педагагічных кадраў, сумеснаму правядзенню навукова-даследчай і метадычнай работы. Яно забяспечвае бесперапынную адукацыю выпускнікоў Аршанскага педагагічнага каледжа па адпаведных спецыяльнасцях са скарочаным амаль напалову тэрмінам навучання ў вышэйшай навучальнай установе. *Л.В.Яршова.*

АРШАНСКАЕ МЕДЫЦЫНСКАЕ ВУЧЫЛІШЧА

Паводле рашэння Савета Народных Камісараў ад 9.6.1937 г. ў Оршы была адкрыта школа медсясцёр. У 1947 г. яе ўзначаліў галоўны ўрач бальніцы імя Сямашкі М.П.Усевіч. У 1955 г. на базе школы было створана медыцынскае вучылішча. Спецыяльнасці: фельчарская, акушэрская медсястра. Навучанне дзённае. У 1969—98 гг. вучылішча ўзначальваў А.І.Янкоўскі. Для навучэнцаў пабудаваны інтэрнат. У 1996 г. адкрыта аддзяленне зубных тэхнікаў. Штогод у сярэднім вучылішча выпускае 340 спецыялістаў, працуе больш за 60 выкладчыкаў.

АРШАНСКІ МЕХАНІКА-ТЭХНАЛАГІЧНЫ ТЭХНІКУМ

15.3.1954 г. ў Оршы адкрыты вячэрні тэкстыльны тэхнікум. Спецыяльнасці: тэхнікатэхнолаг, ільнопрадзенне, ільноткацтва. У 1973 г. тэхнікум перайменаваны ў механіка-тэхналагічны, было 7 дзённых аддзяленняў. Спецыяльнасці (1998): абсталяванне тэкстыльных прадпрыемстваў (са спецыялізацыяй эксплуатацыі машын і абсталявання), ткацкая вытворчасць, таваразнаўства лёну, пачатковая апрацоўка лёну, бухгалтарскі ўлік, апрацоўка металаў рэзаннем, ільнопрадзільная вытворчасць. Навучанне дзённае і завочнае. За гады існавання падрыхтавана больш за 11 тыс. спецыялістаў.

АРШАНСКІ ТЭХНІКУМ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ

Створаны ў 1929 г. на базе школы ФЗН. З першага яго выпуску ў 1934 г. на чыгунку пайшло працаваць 69 спецыялістаў. У гады вайны выпускнікі тэхнікума забяспечвалі работу транспарта, змагаліся з ворагам на франтах і ў партызанскіх атрадах. Звання Героя Савецкага Саюза ўдастоены М.С.Камельчык, Л.У.Буткевіч. Аддалі сваё жыццё за Радзіму Г.А.Кукса, Л.В.Кандрацьеў, С.Ф.Гарбукова, выкладчыкі Н.К.Берднікаў, М.Ф.Пруднікаў, А.М.Паўлоўскі. Пасля вызвалення Оршы былі арганізаваны курсы падрыхтоўкі для паступлення ў тэхнікум. 1.9.1944 г. вучылася ўжо 320 чалавек. Функцыяніравала 36 вучэбных кабінетаў і лабараторый, мелася мадэль чыгункі. Да 1990-х гадоў падрыхтавана каля 10 тыс. спецыялістаў. Дыпломы тэхнікума штогод атрымлівалі каля 250 чал. Сярод выпускнікоў тэхнікума — міністр шляхоў зносін І.Г.Паўлоўскі, начальнік Беларускай чыгункі Я.І.Валадзько, Я.П.Юшкевіч, начальнік Паўднёвай чыгункі А.І.Шутаў, начальнік Ленінградска-Віцебскага аддзялення Кастрычніцкай чыгункі Н.І.Сінельнік, Герой Сацыялістычнай Працы намеснік начальніка тэхнічнага аддзела Беларускай чыгункі П.Д.Суднікаў.

ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНАЯ БАЗА «ВУСЦЕ»

Створана ў 1938 г. на базе саўгаса «Вусце» Аршанскага раёна. Да 1956 г. — сельскагаспадарчая вопытная станцыя. Спецыялізуецца па вытворчасці элітнага насення збожжавых культур, траў і бульбы. У 1957 г. яе тэрыторыя павялічылася з 589 га да 3918 га, у тым ліку сельскагаспадарчых угоддзяў 3194 га, раллі 2293 га. Праводзіцца навукова-даследчая работа. Спецыялісты эксперыментальнай

базы «Вусце» сумесна з навукоўцамі распрацавалі комплекс аграпрыёмаў, накіраваных на павышэнне ўрадлівасці зямель. У 1970—75 гг. ураджайнасць на ўсёй плошчы павялічылася да 35,5 ц/га, бульбы да 170—180 ц/га, надоена 3250 кг малака ад адной каровы, у 1998 г. ўраджайнасць раслінаводства склала 38,3 ц/га, бульбы — 225 ц/га, караняплодаў — 511,7 ц/га, надоена 3280 кг малака ад адной каровы. На тэрыторыі гаспадаркі размешчаны сярэдняя школа са спартыўнай залай, Дом культуры з музычнай школай, амбулаторыя, лабараторны корпус, стадыён, гісторыка-краязнаўчы музей. Кіраўнікі: З.І.Баркоўскі, В.І.Зінкевіч, І.А.Голуб, М.Дз.Паўлечка. *Л.А.Лагунова.*

«ДНЯПРОЎСКІЯ ГАЛАСЫ»

Адразу пасля вызвалення Оршы ад гітлераўскіх захопнікаў быў адноўлены рэгулярны выпуск газеты «Ленінскі прызыў». На яе старонках друкаваліся творы тых ці іншых аўтараў, але гаварыць аб нейкім устойлівым аб'яднанні літаратурных сіл вакол рэдакцыі пакуль не даводзіцца. І толькі 17 ліпеня 1949 г. ў «Ленінскім прызыве» з'явілася першая ў пасляваенны час літаратурная старонка і быў арганізаваны літаратурны гурток, які атрымаў назву «Дняпроўскія галасы». У гэты гурток увайшлі член Саюза савецкіх пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Корбан, маладыя пачынаючыя паэты: студэнт Аршанскага настаўніцкага інстытута Адольф Барэйка, рабочы завода швейных машын «Чырвоны Кастрычнік» Альберт Іговін і іншыя.

Рэдакцыя газеты звярталася да ўсіх чытачоў горада і раёна з просьбай прыняць актыўны ўдзел у рабоце літаратурнага гуртка і выпуску літаратурных старонак. На першай літаратурнай старонцы былі змешчаны вершы Адольфа Барэйкі, Альберта Іговіна і дзве байкі Уладзіміра Корбана.

У тым жа нумары газеты паведамлялася пра літаратурны вечар у Барані, на якім Уладзімір Корбан чытаў свае байкі. Рабочыя завода «Чырвоны Кастрычнік», з якімі адбылася сустрэча, выказалі жаданне часцей наладжваць такія вечары. У далейшым на літаратурных старонках «Ленінскага прызыву» рэгулярна выступалі У.Корбан, А.Барэйка, А.Махнач, Я.Брагінскі і іншыя аўтары. Праводзіліся канферэнцыі чытачоў і літаратурныя сустрэчы. У 1950 — 1-й палавіне 1951 г. літаратурныя старонкі не з'яўляліся, друкаваліся толькі вершы асобных аўтараў. Але з 29 ліпеня 1951 г. літаратурная старонка зноў пачала выходзіць, на ёй — першыя публікацыі Уладзіміра Караткевіча. Гэта былі вершы «Здесь будет канал» (на рускай мове, прысвячаўся будаўніцтву Волга-Данскога канала) і «Якубу Коласу». Абодва вершы не ўвайшлі ў збор яго твораў у 8 тамах, выдадзены на працягу 1987—91 гг., і мы лічым патрэбным даць хаця б адзін з іх:

ЯКУБУ КОЛАСУ

Пясняр наш, пісьменнік вялікі,
У змрочныя злыя гады
Ты быў нашым шчырым музыкам,
Ты нас пазбаўляў ад нуды.
Спяваў нам аб нашай свабодзе,
Каб цвёрда, упэўнена йшлі.
Аб жудасным лёсе народа,
Аб новай жаданай зямлі.
Бацькоў нашых зваў да змагання,
Да моцных, узрушаных сіл,
Да сілы вялікай паўстання,
Да косаў, да стрэльб і да віл.
Народнай цудоўнаю мовай
Цудоўныя песні ты пеў,
За новае вольнае слова
У каменных турмах сядзеў.
Звaліліся цяжкія путы,
Пазбыўся кайданаў народ,
І разам з народам раскутым
Ты рушыў у новы паход.

Хоць верш, зразумела, даніна свайго часу, тым не менш ён дарагі як спадчына Уладзіміра Сямёнавіча, першая яго публікацыя ў друку.

Прыкладна ў той жа час, у сярэдзіне 1950-х гадоў пачалі спрабаваць свае сілы ў літаратуры Леанід Калодзежны, Янка Сіпакоў — ураджэнцы Аршаншчыны, а таксама Нэлі Тулупава, Аляксандр Харкевіч, якія працавалі тут, нямала іншых паэтаў і празаікаў.

У 1950—80 гг. літаратурным аб'яднаннем кіраваў Леанід Канстанцінавіч Высоцкі, здольны журналіст і літаратар. Літаб'яднанне ў той час рэгулярна праводзіла пасяджэнні і нарады пачаткоўцаў. Пазней кіраўнікамі «Дняпроўскіх галасоў» былі Фёдар Кулакоў, Ала Танчэўская, Леанід Калодзежны, Кастусь Севярынец, Генадзь Казак, Мікола Дземідовіч. Некаторыя аўтары літаратурнай старонкі выдавалі свае кніжкі або калектыўныя зборнікі.

Бестава Серафіма, працавала бібліятэкарам у школе. Выдала кніжку вершаў для дзя-

цей «Добры дзень, сонейка», друкавалася ў зборніку «Крыло».

Гусціновіч Васіль настаўнічае ў Оршы. Друкаваўся ў зборніку «Крыло».

Казак Генадзь піша на рускай мове, вядомы як аўтар паэтычных кніг «С любовью к людям», «Поле памяти», «Певчая роща», «Сегодня на заре». У 1994 г. выйшла яго кніга «Пою о нашей доброй Орше».

Лазуркін Рыгор працуе ў Оршы інжынерам. Вядомы як празаік-гумарыст. Выдаў зборнік гумарыстычных апавяданняў «Тайная вячэра» і гумарыстычную аповесць «Благаўскія салаўі».

Прохараў Анатоль у Оршы жыве даўно. Піша для дзяцей. Аўтар дзвюх кніжак: «Вуркаток» (1983) і «Птушыны гарадок» (1988).

Філіповіч Марыя працавала фельчарам у в. Смётанка Аршанскага раёна. Аўтар кнігі апавяданняў «Мадонна з Выселкаў» (1984) і зборніка прозы для дзяцей «Пра Алеся і яго сяброў (1988).

Настаўнікі Мікола Дземідовіч, Мікола Камароўскі, Алена Танана (Сцяпанава), журналіст Анатоль Лазуркін, рабочы Юрый Дзямідаў (у 1991 г. выдаў у Аршанскай друкарні кніжку вершаў «Вам!»), урач Васіль Шэлегаў і многія іншыя паэты і празаікі прымаюць самы дзейсны ўдзел у літаратурным жыцці Оршы, рэгулярна выступаюць на літаратурных старонках «Ленінскага прызыву», у абласной газеце «Віцебскі рабочы», у рэспубліканскіх выданнях.

Некалькі гадоў назад прыехала з сям'ёй на радзіму з Чарнобыльскай зоны (з Брагшчыны) настаўніца Марыя Міхайлаўна Дзмітранок. Нарадзілася яна ў в. Задроўе Аршанскага раёна, раней пісала на рускай мове, цяпер на беларускай. Друкавалася ў часопісе «Полымя». Калі пры гарадскім цэнтры дзіцячай творчасці была заснавана школа юных паэтаў, М. Дзмітранок узначаліла яе. У 1994 г. юныя выхаванцы школы выдалі ў Аршанскай друкарні кнігу «Голоса безмолвия» з вершамі на беларускай і рускай мовах.

Знамянальным для літаратурнай Оршы быў 1990 год. У горадзе адзначалася 60-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча. «Дняпроўскія галасы» зрабілі свой падарунак да юбілею земляка: у мясцовай друкарні выйшаў калектыўны зборнік паэзіі «Вяртанне», на тытульным лісце якога былі словы: «Дняпроўскія галасы» — у вянок памяці Уладзіміра Караткевіча — пісьменніка, чалавека, земляка, вестуна беларускага нацыянальнага адраджэння». У зборніку са сваімі вершамі выступілі Марыя Дзмітранок, Васіль Гусціновіч, Мікола Дземідовіч, Зміцер Дзядзенка, Віктар Дзергілёў, Мікола Камароўскі, Алена Танана, Ала Танчэўская, Сяржук Чайкін і Васіль Шэлегаў.

А да 65-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча ў Аршанскай друкарні выйшаў другі зборнік твораў мясцовых літаратараў.

Беларускім тэлебачаннем у розныя гады былі падрыхтаваны перадачы, прысвечаныя «Дняпроўскім галасам» з Оршы. Адбыліся перадачы пра іх таксама на абласным тэлебачанні, рэспубліканскім і абласным радыё. Дзейнасць літаратурнага аб'яднання атрымала высокую адзнаку на пленумах праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аднойчы нават гаварылася пра зараджэнне аршанскай школы літаратараў. Магчыма, гэта і перабольшванне, але ў гэтым выказванні з афіцыйнага даклада ёсць доля праўды. Пра «Дняпроўскія галасы» пісалі газеты «Літаратура і мастацтва», «Чырвоная змена», «Советская Белоруссия». Кожны год сябры літаб'яднання бываюць гасцямі амаль усіх школ і вучылішчаў горада, наведваюць установы, прадпрыемствы, дзе іх заўсёды сардэчна вітаюць.

Напярадзе новыя задумы і, безумоўна, новыя здабыткі на творчай ніве. Літаратурнае жыццё Аршанскага краю не спыняецца.

Мікола Дземідовіч, Мікола Камароўскі, Фёдар Кулакоў.

Аршаншчына спартыўная

Пра спартыўнае жыццё Оршы ў дарэвалюцыйны час да нас дайшлі вельмі скупыя звесткі. Паводле справаздачы аб выкладанні курса гімнастыкі ў Аршанскім гарадскім вучылішчы ў 1901—10 гг. вядома, што заняткі ва ўсіх 4 класах (142 вучні) праводзіліся адзін раз у тыдзень працягласцю 55 хвілін, летам — у двары, зімой — у прыстасаваным памяшканні, якое называлася «гімнастычнай залай». На занятках выкарыстоўваліся драў-

ляныя палкі, «снарады» для скачкоў у вышыню, вертыкальныя шасты, трапецыі і шведская лесвіца. Былі і паралельныя брусы, але малыя памеры памяшкання не дазвалялі імі карыстацца. На ўроках гулялі ў чахарду, пікара, у пашане было перацягванне, барацьба і іншае з народных гульняў. У 1909—10 гг. у Аршанскай гімназіі быў створаны гурток па занятках так званай «чэшскай сакольскай гімнастыкай», якая набыла папулярнасць у той час.

Паводле знаходак вучоных-археолагаў копыскія рамеснікі ведалі шахматы яшчэ ў 11—13 стст.

У 1920 г. ў Оршы быў створаны ваенна-спартыўны клуб. У наступныя гады тут паспяхова працавала секцыя цяжкай атлетыкі, дзе адначасова займаліся штангай і барацьбой. Кіраваў секцыяй Уладзімір Савіч, сапраўдны энтузіяст сваёй справы, здольны спартсмен. У 1923 г. ў Полацку праводзілася павятовая алімпіяда, на якой Савіч па праграме пяцібор'я набраў у суме 293,2 кілаграма і ўстанавіў рэспубліканскі рэкорд у найлягчэйшай вазе, які пасля неаднаразова паляпшаў.

У 1924 г. адбылося першае ўсебеларускае свята фізічнай культуры, на якім спартсмены з Оршы (17 чалавек) паказалі сябе з найлепшага боку. Першай чэмпіёнкай рэспублікі па бегу на 60 метраў з вынікам 8,6 секунд стала Зоя Раманава. На другім усебеларускім святе яна ўстанавіла яшчэ два рэкорды ў скачках. На гэтых спаборніцтвах рэкардсменкай у кіданні дыска, скачках у вышыню і даўжыню з месца, вышыню з разбегу стала другая прадстаўніца каманды — Паўлоўская. Між іншым, апошні яе рэкорд пратрымаўся да 1936 г.

У 1920-я гады ў Оршы функцыяніравалі іпадром, аэраклуб, лодачная станцыя, стралковы цір. Масаваму развіццю спорту ў значнай ступені садзейнічала ўвядзенне ў 1931 г. комплексу «Гатоў да працы і абароны СССР». Стаць уладальнікам такога значка лічыў за гонар кожны малады чалавек.

У перадваенныя гады на Аршаншчыне нямала рабілася і для ўмацавання матэрыяльнай базы фізкультуры і спорту. 5 чэрвеня 1933 г. быў адкрыты спартыўны сад «Дынама» (цір, гімнастычны гарадок, кракетная пляцоўка), потым — планёрная станцыя. У 1934 г. на БелДРЭС пабудаваны стралковы цір і раённы, трэці ў Беларусі, аэраклуб. У жніўні 1935 г. завершана будаўніцтва першай чаргі гарадскога стадыёна (плошча — 2,5 га, умяшчальнасць — 5000 чалавек), у 1937 г. адкрыты стадыён «Лакаматыў». У Якаўлевіцкім парку абсталяваны футбольная і баскетбольная пляцоўкі, у педінстытуце — зала для заняткаў лёгкай атлетыкай.

Вялікі ўплыў на масава-фізкультурную работу ў пачатку 1940-х гадоў аказваў Асаавіяхім. Прыярытэт набылі абаронныя віды спорту. Галоўны ўхіл у той час рабіўся на прымнажэнне стралковых гурткоў і стралковыя спаборніцтвы, правядзенне лыжных і велапрабегаў, эстафет, паходаў на шлюпках. У калгасах ствараліся хімкаманды па барацьбе са шкоднікамі раслін, каравульныя каманды і г.д. У 1936 г. адбыліся лыжныя пераходы Орша—Смаленск (усе ўдзельнікі іх ішлі з вінтоўкамі і процівагазамі), чатырохдзённы Орша—Мінск, Орша—Талачын і іншыя.

Трэніроўкі ў процівагазах, работа ў іх, пераходы на даволі значныя адлегласці, правядзенне спаборніцтваў, у тым ліку стралковых, былі звычайнай з'явай (першы агульнагарадскі стралковы чэмпіянат праведзены ў 1933 г., пераможца атрымаў пераходны Чырвоны Сцяг, вінтоўку і 100 патронаў). Дарэчы, на адным са стэндаў музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску экспануецца снайперская вінтоўка № 984 з надпісам «Лепшаму стралку ад ваеннага савета. 1942 г.». У гады вайны гэта была баявая зброя Леаніда Уладзіміравіча Буткевіча. Адважны воін знішчыў 327 гітлераўцаў, 22 кулямётныя кропкі праціўніка. 23 кастрычніка 1943 г. яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Першымі ж навыкамі снайперскай справы юнак авалодаў яшчэ да вайны ў стралковым гуртку Аршанскага чыгуначнага тэхнікума. Навыкі і фізічная загартоўка, атрыманыя ў перадваенныя гады, дапамаглі таксама Героям Савецкага Саюза А.Салянікаву, І.Карначонку, М.Сяржантаву, дзесяткам іншых воінаў і партызан.

Вельмі развіты быў да вайны конны спорт. Стайні з ваенізаваным ухілам ствараліся ва ўсіх гаспадарках. Даглядаць коней даручалася лепшым гаспадарам пры абавязковым членстве ў Асаавіяхіме. У асобных гаспадарках утрымлівалася даволі значнае (да 60 коней) пагалоўе. Ствараліся клубы «Варашылаўскі кавалерыст». 23 лютага 1934 г., у Дзень Чырвонай Арміі, у горадзе праводзілася дэманстрацыя коннікаў і лыжнікаў, а ў

чэрвені таго ж года адбылося «Свята каня», галоўнай мэтай якога было «разгортванне барацьбы за ўдарную конную работу, за вырошчванне і захаванне каня, павелічэнне пагалоўя». Выстава коней, парад кавалерыстаў, конныя спаборніцтвы выклікалі вялікую цікавасць у насельніцтва.

Да 1936 г. ў калгасах раёна было 30 конна-спартыўных гурткоў. На абласных спаборніцтвах наезнікі Цімашкоў (калгас «Авангард» Баранскага сельсавета), Ермашкевіч (калгас імя Кірава Кудаеўскага сельсавета), Баркоўская (калгас імя Мянжынскага Межаўскага сельсавета) і іншыя занялі другое агульнакаманднае месца.

Развіццю фізкультуры і спорту спрыяла іх арганізацыйнае афармленне. У 1936 г. пры гарадскім Савеце быў створаны камітэт па справах фізічнай культуры і спорту, на чыгуначным вузле афіцыйна аформлена таварыства «Лакаматыў» і праведзена 1-я гарадская канферэнцыя таварыства «Спартак».

Паступова акрэсліўся паварот ад абаронна-ваенізаванага накірунку ў рабоце да фізкультурна-спартыўнага. Ужо ў 1935 г. адбыўся 1-ы чэмпіянат горада па лёгкай атлетыцы. На 1-й Усебеларускай спартакіядзе ў Мінску Сліжоў з калгаса імя Чапаева Кудаеўскага сельсавета стаў другім прызёрам у кіданні гранаты. Тры гады запар (1937—39 гг.) не было роўных у Беларусі сярод сяльчан у зімовым двухбор'і (лыжныя гонкі плюс стральба) камандзе калгаса імя Кірава Кудаеўскага сельсавета, дзе асабліва вызначыліся Міхаіл Ермашкевіч, Алесь Сасноўскі, Ніна Ржэпка, Стася Кавалёва, Станіслаў Ржэпка, Уладзімір Вальковіч. Трэніраваў каманду адзін з лепшых лыжнікаў горада, неаднаразовы чэмпіён вобласці У.П.Чапцоў. Не зважаючы на надвор'е, ён станавіўся на лыжы і шыбаваў у Берасценава, а пасля трэніроўкі, прыцемкамі, вяртаўся назад у Оршу. За перамогі каманды атрымліваў «натуральную аплату» пэўнай колькасцю збожжа, якую ўстанавіла праўленне.

Аднак берасценаўцам не даводзілася спачываць на лаўрах. На раённых, абласных, рэспубліканскіх спаборніцтвах дастойнымі канкурэнтамі ім з'яўляліся лыжнікі калгасаў «Авангард», «Ларынаўка», імя Гікалы, «Высокі бераг», саўгасаў «Забалацце», «Бабінічы», «Вусце».

Асаблівая ўвага надавалася спаборніцтвам на вынослівасць і сілу. 24 ліпеня 1937 г. была праведзена першая камбінаваная эстафета на перасечанай мясцовасці (дыстанцыя — 16 150 метраў) на прыз газеты «Ленінскі прызыў», удзел у якой прынялі 10 каманд. Праз год задачу ўскладнілі. Маршрут Орша—Дуброўна—Берасценава—Кабылякі—Орша расцягнуўся ўжо на 48 кіламетраў. Першую частку маршруту спартсменам трэба было пераадолець на веласіпедах (мужчынам — 10 кіламетраў, адзін з іх у процівагазе, жанчынам — удвая менш), потым прайсці на шлюпках па Дняпры і завяршыць лёгкаатлетычным кросам.

Першымі праз 3 гадзіны 23 хвіліны фінішавалі прадстаўнікі льнокамбіната, потым каманды Асінторфа, атлеты таварыстваў «Спартак», «Дынама» і БелДРЭС.

Чэмпіянаты горада і раёна сталі рэгулярнымі. Падзеяй у спартыўным жыцці было тое, што пяцёра самых вынослівых лыжнікаў адважыліся пакарыць 50-кіламетровую дыстанцыю. Стартавалі яны 12 лютага 1938 г. Першым (5 гадзін 59 хвілін) фінішаваў прадстаўнік таварыства «Спартак» Грышан, за ім прыйшлі Каваленка (хлебазавод) і Чапцоў («Спартак»). Двума тыднямі пазней каманда Оршы ўпэўнена перамагла на першынстве Беларусі, дзе на 50-кіламетроўцы вызначыўся інструктар фізкультуры хлебазавода Каваленка. Асобна трэба сказаць пра маладых будаўнікоў першынца беларускай энергетыкі, якія не толькі старанна працавалі, але і з ахвотай займаліся спортам, актыўна і не без поспеху ўдзельнічалі ў розных спаборніцтвах. У верасні 1939 г. ў Шатуры, дзе быў адзін з лепшых стадыёнаў, праводзіліся ўсесаюзныя лёгкаатлетычныя спаборніцтвы работнікаў электрастанцый СССР. БелДРЭС на іх прадстаўляў Шэметаў. На дыстанцыі 5 кіламетраў ён стартаваў разам з сусветна вядомымі братамі Георгіем і Серафімам Знаменскімі і заняў другое месца. Калі ўлічыць стан тагачасных бегавых дарожак і экіпіроўку правінцыяльных спартсменаў, вынік, які паказаў Шэметаў, зусім нядрэнны.

13 чэрвеня 1945 г. ў Оршы была праведзена першая пасляваенная гарадская спартакіяда па лёгкай атлетыцы, плаванні, валейболе, баскетболе, футболе. У маі 1946 г. адкрылася дзіцячая спартыўная школа. 65 юных яе навучэнцаў прыступілі да заняткаў у футболь-

най, баскетбольнай і лёгкаатлетычнай секцыях. Ужо восенню юныя футбалісты паспяхова выступілі на рэспубліканскіх спаборніцтвах у Полацку і трапілі ў фінал. Добры тон у спартыўным жыцці горада ў першыя пасляваенныя гады задавалі чыгуначнікі. Напрыклад, футбольная каманда паравознага дэпо стала чэмпіёнкай вобласці 1946 г., выйграла кубак Заходняй чыгункі, а потым шматразова паўтарала гэты поспех.

Набіраў сілы фізкультурны рух і на вёсцы. У кастрычніку 1951 г. быў створаны райсавет ДСТ «Калгаснік», праведзена першая раённая спартакіяда, прызёрамі якой сталі прадстаўнікі калгасаў імя Кірава Пішчалаўскага, «Камунар» Якаўлевіцкага і «Камінтэрн» Крапівенскага сельсаветаў. Праз год валейбалісты калгаса імя Кірава першынствавалі на абласной сельскай спартакіядзе. Гонар Аршаншчыны на абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах паспяхова абаранялі В.Какора, Р.Булыгін (лёгкая атлетыка), М.Сусман, Ю.Малкоў (цяжкая атлетыка), М.Шарыпа, М.Шчэрба (лыжы), В.Кісялёў (лыжы, веласпорт) і іншыя.

Даволі актыўна дзейнічала ў той час лодачная станцыя. Пра гэта сведчылі рэгулярныя шлюпачныя паходы па Дняпры, пераходы Орша—Копысь, Орша—Шклоў, Орша—Магілёў. У ліпені 1958 г. 9 студэнтаў тэхнікума чыгуначнага транспарту разам з выкладчыкам Г.Каптуном узялі старт шлюпачнага пераходу Орша—Херсон і паспяхова завяршылі яго.

У 1960-х гадах Орша — лідэр у рэспубліцы па спартыўным будаўніцтве. Былі рэканструяваны або пабудаваны новыя стадыёны льнокамбіната ў Барані, спартыўныя залы будаўнічага трэста № 18 і спартклуба «Лакаматыў», заводаў трактарарамонтнага і «Легмаш», плавальныя басейны заводаў «Чырвоны барацьбіт», «Легмаш», «Чырвоны Кастрычнік», ільнокамбіната. Комплексныя спартыўныя пляцоўкі з'явіліся ў Вусці, Смалянах, Пішчалаве, Высокім, Межаве. Павышалася майстэрства спартсменаў. У першынстве рэспублікі па футболе ўдала выступілі каманды «Старт» (завод «Легмаш»), «Тэмп» (завод «Чырвоны Кастрычнік»), «Станкабудаўнік» (завод «Чырвоны барацьбіт»), «Колас» (эксперыментальная база «Вусце»).

Традыцыйным відам спорту ў Оршы быў хакей з мячом. Шмат гадоў чэмпіёнам Беларусі з'яўлялася каманда завода швейных машын. У 1970 г. яна паспяхова выступіла ў першынстве СССР на катках Расіі, Украіны, Латвіі. Сярод сельскіх хакеістаў неаднаразовым чэмпіёнам была каманда эксперыментальнай базы «Вусце».

За поспехі ў арганізацыі фізкультурна-спартыўнай работы, падрыхтоўку спартсменаў высокага класа ганаровага звання «Заслужаны трэнер Беларусі» ўдастоены Леанід Іванавіч Шыдлоўскі (былы старшыня райспорткамітэта), Мікалай Фёдаравіч Гапеенка (канькабежны спорт), Ігар Уладзіміравіч Камароў, Леанід Сяргеевіч Рабцаў (барацьба дзюдо), Аляксандр Яўгенавіч Шайдараў (веласпорт), Уладзімір Дзмітрыевіч Хуцкі (старшыня райспорткамітэта), Уладзімір Паўлавіч Гудына (барацьба самба), Леанід Андрэевіч Барэйша (хакей на траве), Анатоль Фёдаравіч Рэзнікаў (баскетбол), Уладзімір Канстанцінавіч Камянкоў (цяжкая атлетыка).

Так нараджаюцца традыцыі. Барыс Нячаеў вучыўся ў Аршанскай сярэдняй школе № 11, займаўся лёгкай атлетыкай у першай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе, быў першаразраднікам па скачках у вышыню. Пасля школы працаваў у лакаматыўным дэпо, потым быў прызваны на флот. У 1983 г. на падлодцы, дзе служыў Барыс, здарылася аварыя, ён першым выклікаўся ліквідаваць яе. Экіпаж Барыс Нячаеў выратаваў, але сам загінуў. Пасмяротна мужны марак быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З таго часу гарадскі аддзел народнай адукацыі сумесна са спартыўным клубам «Лакаматыў» штогод праводзіць лёгкаатлетычны турнір памяці Барыса Нячаева з запрашэннем спартсменаў іншых гарадоў.

Праводзіцца ў Оршы і мотакрос на прыз славутага земляка, легендарнага камандзіра партызанскай брыгады Канстанціна Заслонава. Цяпер гэта спартыўнае мерапрыемства не толькі рэспубліканскага маштабу. Такія спаборніцтвы далі значны штуршок развіццю мотаспорту ў горадзе. Валерый Сазанавец і яго сябры з Оршы ўпэўнена трымаюцца на трасах многіх краін далёкага і блізкага замежжа.

Значных поспехаў на абласных і сусветных спаборніцтвах дасягнулі выхаванцы аршанскіх барцоўскіх школ: самбісты, дзюдаісты, карацісты.

У горадзе і раёне тым часам узнікалі ўсё новыя і новыя веласекцыі, якія актыўна працавалі на заводах швейных машын, «Чырвоны Кастрычнік», трактарарамонтным, «Чырвоны барацьбіт», сілікатных вырабаў, ДСТ «Лакаматыў» і «Спартак», Смалянскім саўгасе-тэхнікуме, асобныя здольныя веласіпедысты былі ў вёсках Анібалева, Бабіна, Юрцава, Межава, Панізоўе, Харкаўка і інш.

Узнікла думка сабраць прадстаўнікоў розных відаў спорту ў адным месцы і ў адзін дзень. Так, у жніўні 1965 г. нарадзілася яшчэ адна добрая традыцыя правядзення раённых спартыўных святаў. Першае такое свята было прымеркавана да адкрыцця новага стадыёна ў эксперыментальнай базе «Вусце». У ім прынялі ўдзел 34 калектывы фізкультуры. Спаборнічалі веласіпедысты і футбалісты, лёгкаатлеты і валейбалісты, у праграме былі таксама перацягванне каната, конкурс асілкаў і інш.

У лютым 1966 г. ў Арэхаўску адбылося і першае зімовае спартыўнае свята, у ім удзельнічала больш за 700 спартсменаў горада і раёна з 26 калектываў фізкультуры. Праводзіліся спаборніцтвы па лыжнай эстафеце, хакеі з мячом, перацягванні каната, у праграме былі таксама лыжныя гонкі для ветэранаў, конкурс асілкаў, падлёдная лоўля рыбы. Тут упершыню пераможцы былі ўзнагароджаны спецыяльнымі жэтонамі «Чэмпіён Аршанскага раёна 1966 г.».

Геаграфія цікавых спаборніцтваў увесь час пашыралася, бо ў аснове арганізацыі іх правядзення ляжаў прынцып: «Кожнае новае свята — на новым стадыёне». Месцамі іх правядзення былі г.п. Арэхаўск, пас. Высокае, вёскі Вусце, Забалацце, Пішчалава, Бабінічы, Зорная, Ларынаўка, Смаляны, Межава, Дачная, Зубава. Акрамя пералічаных вышэй відаў спорту летам мелі месца конныя скачкі, стральба кулявая і стэндавая, настольны тэніс, бадмінтон, ручны мяч, барацьба самба і дзюдо, руская лапта, плаванне, воднае пола, скачкі ў ваду, зімой — хакей з шайбай, слалам, зімовы велакрос, футбол на снезе і інш.

1984-ы год вядомы стварэннем у гарадах і раёнах так званых культурна-спартыўных комплексаў. Адным з вынікаў стварэння такіх комплексаў на Аршаншчыне стала правядзенне ў ліпені 1987 г. на стадыёне льнокамбіната гарадскога спартыўнага свята, якое з таго часу таксама стала традыцыйным.

Аршанцы і сусветны спорт. 1976 год. Манрэаль. XIX Алімпійскія гульні. Менавіта яны звязалі разам выпускнікоў сярэдняй школы № 12 г. Орша — трэнераў зборнай каманды Кубы па лёгкай атлетыцы Рэма Крашаніннікава і зборнай каманды СССР па гандболе Уладзіміра Кавалёва. У адной школе вучыліся, на адным стадыёне, родным «Лакаматыве», трэніраваліся. Рэм Крашаніннікаў, напрыклад, неаднаразовы чэмпіён і рэкардсмен Беларусі па скачках у вышыню...

Аднак упершыню ўдзельнікам Алімпійскіх гульняў у 1964 г. стаў аршанец Георгій Мадзалеўскі, валейбаліст.

Ганарыцца Орша яшчэ адным ураджэнцам горада — Сяргеем Капляковым, сярэбраным прызёрам Манрэальскай алімпіяды, які праз 4 гады ў Маскве стаў ужо алімпійскім чэмпіёнам па плаванні.

Але яны не адзіныя выхадцы з Аршаншчыны, каму ў розныя часы даводзілася абараняць гонар савецкага спорту на Алімпійскіх гульнях. З прадстаўнікамі 32 краін спаборнічаў у спартыўнай хадзьбе на 20 кіламетраў на Такійскай алімпіядзе выпускнік сярэдняй школы № 1 Барыс Храловіч. Барацьба была нялёгкая, таму 7-е месца, якое ён заняў тады, бясспрэчна, высокі вынік. На той жа алімпіядзе ў камандных спаборніцтвах па фехтаванні на шпагах выступіў былы вучань Балбасаўскай сярэдняй школы Юрый Смалякоў. На наступнай алімпіядзе ў Мехіка ён ужо стаў сярэбраным прызёрам.

У складзе асобнай каманды Саюза па веласпорце ў алімпіядзе 1988 г. ў Сеуле ўдзельнічаў выхаванец секцыі «Лакаматыва» Ігар Сумнікаў, двойчы чэмпіён свету.

Бронзавы медаль па зімовых відах спорту заваяваў на зімовых Алімпійскіх гульнях 1986 г. ў Калгары Ігар Жалязоўскі. Сусветныя чэмпіянаты па спрынтарскім шматбор'і ён выйграў і ў наступныя гады — 1987, 1989, 1991, 1992, 1993, у 1994 г. на Алімпіядзе ў Лілехамеры стаў сярэбраным прызёрам. Такое не ўдавалася нікому ў свеце.

Цікавы спартыўны лёс склаўся ў цяжкаатлетаў Аляксандра Сталярова і Лявона Каплуна. Адзін родам з Віцебска, другі — з в. Анібалева, што па суседству. Гэта былі дастойныя сапернікі ў суперцяжкай вазе (звыш 110 кг). У 1982 г. на розыгрышы кубка Саюза па

цяжкай атлетыцы ў Свярдлоўску, пакінуўшы ззаду сапернікаў з іншых каманд, менавіта яны павялі паміж сабой заўзятую барацьбу за права звацца мацнейшым. Перамог Аляксандр, які паспяхова выступіў як на Усесаюзных спаборніцтвах, так і на памостах Венгрыі, Польшчы, Германіі, Румыніі і іншых краін. У 1980 г. ў Дрэздэне чэмпіёнам і рэкардсменам свету сярод юніёраў стаў Лявон Каплун. Перамагаў ён і на іншых спаборніцтвах.

На ўсіх кантынентах свету выступалі спартсмены, якія родам з Аршаншчыны. Людміла Лапацуева ў складзе зборнай каманды Савецкага Саюза стала чэмпіёнкай свету сярод юніёраў па ручным мячы (1990 г., Нігерыя), Яўген Данілін — чэмпіёнам свету па барацьбе дзюдо сярод студэнтаў (1987 г., Бразілія), а ў 1993 г. ў Мінску заваяваў званне абсалютнага чэмпіёна свету па барацьбе самба.

У пачатку 1990-х гадоў вызначыліся аршанкі-самбісткі: Святлана Селіханава — трохразовая чэмпіёнка свету (1991 г., Францыя; 1992, Мінск; 1933, Расія), чэмпіёнка Еўропы (Італія, 1993 г.), Анжэліка Савейка — двухразовая пераможца сусветных чэмпіянатаў сярод дзяўчат (1992 г., Мінск; 1933, Расія); Людміла Бядрыцкая — чэмпіёнка свету (1993 г., Расія).

На 64 клетках. У пачатку 1977 г. работнікі паштовага аддзялення ў Арэхаўску былі нямала здзіўлены, калі пасыпаліся раптам паштоўкі са зваротным адрасам — Бельгія, Нарвегія, Польшча, ЗША, Югаславія, Аргенціна і інш. Адрасаваліся яны аднаму і таму ж чалавеку — інжынеру-эканамісту мясцовага радыёзавода Міхаілу Мядзведзеву. Прычына таму — яго ўдзел у розыгрышы кубка свету па шахматах па перапісцы. Выступаў ён даволі паспяхова, праўда, за каманду Адэскага шахматнага клуба, членам якога стаў завочна.

Выдатным шахматыстам стаў яшчэ адзін наш зямляк — Міхаіл Цэйтлін, які скончыў Балбасаўскую сярэднюю школу. Кандыдат у майстры спорту па шахматах, ён ужо праз паўгода на чэмпіянаце Беларусі выканаў майстарскі нарматыў, у 1977 г. стаў чэмпіёнам Масквы, дабіўся значных поспехаў на турнірах у Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі і інш. У 1987 г. ўрачу з Падмаскоўя Міхаілу Сямёнавічу Цэйтліну было прысвоена самае высокае шахматнае званне — міжнародны гросмайстар. *Л.І.Шыдлоўскі.*

МАЛАДЗЁЖНА-ПОШУКАВЫ КЛУБ «РУСІЧЫ»

Створаны ў 1988 г. па ініцыятыве выкладчыка гісторыі ПТВ № 110 г. Орша Рыгора Сцяпанавіча Шарая. Больш за 10 гадоў ён з'яўляецца кіраўніком клуба, арганізатарам яго шматлікіх добрых спраў. Кансультантамі клуба былі аршанскі краязнавец А.М.Кудзін і выкладчык вучылішча, ветэран Вялікай Айчыннай вайны В.П.Ермалаеў. Вялікую дапамогу ў рабоце клуба аказвае яго былы выхаванец Сяргей Лабкоўскі.

Клуб «Русічы» мае свой статут, эмблему, клятву, якую даюць юнакі і дзяўчаты, што ўступаюць у яго рады.

Галоўная мэта «Русічаў» — пошук невядомых герояў Вялікай Айчыннай вайны, якія загінулі пры абароне і вызваленні Аршаншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 10 гадоў існавання клуба былі знойдзены астанкі каля 900 савецкіх воінаў. Члены клуба выявілі 3,5 тыс. раней невядомых прозвішчаў загінуўшых воінаў, якія ўвайшлі ў кнігі «Памяць. Орша. Аршанскі раён», «Памяць. Дубровенскі раён». Дзякуючы намаганням клуба адноўлены памятны знак на месцы расстрэлу 400 аршанскіх падпольшчыкаў у Гразіўцы, на вул. Пагранічнай устаноўлены помнік 5 тысячам воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, на вул. Пралетарскай на брацкіх могілках устаноўлены помнік воінам і партызанам, якія загінулі пры вызваленні Оршы, помнік ахвярам палітычных рэпрэсій каля в. Андрэеўшчына. «Русічы» прымалі ўдзел у археалагічных раскопках гарадоў Орша і Дуброўна, у рамонце і рэстаўрацыі цэркваў горада і раёна.

Пра дзейнасць клуба расказваюць 2 дакументальныя фільмы: «Уставай — гэта вайна!» (рэжысёр Х.Каменскі, Германія) і «Занядбаны» («Беларусьфільм», рэжысёр А.Алай), які апавядае пра лёс камандзіра батальёна, Героя Савецкага Саюза У.А.Сапрыкіна, што вызначыўся ў снежні 1943 г.

На падставе матэрыялаў, якія былі сабраны ў час экспедыцый па месцах баёў, у ПТВ № 110 створаны адзін з лепшых у горадзе грамадскіх музеяў. З 1992 г. клуб з'яўляецца пастаянным членам Беларускай асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА, актыўна ўдзельнічае ў яе семінарах, міжнародных лагерах, праектах і конкурсах, мае сувязь з арганізацыямі Германіі, якія займаюцца пошукам нямецкіх сал-

дат, што загінулі ў Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. За вялікую ваенна-патрыятычную работу клуб узнагароджаны медалём Георгія Жукава, граматамі і дыпломамі.

В.П.Лютынскі.

ВЫЗНАЧЫЛІСЯ ПРАЦАЙ

ГЕРОІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

БАРКОЎСКІ Захар Іванавіч. Нарадзіўся 3.9.1911 г. ў в. Ліплянск Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. У 1933 г. скончыў Смалянскі сельскагаспадарчы тэхнікум. У Вялікую Айчынную вайну арганізатар партызанскага руху ў Багушэўскім раёне, з 1943 г. намеснік камісара атрада «Мсцівец» 2-й партызанскай брыгады імя К.С.Заслонава. У 1957 г. скончыў БСГА. У 1944—81 гг. дырэктар эксперыментальнай базы «Вусце» Аршанскага раёна. Заслужаны аграном БССР (1966). Званне Героя прысвоена ў 1971 г. за поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці. Памёр у 1994 г.

БАРОЎСКІ Браніслаў Адольфавіч. Нарадзіўся 13.7.1913 г. ў Оршы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 г. працаваў тынкоўшчыкам Аршанскага рамонтна-будаўнічага ўпраўлення № 3. Званне Героя прысвоена ў 1971 г.

ДЗЕРВАЕД Вольга Сямёнаўна. Нарадзілася 17.7.1923 г. ў в. Межава Аршанскага раёна. У 1944—70 гг. даярка эксперыментальнай базы «Межава». Званне Героя прысвоена ў 1966 г. за высокія надоі малака. Узнагароджана ордэнамі Леніна (1966), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1957). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1962—66 гг. Памерла ў 1996 г.

ЗВЕРАЎ Аляксей Васілевіч. Нарадзіўся 18.3.1911 г. ў в. Ольша Краснінскага раёна Смаленскай вобласці. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працоўную дзейнасць пачаў у 1928 г. на станцыі Орша. У 1930—41 гг. на Беларускай ДРЭС, з 1944 г. майстар, з 1979 г. электраманцёр Аршанскага прадпрыемства электрасетак. Званне Героя прысвоена ў 1966 г. за поспехі ў выкананні планаў 7-й пяцігодкі па развіцці энергетыкі.

КЛІМАЎ Міхаіл Трафімавіч. Нарадзіўся 30.1.1929 г. ў в. Міхайлавічы Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. У 1947—86 гг. працаваў на Аршанскім ільнокамбінаце слесарам-рамонтнікам, памочнікам майстра. Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна (1966, 1976), медалямі. Заслужаны настаўнік рабочай моладзі БССР (1978). Званне Героя прысвоена за поспехі ў выкананні планаў 9-й пяцігодкі, творчы ўклад у павелічэнне вытворчасці тавараў народнага спажывання і павышэнне іх якасці.

ПАКРОЎСКІ Уладзімір Пятровіч. Нарадзіўся ў 1928 г. ў г. Мсціслаў Магілёўскай вобласці. Працаваў манцёрам эксплуатацыйна-тэхнічнага вузла сувязі ў Оршы. Званне Героя прысвоена ў 1974 г. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ПАШКЕВІЧ Іван Данілавіч. Нарадзіўся ў 1913 г. ў Оршы. Працаваў на Аршанскім мясакамбінаце. Званне Героя прысвоена ў 1966 г. Узнагароджаны ордэнам Леніна.

САЛТАНОВІЧ Цімафей Емяльянавіч. Нарадзіўся 10.2.1912 г. ў в. Асінаўка Аршанскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1950—75 гг. старшыня калгаса імя Кірава Аршанскага раёна. Званне Героя прысвоена ў 1966 г. за поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1963—71 гг. Памёр у 1976 г.

САСНОЎСКАЯ Дар'я Кузьмінічна. Нарадзілася 13.3.1918 г. ў в. Руміна Аршанскага раёна. У 1955—72 гг. звеннявая па вырошчванні лёну ў калгасе «Ленінская іскра» Аршанскага раёна. Званне Героя прысвоена ў 1966 г. за атрыманне высокіх ураджаяў лёну. Памерла ў 1992 г.

ШАРСНЁЎ Мікалай Яфрэмавіч. Нарадзіўся 12.8.1930 г. ў в. Прыгузкі Аршанскага раёна. Працаваў у калгасе «Чырвоныя Прыгузкі». З 1947 г. механізатар, з 1967 г. звеннявы механізаванага звяна па вырошчванні бульбы ў калгасе імя Куйбышава Аршанскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1971). Званне Героя прысвоена ў 1973 г. за поспехі ў вытворчасці і нарыхтоўках бульбы. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР з 1979 г.

З.І.Баркоўскі.

Б.А.Бароўскі.

В.С.Дзерваед.

А.В.Звераў.

М.Т.Клімаў.

І.Д.Пашкевіч.

Д.К.Сасноўская.

М.П.Шынкароў.

ШЫНКАРОЎ Мікалай Пятровіч. Нарадзіўся 20.5.1928 г. ў в. Люціны Аршанскага раёна. З 1944 г. палявод калгаса імя Дзяржынскага, з 1951 г. трактарыст Копыскай МТС, з 1963 г. брыгадзір трактарнай брыгады ў калгасе імя Дзяржынскага Аршанскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна. Званне Героя прысвоена ў 1966 г. за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі.

А.А.Барташэвіч.

ЛАЎРЭАТЫ ПРЭМІІ

БАРТАШЭВІЧ Анатоль Антонавіч. Нарадзіўся ў 1932 г. Выхоўваўся ў дзіцячым доме. З 1949 г. працаваў у Аршанскім чыгуначным дэпо. Унёс 377 рацыяналізатарскіх прапаноў і 6 вынаходніцтваў для медыцыны. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, заслужаны рацыяналізатар Беларусі, ганаровы чыгуначнік. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

КУЧЫНСКІ Юрый Іванавіч. Трактарыст-машыніст Смалянскага саўгаса-тэхнікума. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988).

ЛАБКОЎ Пётр Піліпавіч. Нарадзіўся 12.7.1935 г. ў Горацкім раёне Магілёўскай вобласці. Працаваў галоўным інжынерам завода «Чырвоны барацьбіт». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1982). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

М.І.Ларыёнаў.

ЛАРЫЁНАЎ Міхаіл Ільіч. Нарадзіўся 10.12.1931 г. ў в. Якаўлевічы Аршанскага раёна. У 1947—88 гг. працаваў слесарам на заводзе «Чырвоны барацьбіт» у Оршы. Заслужаны работнік прамысловасці БССР (1975), Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1982). Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалём «За доблесную працу».

ЛЯВОНЕНКА Зоя Маркаўна. Нарадзілася 14.1.1930 г. ў в. Канавалава Аршанскага раёна. З 1953 г. працавала даяркай на эксперыментальнай базе «Межава». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы 1, 2 і 3-й ступеней.

МІЛАСЕРДНЫ Анатоль Кірылавіч. Нарадзіўся 6.12.1932 г. ў Оршы. З 1959 г. працуе на заводзе «Чырвоны барацьбіт», з 1979 г. дырэктар гэтага завода. Лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і Беларусі, заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За доблесную працу». Народны дэпутат СССР (1989—91).

МІХАЙЛЁНАК Леанід Лукіч. Нарадзіўся ў 1933 г. ў в. Пішчалава Аршанскага раёна. Скульптар. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Адзін з аўтараў манумента «Легендарная тачанка». Жыве ў г. Санкт-Пецярбург.

ЯНКОЎСКІ Яўген Паўлавіч. Токар-расточнік завода «Чырвоны Кастрычнік». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1982).

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ БЕЛАРУСІ

АБРОСІМАВА Софія Яфімаўна. Нарадзілася 5.7.1932 г. ў в. Санцова Гаўрыла-Пасадскага раёна Іванаўскай вобласці. Заслужаны рацыяналізатар Беларусі. У 1951 г. скончыла Іванаўскі хіміка-тэхналагічны тэхнікум. З 1962 г. начальнік хімічнай лабараторыі Аршанскага льнокамбіната.

АБУХОЎСКІ Аляксандр Сяргеевіч. Нарадзіўся 15.9.1931 г. ў Оршы. Заслужаны будаўнік Беларусі. Працаваў у будаўнічай арганізацыі, у лакаматыўным дэпо, з 1955 г. — у будаўнічым упраўленні № 314 у Оршы.

АБУШКЕВІЧ Пётр Нічыпаравіч. Нарадзіўся 29.6.1914 г. ў в. Старая Мілееўка Магілёўскага раёна. Заслужаны настаўнік Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў у сельгастэхнікуме ў

З.М.Лявоненка.

А.К.Міласердны.

С.Я.Абросімава.

П.Н.Абушкевіч.

Я.М.Аляксеенка.

П.С.Амоненка.

У.П.Андрушчанка.

В.В.Барысава.

в. Забалацце. У 1952—74 гг. дырэктар Якаўлевіцкай сярэдняй школы Аршанскага раёна.

АЛЯКСЕЕНКА Яўген Мікітавіч. Нарадзіўся 28.7.1928 г. ў в. Пірагі Дубровенскага раёна Віцебскай вобл. Заслужаны машынабудаўнік Беларусі. З 1957 г. працаваў наладчыкам швейных машын на Аршанскім ільнокамбінаце.

АМОНЕНКА Павел Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Шалашына Дубровенскага раёна Віцебскай вобл. Заслужаны будаўнік Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 г. працаваў цесляром.

АНДРУШЧАНКА Уладзімір Прохаравіч. Нарадзіўся 15.8.1931 г. ў в. Засценкі Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. З 1949 г. працаваў на Аршанскім мясакансервавым камбінаце. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалём «За працоўную доблесць».

АНТОНАЎ Уладзімір Іванавіч. Заслужаны рацыяналізатар Беларусі. Працаваў слесарам-наладчыкам мясакансервавага камбіната.

АНТЫПАЎ Васіль Карпавіч. Заслужаны рацыяналізатар Беларусі. Працаваў слесарам аўтакалоны 2404.

АНЦІПЕНКА Ягор Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1914 г. ў в. Шарэйкі Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1963). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

БАГДАНАЎ Фелікс Іванавіч. Нарадзіўся 16.11.1930 г. ў г. Веліж Смаленскай вобласці. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. У 1963—74 гг. працаваў дырэктарам завода «Чырвоны Кастрычнік» у г. Барань.

БАКУНОВА Варвара Васілеўна. Заслужаны настаўнік БССР (1960).

Э.Б.Белановіч.

В.М.Вейсенберг.

БАРЫСАВА Валянціна Васілеўна. Нарадзілася 21.1.1929 г. ў пас. Высокае Аршанскага раёна. Заслужаны работнік культуры БССР (1975). У 1963—84 гг. працавала загадчыцай аддзела культуры Аршанскага райвыканкома.

БЕЛАНОВІЧ Эмілія Баляславаўна. Нарадзілася ў сакавіку 1917 г. ў Талачынскім раёне Віцебскай вобласці. Заслужаны сувязіст Беларусі. З 1948 г. працавала паштальёнам.

БУГЛАК Генадзь Трафімавіч. Нарадзіўся 4.12.1926 г. ў в. Прудок Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Заслужаны ўрач Беларусі. У 1952 г. скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут. Працаваў на санэпідэмстанцыі. З 1981 г. галоўны ўрач Аршанскай цэнтральнай раённай бальніцы.

БЯЛЯНКА Клаўдзія Мікалаеўна. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі.

ВЕЙСЕНБЕРГ Вера Мікалаеўна. Нарадзілася 25.8.1910 г. ў г. Рослаўль Смаленскай вобласці. Заслужаны ўрач БССР (1968). З 1915 г. жыла ў Оршы. У 1949—69 гг. урач

Я.М.Венядзіктаў.

М.Я.Глушанкоў.

А.В.Грэлаў.

А.А.Дамарацкі.

Варашылаўскай бальніцы ў Оршы. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памерла ў 1984.

ВЕНЯДЗІКТАЎ Яўген Мацвеевіч. Нарадзіўся ў 2.1.1924 г. ў г. Астрахань. Заслужаны работнік транспарту Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў качагарам лакаматыўнага дэпо ў Оршы, потым машыністам. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, 2 ордэнамі Айчыннай вайны, медалямі. Памёр у 1997 г.

ВЯЛІЧКА Уладзімір Сцяпанавіч. Нарадзіўся 5.1.1930 г. ў в. Ляўкі Аршанскага раёна. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1998). У 1957 г. скончыў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў аграномам, з 1962 г. — старшыня калгаса імя Я.Купалы ў в. Зубава. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

ГАЛЕНЧЫК Леанціна Венядзіктаўна. Нарадзілася 22.1.1922 г. на ст. Койданава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Заслужаны ўрач БССР (1968). З 1958 г. ўрач-педыятр, потым загадчыца дзіцячага аддзялення бальніцы імя Сямашкі ў Оршы.

ГАРБАЧОВА Вольга Васілеўна. Нарадзілася ў 1910 г. Заслужаны настаўнік БССР (1964). У 1944—70 гг. працавала настаўніцай Забалацкай сярэдняй школы. Памерла ў 1991 г.

ГАРБУЗАВА Любоў Георгіеўна. Нарадзілася ў 1919 г. Заслужаны настаўнік БССР (1967). Працавала настаўніцай у Аршанскім педагагічным каледжы. Памерла ў 1989 г.

ГЕРАСКЕВІЧ Фёдар Рыгоравіч. Нарадзіўся 18.9.1926 г. ў Жытомірскай вобласці. Заслужаны настаўнік Беларусі (1985). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ГЛУШАНКОЎ Мікалай Яфімавіч. Нарадзіўся 3.3.1916 г. ў в. Гусіна Смаленскай вобласці. Заслужаны будаўнік БССР (1965). З 1945 г. галоўны інжынер, з 1951 г. начальнік будупраўлення № 314 трэста «Белтрансбуд» у Оршы. Памёр у 1997 г.

ГОЛУБ Іван Антонавіч. Нарадзіўся 30.10.1950 г. ў в. Пад'ясенка Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1997). У 1974 г. скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Доктар сельскагаспадарчых навук. Працаваў галоўным аграномам у калгасах «Чырвоны факел» Мсціслаўскага раёна, імя Чапаева Аршанскага раёна. З 1984 г. дырэктар эксперыментальнай базы «Вусце», у 1998—99 старшыня Аршанскага райвыканкома. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ГОЛУБЕЎ Віктар Міхайлавіч. Заслужаны настаўнік Беларусі (1965). Загадчык райана.

ГРАШНОВА Ніна Ільінічна. Заслужаны настаўнік Беларусі. Працавала настаўніцай СШ № 14 у Оршы.

ГРУСМАН Міхаіл Абрамавіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў Оршы. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1978). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ГРЭЛАЎ Андрэй Васілевіч. Нарадзіўся 28.8.1922 г. ў г.п. Меджыбаж Хмяльніцкай вобласці. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Больш за 30 гадоў працаваў галоўным інжынерам на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» у г. Барань. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Узнагароджаны ордэнам Леніна, залатым, сярэбраным і бронзавым медалямі ВДНГ СССР. Мае 9 пасведчанняў на прамысловыя ўзоры.

ДАМАРАЦКІ Антон Антонавіч. Нарадзіўся 5.7.1928 г. ў г. Барань Аршанскага ра-

Я.Г.Данільчык.

А.Я.Дзмітрыеў.

Р.Т.Жанеўская.

С.М.Затоненка.

ёна. Заслужаны настаўнік БССР (1967). З 1951 г. працаваў завучам, потым дырэктарам Баранскай сярэдняй школы.

ДАНІЛЬЧЫК Яўгенія Георгіеўна. Нарадзілася 20.1.1925 г. ў г. Дарагабуж Смаленскай вобласці. Заслужаны работнік прафесійна-тэхнічнай адукацыі БССР (1965). З 1952 г. завуч, у 1953—80 гг. дырэктар фабрычна-заводскага вучылішча Аршанскага льнокамбіната.

ДАШУК Валянціна Аляксандраўна. Нарадзілася ў 1890 г. Заслужаны настаўнік БССР (1947).

ДЗЕМ'ЯНОВІЧ Вітольд Іванавіч. Нарадзіўся 2.4.1924 г. ў в. Варапаі Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны ўрач БССР (1971). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1952 г. скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут. З 1957 г. ўрач-хірург, загадчык хірургічнага аддзялення, намеснік галоўнага ўрача чыгуначнай бальніцы ў Оршы, з 1983 г. ўрач-хірург, загадчык дзіцячага хірургічнага аддзялення бальніцы імя Сямашкі ў Оршы.

ДЗМІТРЫЕЎ Аляксандр Якаўлевіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў Разанскай вобласці. Заслужаны рацыяналізатар Беларусі. Працаваў слесарам ацяплення і вентыляцыі, брыгадзірам, памочнікам майстра, слесарам-брыгадзірам па рамонце і наладцы швейных машын на Аршанскім ільнокамбінаце. Памёр у 1992 г.

ДУБРОВІНА Варвара Рыгораўна. Нарадзілася ў 1909 г. ў в. Юрцава Аршанскага раёна. Заслужаны настаўнік БССР (1957), Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

ЖАНЕЎСКАЯ Рэгіна Тарасаўна. Нарадзілася 5.4.1932 г. ў в. Мар'янполле Талачынскага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1973). У 1953 г. скончыла Аршанскі настаўніцкі інстытут імя Янкі Купалы, у 1964 г. Магілёўскі педагагічны інстытут. З 1959 г. начальнік дзетпрыёмніка ў Оршы. Працавала настаўніцай сярэдняй школы № 6, потым загадчыцай аддзела адукацыі ў Оршы.

ЗАБЕЛА Валянцін Ісакавіч. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. Працаваў на заводзе «Чырвоны Кастрычнік».

ЗАЙЦАЎ Аляксей Іванавіч. Нарадзіўся ў 1912 г. ў в. Чурылава Аршанскага раёна. Заслужаны настаўнік БССР (1957). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1958 г. дырэктар Драгічынскай сярэдняй школы № 2 Брэсцкай вобл. Памёр у 1991 г.

ЗАТОНЕНКА Сямён Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1917 г. ў в. Дзятлава Аршанскага раёна. Заслужаны настаўнік Беларусі. Скончыў Аршанскі настаўніцкі інстытут, Віцебскі педагагічны інстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў загадчыкам аддзела, сакратаром Коханаўскага райкома партыі, потым дырэктарам Андрэеўшчынскай школы-інтэрната і Панізоўскай сярэдняй школы Аршанскага раёна. Памёр у 1974 г.

ЗАХАРЭНКА Ціверый Міхайлавіч. Нарадзіўся 5.5.1925 г. ў в. Хімы Аршанскага раёна. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. З 1962 г. працаваў дырэктарам завода «Чырвоны барацьбіт» у Оршы. Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Працоўнага Чырвонага Сцяга.

А.А.Здраеўскі.

Л.У.Каржыцкая.

І.А.Корзун.

М.П.Кулік.

ЗДРАЕЎСКІ Андрэй Аляксандравіч. Нарадзіўся 25.10.1935 г. ў в. Стараселле Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1975). Працаваў у Оршы настаўнікам геаграфіі ў сярэдніх школах № 2 і 4. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ЗУБОЎСКІ Сцяпан Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1912 г. ў Оршы. Заслужаны настаўнік БССР (1964). Удзельнік савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

ІГНАЦЕНКА Сяргей Фёдаравіч. Заслужаны энергетык БССР (1971).

ІДЗІЯТУЛІНА Лілія Францаўна. Нарадзілася 28.4.1940 г. ў Оршы. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі (1990). Памерла 31.12.1991 г.

ІЛБОЎНІК Уладзімір Сяргеевіч. Нарадзіўся 16.11.1915 г. ў Магілёве. Заслужаны ўрач БССР (1968). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

КАЗЛОВІЧ Антаніна Піліпаўна. Заслужаны настаўнік Беларусі. Выкладчык тэхнікума чыгуначнага транспарту.

КАЛЕЦКІ Аляксей Пятровіч. Нарадзіўся ў 1887 г. Заслужаны настаўнік БССР (1949).

КАЗЛОЎСКАЯ Алена Фёдараўна. Нарадзілася ў 1921 г. ў в. Чачэвічы Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны настаўнік Беларусі. З 1947 г. працавала ў Смалянскай сярэдняй школе Аршанскага раёна. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

КАЛІНОЎСКАЯ Ніна Іванаўна. Нарадзілася ў 1918 г. ў в. Альхова Жытомірскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1971). З 1955 г. працавала настаўніцай у Оршы.

КАМЯНКОЎ Уладзімір Канстанцінавіч. Нарадзіўся 8.8.1948 г. ў Полацкім раёне Віцебскай вобласці. Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь (1994). З 1968 г. настаўнік Арахоўскай сярэдняй школы, з 1971 г. настаўнік фізкультуры Высокаўскай сярэдняй школы Аршанскага раёна.

КАРЖЫЦКАЯ Лідзія Ульянаўна. Нарадзілася ў 1926 г. ў п. Арахі Аршанскага раёна. Заслужаны настаўнік Беларусі. У 1948 г. скончыла Аршанскае педвучылішча. З 1951 г. працавала ў Арахоўскай сярэдняй школе. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

КОЛАСАЎ Сяргей Аляксеевіч. Нарадзіўся 12.5.1912 г. ў Тульскай вобласці. Заслужаны аграном Беларусі. З 1963 г. дырэктар саўгаса-тэхнікума «Смаляны» Аршанскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1994 г.

КОЛБ Зінаіда Данілаўна. Нарадзілася 2.7.1937 г. Заслужаны работнік культуры БССР (1978).

КОРЗУН Іосіф Альбінавіч. Нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Пуца Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны работнік прафесійна-тэхнічнай адукацыі БССР (1965). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў на Аршанскім мясакансервавым камбінаце, з 1949 — інструктарам фабрычна-заводскага вучылішча. Навучыў прафесіі больш за 500 чалавек для мясной прамысловасці. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені.

КУЗЬМЯНКОЎ Васіль Майсеевіч. Нарадзіўся 5.10.1922 г. ў в. Казяны Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. З 1960 г. працаваў слесарам на заводзе «Чырвоны барацьбіт» у Оршы. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Ц.М.Лазарэнка.

В.Ф.Ларыёнава.

Т.М.Мядзвецкі.

С.І.Мяжуеў.

КУКІШАЎ Валянцін Пятровіч. Нарадзіўся ў 1931 г. ў в. Лявонаўка Аршанскага раёна. Заслужаны настаўнік БССР (1966). Працаваў настаўнікам у Аршанскім педагагічным каледжы.

КУЛІК Мікалай Піліпавіч. Нарадзіўся ў 22.6.1928 г. ў в. Паршні Аршанскага раёна. Заслужаны работнік транспарту Беларусі. Працаваў памочнікам машыніста, потым машыністам цеплавоза лакаматыўнага дэпо ў Оршы.

ЛАБАНАВА Ніна Іванаўна. Нарадзілася 12.2.1928 г. Заслужаны настаўнік БССР (1976). Працавала настаўніцай Смалянскай школы.

ЛАЗАРЭНКА Цеамір Міхайлавіч. Нарадзіўся 30.7.1926 г. ў в. Смаляны Аршанскага раёна. Заслужаны работнік народнай асветы Беларусі (1990). У 1953 г. скончыў БДУ, у 1959 г. Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Працаваў старшым выкладчыкам Мінскай ВПШ. Дацэнт (1990). Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

ЛАРЫЁНАВА Валянціна Фёдараўна. Нарадзілася ў 1926 г. ў в. Урталга Куедзінскага раёна Пермскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1965). З 1948 г. працавала настаўніцай пачатковых класаў у Аршанскай сярэдняй школе № 6.

ЛІНЬКОЎ Мікалай Трафімавіч. Нарадзіўся 26.7.1926 г. ў Магілёўскай вобласці. Заслужаны механізатар сельскай гаспадаркі Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ЛУК'ЯНАЎ Іван Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1940 г. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі.

ЛЯГЕЗІН Мікалай Міхайлавіч. Нарадзіўся 17.8.1927 г. ў в. Жураўка Прохараўскага раёна Белгародскай вобласці. Заслужаны рацыяналізатар Беларусі. У 1961 г. скончыў Аршанскі філіял Мінскага палітэхнікума, працаваў брыгадзірам вентыляцыйных установак, майстрам, інжынерам-канструктарам на Аршанскім ільнокамбінаце.

МАЕЎСКАЯ Яўгенія Ігнатаўна. Заслужаны настаўнік Беларусі. Працавала настаўніцай СШ № 11 у Оршы.

МАЗГАВАЯ Любоў Аляксееўна. Заслужаны настаўнік Беларусі. Працавала настаўніцай Балбасаўскай сярэдняй школы Беларусі.

МАЙСЕЕЎ Віктар Трафімавіч. Нарадзіўся 28.9.1925 г. ў в. Сякірына Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. Працаваў фрэзероўшчыкам на заводзе «Чырвоны барацьбіт» у Оршы. Узнагароджаны ордэнам Леніна.

МАНЬКОЎСКІ Мікалай Васілевіч. Нарадзіўся 20.8.1914 г. на Аршаншчыне. Заслужаны сувязіст Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 г. працаваў намеснікам, потым начальнікам канторы сувязі, адначасова скончыў Мінскі электратэхнікум. З 1969 г. начальнік гарадскога вузла сувязі ў Оршы. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны. Памёр у 1995 г.

МАРТЫНЕНКА Антон Малахавіч. Нарадзіўся ў 1910 г. Заслужаны рацыяналізатар БССР (1964).

МЯДЗВЕЦКІ Трафім Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Андрэеўшчына Аршанскага раёна. Заслужаны шафёр Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў шафёрам у аўтобусна-таксаматорным парку ў Оршы.

МЯЖУЕЎ Сцяпан Ігнатавіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Нарэйкава Аршанскага раёна. Заслужаны механізатар Беларусі. Удзельнік Вя-

М.А.Мяжэвіч.

Г.Р.Навумава.

Я.Ц.Наталевіч.

П.І.Несцераў.

Г.І.Осіпава.

Дз.Дз.Прашчаеў.

лікай Айчыннай вайны. З 1946 г. працаваў брыгадзірам комплекснай брыгады, з 1961 г.— механізатарам. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны.

МЯЖЭВІЧ Мікалай Агеевіч. Нарадзіўся 20.10.1922 г. ў Оршы. Заслужаны будаўнік БССР (1975). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў мулярам на Аршанскім ільнокамбінаце, потым у будаўнічым управленні № 48 у Оршы. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені, медалямі. Памёр у 1990 г.

МЯЛКОЎСКАЯ Ніна Мяфодзьеўна. Заслужаны настаўнік БССР (1957).

МЯЦЕЛІЦА Валянціна Аўдзееўна. Нарадзілася ў 1928 г. ў в. Межава Аршанскага раёна. Заслужаны настаўнік БССР (1975). Працавала настаўніцай матэматыкі ў Межаўскай сярэдняй школе. Узнагароджана знакам «Выдатнік народнай асветы Беларусі».

НАВУМАВА Галіна Рыгораўна. Нарадзілася ў 1929 г. ў в. Анісімава Тальменскага раёна Алтайскага краю. Заслужаны настаўнік БССР (1968). З 1960 г. настаўніца пачатковых класаў у Аршанскай сярэдняй школе № 2.

НАТАЛЕВІЧ Яўген Цімафеевіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў в. Веравойша Аршанскага раёна. Заслужаны работнік транспарту Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 г. працаваў машыністам лакаматыўнага дэпо ў Оршы. Памёр у 1974 г.

НЕСЦЕРАЎ Пётр Іванавіч. Нарадзіўся 22.6.1921 г. ў в. Жокава Арлоўскай вобласці. Заслужаны сувязіст БССР (1967). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1996 г. працаваў у гарадскім вузле сувязі, з 1973 г. — начальнікам аддзялення перавозкі пошты ў Оршы. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі.

НОВІКАЎ Васіль Дзянісавіч. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі.

ОСІПАВА Галіна Іванаўна. Нарадзілася ў 1917 г. ў в. Лапкі Віцебскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1967). Працавала настаўніцай пачатковых класаў СШ № 2 у Оршы. Памерла 26.6.1983 г.

ПАЛКІН Валянцін Пятровіч. Заслужаны лесавод Беларусі (1996).

ПАНЦЯЛЕЕВА Фаіна Паўлаўна. Нарадзілася 15.2.1924 г. ў Віцебскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1977). Узнагароджана ордэнам Леніна (1978).

ПРАШЧАЕЎ Дзмітрый Дзмітрыевіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў Дубровенскім раёне Віцебскай вобласці. Заслужаны будаўнік Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 г. служыў у ваенізаванай ахове МУС, з 1951 г. працаваў каменшчыкам аддзела капітальнага будаўніцтва Аршанскага льнокамбі-

В.Ц.Прохараў.

Н.Ф.Радкевіч.

І.Я.Саксонаў.

ната. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр у 1981 г.

ПРОХАРАЎ Васіль Цімафеевіч. Нарадзіўся 23.10.1931 г. ў в. Кліменкі Руднянскага раёна Смаленскай вобласці. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. Працаваў на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» у г. Барань. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ПУРАНКОЎ Леанід Фядотавіч. Нарадзіўся ў 1930 г. ў в. Вусце Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны настаўнік Беларусі. Скончыў Аршанскае педвучылішча. Працаваў настаўнікам у Берасценаўскай, Барадзінскай і Пішчалаўскай школах Аршанскага раёна.

ПЯТРОВА Ірына Паўлаўна. Заслужаны настаўнік Беларусі. Выкладчык тэхнікума чыгуначнага транспарту.

РАБУШКА Гаўрыіл Іванавіч. Заслужаны механізатар БССР (1968).

РАБЦАВА Еўдакія Іосіфаўна. Нарадзілася ў 1923 г. ў в. Лучоса Віцебскага раёна. Заслужаны настаўнік Беларусі. У 1944 г. скончыла Высачанскае педвучылішча. Працавала ў Стапуроўскай сямігадовай школе, з 1947 г. — у Высокаўскай сярэдняй школе Аршанскага раёна. Узнагароджана знакам «Выдатнік народнай асветы Беларусі», Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

РАГУЛІНА Марыя Вітольдаўна. Нарадзілася 2.2.1940 г. ў Оршы. Заслужаны ўрач БССР (1987). Працуе ўрачом бальніцы імя Сямашкі.

РАДКЕВІЧ Надзея Фёдараўна. Нарадзілася ў 1921 г. ў в. Кушэўка Аршанскага раёна. Заслужаны настаўнік Беларусі. Працавала ў Люцінскай пачатковай школе, з 1945 г. дырэктар Румінскай пачатковай школы Аршанскага раёна.

РЫЖЫКАЎ Уладзімір Трафімавіч. Нарадзіўся 20.4.1924 г. Заслужаны настаўнік Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Памёр у 1980 г.

РЭЗНІКАЎ Анатоль Фёдаравіч. Нарадзіўся 22.3.1947 г. ў Оршы. Заслужаны трэнер Беларусі (1995).

САКСОНАЎ Іван Якаўлевіч. Нарадзіўся 20.11.1926 г. ў в. Міхалінава Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны рацыяналізатар Беларусі. З 1950 г. працаваў памочнікам майстра па абслугоўванні лёначасальных машын, з 1975 г. — майстрам прадзільнай вытворчасці № 2, з 1988 г. — слесарам-рамонтнікам фабрыкі № 2 Аршанскага льнокамбіната.

САЛТАНОВІЧ Міхаіл Аляксандравіч. Нарадзіўся 11.2.1951 г. ў Оршы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1999). З 1978 г. працуе выкладчыкам ПТВ № 122.

САЧКОВА Надзея Фёдараўна. Нарадзілася ў 1921 г. ў в. Кушэўка Аршанскага раёна. Заслужаны настаўнік Беларусі. Працавала ў Люцінскай і Румінскай школах Аршанскага раёна. Узнагароджана знакам «Выдатнік народнай адукацыі Беларусі».

СІДНЯКОВА Клара Іванаўна. Нарадзілася 4.7.1923 г. ў Оршы. Заслужаны работнік гандлю і грамадскага харчавання БССР (1971). З 1952 г. буфетчыца сталовай, з 1962 г. загадчыца сталовай № 6 у Оршы.

СЛЕПУХОЎ Васіль Антонавіч. Нарадзіўся 24.3.1923 г. ў в. Вацлавова Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны будаўнік БССР (1960). У Вялікую Айчынную вай-

К.І.Сіднякова.

В.А.Слепухоў.

К.В.Суораў.

М.К.Сцегін.

М.М.Сянкевіч.

ну вывезены ў Германію на прымусовыя работы. З 1947 г. працаваў на будаўніцтве ў Оршы. Быў рабкорам газеты «Ленінскі прызыў».

СМАРЫГА Іван Іванавіч. Нарадзіўся 22.2.1918 г. ў в. Сяльцы Невельскага раёна Пскоўскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1966). З 1947 г. працаваў намеснікам дырэктара, потым дырэктарам Аршанскага педагагічнага каледжа.

СМІРНОЎ Адам Еўлампіевіч. Нарадзіўся ў 1910 г. ў Арлоўскай вобласці. Заслужаны рацыяналізатар Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1939 г. працаваў на Аршанскім ільнокамбінаце, пасля вайны — начальнік канструктарскага бюро, потым намеснік галоўнага механіка.

СУВОРАЎ Кірыла Віктаравіч. Нарадзіўся 18.3.1917 г. ў в. Быстрыца Полацкага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны дзеяч культуры БССР (1967). Скончыў Полацкі педтэхнікум. З 1935 г. працаваў настаўнікам. У Вялікую Айчынную вайну камандзір партызанскага атрада брыгады імя К.Я.Варашылава. У 1944—82 гг. працаваў у газетах «Віцебскі рабочы», «Чырвоная звязда», «Ленінскі прызыў».

СУШЧАНКОЎ Іван Мікітавіч. Нарадзіўся 1.7.1920 г. ў в. Салаўёва Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. Працаваў слесарам, потым майстрам на заводзе «Чырвоны барацьбіт» у Оршы.

СЦЕГІН Міхаіл Карнеевіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Навасельцы Піцямскага раёна Маскоўскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1971). З 1950 г. працаваў настаўнікам сярэдніх школ № 7 і 9 у Оршы.

СЦЕПАНЬКОВА Марыя Фёдараўна. Нарадзілася 22.8.1914 г. ў Віцебску. Заслужаны настаўнік БССР (1966). Памерла ў 1998 г.

СЯЛІЦКІ Вацлаў Антонавіч. Нарадзіўся 25.6.1923 г. на ст. Калодзішчы Мінскай вобласці. Заслужаны шафёр БССР (1968). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1947 г. працаваў у органах МУС, з 1950 г. — слесарам, потым шафёрам у Аршанскай аўтатранспартнай канторы. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнай Славы 2-й ступені.

СЯНКЕВІЧ Марыя Міхайлаўна. Нарадзілася 10.10.1910 г. Заслужаны настаўнік Беларусі.

СЯНЧЫЛА Надзея Іванаўна. Нарадзілася 15.2.1930 г. ў в. Івашні Аршанскага раёна. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі. З 1950 г. працавала паляводам, з 1959 — даяркай калгаса імя Кірава. Узнагароджана ордэнам Славы 1, 2 і 3-й ступеней, залатым медалём ВДНГ СССР.

ТАРАСЕВІЧ Таццяна Аўрамаўна. Нарадзілася 16.2.1914 г. Заслужаны настаўнік

Л.П.Улаховіч.

М.П.Усевіч.

М.Л.Федзяцова.

В.В.Федуковіч.

БССР (1966). Кіраўнік першых піянерскіх атрадаў на Аршаншчыне.

ТРАЙЦ Уладзімір Альфрэдавіч. Заслужаны рацыяналізатар Беларусі.

ТРАЦЦЯКОВА Аляксандра Цімафееўна. Нарадзілася 2.5.1934 г. ў Магілёўскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1970).

ТУРАВЕЦ Раіса Пятроўна. Нарадзілася ў 1934 г. ў Віцебску. Заслужаны настаўнік Беларусі. Працавала ў Стайкаўскай школе Аршанскага раёна. Узнагароджана знакам «Выдатнік народнай адукацыі Беларусі».

УЛАХОВІЧ Любоў Паўлаўна. Нарадзілася 20.3.1941 г. ў г. Сафонава Смаленскай вобласці. Заслужаны работнік прамысловасці БССР (1980). Скончыла Аршанскі тэкстыльны тэхнікум. У 1960—91 гг. працавала ткачыхай на Аршанскім ільнокамбінаце. Узнагароджана ордэнамі «Знак Пашаны», Працоўнай Славы 1-й і 3-й ступеней.

УСЕВІЧ Міхаіл Пятровіч. Нарадзіўся 20.3.1922 г. ў в. Красніца Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці. Заслужаны ўрач БССР (1965). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1946 г. скончыў Мінскі медінстытут. Працаваў урачом-ардынатарам хірургічнага аддзялення бальніцы імя Варашылава, з 1953 г. галоўны ўрач бальніцы імя Сямашкі ў Оршы. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені.

ФЕДЗЯЦОВА Марыя Леанідаўна. Нарадзілася 11.12.1934 г. ў в. Ліштава Кастрамской вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1968). Працавала ў сярэдніх школах № 16 і 7 у Оршы. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

ФЕДУКОВІЧ Вольга Васілеўна. Нарадзілася ў 1941 г. ў в. Післяціна Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны работнік прамысловасці БССР (1980). У 1962—92 гг. працавала ткачыхай на Аршанскім ільнокамбінаце. Узнагароджана ордэнамі «Знак Пашаны», Працоўнай славы 2-й ступені.

А.У.Хмяльніцкі.

ФРАНЦКЕВІЧ Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся 22.8.1934 г. Заслужаны будаўнік Беларусі (1994).

ХАДОСКА Пётр Уладзіміравіч. Нарадзіўся ў 1892 г. Заслужаны настаўнік БССР (1955).

ХАЦЬЯНАЎ Сямён Міхайлавіч. Заслужаны настаўнік БССР (1966).

ХАЧАТУРАЎ Мардунік Хачыкавіч. Нарадзіўся ў 1940 г. ў г. Тбілісі, Грузія. Заслужаны настаўнік Беларусі (1998). «Выдатнік народнай асветы Беларусі». Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1987).

ХМЯЛЬНІЦКІ Аляксандр Уладзіміравіч. Нарадзіўся 19.7.1940 г. ў г. Волагда. Заслужаны настаўнік БССР (1977). Працуе дырэктарам Аршанскага педагагічнага каледжа.

Ц.Я.Церахаў.

Ф.А.Цімкаева.

А.І.Цітова.

С.К.Ціханскі.

У.А.Чарняўскі.

У.І.Чэрнікаў.

ХУЦКІ Уладзімір Дзмітрыевіч. Нарадзіўся 23.8.1952 г. ў в. Панізоўе Аршанскага раёна. Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь (1995). З 1969 г. працаваў слесарам-рамонтнікам на Аршанскім ільнокамбінаце. З 1977 г. старшыня, з 1995 г. загадчык аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Аршанскага раёна.

ЦЕРАХАЎ Ціхан Яўсеевіч. Нарадзіўся 30.5.1922 г. ў в. Ермалоўка Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1948 г. працаваў на Аршанскім мясакансервавым камбінаце. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Айчыннай вайны 2-й ступені.

ЦІМКАЕВА Фаіна Абасаўна. Нарадзілася 26.4.1923 г. на ст. Каргат Новасібірскай вобласці. Заслужаны работнік гандлю і грамадскага харчавання Беларусі. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 г. працавала экспедытарам, потым начальнікам аддзела рабочага забеспячэння ў Оршы. Узнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны».

ЦІТОВА Антаніна Іванаўна. Нарадзілася 7.1.1935 г. ў Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці. Заслужаны эканаміст БССР (1971). У 1954 г. скончыла Мінскі фінансавы тэхнікум, у 1960 г. — Беларускі інстытут народнай гаспадаркі. Працавала ў Аршанскім аддзяленні Дзяржбанка, з 1981 г. намеснікам старшыні Аршанскага гарвыканкома, з 1991 г. у органах сацзабеспячэння ў Оршы.

ЦІХАНСКІ Сяргей Кліменцьевіч. Нарадзіўся 5.3.1933 г. ў в. Яромкавічы Аршанскага раёна. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. Працаваў на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» у г. Барань. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1980), Дружбы народаў.

ЧАРНЯЎСКІ Уладзімір Андрэевіч. Нарадзіўся 16.5.1938 г. ў в. Межава Аршанскага раёна. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі. Скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут (1966). З 1959 г. працаваў шафёрам у саўгасе «Межава», з 1970 г.— дырэктарам Аршанскага дзяржпрадпрыемства, з 1974 г. — намеснікам дырэктара Смалянскага саўгаса-тэхнікума, з 1982 г. дырэктар птушкафабрыкі «Аршанская».

ЧЭРНІКАЎ Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся 17.1.1928 г. ў в. Сава Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. З 1954 г. працаваў абвальшчыкам мяса, потым начальнікам кансервавага цэха на Аршанскім мясакансервавым камбінаце.

ШАМШУРОВА Еўдакія Мікалаеўна. Нарадзілася ў 1922 г. ў Оршы. Заслужаны

П.Ф.Юрчанка.

М.Я.Якушэвіч.

І.Р.Янкоўскі.

А.В.Ярмоленка.

настаўнік БССР (1966). Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Памерла ў 1984 г.

ШАРАЙ Францыск Міхайлавіч. Нарадзіўся 10.10.1914 г. ў Чашніцкім раёне Віцебскай вобласці. Заслужаны работнік транспарту БССР (1971). Працаваў слесарам вагоннага дэпо.

ШАЎЛЯКОВА Ганна Уладзіміраўна. Нарадзілася 20.3.1918 г. на ст. Троіцкая Гродзенскай вобласці. Заслужаны ўрач БССР (1967). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1947 г. працавала галоўным урачом скурвендыспансера, з 1973 г. загадчыцай сералагічнай лабараторыі дыспансера ў Оршы. Памерла ў 1977 г.

ШЧЭПКІН Мікалай Васілевіч. Нарадзіўся 16.6.1932 г. на Смаленшчыне. Заслужаны будаўнік Беларусі. Выхоўваўся ў Віцебскім дзіцячым доме. Працаваў мулярам у будаўнічым упраўленні № 40 у Оршы. Памёр у 1973 г.

ШЫБЕКА Ганна Кірылаўна. Заслужаны настаўнік Беларусі. Працавала настаўніцай СШ № 14 у Оршы.

ШЫДЛОЎСКІ Леанід Іванавіч. Нарадзіўся 13.1.1937 г. ў в. Вялікія Пышнагоры Лепельскага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны трэнер БССР (1972). З 1955 г. працаваў настаўнікам фізкультуры Якаўлевіцкай сярэдняй школы, з 1964 г. — старшынёй камітэта па фізічнай культуры і спорту Аршанскага раёна.

ШЫНКЕВІЧ Кузьма Трафімавіч. Нарадзіўся 1.6.1911 г. Заслужаны настаўнік БССР (1964). У 1932 г. скончыў Аршанскае педвучылішча. Працаваў у Пуцяцінскай пачатковай школе. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1944—77 гг. загадчык Барадулінскай пачатковай школы Аршанскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

ЮРКЕВІЧ Галіна Іванаўна. Нарадзілася 21.12.1927 г. ў Мінскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1968).

ЮРЧАНКА Пётр Феафанавіч. Нарадзіўся 29.6.1928 г. ў г. Дуброўна Віцебскай вобласці. Заслужаны работнік транспарту БССР (1975). З 1946 г. працаваў памочнікам машыніста паравоза, з 1953 — машыністам цеплавоза ў Оршы.

ЮРЧАНКА Уладзімір Еўфанавіч. Нарадзіўся 25.10.1925 г. ў в. Ляўкі Аршанскага раёна. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, «Знак Пашаны».

ЮШКЕВІЧ Яўген Паўлавіч. Нарадзіўся 15.9.1915 г. Скончыў Маскоўскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту. Заслужаны работнік транспарту Беларусі. Кандыдат тэхнічных навук. З 1934 г. працаваў дыспетчарам Аршанскага чыгуначнага вузла, потым начальнікам станцый Лепель, Орша і Вязьма Заходняй чыгункі. З 1944 г. начальнік Аршанскага аддзялення Заходняй чыгункі, у 1969—81 гг. начальнік Беларускай чыгункі.

ЯКАВЕНКА Галіна Данілаўна. Заслужаны работнік гандлю і грамадскага харчавання Беларусі.

ЯКУШЭВІЧ Марыя Яфрэмаўна. Нарадзілася 28.8.1898 г. Заслужаны настаўнік БССР (1949). Памерла ў 1957 г.

ЯНКОЎСКІ Іван Рыгоравіч. Нарадзіўся 23.4.1934 г. ў в. Арлоўшчына Аршанскага раёна. Заслужаны работнік прамысловасці БССР (1973).

ЯРМОЛЕНКА Аляксандра Віктараўна. Нарадзілася ў 1922 г. ў Оршы. Заслужаны настаўнік БССР (1968). У 1947—77 гг. пра-

І.П.Яромін.

В.П.Баранава.

Г.С.Бранзевіч.

Н.Дз.Жданец.

цавала настаўніцай, завучам, потым дырэктарам школы ў Оршы.

ЯРОМІН Іван Паўлавіч. Нарадзіўся 10.7.1927 г. ў в. Валокавая Смаленскай вобласці. Заслужаны работнік транспарту БССР (1976). З 1949 г. качагар, машыніст цеплавоза лакаматыўнага дэпо ў Оршы. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны».

АРДЭНАНОСЦЫ

Узнагароджаныя Ордэнам Леніна

(у канцы артыкула ў дужках даецца дата ўзнагароджання)

БАБРОВА Еўдакія Кузьмінічна. Нарадзілася 22.3.1920 г. ў в. Германы Дубровенскага раёна. З 1936 г. працавала даяркай у в. Зорная Аршанскага раёна Віцебскай вобл. (1974).

БАБРОЎ Яфім Фаміч. Нарадзіўся 12.12. 1913 г. ў в. Вусце Аршанскага раёна. Працаваў механізатарам у саўгасе. З 1934 г. ў Чырвонай Арміі. Скончыў Саратаўскае танкавае вучылішча, Акадэмію бранятанкавых войск. Удзельнік савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў. З 1962 г. ў адстаўцы. Жыў і працаваў у Мінску.

БАГАМОЛ Мікалай Емяльянавіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Семахі Аршанскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны таксама ордэнам Чырвонай Зоркі.

БАРАНАВА Вера Парфіраўна. Нарадзілася ў 1916 г. ў Магілёве. З 1939 г. працавала настаўніцай, з 1948 г. завуч Бялгрэсаўскай сярэдняй школы Аршанскага раёна. (1960).

БЛАЖКЕВІЧ Франц Андрэевіч. Нарадзіўся ў 1890 г. ў в. Копысь Аршанскага раёна. Быў членам райкома і райвыканкома Копыскага раёна, потым Магілёўскага губвыканкома. Працаваў загадчыкам аддзела юстыцыі, павятовым камісарам харчавання, з 1921 г. — загадчыкам Гомельскага павятовага зямельнага аддзела. З 1927 г. ў Маскве, загадчык аддзела конегадоўлі Наркамзема РСФСР. Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1964 г.

БРАНЗЕВІЧ Ганна Сяргееўна. Нарадзілася ў 1922 г. ў в. Межава Аршанскага раёна. Працавала паляводам, потым звеннявой па вырошчванні кукурузы ў саўгасе «Межава». (1949).

ЖДАНЕЦ Ніна Дзямідаўна. Нарадзілася ў 1932 г. ў в. Межава Аршанскага раёна. Скончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. З 1964 г. працавала галоўным аграномам на эксперыментальнай базе «Межава».

ЗМІТРУЛЯ Іван Паўлавіч. Нарадзіўся 9.2.1920 г. ў в. Ларынаўка Аршанскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ІВАНОЎ Яўген Васілевіч. Нарадзіўся ў 1910 г. ў Оршы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны таксама ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і Аляксандра Неўскага. (1944).

КАЗАКЕВІЧ Іван Мікітавіч. Нарадзіўся ў 1927 г. ў в. Муханава Аршанскага раёна. Працаваў у калгасе імя Чапаева. Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны». (1969).

КАПІТАНАЎ Валянцін Ягоравіч. Нарадзіўся 1.9.1937 г. ў в. Міхайлаўка Гардзееўскага раёна Бранскай вобласці. Працаваў аграномам у калгасе імя Дзяржынскага. У

І.М.Казакевіч.

П.Ц.Краўчанка.

М.П.Магераў.

Н.П.Малахава.

1967—87 гг. старшыня калгаса «Камінтэрн». Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны». Памёр 1.8.1990 г. (1970).

КУЛЯШОЎ Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся ў 1923 г. ў в. Казловічы Аршанскага раёна. Працаваў 20 гадоў брыгадзірам паляводчай брыгады ў калгасе «Чырвоны Сцяг», потым у калгасе «Запаветы Ільіча». Узнагароджаны таксама ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і Кастрычніцкай Рэвалюцыі. З 1986 г. жыў у Мінску. Памёр у 1994 г.

КРАЎЧАНКА Праскоўя Цітаўна. Нарадзілася ў 1914 г. ў в. Панізоўе Аршанскага раёна. З 1955 г. працавала звеннявой па вырошчванні лёну ў калгасе «Ленінская іскра». Памерла ў 1990 г. (1966).

МАГЕРАЎ Мікалай Паўлавіч. Нарадзіўся 5.9.1934 г. ў Оршы. Працаваў камбайнерам у в. Якаўлевічы. Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

МАЛАХАВА Надзея Паўлаўна. Нарадзілася ў 1929 г. ў в. Мядзвёдаўка Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці. З 1945 г. працавала даяркай у саўгасе «Вусце». Памерла ў 1990 г. (1974).

МАСКАЛЕВІЧ Максім Паўлавіч. Нарадзіўся ў 1914 г. Працоўную дзейнасць пачаў у 1930 г. тэхнікам-землеўладкавальнікам у г. Мазыр Гомельскай вобласці. З 1939 г. кіраўнік аддзела Дзяржбанка, з 1942 г. начальнік палявой касы Дзяржбанка, з 1948 кіраўнік Дзяржбанка г. Орша, у 1954—74 гг. старшыня калгаса «Ленінская іскра». Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, ордэнамі Чырвонай Зоркі, Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Памёр у 1991 г.

МЕЛЬНІКАЎ Васіль Якаўлевіч. Нарадзіўся ў 1929 г. ў в. Хрушчава-Растовец Старадубскага раёна Ліпецкай вобласці. У 1960—89 гг. працаваў на Аршанскім ільнокамбінаце начальнікам, галоўным інжынерам, генеральным дырэктарам. Узнагароджаны таксама ордэнамі Знак Пашаны, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1980—85 гг. Памёр у 1995.

В.Я.Мельнікаў.

НАВУМОВІЧ Сямён Сямёнавіч. Нарадзіўся 3.2.1900 г. ў в. Копысь Аршанскага раёна. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, генерал-маёр. Пасля вайны начальнік 2-га Ленінградскага ордэна Леніна артылерыйскага вучылішча. Узнагароджаны таксама 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

НІЗОЎСКАЯ Сіма Якаўлеўна. Нарадзілася 14.9.1915 г. Працавала ў бальніцы імя Сямашкі. (1966).

ПІСКУНОЎ Сцяпан Іванавіч. Нарадзіўся 10.7.1934 г. ў в. Пашына Аршанскага раёна. Працаваў механізатарам, з 1962 г. — камбайнерам у калгасе «Камінтэрн». Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр у 1992 г.

М.М.Хрыпіна.

І.І.Цітовіч.

М.А.Чахоўская.

ПУЧКОВА Тамара Сцяпанаўна. Нарадзілася ў 1941 г. ў в. Пашына Аршанскага раёна. Працавала даяркай у калгасе «Камінтэрн». Узнагароджана таксама ордэнамі Працоўнай славы 1-й, 3-й ступеней, «Маці-гераіня». (1966).

САВІЦКАЯ Наталля Епіфанаўна. Нарадзілася ў 1915 г. ў в. Вусце Аршанскага раёна. Працавала даяркай у калгасах «Чырвоны бераг» і імя Кірава.

САФРОНАЎ Іван Георгіевіч. Нарадзіўся ў 1909 г. ў в. Копысь Аршанскага раёна. У 1934 г. скончыў вышэйшую лётную школу. Удзельнік савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Узнагароджаны таксама ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 1-й ступені, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

СЯНЧЫЛА Мікалай Пятровіч. Нарадзіўся 22.5.1926 г. ў в. Еліна Аршанскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну быў вязнем канцлагера. З 1946 г. працаваў брыгадзірам калгаса імя Кірава. Узнагароджаны залатым медалём ВДНГ СССР.

ХРЫПІНА Марыя Міхайлаўна. Нарадзілася ў 1927 г. ў Аршанскім раёне. У 1945—73 гг. працавала на Аршанскім ільнокамбінаце токарам, шліхтавальшчыцай, інструктарам вытворчага навучання.

ЦІТОВІЧ Іван Ільіч. Нарадзіўся ў 1907 г. ў в. Заазер'е Талачынскага раёна Віцебскай вобл. У 1948—65 гг. старшыня калгаса «Камінтэрн» Аршанскага раёна. Памёр 8.6.1965.

ЧАХОЎСКАЯ Марыя Аляксандраўна. Нарадзілася ў 1901 г. ў в. Паддубцы Аршанскага раёна. З 1931 г. працавала даглядчыцай жывёлы ў калгасе, потым 17 гадоў — даяркай. Памерла ў 1994 г.

ШАВЕКА Міхаіл Анісімавіч. Нарадзіўся 14.10.1935 г. ў в. Смётанка Аршанскага раёна. Працаваў механізатарам у калгасе імя Я.Купалы. Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Зубава.

ШАЙКОВА Раіса Іванаўна. Нарадзілася 14.1.1932 ў в. Бабінічы Аршанскага раёна. У 1951—91 гг. працавала даяркай у саўгасе «Бабінічы». (1966).

Ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі

АРАШКЕВІЧ Аляксандра Сямёнаўна. Нарадзілася ў 1935 г. ў в. Еліна Аршанскага раёна. Працавала даяркай у калгасе імя Кірава.

КАБАНАЎ Васіль Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1919 г. ў Шклоўскім раёне Магілёўскай вобласці. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў брыгадзірам паляводчай брыгады ў саўгасе «Вусце». Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1995 г.

КУЧАРОНАК Ніна Яфімаўна. Нарадзілася 19.9.1930 г. ў в. Пішчалава Аршанскага раёна. Працавала паляводам, з 1953 г. — даяркай у калгасе імя Кірава. Узнагароджана таксама ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

МАГЕРАВА Кацярына Іванаўна. Нарадзілася ў 1926 г. ў в. Якаўлевічы Аршанскага раёна. Працавала даяркай у калгасе імя Леніна. Памерла ў 1997 г.

МІХАЙЛОЎСКІ Фёдар Мітрафанавіч. Нарадзіўся ў 1916 г. ў в. Пішчалава Аршанскага раёна. З 1938 г. працаваў у вагонным дэпо ст. Орша. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў старшынёй калгаса, з 1950 г. — брыгадзірам калгаса імя Кірава. Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1998 г.

В.І.Савіцкі.

МЯДЗВЕДСКІ Васіль Герасімавіч. Нарадзіўся 25.10.1938 г. ў в. Андрэеўшчына Аршанскага раёна. З 1955 г. працуе ў калгасе імя Чапаева. Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. З 1995 г. заслужаны калгаснік калгаса імя Чапаева.

ПАЛКОЎСКІ Аляксей Антонавіч. Нарадзіўся ў 1927 г. ў в. Масееўка Аршанскага раёна. Працаваў механізатарам у калгасе імя Кірава. Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны». Памёр у 1987 г.

П.Ф.Шарковіч.

Н.П.Андронік.

САВІЦКІ Віктар Іосіфавіч. Нарадзіўся ў 1934 г. ў г. Сянно Віцебскай вобл. З 1958 г. працаваў механізатарам у саўгасе «Орша», потым на эксперыментальнай базе «Вусце». Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ХРАПАВІЦКІ Уладзімір Міхайлавіч. Нарадзіўся 21.10.1926 г. ў в. Чаркасава Аршанскага раёна. Пасля вайны скончыў Гарадоцкі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі. Працаваў трактарыстам, брыгадзірам, механікам у калгасе імя Кірава. (1969).

ЧАБАТАРОЎ Анатоль Іванавіч. Нарадзіўся 27.8.1930 г. ў в. Папоўка Аршанскага раёна. У 1953—93 гг. працаваў брыгадзірам. Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны».

ШАРКОВІЧ Пётр Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1933 г. ў Талачынскім раёне Віцебскай вобл. Працаваў на адказных пасадах у дзяржаўных установах. У 1972—94 гг. старшыня калгаса імя Леніна Аршанскага раёна. Узнагароджаны таксама ордэнамі Дружбы народаў, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Граматай Вярхоўнага Савета СССР. Памёр у 1998 г.

Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

АНДРОНІК Надзея Прохараўна. Нарадзілася ў 1924 г. Працавала садаводам, агароднікам, даяркай у саўгасе «Днепр».

АЎХУКОВА Алена Сямёнаўна. Нарадзілася 10.3.1942 г. ў г.п. Копысь. У 1963 г. скончыла Смалявіцкі саўгас-тэхнікум. З 1963 г. працавала заатэхнікам, з 1982 г. намеснікам старшыні калгаса імя Я.Купалы. (1975).

БАГАДЗЕВІЧ Надзея Пятроўна. Нарадзілася 9.3.1929 г. ў в. Лялейкава Духаўшчынскага раёна Смаленскай вобласці. З 1955 г. працавала паляводам на эксперыментальнай базе «Межава». (1973).

БАРДАШУН Леанід Антонавіч. Нарадзіўся 20.3.1921 г. ў в. Парэчча Аршанскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1946—73 гг. старшыня калгаса «Чырвоная Адроўка» ў в. Парэчча. Узнагароджаны таксама ордэнам Айчыннай вайны. (1971).

БЯЛЯЎСКАЯ Лізавета Фадзееўна. Нарадзілася ў 1932 г. ў в. Крапіўна Аршанскага раёна. Працавала ў калгасе «Прамень сацыялізму», потым свінаркай у саўгасе «Днепр».

ГАНАК Пётр Яфімавіч. Нарадзіўся ў 1919 г. ў в. Селішча Аршанскага раёна. Скончыў Гарадоцкую сельскагаспадарчую школу.

П.Я.Ганак.

П.А.Гумнянкоў.

М.П.Дземідкоў.

І.Ц.Ермалюгін.

І.П.Казанцаў.

А.Я.Каліноўскі.

Удзельнік савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Пасля вайны працаваў механікам у Высокаўскай МТС, з 1964 г. галоўны механік, у 1973—81 гг. начальнік зерневага комплекса калгаса «Ленінская іскра». Памёр у 1981 г.

ГАПОНЕНКА Міхаіл Рыгоравіч. Нарадзіўся 22.3.1932 г. ў в. Аланцьева Аршанскага раёна. З 1951 г. працаваў трактарыстам у саўгасе «Рассвет». (1973).

ГУМНЯНКОЎ Пётр Арцёмавіч. Нарадзіўся ў 1938 г. ў в. Падсоена Руднянскага раёна Смаленскай вобласці. У 1961 г. скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут. Працаваў дырэктарам эксперыментальнай базы «Межава». З 1970 г. начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі ў г.п. Лёзна Віцебскай вобласці, з 1973 г. старшыня Лёзненскага райвыканкома, з 1985 г. намеснік генеральнага дырэктара, дырэктар племсаўгаса «Задняпроўскі». Узнагароджаны таксама 2 ордэнамі «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. (1971).

ДАМАЕНТАЎ Леанід Іосіфавіч. Нарадзіўся ў 1930 г. ў в. Зубрэвічы Аршанскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў механізатарам у калгасе «Дубраўка».

ДЗЕМІДКОВА Ефрасіння Пракопаўна. Нарадзілася ў 1900 г. ў в. Харкаўка Аршанскага раёна. З 1930 г. працавала ў калгасе «Ленінская іскра», потым звеннявой па вырошчванні лёну. Памерла ў 1979 г.

ДЗЕМІДКОЎ Мікалай Піліпавіч. Нарадзіўся ў 1932 г. ў в. Харкаўка Аршанскага раёна. Скончыў Смалявіцкі саўгас-тэхнікум. 40 гадоў працаваў брыгадзірам комплекснай брыгады ў калгасе «Ленінская іскра». Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны».

ЕРМАЛЮГІН Іван Цярэнцьевіч. Нарадзіўся ў 1937 г. ў в. Руміна Аршанскага раёна. Скончыў Гарадоцкі сельгастэхнікум. Працаваў у калгасе «Ленінская іскра» загадчыкам майстэрняў па рамонце тэхнікі, потым брыгадзірам трактарнай брыгады.

КАВАЛЁВА Лідзія Пятроўна. Нарадзілася ў 1936 г. ў в. Сідараўка Аршанскага раёна. З 1951 г. працавала на Аршанскай ільнофабрыцы, з 1959 г. — даяркай у калгасе «Запаветы Ільіча». (1971).

КАЗАНЦАЎ Іван Паўлавіч. Нарадзіўся 20.12.1917 г. ў г.п. Арэхаўск Аршанскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 па 1944 гг. партызан 8-га атрада імя М.Н.Селіванёнка брыгады «Аляксея» Віцебскай вобласці. Узнагароджаны таксама ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны.

КАЛІНОЎСКІ Анатоль Ягоравіч. Нарадзіўся 1.5.1936 г. ў в. Свісцёлкі Аршанскага раёна. З 1957 г. рабочы саўгаса «Дняпро». (1957).

А.П.Каташоў.

М.Ф.Махначоў.

М.М.Музок.

В.К.Мяльніцкі.

КАМАР Пётр Андрэевіч. Нарадзіўся ў 1899 г. ў п. Красны Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. З 1934 г. працаваў настаўнікам Копыскай школы Аршанскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Памёр у 1982 г.

КАТАШОЎ Аркадзь Піліпавіч. Нарадзіўся 21.3.1933 г. ў в. Свісцёлкі Аршанскага раёна. Скончыў Аршанскі філіял Мінскага палітэхнікума (1961), Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут (1968). Працаваў на заводзе ў Оршы, у сістэме МУС Беларусі. Палкоўнік. Узнагароджаны таксама 2 медалямі «Ветэран працы». Памёр 15.9.1997 г.

КОШАЛЕЎ Аркадзь Васілевіч. Нарадзіўся 22.8.1922 г. ў в. Дубраўка Аршанскага раёна. З 1959 г. працаваў брыгадзірам жывёлагадоўлі на эксперыментальнай базе «Межава».

КУЛЯШОЎ Мікалай Апанасавіч. Нарадзіўся ў 1930 г. ў в. Раманаўка Аршанскага раёна. З 1948 г. працаваў механізатарам Копыскай МТС, з 1956 г. — брыгадзірам паляводчай брыгады, потым трактарыстам у калгасе «Запаветы Ільіча». (1966).

ЛУЧКО Барыс Андрэевіч. Нарадзіўся 19.9.1930 г. ў в. Ферма Аршанскага раёна. Скончыў Смалянскі саўгас-тэхнікум. З 1955 г. працаваў у Межаўскай МТС, потым аграномам, старшынёй калгаса імя Дзяржынскага. Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны».

МАНУШКА Мікалай Лаўрэнцьевіч. Нарадзіўся 24.5.1928 г. ў в. Крапіўна Аршанскага раёна. Працаваў механізатарам у саўгасе «Бабінічы». Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны» (1973), Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. (1976).

МАХНАЧОЎ Мікалай Фадзеевіч. Нарадзіўся ў 1935 г. ў в. Крапіўна Аршанскага раёна. У 1968 г. скончыў інстытут народнай гаспадаркі ў Маскве. Працаваў інжынерам аўтабазы № 12 у г. Дуброўна, потым шафёрам аўтакамбіната, саўгаса «Днепр». Узнагароджаны таксама Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. (1980).

МУЗОК Марыя Мікалаеўна. Нарадзілася 5.5.1944 г. ў Аршанскім раёне. З 1958 г. працавала даяркай. Узнагароджана таксама ордэнам «Знак Пашаны». (1971).

МЯДЗВЕДСКІ Віктар Фёдаравіч. Нарадзіўся 5.9.1934 г. ў в. Андрэеўшчына Аршанскага раёна. З 1953 г. працуе трактарыстам у калгасе імя Чапаева. Заслужаны калгаснік. (1975).

МЯЖЭВІЧ Анатоль Фёдаравіч. Нарадзіўся 22.6.1928 г. ў в. Смаляны Аршанскага раёна. З 1954 г. працаваў брыгадзірам паляводчай брыгады ў калгасе «Новае жыццё». Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны». (1966).

МЯЛЬНІЦКІ Васіль Кузьміч. Нарадзіўся 19.1.1931 г. ў в. Крапіўна Аршанскага раёна. Працаваў механізатарам, з 1960 г. — брыгадзірам трактарнай брыгады ў калгасе «Прамень сацыялізму». Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны».

ПАПКОЎ Нічыпар Аўрамавіч. Нарадзіўся 1.3.1922 г. ў п. Балбасава Аршанскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны таксама ордэнамі «Знак Пашаны», Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі.

ПРЫШЧЭПА Роза Іванаўна. Нарадзілася 5.9.1935 г. ў Клімавіцкім раёне Магілёўскай вобласці. У 1953 г. скончыла Магілёўскую фельчарска-акушэрскую школу. Працавала фельчарам-акушэрам ў в. Панізоўе Аршанскага раёна, з 1961 г. загадчыца амбулаторыі ў в. Бабінічы. Памерла ў 1989 г.

Г.В.Пяткевіч.

А.С.Шкураў.

Я.С.Шынкевіч.

Б.Ф.Шалуха.

ПУЛЬЯНАЎ Іван Ягоравіч. Нарадзіўся 2.6.1946 г. ў в. Пісаршчына Аршанскага раёна. Працаваў трактарыстам у калгасах «Маяк Камуны», імя Свярдлова.

ПЯТКЕВІЧ Георгій Васілевіч. Нарадзіўся 17.4.1907 г. ў Оршы. У 1944—49 гг. старшыня Аршанскага гарвыканкома. Памёр 1.5.1973 г.

РАДКЕВІЧ Дзмітрый Ігнатавіч. Нарадзіўся ў 1935 г. ў в. Руміна Аршанскага раёна. Працаваў у калгасе «Ленінская іскра». Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны». Памёр у 1995 г.

РАДКЕВІЧ Павел Канстанцінавіч. Нарадзіўся ў 1913 г. ў в. Панізоўе Аршанскага раёна. Пасля вайны працаваў на Аршанскім хлебакамбінаце, з 1954 г. — брыгадзірам комплекснай брыгады ў калгасе «Ленінская іскра». Памёр у 1996 г.

СЛІЖОЎ Анатоль Максімавіч. Нарадзіўся ў 1931 г. ў в. Зубрэвічы Аршанскага раёна. Працуе механізатарам у калгасе «Дубраўка».

СТАНКЕВІЧ Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся 9.11.1948 г. ў в. Корава Аршанскага раёна. З 1965 г. працуе механізатарам у калгасе імя Свярдлова. Узнагароджаны таксама Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета СССР.

ТРЭНДЗЕНАК Іван Яўціхавіч. Нарадзіўся 8.11.1923 г. ў в. Юрцава Аршанскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ХАРКЕВІЧ Іван Аўрамавіч. Нарадзіўся ў 1923 г. ў в. Лучыншчына Аршанскага раёна. З 1938 г. працаваў у калгасе.

ХРАПАВІЦКІ Васіль Фаміч. Нарадзіўся 12.4.1927 г. ў в. Юрцава Аршанскага раёна. Працаваў трактарыстам у калгасе «Актывіст».

ЧАРВЯКОВА Настасся Якаўлеўна. Нарадзілася 11.11.1897 г. ў г.п. Копысь Аршанскага раёна. З 1914 г. працавала настаўніцай.

ШАЎЛІНСКІ Леанід Аўрамавіч. Нарадзіўся 20.6.1938 г. ў в. Крапіўна Аршанскага раёна. Працаваў механізатарам у саўгасе «Дняпро».

ШКУРАЎ Анатоль Сямёнавіч. Нарадзіўся 6.2.1932 г. ў в. Дзятлава Аршанскага раёна. Скончыў Высокаўскую школу механізатараў. Працаваў камбайнерам, механікам у саўгасе «Ударнік». Узнагароджаны таксама залатым медалём ВДНГ СССР.

ШЫНКЕВІЧ Яўген Савельевіч. Нарадзіўся ў 1925 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў у райфінаддзеле, потым шафёрам у саўгасе «Днепр». Узнагароджаны таксама ордэнамі Айчыннай вайны, «Знак Пашаны», медалямі.

ШЫШКЕВІЧ Пётр Піменавіч. Нарадзіўся 10.3.1936. Працаваў механізатарам у калгасе «Прамень сацыялізму».

Узнагароджаны знакам «Выдатнік народнай асветы БССР»

ШАЛУХА Барыс Фёдаравіч. Нарадзіўся 23.4.1924 г. ў в. Крапіўна Аршанскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Смаленскі педагагічны інстытут. Працаваў настаўнікам, старшынёй раённага камітэта прафсаюза работнікаў народнай асветы ў г.п. Арэхаўск. Выдаў кнігі «Імя Юрыя Смірнова», «У баях пад Оршай», «Пад музыку турбін», «Юнак з легенды», шэраг публікацый у перыядычным друку. Узнагароджаны таксама ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Славы 3-й ступені.

ІМІ ГАНАРЫЦЦА АРШАНШЧЫНА

ЛУКАШЭНКА Аляксандр Рыгоравіч
Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

Нарадзіўся 30.8.1954 г. ў г.п. Копысь Аршанскага раёна. У 1975 г. скончыў гістарычны факультэт Магілёўскага педінстытута, у 1985 г. — Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Паводле адукацыі — гісторык, грамадазнавец і эканаміст аграпрамысловай вытворчасці. Атрымаў рознабаковы вопыт практычнай работы. У 1975—77 гг., 1980—82 гг. служыў у пагранічных войсках і ў Савецкай Арміі. У 1977—78 гг. на дзяржаўнай рабоце ў Магілёве, на розных пасадах у Шклоўскім раёне, у тым ліку ў аграпрамысловым комплексе. З 1990 г. дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. З красавіка 1993 г. па ліпень 1994 г. старшыня камісіі па барацьбе з карупцыяй. На гэтай пасадзе А.Р.Лукашэнка ўпершыню ў нацыянальным маштабе праявіў сябе яркім трыбунам, праціўнікам карупцыі, незалежным дэпутатам са сваёй асаблівай пазіцыяй па галоўных накірунках рэфармавання і дэмакратызацыі беларускага грамадства.

10.7.1994 г. пасля складанай барацьбы з 5 іншымі кандыдатамі, прадстаўнікамі ўсяго спектра палітычных сіл краіны, абраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Ён атрымаў больш за 80% галасоў выбаршчыкаў. 20.7.1994 г. на нечарговай сесіі Вярхоўнага Савета А.Р.Лукашэнка даў прысягу. У сваім выступленні спаслаўся на словы Аўраама Лінкольна аб тым, што сапраўдная дэмакратыя — улада народа, ад народа і для народа. Сказаў і аб адзінай магчымай дыктатуры — дыктатуры Закона, і таму ўсе яго спадзяванні звязаны з дасягненнем грамадзянскай згоды ў краіне.

А.Р.Лукашэнка Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі Рэспублікі Беларусь, узначальвае Савет Бяспекі рэспублікі. У красавіку 1996 г. абраны Старшынёй Вышэйшага Савета Супольніцтва Беларусі і Расіі, у красавіку 1997 г. — Старшынёй Вышэйшага Савета Саюза Беларусі і Расіі, у пачатку 2000 г.— Старшынёй Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы. З 1995 г. Ганаровы акадэмік Расійскай Акадэміі сацыяльных навук, з мая 1997 г. — прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі. У 1997 г. А.Р.Лукашэнка стаў лаўрэатам Міжнароднай прэміі імя М.А.Шолахава — «за мужную палітычную публіцыстыку і самаадданую пазіцыю ў абароне народных інтарэсаў».



А.Р.Лукашэнка.

27.9.1998 г. за вялікі ўклад у духоўнае адраджэнне народа Беларуская праваслаўная царква ўзнагародзіла яго Ордэнам Крыжа Святой Ефрасінні Полацкай. У студзені 2000 г. на ўрачыстасцях, прысвечаных 2000-годдзю хрысціянства, атрымаў вышэйшую ўзнагароду Іерусалімскай патрыярхіі — ордэн Святога Крыжа Рыцараў Гроба Гасподня.

А.Р.Лукашэнка многа і ахвотна займаецца спортам. Ён упэўнены, што вялікія псіхалагічныя нагрузкі, якія кладуцца кожны дзень на кіраўніка дзяржавы, стан нервовага стрэсу можна зняць актыўным спортам.

Прэзідэнт, працоўны дзень якога распісаны па мінутах, за дзяржаўнымі справамі знаходзіць час, каб падысці да кніжнай паліцы. Чытанне кніг — адзін з самых прыемных для яго заняткаў. Ён атрымлівае задавальненне пры знаёмстве з тэхнічнымі навінкамі, апошнімі дасягненнямі навуковай думкі.

АНДРЭЕВА Наталля Яўгенаўна. Нарадзілася 1.5.1933 г. ў Оршы. Доктар медыцынскіх навук, прафесар Маскоўскага інстытута гематалогіі.

АРЦЮШКЕВІЧ Аляксандр Сяргеевіч. Нарадзіўся 31.1.1947 г. ў г. Барань. Доктар медыцынскіх навук (1996), прафесар. У 1970 г. скончыў Смаленскі медыцынскі інстытут па спецыяльнасці стаматалогія. Працаваў у Калужскай вобласці, потым у Оршы. У 1975 г. скончыў клінічную ардынатуру па хірургічнай стаматалогіі ў Мінскім медыцынскім інстытуце. У 1976—78 гг. урач-стаматолаг 4-га Галоўнага ўпраўлення Міністэрства аховы здароўя Беларусі. З 1991 г. загадчык кафедры Беларускага інстытута ўдасканалення ўрачоў. Аўтар больш за 100 навуковых прац, кнігі «Траўмы галавы і шыі» (1999). Мае 2 патэнты і 4 аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтва. Жыве ў Мінску.

АСМАЛОЎСКАЯ Зоя Васілеўна. Нарадзілася 1.3.1923 г. ў Оршы. Беларуская актрыса. Заслужаная артыстка Беларусі. (1982). Скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1952). Працавала ў Гродзенскім абласным драматычным тэатры, дзе выканала ролі Марыны Казаніч («Гэта было ў Мінску» А.Кучара), Клавы Аганьковай («Дзяўчаты-красуні» А.Сімукова), Дусі («Таня» А.Арбузава), Далорэс («Каменны гаспадар» Л.Украінкі). З 1954 г. ў Дзяржаўным рускім драматычным тэатры Беларусі. Актрыса востра адчувае характарную адметнасць і эмацыянальны стан душы сваіх гераінь. Ад сваіх педагогаў Дз.Арлова і Б.Мардвінава ўспрыняла ўрокі арганічнага жыцця ў вобразе, натуральнага ўнутранага пераўвасаблення ў псіхалагічны свет персанажа, што і характарызуе створаныя ёю ролі. Сярод іх: Зорына («Брэсцкая крэпасць» К.Губарэвіча), Людміла («Пад адным небам» А.Маўзона), Нюра («У дзень вяселля» В.Розава), Ларыса («Іркуцкая гісторыя» А.Арбузава), Вара («Разгром» паводле А.Фадзеева), Айша-Апа («Узыходжанне на Фудзіяму» Ч.Айтматава і К.Мухамеджанава), Ніна Іванаўна і Валянціна («Рэтра» і «Зоркі на ранішнім небе» А.Галіна), Міроніха («Апошні тэрмін» паводле В.Распуціна). Маці («Фантазіі Фарацьева» А.Сакаловай), Ульяна («Трывога» А.Петрашкевіча), Гаспадыня («А досвіткі тут ціхія...» паводле Б.Васільева). З.В.Асмалоўскую вылучае адчуванне ансамбля выканаўцаў роляў у спектаклі: прытрымліваецца агульнага тону сцэнічнага відовішча і «саліруе» ў межах адведзенага ёй драматургам і рэжысёрска-пастановачным планам. Гэта выявілася ў ролях вялікіх і эпізадычных: Акуліна («Улада цемры» Л.Талстога), Цвятаева, Квашня, Глафіра і Ксенія («Мяшчане», «На дне» і «Ягор Булычоў і іншыя» М.Горкага), Матрона («Гарачае сэрца» А.Астроўскага), Анфіса («Тры сястры» А.Чэхава), Аўдоцця («Дзеці Ванюшына» С.Найдзёнава), Другая старая («Макбет» У.Шэкспіра), пані Аргант («Адзіны наследнік» Ж.Ф.Рэньяра), Селья («Дурнічка» Лопэ дэ Вэга), Марта («Каменнае гняздо» Х.Вуаліёкі), Жульета («Падарожнік без багажу» Ж.Ануя), Понсія («Дом Бернарды Альбы» Ф.Гарсія Лоркі), Эленэ («Нявеста з Імерэтыі» паводле Д.Кладзіяшвілі), Мамка («Іван-ды-Мар'я» У.Гольдфельда). Выступае ў тэле- і радыёспектаклях. *Б.І.Бур'ян.*

АСТАПОВІЧ Наталля Іванаўна. Нарадзілася 14.4.1940 г. ў Оршы. Беларускі мікрабіёлаг. Доктар біялагічных навук (1989). Скончыла БДУ (1962). З 1962 г. ў Інстытуце мікрабіялогіі НАН Беларусі, з 1989 г. намеснік дырэктара. Навуковыя працы па сакрэцыі і мадыфікацыі экспартных ферментных бялкоў у мікраміцэтах, стварэнні мікробных прэпаратаў на аснове біфіда- і малочнакіслых бактэрый. Сфармулявала канцэпцыю наяўнасці рэгулятарнага механізма, які дзейнічае на постсакраторным узроўні і звязаны з неабарачальнай дэградацыяй пазаклетачнага бялку.

БАБКОЎ Юрый Рыгоравіч. Нарадзіўся ў 1950 г. ў в. Мядзведзева Кашынскага раёна Цвярской вобласці. З 1952 г. жыў у Оршы. З

Ю.Р.Бабкоў.

1971 г. працаваў участковым інспектарам міліцыі ў мікрараёне льнокамбіната. Загінуў 29.6.1979 пры выкананні службовых абавязкаў. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі пасмяротна, медалём «За бездакорную службу» 3-й ступені. Імем Ю.Р.Бабкова названа вуліца ў Оршы.

БАГУШЭВІЧ Юрый Канстанцінавіч. Нарадзіўся 5.5.1917 г. Рускі пісьменнік. З сям'і аршанскага чыгуначніка. У 1941 г. скончыў Мінскі педінстытут. Адначасова працаваў у газеце «Сталинская молодежь». У Вялікую Айчынную вайну знаходзіўся ў дзеючай арміі на Калінінскім і Беларускім франтах. З 1948 г. ваенны карэспандэнт (у 1945—1949 гг. у Карэі і Кітаі), літаратурны кансультант СП БССР. У 1961—64 гг. галоўны рэдактар Мінскай кінастудыі навукова-папулярных і дакументальных фільмаў.

Першыя літаратурныя творы Ю.Багушэвіч апублікаваў яшчэ ў 1938 г., але кнігі, якія прынеслі яму вядомасць, пачалі выходзіць з сярэдзіны 1950-х гадоў (пісаў на рускай мове). Сярод іх — «Пабрацімы» (1955, 1-е выд.), «Дрэва дружбы» (1959), «У гарадку над Нёманам» (1973), «Дырэктар «зялёнай школы» (1975), «Юнацтва прыйшло» (1977, 1987). Пісаў Юрый Багушэвіч пераважна для юнага чытача. Самую найлепшую і найбольш аўтарытэтную характарыстыку яго творчасці даў наш зямляк Аляксандр Міронаў у прадмове да кнігі Ю.Багушэвіча «Пабрацімы», якая вытрымала 8 выданняў:

«...Што ж сілкуе нязгасны чытацкі інтарэс да твораў Юрыя Багушэвіча? Мне думаецца, галоўнае — нявыдуманая, непрыхарошаная праўда, якая пранізвае старонкі яго аповесцей і апавяданняў. Заходзіць размова пра вайну — ён ведае, чым была для нашага народа Вялікая Айчынная вайна. Малодшы сяржант-мінамётчык, радыст Юрый Багушэвіч з баямі прайшоў цярністы шлях ад Вялікіх Лук да Берліна... Але для яго, як і для многіх аднапалчан, Вялікая Айчынная не скончылася пераможным салютам 1945 года. Прайшло крыху больш за два месяцы, і ваенны журналіст Юрый Багушэвіч ужо на Далёкім Усходзе. Сакрушальны разгром Квантунскай японскай арміі... Баі ў Карэі... Вызваленне Порт-Артура... Безагаворачная капітуляцыя Японіі... Ці не там упершыню нарадзілася думка напісаць аповесць аб

Г.М.Базыленка.

дружбе савецкага і карэйскага хлопчыкаў — «Пабрацімы»?..

Няма патрэбы Юрыю Багушэвічу нічога прыдумваць і выдумляць і пра нашых школьнікаў: літаральна напярэдадні вераломнага нападу гітлераўскіх орд на нашу краіну ён здаў апошні выпускны экзамен у педагагічным інстытуце імя М.Горкага ў Мінску.

І пра спорт, пра спартсменаў не трэба выдумваць: гэта ж Юрый Багушэвіч не адзін год судзіў гарачыя паядынкі на баксёрскіх рынгах.

Адсюль і жыццёвая праўда яго кніг...»

Да канца жыцця працаваў Юрый Багушэвіч журналістам — найбольш у дзіцячых і спартыўных выданнях. Памёр 18.3.1983 г. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені і Чырвонай Зоркі.

БАЗЫЛЕНКА Ганна Мартынаўна. Нарадзілася 4.4.1908 г. ў г.п. Арэхаўск Аршанскага раёна. Беларускі мовазнавец. Кандыдат філалагічных навук (1952). У 1920-я гады пад уласным прозвішчам і псеўданімам «Ганна Арахоўская» друкавала вершы, апавяданні і аднаактовыя п'есы. У 1931 г. скончыла БДУ. Працавала ў Слуцкім і Мінскім педагагічных тэхнікумах (1931—33), Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР (1933—38), БДУ (1944—70). Аўтар манаграфіі «Пабочныя і ўстаўныя словы, словазлучэнні і сказы ў сучаснай беларускай літаратурнай мове» (1964), шэрагу навуковых артыкулаў па праблеме сучаснай беларускай мовы. Памерла 16.1.1980 г.

БЯЗЛЮДАЎ Артур Іосіфавіч. Нарадзіўся 28.4.1934 г. ў г. Барань Аршанскага раёна. Дзяржаўны дзеяч Беларусі, вучоны-эканаміст. Доктар эканамічных навук (1985), прафесар (1988). Скончыў ВПШ пры ЦК КПСС (1963). З 1955 г. тэхнолаг, начальнік цэха,

старшы інжынер-тэхнолаг завода «Чырвоны барацьбіт» у Оршы. З 1957 г. намеснік загадчыка аддзела Віцебскага абкома, з 1958 г. 1-ы сакратар Віцебскага гаркома ЛКСМБ. З 1961 г. загадчык аддзела Віцебскага, 2-гі сакратар Полацкага, 1-ы сакратар Наваполацкага гаркомаў КПБ. У 1973—86 гг. міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі БССР. З 1994 г. рэктар Беларускага недзяржаўнага інстытута кіравання, фінансаў і эканомікі і недзяржаўнага інстытута дзелавога адміністравання. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1975—85 гг.

БЯЛЫНІЦКІ-БІРУЛЯ Аляксей Андрэевіч. Нарадзіўся 5.11.1864 г. ў в. Бабкоў Аршанскага раёна. Вучоны-натураліст, падарожнік. Член-карэспандэнт АН СССР. Прафесар Ленінградскага універсітэта. Скончыў прыродазнаўчае аддзяленне фізіка-матэматычнага факультэта Пецярбургскага універсітэта (1891). З 1893 г. да канца жыцця працаваў у Заалагічным музеі ў Пецярбургу. У 1900—03 гг. удзельнічаў у палярнай экспедыцыі на чале з геолагам і географам Э.В.Толем, у ходзе якой упершыню апісаў расліннае покрыва мыса Чэлюскін, даследаваў жывёльны і раслінны свет Новасібірскіх астравоў. Памёр 18.6.1937 г. *В.П.Грыцкевіч.*

БЯЛЯЦКІ Дзмітрый Паўлавіч. Нарадзіўся 2.11.1906 г. ў в. Пугляі Аршанскага раёна. Беларускі вучоны ў галіне сацыяльнай гігіены і гісторыі медыцыны. Доктар медыцынскіх навук (1967), прафесар (1967). Заслужаны ўрач БССР (1967). Скончыў Мінскі медыцынскі інстытут (1933). З 1933 г. ў Наркамаце аховы здароўя БССР. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1943—59 гг. намеснік міністра аховы здароўя БССР. У 1945—78 гг. загадчык кафедры сацыяльнай гігіены і арганізацыі аховы здароўя Мінскага медыцынскага інстытута. Аўтар прац па сацыяльнай гігіене і гісторыі развіцця санітарнай службы на Беларусі. Памёр 2.6.1983 г.

М.К.Зубрыцкі.

ВАКАР Сяргей Міхайлавіч. Нарадзіўся 27.8.1928 г. ў Оршы. Беларускі скульптар. Заслужаны дзеяч мастацтва Беларусі (1978). Працаваў рабочым чыгуначнага дэпо. У 1966 г. скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Асноўная тэма творчасці — Вялікая Айчынная вайна: работы «Юныя мсціўцы», партрэты Герояў Савецкага Саюза С.Шутава, К.Арлоўскага, К.Заслонава, М.Шмырова, М.Кедышкі, двойчы Героя Савецкага Саюза П.Галавачова і інш. Выканаў партрэты беларускіх пісьменнікаў У.Караткевіча, П.Панчанкі, Я.Брыля і інш.

С.М.Вакар.

Плённа працуе скульптар у вобласці манументальнай скульптуры. Значнымі работамі С.Вакара з'яўляюцца помнікі віцэ-адміралу В.П.Дразду на яго радзіме ў Буда-Кашалёве і Ф.Э.Дзяржынскаму ў сядзібе Дзяржынава Стаўбцоўскага раёна. Шмат разоў мастак вяртаўся да вобраза паэта М.Багдановіча, таму невыпадкова стаў пераможцам конкурсу на лепшы праект помніка паэту ў сталіцы рэспублікі. Стварыў шэраг мемарыяльных дошак. Памёр у 1998 г.

С.Вакар. Партрэт Я.Брыля. Дрэва. 1976.

ВАЛАДЗЬКО Яўген Іванавіч. Нарадзіўся ў 1941 г. ў Аршанскім раёне. Заслужаны работнік транспарту Беларусі (1996). Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны». Двойчы ганаровы чыгуначнік. Памёр у 1998 г.

ВАСІЛЁНАК Яўген Пятровіч. Нарадзіўся 26.12.1917 г. Беларускі пісьменнік. З сям'і аршанскага чыгуначніка. У 1934—35 гг. вучыўся ў Магілёўскім педагагічным інстытуце. Працаваў у раённых і гарадскіх газетах Барысава, Багушэўска і роднай Оршы, з 1939 г.— на Далёкім Усходзе. У гады вайны быў франтавым журналістам, потым жыў у Алма-Аце. З 1948 г. ў Мінску, працаваў рэдактарам БелТА, карэспандэнтам газеты «Труд» па Беларусі, загадчыкам аддзела публіцыстыкі часопіса «Маладосць», у 1958—1966 гг. — галоўны рэдактар часопіса «Неман». Ён ніколі не парываў сувязі з роднай Аршай. Друкаваўся з 1935 г. Найбольш вядомыя кнігі Я.Васілёнка выйшлі ў пасляваенны час: «Зялёныя агні» (1954), «Прызванне» (1956), «Выпадковы прыпынак» (1957), «Таццяна Ларына» (1964), «Вячэрняя размова» (1968) і г.д. Асобнай кнігай выдадзена ў 1959 г. яго драма «Каралеўскі гамбіт», якая і сёння не страціла актуальнасці і ставіцца на сцэнах тэатраў. Памёр 23.9.1973 г. «Выбраныя творы» Я.Васілёнка ў 2 тамах былі выдадзены ў 1977 г.

Я.П.Васілёнак.

ВАСІЛЬЕЎ Васіль Вячаслававіч. Нарадзіўся 2.12.1954 г. ў Оршы. Беларускі мастак. Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута (1982), Беларускую АМ (1992). Удзельнік мастацкіх выставак з 1978 г. Працуе ў галіне станковага жывапісу. З 1990 г. займаецца пластычнымі, колеравымі, канцэптуальнымі пошукамі. За працу «Адбіткі на асфальце» (1991) «Гран-пры» І Міжнароднага пленэру «Малевіч. Уновіс. Сучаснасць» (Віцебск, 1994). Выкладае ў Віцебскім тэхналагічным універсітэце.

ВІГДАРАВА Фрыда Абрамаўна. Нарадзілася ў 1915 г. ў Оршы. У 1937 г. скончыла Маскоўскі пединстытут. Аўтар кніг «Дарога в жизнь», «Это мой дом», «Семейное счастье». У 1964 г. зрабіла запіс судовага працэсу над І.Бродскім. Памерла ў 1966 г.

ВЫГОЦКІ Леў Сямёнавіч. Нарадзіўся 17.11.1896 г. ў Оршы. Псіхолаг. У 1917 г. скончыў Маскоўскі універсітэт. У 1919—23 гг. жыў і працаваў у Беларусі. З 1924 г. ў Маскоўскім інстытуце эксперыментальнай псіхалогіі, потым у заснаваным ім інстытуце дэфекталогіі. Даследаваў грамадскую, дзіцячую, педагагічную і клінічную псіхалогію. У сваім рукапісе «Сэнс псіхалагічнага крызісу» (1926) крытычна прааналізаваў тагачасныя філасофскія і псіхалагічныя канцэпцыі. У кнізе «Гісторыя развіцця вышэйшых псіхічных функцый» (1930—31, апубл. 1960) выклаў культурна-гістарычную тэорыю развіцця псіхікі. Вывучаў таксама структуру свядомасці («Мысленне і мова», 1934). Памёр 11.6.1934 г.

ГАНЧАРОВА Роза (Ружа) Іосіфаўна. Нарадзілася 10.3.1938 г. ў Оршы. Беларускі вучоны ў галіне генетыкі. Доктар біялагічных навук (1991). У 1960 г. скончыла БДУ. З 1963 г. ў Інстытуце генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі. Аўтар навуковых прац па праблемах антымутагенезу, генетычнай таксікалогіі (мутагены навакольнага асяроддзя), радыяцыйнай генетыкі (генетычныя наступствы Чарнобыльскай катастрофы).

ГРЫГОР'ЕЎ Самуіл (Самошка). Майстар-цаніннік 2-й палавіны 17 ст. Выхадзец з Копысі. У 1654 г. ўзяты патрыярхам Ніканам у Валдайскі манастыр для цаніннай справы, потым на будоўлю Новаіерусалімскага храма ў г. Істра. Працаваў у Аружэйнай палаце ў Маскве. У 1667—68 гг. рабіў кафлі для Каломенскага палаца цара Аляксея Міхайлавіча.

ДАРАШЭВІЧ Міхаіл Васілевіч. Нарадзіўся 19.11.1900 г. ў Оршы. Беларускі дзяржаўны дзеяч, вучоны-геадэзіст. Прафесар (1961), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР (1954). У 1927 г. скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. З 1933 г. ў БПІ: загадчык кафедры геадэзіі (1933—41, 1945—68), рэктар (1947—59). З 1959 г. міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1955—68 гг. Аўтар навуковых прац па розных відах геадэзічных здымак, камеральнай апрацоўцы палявых матэрыялаў, выяўленні і вывучэнні тарфяных радовішчаў. Памёр 28.1.1968 г.

С.Ю.Друкер.

ДЗЕМЯШКЕВІЧ Адам Станіслававіч. Нарадзіўся 1.11.1902 г. ў Оршы. Генерал-лейтэнант авіяцыі (1959). У 1934 г. скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе. У Чырвонай Арміі з 1920 г. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Заходнім і 1-м Беларускім франтах. Удзельнік абароны Масквы, Ленінграда, вызвалення Польшчы, баёў за Берлін. Пасля вайны на адказных пасадах у Савецкай Арміі, намеснік начальніка Ваенна-паветранай акадэміі. Памёр 12.9.1962 г.

ДРУКЕР Софія Юр'еўна. Нарадзілася 7.1.1907 г. ў г.п. Копысь Аршанскага раёна. Беларуская спявачка (драматычнае сапрано). Народная артыстка БССР (1955). У 1933 г. скончыла Беларускую студыю оперы і балета пад кіраўніцтвам А.Баначыча, у 1932—36 гг. вучылася ў Беларускай кансерваторыі (клас П.Ціханава). У 1933—41 і 1944—77 гг. салістка Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі (у Вялікую Айчынную вайну спявала на сцэне Саратаўскага тэатра оперы і балета, удзельнічала ў рабоце франтавых канцэртных брыгад, выступала перад партызанамі Віцебшчыны). Валодала моцным голасам прыемнага тэмбру. Раскрыццю музычна-драматычных здольнасцей артысткі садзейнічала работа над партыямі нацыянальнага рэпертуару, ад глыбока драматычнай (Аўгіння ў оперы «У пушчах Палесся» А.Багатырова) да востракамедыйнай (Рагнеда Янаўна ў «Калючай ружы» Ю.Семянякі). Майстэрства стварэння драматычна напружаных, багатых псіхалагічнымі адценнямі вобразаў найбольш выявілася ў буйных партыях опернай класікі: Яраслаўна («Князь Ігар» А.Барадзіна), Наташа («Русалка» А.Даргамыжскага), Ліза, Марыя, Настасся, Аксана («Пікавая дама», «Мазепа», «Чарадзейка», «Чаравічкі» П.Чайкоўскага) і інш. Каларытна ўвасоблены ёю камедыйныя вобразы Часніковай («Страшны двор» С.Манюшкі), Адаркі («Запарожац за Дунаем» С.Гулак-Арцямоўскага), Дуэньі («Заручыны ў манастыры» С.Пракоф'ева), Фроські («Марозка» М.Красева), Мірабелы («Цыганскі барон» І.Штрауса). Шмат выступала ў канцэртах, у тым ліку з творамі беларускіх кампазітараў. Памерла 23.4.1984 г.

ЖУК Ігар Леанідавіч. Нарадзіўся 14.10.1964 г. ў Оршы. Беларускі мастак. Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (1986), Беларускую АМ (1996). Удзельнік мастацкіх выставак з 1989 г. Працуе ў галіне станковай і камп'ютэрнай графікі, дызайну, жывапісу. Асноўныя творы: графічная серыя «Архаіка», лісты «Свет жывёл», «Лялькі», «Фантазіі»; карціны «Рыбакі», «Сны»; у галіне графічнага дызайну «Партрэт дачкі», «Мае сучаснікі». Жыве ў Мінску.

С.Друкер у ролі Аўгінні з оперы «У пушчах Палесся» А.Багатырова.

ЗАБЕЛА Леанід Яўгенавіч. Нарадзіўся 7.9.1947 г. ў Оршы. Беларускі матэматык. Доктар фізіка-матэматычных навук (1992). Скончыў БДУ (1970), дзе і працуе. Навуковыя працы па якаснай тэорыі аптымальных працэсаў. Распрацаваў метад рашэння выраджаных задач для сістэм са спазненнем з выкарыстаннем канечнага набору матрычных функцый.

ЗАСЦЕНСКІ Леанід Сямёнавіч. Нарадзіўся 1.9.1937 г. ў в. Крапіўна Аршанскага раёна. Беларускі вучоны ў галіне лясной гаспадаркі. Доктар сельскагаспадарчых навук (1984), прафесар (1986). Скончыў Беларускі тэхналагічны універсітэт (1962), дзе і працуе. Навуковыя працы па агратэхніцы вырошчвання дрэвавых пародаў, ахоўных насаджэнняў, рэкультывацыі зямель, механізацыі лесагаспадарчай вытворчасці, глебава-экалагічнай ацэнцы тэхнагенных ландшафтаў.

ЗАХАРЧЭНЯ Барыс Пятровіч. Нарадзіўся 1.5.1928 г. ў Оршы. Расійскі фізік. Акадэмік Расійскай АН (1992; член-карэспандэнт 1976). Скончыў Ленінградскі універсітэт (1952). З 1952 г. ў Пецярбургскім фізіка-тэхнічным інстытуце. Навуковыя працы па оптыцы, спектраскапіі і магнітаоптыцы паўправаднікоў, оптаэлектроніцы. Ленінская прэмія 1966 г. Дзяржаўная прэмія СССР 1976 г.

ЗДАНОВІЧ Аляксандр Аляксандравіч. Нарадзіўся 17.7.1927 г. ў Оршы. Дзяржаўны дзеяч Беларусі. У 1952 г. скончыў Мінскі юрыдычны інстытут. З 1951 г. народны суддзя Лёзненскага раёна, з 1959 г. на партыйнай і адміністрацыйнай рабоце. Працаваў міністрам юстыцыі БССР. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

ЗУЕВА Ларыса Міхайлаўна. Нарадзілася 15.4.1957 г. ў Оршы. Беларускі мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Скончыла Віцебскі педагагічны інстытут (1979). Удзельніца мастацкіх выставак з 1981 г. Асноўныя творы: габелены «Палессе», «Хлеб», «Памяці Францыска Скарыны» і інш.; цыклы габеленаў «Беларускія матывы», «Танцы народаў СССР». Творы знаходзяцца ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, Гомельскім абласным краязнаўчым музеі, Чарнігаўскім мастацкім музеі. Узнагароджана сярэбраным медалём ВДНГ СССР (1981, 1986). Жыве ў г. Гомель.

ІПАЛІТ (Старац). Разьбяр па дрэве 17 ст. Манах з Оршы. Працаваў у палаце разьбярных і сталярскіх спраў Маскоўскага Крамля. З вучнямі Яфімам Анціп'евым, Данілам Грыгор'евым і Ларкам Юр'евым рэзаў і залаціў стаўпы і гербы царскіх карэт, іканастасы, ракі для мошчаў, рызніцы, шафы, куфры і інш. У 1679 г. стварыў рэльефнае распяцце для Галгофы ў царкве Уваскрэсення Славушчага і рысункі кафляных упрыгожанняў купалоў Верхняспаскага сабора ў Маскоўскім Крамлі.

КАЗЛОЎСКІ Іван Андрэевіч. Нарадзіўся ў 1892 г. ў в. Малое Гальцэва пад Оршай (цяпер у Талачынскім раёне) у шматдзетнай сям'і селяніна-бедняка. З 1911 г. быў рабочым у Пецярбургу, адначасова вучыўся ў вячэрнім рабочым універсітэце і супрацоўнічаў у падпольнай «Правде». Свае замалёўкі і вершы Іван Казлоўскі падпісваў псеўданімам «Іван Батрак», які азначаў яго сялянскае, сапраўды батрацкае мінулае. 1914 год — час актыўнай рэвалюцыйнай дзейнасці Івана Казлоўскага-Батрака. У тым жа годзе ён уступіў у партыю бальшавікоў.

У кастрычніку 1915 г. Іван Андрэевіч быў арыштаваны. Ваенна-акруговы суд прыгаварыў яго да васьмігадовай катаргі, але гэта не зламала волю юнака. У адзіночнай камеры Шлісельбургскай крэпасці ён працягваў пісаць вершы.

У Лютаўскую рэвалюцыю 1917 г. быў вызвалены. У канцы таго ж года па заданні партыі прыехаў у Оршу і ўзначаліў павятовы камітэт партыі, потым участак народнай адукацыі. Калі пачала выходзіць газета «Набат», стаў яе рэдактарам. Поруч з грамадска-палітычнай дзейнасцю займаўся літаратурнай працай, пісаў вершы, якія, трэба думаць, друкаваліся ў «Набаце». Для ранняй яго творчасці характэрны гераічныя матывы.

У літаратуры таго часу ён быў вядомы найперш як паэт-сатырык, байкапісец, і многія крытыкі ставілі яго ўпоравень з Дзям'янам Бедным. Ён аўтар зборнікаў баек «Абручы і клёпкі» (1926), «Саха і трактар» (1928), «Павукі і мухі» (1931), «Байкі» (1928, 1933). Перакладаў на рускую мову творы Я.Коласа і К.Крапівы. Апошняя яго кніга «Избранное» выйшла ў 1958 г.

З Оршай І.А.Казлоўскі развітаўся ў 1920 г., калі пачалася грамадзянская вайна. Памёр у 1943 г. ў Маскве.

У.С.Караткевіч.

КАЛОДЗЕЖНЫ Леанід Трафімавіч. Нарадзіўся 22.2.1935 г. ў в. Солаўе Аршанскага раёна. Беларускі пісьменнік. У 1951—53 гг. вучыўся ў Віцебскім мастацка-графічным педагагічным вучылішчы. У 1954—57 гг. служыў у Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі загадваў Кудаеўскім сельскім клубам. З восені 1958 г. супрацоўнічаў у рэдакцыях газет «Дняпроўская праўда» і «Ленінскі прызыў». З 1961 г. да выхаду на пенсію працаваў мастаком-афарміцелем на Аршанскім ільнокамбінаце. Друкуецца з 1958 г. Выдаў 2 зборнікі апавяданняў — «Аўсяны звон» (1975) і «Бярозы ў жыце» (1981). Аўтар артыкулаў, апавяданняў і аповесцей у перыёдыцы, твораў для дзяцей. Яго творы звязаны пераважна з жыццём вёскі, ім уласцівы лірызм, настроенасць, дакладнасць у перадачы малюнкаў жыцця і псіхалогіі герояў.

КАМЛЮК Лілія Васілеўна. Нарадзілася 2.2.1937 г. ў Оршы. Беларускі вучоны ў галіне гідраэкалогіі. Доктар біялагічных навук (1922), прафесар (1977). Скончыла БДУ (1959), дзе і працуе. Навуковыя працы па метадах аптымізацыі экасістэм рыбаводных сажалак з мэтай павелічэння выхаду рыбапрадукцыі, вывучэнні структуры і функцыянавання зоапланктоннага згуртавання вадаёмаў пад уплывам антрапагеннага уздзеяння.

КАНЦАВОЙ Міхаіл Пятровіч. Нарадзіўся 19.11.1949 г. ў г. Барань. Беларускі мастак. Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (1976). Удзельнік мастацкіх выставак з 1977 г. Працуе ў галіне станковай, манументальна-дэкаратыўнай скульптуры. Асноўныя творы: помнікі М.Казлоўскаму у в. Гапонавічы Мінскай вобласці, А.Гараўцу ў Віцебску (у саўт.); кампазіцыі «Цяжкавагавікі», «Вяртанне. Прысвячэнне М.Багдановічу», «Успаміны маёй маці» і інш. Яму належыць дэкаратыўнае афармленне Нясвіжскага парку. З 1987 г. кіраўнік мастацка-ліцейнага прадпрыемства «Адраджэнне рамёстваў» у Мінску.

КАПЛЯКОЎ Сяргей Віктаравіч. Нарадзіўся 23.1.1959 г. ў Оршы. Беларускі спартсмен (плаванне). Заслужаны майстар спорту СССР (1979). У 1981 г. скончыў Ленінградскі інстытут фізкультуры. Сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў у 1976 г. (Манрэаль, Канада) і ў 1980 г. (Масква). Чэмпіён Еўропы ў 1977 г. (Ієнчэпінг, Швецыя), СССР у 1978 г. Сярэбраны прызёр чэмпіянату свету ў 1978 г. (Заходні Берлін). Рэкардсмен свету ў 1979 г. і Еўропы ў 1980 г. Пераможца і прызёр міжнародных і ўсесаюзных спаборніцтваў.

КАРАТКЕВІЧ Уладзімір Сямёнавіч. Нарадзіўся 26.11.1930 г. ў Оршы. Беларускі пісьменнік. У гады Вялікай Айчыннай вайны жыў у Пермскай вобласці, пасля ў Арэнбургу. У 1944 г. вярнуўся у Оршу, атрымаў сярэднюю адукацыю. У 1954 г. скончыў філалагічны факультэт Кіеўскага універсітэта імя Т.Р.Шаўчэнкі. У 1954—56 гг. настаўнічаў у в. Лесавічы Тарашчанскага раёна Кіеўскай вобласці, у 1956—58 гг. у Оршы. Скончыў Вышэйшыя літаратурныя (1960) і сцэнарныя (1962) курсы ў Маскве. З 1963 г. жыў у Мінску. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1957 г. Першыя вершы апублікаваў у 1951 г. ў аршанскай раённай газеце «Ленінскі прызыў». У 1955 г. верш «Машэка» быў змешчаны ў часопісе «Полымя». Першымі яго кнігамі былі паэтычныя зборнікі «Матчына душа» і «Вячэрнія ветразі». У 1969 г. выдаў арыгінальны зборнік паэзіі «Мая Іліяда». Прыкметнай з'явай у беларускай літаратуры стала апошняя яго паэтычная кніга «Быў. Ёсць. Буду», якая выйшла пасля яго смерці. Шырокае прызнанне У.Караткевічу прынесла яго проза. У 1957 г. напісаў аповесць «У снягах драмае вясна», у 1958 г. — аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» — адзін з самых вядомых твораў пісьменніка. Аўтар зборнікаў і аповесцей «Блакіт і золата дня» (1961), «Чазенія» (1966, выдадзены ў 1967) і інш. У Маскве быў задуманы першы раман «Леаніды не вернуцца да Зямлі», які пад назвай «Нельга забыць» быў надрукаваны ў 1962 г. ў часопісе «Полымя». Створаны 1-ы раман трылогіі «Каласы пад сярпом тваім» (1962—64, выдадзены ў 1965), раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (1965—66, выдадзены на

беларускай мове ў 1972; аднайменны кінафільм 1967), раман «Чорны замак Альшанскі» (1979; аднайменны кінафільм 1984). Для дзяцей выдаў «Казкі» (1975), нарыс «Белавежская Пушча» (1975). Плённа працаваў У.Караткевіч і як драматург. У 1957 г. напісаў п'есу «Млын на Сініх Вірах» (апублікавана ў 1988, пастаўлена ў 1959 на Беларускім тэлебачанні). У 1978 г. Віцебскім тэатрам пастаўлена яго п'еса «Кастусь Каліноўскі» (вядома каля дзесяці варыянтаў гэтага твора, адзін з ранніх называўся «Руна пра Кастуся»). Да 1000-годдзя Віцебска з'явілася драма «Званы Віцебска» (пастаўлена ў 1974 Віцебскім тэатрам). 100-годдзю з дня нараджэння Я.Купалы прысвяціў п'есу «Калыска чатырох чараўніц» (1981, пастаўлена ў 1982 Мінскім тэатрам юнага гледача), у 1982 г. закончыў драму «Маці ўраганаў» (пастаўлена ў 1988; аднайменны кінафільм 1990). Прыкметны след пакінуў У.Караткевіч у публіцыстыцы і літаратурнай крытыцы. Мастацкай энцыклапедыяй Беларусі стаў яго нарыс «Зямля пад белымі крыламі» (1971, выдадзена на беларускай мове ў 1977). У ёй пісьменнік з любоўю і цеплынёй расказаў пра Беларусь і яе народ, беларускую гісторыю і культуру. Аўтар шматлікіх нарысаў і эсэ. У творчай спадчыне У.Караткевіча захаваліся малюнкі, а таксама ілюстрацыі да ўласных твораў. На самым пачатку творчага шляху звярнуўся ён і да мастацкага перакладу. Аддаваў перавагу паэтам-рамантыкам, выказваў прыхільнасць галоўным чынам да духоўна блізкіх аўтараў. Ён узнавіў па-беларуску паэзію В.Катула, Дж.Байрана, А.Міцкевіча, І.Франка, Б.Мацкявічуса і інш., драмы грэчаскага пісьменніка П.Антэса «Праметэй перад трыбуналам», А.К.Талстога «Цар Фёдар Іаанавіч» і інш. Аўтар сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Сведкі вечнасці» (1964), «Памяць» (1966), «Будзь шчаслівай, рака» (1967), мастацкага «Чырвоны агат» (1973) і інш. Па яго творах пастаўлены мастацкія фільмы, тэле- і радыёспектаклі. У Беларускім тэатры оперы і балета створаны оперы «Сівая легенда», «Дзікае паляванне караля Стаха». У 1970-я гады быў удзельнікам навуковых экспедыцый «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, вёў на Беларускім тэлебачанні праграму «Спадчына». Творы пісьменніка перакладзены на многія мовы.

Орша. Адкрыццё мемарыяльнай дошкі У.С.Караткевічу на вуліцы, якая носіць яго імя.

Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І.Мележа (1983, раман «Нельга забыць») і Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я.Коласа (1984, раман «Чорны замак Альшанскі»). Памёр 25.7.1984 г.

Імем У.Караткевіча названы вуліцы ў Віцебску і Оршы, яго імя прысвоена школе ў Оршы, у якой адкрыты літаратурны музей У.Караткевіча. У Мінску, Оршы, на дамах, дзе ён жыў, устаноўлены мемарыяльныя дошкі, на магіле і ў Оршы — помнікі.

Гэтыя радкі У.С.Караткевіч прысвяціў Оршы.

«РША КАМЕН...»

Гораду майму — дзевяцьсот. Не дужа шмат, але не так ужо і мала. Полацк, самы стары горад усходніх славян, вядома, старэйшы за яго, але многія — маладзейшыя.

Дзевяцьсот...

Усе гэтыя гады ляжыць ён на вышынях Беларуска-Літоўскага ўзвышша, на ўвалах

над Дняпром і ягонымі парогамі. Пойдзеш некуды за Чарталле, сядзеш над празрыстымі водамі, паглядзіш на зарэчныя камяніцы і сады і адчуеш — радзіма. Хай сабе і не жылі тут твае продкі, а — радзіма.

Тое самае, відаць, адчуваў і Купала, бо нездарма ж ён пасяліўся менавіта ў гэтых мясцінах.

Усе мы пілі гэтую ваду. Карычневую, як чай, — з Аршыцы, мяккую і празрыстую — з Дняпра, вуглякісла-жалезістую — з Любавіцкіх крыніц.

І ўсе мы, з часоў Усяслава-чарадзея, асядалі на гэтых стасажэнных гарбах, на Кабыляцкім вапняковым кліне, здабывалі тарпу і секлі лясы, палявалі на бабровых гонях, ішлі на звера і дзічыну, здабывалі балотную жалезную руду, каменнае масла (нафта дагэтуль точыцца ў ваду з берагоў) і непараўнальны наш вапняк.

«Аршанцы-вапеннікі, на вапне любяцца, на вапне родзяцца і ў вапну кладуцца».

Мы заўсёды былі народ прадпрымальны. Дзегцяры, цагельнікі, смаляры. Наваколле нашага горада заўсёды славілася садамі і народным быдлам. Першыя на Беларусі плугі з'явіліся ў сялян — тут. І яшчэ — вытворчасць дроту, цвікоў, шкур. І ўсё гэта — на крутых і звілістых берагах, на шматлікіх «бітых дарогах», дужа старажытных (князь Расціслаў ішоў праз Оршу на Друцк — някепскай дарогай — яшчэ ў 1127 годзе). Пазней сталі мы параходным краем (пала параходства, а шкада), а яшчэ пасля — краем чыгуначным.

Любілі мураваць, калі паўсюль панавала дрэва. І звалі наш горад: «Рша камен...».

Яшчэ ў глыбокай старажытнасці.

І такія ж каменныя засталіся мы і цяпер. Толькі ўжо не смалу і шкіпінар дае Орша, а швейныя машыны, ільняныя тканіны, катлы і процьму ўсяго іншага, аб чым у кароткім слове не раскажаш.

Усе, хто еў вэнджаную рыбу са славутай аршанскай «курніцы», гуляў у «піва» на валах «замка Боны» ці на разбураных мурах езуіцкага калегіума, — усе тыя згодзяцца, што адзначае нас, карэнных аршанцаў, асобая аршанская рошчына. Яна ў незалежнасці, працавітасці, своеасобнасці меркаванняў.

Падтрымлівалі мы крамольнага князя Усяслава (быў гэта 1067 год, год першага ўпамінання аб горадзе). Прыйшоў на гэтую зямлю з рабункам Васіль Трэці — і яму здолелі даць па шыі аршанскія людзі. Спатрэбілася віцяблянам забіць ката Кунцэвіча — яны паклікалі на дапамогу нас, бо ведалі мужнасць нашу і вернасць.

Ніколі не любілі аршанцы тыранаў. Не хапала сілы — замыкаліся ў сабе — давалі свету тых мужыкоў, што пабілі напалеонаўскі ар'ергард.

У грамадзянскую вайну немцы не ўвайшлі ў Оршу. А ў пачатку Вялікай Айчыннай па іхніх нашчадках ударыў наш першы залп «кацюш».

Слаўны мужнасцю яшчэ васемсот гадоў таму назад, горад мой у мінулую вайну пасылае на вялікую бітву Заслонава і насыпае пасля Курган неўміручасці над сваімі сынамі.

Мураваны стагоддзямі, росціць ён і сёння, як грыбы, рады новых будынкаў.

Пісьменны і абазнаны ў культуры яшчэ сярэднімі вякамі (у Куцейне была адна з першых друкарань) — дае роднаму краю, з сябе і навакольных вёсак, пісьменнікаў і паэтаў.

Горад-працаўнік, горад-паэт, горад-воін, горад-вучоны — жыць табе яшчэ тысячы і тысячы год. Нізкі табе паклон ад усіх тваіх сыноў.

Друкуецца па кн.: Уладзімір Караткевіч. Збор твораў у васьмі тамах. Мн., 1991. Т. 8. Кн. 2. С. 48—49.

ОРША

Яна не блішчыць красою,
А ў сэрца навек запала
З паркам сваім змарнелым,
З сваёй Кабыляцкай гарой,
З лянівай сястрой Аршыцай,
Што летам бруіцца памалу
У шырокі, як песня наша,
Магутны, сівы Дняпро.

Хаткі, што да абрыву,
Як ластавак гнёзды, туляцца —
Родныя і дарагія,
Як поціск сяброўскай рукі;
Брук, размыты дажджамі,
Пыльныя ўскраіны вуліцы
Куродым на сценах будынкаў,
Дальнія цягнікі.

Далёка яна ад мяне,
Адзіная і дарагая,
У чорных істужках чыгунак,
Што ўсю яе абвілі,
З народам сваім, што ў бітвах
Ніколі не памірае:
Заслонава слава звоніць
На ўсіх перагонах зямлі.

Калісьці... Было і такое...
Хацелі пазбавіць крылляў...
Быдлам нас называлі,
А ўсё ж такі мы былі
Нязломнымі ў чорнай бядоце,
Гордымі і ў бяссіллі,
Бо род наш быў пралетарскі
А рукі — у чорным вуглі.

Мы паціскалі плячыма,
Калі нам з пагардай казалі,
Жадаючы ў час вясёлы
Рабочы наш род абсмяяць:
«Знаёмяцца ў вас на вапне,
На вапне вы нараджаліся,
Вапна ўсіх вас карміла,
У вапне вам і ляжаць».

Паслухайце: наш ён, наш горад,
Няхай і суровы часам, —
Працоўнае гордае права
Здабыў у цяжкой барацьбе,
Гэта наш родны горад,
Яму не патрэбны прыкрасы,
Ён сам для сябе прыкраса
І гордасць сам для сябе.

Мы цягнікі вадзілі,
Палотны на фабрыках ткалі,
Лес магутны валілі
І ўмелі плавіць метал,
У цёмных каменяломнях
Былы вапняк ламалі,
Гліну і торф здабывалі, —
Гарачы ў нас запал!

Як толькі цёмнаю ноччу
Вочы свае закрываю,
Адразу я Оршу бачу
З яе нияркай красой,
З бярозамі над Аршыцай,
З вясёлым сонейкам мая,
З блакітам першых пралесак
У косах каханай маёй.

Тут нарадзіліся думкі,
Воля, імкненні, жаданні,
Тут стаў я сынам краіны,
Абпален яе агнём...
Таму і люблю я Оршу
Першым вялікім каханнем,
Якое не знікне, пэўна,
Нават з маім жыццём.

Друкуецца па кн.: Уладзімір Караткевіч. Збор твораў у 8 тамах. Мн., 1987. Т. 1. С. 19—21.

Уладзімір Караткевіч і Орша

«ТУТ СТАЎ Я СЫНАМ КРАІНЫ...»

12 ліпеня 1971 года Уладзімір Караткевіч закончыў нарыс «Зямля пад белымі крыламі», прызначаны для ўкраінскага чытача сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту. Нарыс — своеасаблівая гісторыя Беларусі, народжаная вялікай любоўю аўтара да роднай зямлі.

Адзін з яго раздзелаў называецца «Камяніцы і гмахі, і вежы». Аўтар расказвае пра найбольш знакамітыя беларускія гарады. «Ясна, — піша Караткевіч, — трэба сказаць пра сталіцу, пра абласныя гарады, а далей... далей пра тое, пра што хочацца, пра тыя гарадкі і мястэчкі, якія найлепш ведаеш і найбольш любіш».

Прызнаюся, упершыню чытаў беларускае выданне нарыса і чакаў расповяд праз прызму Оршы. Думалася, што родны горад будзе апісаны адным з першых. Гэта так натуральна!

Аднак... Мінск, Полацк, Віцебск, Магілёў, Гомель, Брэст, Гродна, Навагрудак, Слонім, Нясвіж, Пінск, Мазыр... Але вось і Орша. Чытаем: «...пра ўсе вартыя слова беларускія гарады не раскажаш. Што выбраць? Аб чым сказаць?.. Ці пра Оршу з яе легендамі, з парогамі на Дняпры і льнокамбінатам, які выпускае адны з найлепшых ільняных тканін у свеце? Пра Оршу, дзе стаіць помнік «Кацюшам», якія ў вайну далі тут першы залп».

Лёгкае расчараванне... Няўжо для роднага горада з яго вялікай і славутай гісторыяй, з магутнай сучаснай прамысловасцю, з цудоўнымі, працавітымі людзьмі ў аўтара не знайшлося слоў?

... 29 ліпеня 1951 года аршанская газета «Ленінскі прызыў» апублікавала два вершы маладога Караткевіча — «Здесь будет канал» (на рускай мове) і «Якубу Коласу» (на беларускай). У трэцім нумары часопіса «Полымя» за 1956 год з'яўляецца верш «Орша». У

1962 годзе трэці нумар часопіса «Полымя» друкуе верш «Вуліца Касманаўтаў» (цяпер вуліца У.Караткевіча ў Оршы; тут нарадзіўся пісьменнік). 4 ліпеня 1967 года ў газеце «Літаратура і мастацтва» з'яўляецца яго эсэ «Рша камен...», прысвечанае 900-годдзю Оршы. Мы знойдзем яшчэ нямала «аршанскіх» радкоў у аповесцях, раманах, п'есах, публічных і тэлевізійных выступленнях. (У 1976 годзе Караткевіч быў вядучым праграмы «Спадчына» на Беларускім тэлебачанні.) Усё гэта пераканаўча гаворыць за тое, што сціплыя радкі пра Оршу ў «Зямлі пад белымі крыламі» можна, відаць, растлумачыць нейкімі вялікімі задумамі пісьменніка адносна горада, невядомымі нам. А магчыма, ён лічыў, што ў сваіх гістарычных творах аддаў належнае аршанскай даўніне. На карысць гэтага меркавання ёсць нямала аргументаў.

У аповесці «Сівая легенда» (чацвёрты нумар «Полымя» за 1961 год) чытаем: «Орша — крэпасць страшная. Каб выстаяць за такім плотам, патрэбна вялікая мужнасць і вялікая лёгкадумнасць. А яны не толькі выстойвалі, але і наносілі страты ворагу».

Увогуле, важнейшай асаблівасцю прозы Караткевіча, яе фундаментам з'яўляецца наша гісторыя. Гэта заканамерна робіць такія яго буйнамаштабныя творы, як «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (1972 год, асобнае выданне) і «Каласы пад сярпом тваім» (1965 год, часопіс «Полымя», другі—шосты нумары) своеасаблівымі гістарычнымі даведнікамі.

У першым з гэтых твораў ёсць апісанне «аршанскага агню», дзякуючы якому быццам бы «... Літва аршанскае Благавешчанне доўга ўзяць не магла». Магчыма, яно нейкім чынам звязана з паведамленнем аб тым, як у 1392 годзе аршанцы, зачыніўшы браму, два дні ўпарта абараняліся ад князя Вітаўта і здаліся толькі на трэці дзень, калі той прывёў у дзеянне «агняпальны снарад».

Нам пакуль невядома, ці існаваў на самой справе абраз Маці Божай Куцеінскай. Магчымым яго прататыпам можа лічыцца абраз Казанскай Божай Маці, які захоўваўся у Куцеінскім Успенскім жаночым манастыры і ўшаноўваўся штогод 8 ліпеня багамольцамі з навакольных вёсак і нават з далёкіх паветаў Магілёўскай і Смаленскай губерняў. У 1722 годзе яго хацелі захапіць і вывезці з манастыра студэнты Аршанскага езуіцкага калегіума.

Гэты абраз упамінаецца і ў рамане «Каласы пад сярпом тваім». Тут змешчана цэлае паданне, згодна з якім абраз быў напісаны ў 15 стагоддзі ваяводам Глебам. Апошні, прывёўшы ў хрысціянства «жыхароў Сухадола і Ршэ», пастрыгся ў манахі пад імем Анфімія і напісаў два абразы Божай Маці Куцеінскай, адзін з якіх быў скапіраваны ў 17 стагоддзі куцеінскім майстрам Іпаціем.

Караткевіч, апісваючы абраз, робіць спасылку: «Гэтая ікона з Куцейны (пад Оршай) лічылася раней узорам для тых, хто пісаў іконы: «Прыгажосць невыказная».

Наколькі сур'ёзна вывучаў пісьменнік гісторыю роднага краю, наколькі добра валодаў ёю, сведчаць і наступныя эпізоды з рамана «Каласы пад сярпом тваім». Апісваючы жыццёвы шлях старога Вежы і аднаго з суседзяў і сваяка Загорскіх Кроера, ён выкарыстаў сапраўдную гісторыю жыцця князя Ксаверыя Любамірскага, апісаную гісторыкам Адамам Кіркорам у трэцім томе «Живописной России». У 1783 годзе Любамірскі абмяняў свае маёнткі ў Рэчы Паспалітай на мястэчка Дуброўну, якое належала князю Пацёмкіну. Ад'язджаючы ў Пецярбург, Ксаверый паручыў чыноўніку Лускіну выконваць любыя капрызы сваёй дачкі Клемянціны. Брат Лускіна, які быў маршалкам у Оршы, даў баль у гонар князёўны. На балі Клемянціна сустрэла і пакахала небагатага, але маладога і прыгожага памешчыка Кроера. Літаральна на другі дзень маладыя з дапамогай манахаў абвянчаліся і ўцяклі ў Магілёў. Даведаўшыся пра гэта, князь Любамірскі тэрмінова вярнуўся ў Дуброўну. Ноччу манастыр згарэў, а ў Дняпры знайшлі двух тапельцаў. Гэта былі манахі, якія вянчалі Клемянціну і Кроера.

Калі звесткі пра гэтыя падзеі дайшлі да сталіцы, імператар загадаў генерал-губернатару Пасеку асабіста расследаваць гэту справу. Губернатар вельмі любіў карты. Калі ён прыехаў у Дуброўну, Любамірскі прапанаваў згуляць з ім. Пасек выйграў шмат грошай. А ў выніку ў Пецярбург пайшла справаздача, якая сцвярджала: манастыр згарэў з-за неасцярожнага абыходжання з агнём, а манахі загінулі таксама з-за уласнай неасцярожнасці.

Пётр Кроер, якому ад князя дасталося мястэчка Любавічы, з гадамі ператварыўся ў «дэспата і эксцэнтрыка», вядомага на ўвесь край сваімі выбрыкамі. Менавіта ён двойчы запрашаў святароў і суседзяў на сваё паха-

ванне, сустракаючы гасцей у труне з келікам шампанскага ў руцэ. Калі ж ён памёр папраўдзе, ніхто ўжо не паверыў і на пахаванне не прыехаў.

А вось яшчэ адна таямнічая з'ява з гісторыі Аршаншчыны, узгаданая Караткевічам у рамане «Каласы пад сярпом тваім». Ён піша: «Прыдняпроўскія мужыкі заўсёды былі дзёрзкія, з нейкімі аж казацкімі замашкамі. Ролю рошчыны ў гэтай неспакойнай дзяжы ігралі шматлікія незалежныя ад паноў колы і групы: былыя пастухі каралеўскіх чарод, скупа ўзнагароджаныя зямлёй пры раздзеле; панцырныя баяры, ці былая памежная варта, перад якой калісьці запабягаў сам кароль; насельніцтва шматлікіх багатых гарадоў, у якіх асцерагаліся забраць магдэбургскае права; магутныя ўсепранікальныя абшчыны баркалабаўскіх і куцеянскіх старцаў».

У адным абзацы пералічаны цэлы шэраг невядомых і надзвычай цікавых гістарычных з'яў. Нас у гэтым выпадку, натуральна, цікавяць «куцеянскія старцы». Нечаканым пацвярджэннем магчымасці іх існавання стаў фрагмент з аўтабіяграфічнай аповесці К.Паустоўскага «Далекие годы».

Вось што пачуў пісьменнік, калі яму давялося пабываць на ўкраінскім Палессі на пачатку стагоддзя: «Издавна, еще со времен польского владычества в Могилеве на Днепре начала складываться община нищих и слепцов. У нищих — их звали в народе «могилевскими дедами» — были свои старшины и учителя — майстры. Они обучали вновь принятых в общину сложному своему ремеслу — пению духовных стихов, умению просить милостыню — и внушали им твердые правила нищенского общежития...

У могилевских дедов был свой язык, непонятный для окружающих. В неспокойные времена народных волнений эти нищие представляли грозную силу. Они не давали погаснуть народному гневу. Они поддерживали его своими песнями о несправедливости панской власти, о тяжкой доле замордованного сельского люда».

Караткевіч таксама ўзгадвае «магілёўскіх дзядоў» (эсэ «Летапісец»).

...Многія з найцікавейшых з'яў, падзей і асоб нашай гісторыі і, у прыватнасці, гісторыі Аршаншчыны Караткевіч вярнуў сучаснікам. Але многія старонкі яго твораў засталіся загадкамі. Яны разлічаны на будучага чытача, для якога праблемы, закранутыя ў творах пісьменніка, стануць актуальнымі і якому беларускія гістарычныя рэаліі не будуць чужымі...

Караткевіч любіў Оршу, шанаваў яе гісторыю і сучаснасць, паважаў аршанцаў, уважліва сачыў за творчасцю сваіх землякоў-пісьменнікаў. Прывяду толькі адзін прыклад. Ва ўласным архіве аршанскага празаіка Леаніда Калодзежнага захоўваюцца напісаныя рукой Караткевіча выказванні пра яго творчасць. Вось фрагменты гэтых запісаў: «Чытаў апавяданні там-сям. Можа, нешта і забылася. А тут Л.Т.Калодзежны: «Аўсяны звон» 1975. З першых слоў сімпатыя. Тым больш зямляк. Люблю я малых дзяцей, сабак. І вялікіх дзядзькоў, якія хораша пра іх пішуць... Харошая спекуляцыя на харошых пачуццях чытача. Вялікая будучыня, калі памятае чалавек, як ён у дзяцінстве маляваў ката... Разумнікі! Першая справа разумець дзіця, сабаку і каня. Якое апавяданне! Тысячы прыкладаў перад вачыма... Добрая, грунтоўная, мастацкая проза. Усё на месцы — не прыбавіць, не адбавіць».

Віктар Пятрушын, Беларуская мінуўшчына, 1997, № 2.

РАЗВІТАННЕ БЕЗ САМОТЫ (МОЙ ЗЯМЛЯК УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ)

Каб ушанаваць такога чалавека, перш за ўсё, неабходна ацаніць яго творы. Яны выспелі на глебе сваёй радзімы. Мы задумваемся: а, магчыма, кожны сапраўдны твор караніцца ў сваёй роднай зямлі? Паэт Ёган Гебел пісаў: «Мы расліны, якія — хочам мы ўсведамляць гэта ці не — павінны караніцца ў зямлі, каб, падняўшыся, квітнець у эфіры і прыносіць плён». Паэт хацеў тым самым сказаць: каб праца чалавечая прыносіла сапраўдны радасны і гаючы плён, чалавек павінен узняцца ў эфір з глыбіні сваёй роднай зямлі. Эфір тут азначае свабоднае паветра нябёс, адкрытае царства духу.

Цяпер пад пагрозай знаходзіцца сама ўкаранёнасць сучаснага чалавека. Больш таго, страта каранёў не выклікана толькі знешнімі абставінамі і лёсам. Яна адбываецца не толькі ад нядбайнасці і павярхоўнага стылю чалавечага жыцця. Страта ўкаранёнасці зыходзіць з самога духу стагоддзя, у якім мы народжаны. Калі гэта так, то ці змогуць і надалей чалавек і яго тварэнне караніцца ў плённай глебе радзімы і цягнуцца да эфіру, на прасторы нябёс і духу?

Гаворачы сёння пра Уладзіміра Караткевіча, мы думаем пра вытокі яго творчасці і карані, якімі жывіла яго радзіма. Ён нарадзіўся ў маленькім горадзе на беразе Дняпра, дзе позняй восенню ўсё яшчэ многа сонца і жоўтага лісця. Усё сваё жыццё потым ён будзе ўспамінаць гэты горад, вяртацца ў думках і наяве ў «вішнёвы сад і самую любую вуліцу з усіх, што ёсць на зямлі», адпачываць душою і набірацца сіл, каб зноў ісці па «дарозе, якой канца няма». Яго жыццё не было лёгкім. Школа, вайна, эвакуацыя, Кіеўскі універсітэт, першае каханне, адзінота і неразуменне. Усё гэта мы потым знойдзем на старонках яго кніг. Усё гэта было патрэбна, каб пісаць. Пісаць балюча, аддаючы сябе ўсім, верыць, што са старонак кніг будзе дыхаць вечнасць. Ён хацеў пісаць з дзяцінства. І з дзяцінства ў яго былі дзёрзкія думкі і мары. У кожным яго радку было жыццё: ён пісаў пра ўсё: пра Бога і вечную прагу перамен, пра горыч кахання і веліч, родную зямлю «пад белымі крыламі», яе людзей, мову, легенды і паданні. Яго героі настолькі рэальныя, што без іх жыццё здаецца няпоўным.

Ён стварыў свой свет — незвычайны і супрацьпастаўлены ўсяму навакольнаму. Дабро тут перамагае зло, а развітанне абавязкова заканчваецца сустрэчай. Ён адчуваў і разумеў красу і веліч жыцця. У кожным яго радку яно кіпела, поўнае болю і страт, кахання і нянавісці, але ўсё роўна было цудоўным і дзіўным.

Ён быў чалавекам простым, прывабным, надзеленым захапленнямі, смеласцю, смехам. Ён быў дарослым чалавекам з душою дзіцяці і вечным імкненнем да дасканаласці. Ён заўсёды ішоў крыху наперадзе ўсіх, і зорка яго свеціць нам да гэтага часу.

Яго жыццё не было лёгкім. Ці лёгка насіць усё жыццё тугу аб прывідным, далёкім, імкнуцца выявіць усё гэта ў непаўторных фарбах?! Ён пісаў пра чалавечнасць, якая спадарожнічае закаханым, і пра каханне, што народжана натхненнем.

Ён не умеў і не хацеў прыстасоўвацца да жыцця. Вандраваў, пісаў вершы, кахаў жанчын. Яго душа была поўная любові да свайго «гордага, добрага і таленавітага народа», да роднай зямлі, да роднай пявучай мовы. Яго кнігі — прызнанне ў любові да самага дарагога, бацькаўшчыны, — пішуцца і сёння. У адпаведнасці з яго прызнаннем-запаветам: «Любіце гэтую святую зямлю аддана і да канца. Іншай вам не дадзена, ды й непатрэбна».

І.К.Ігнацьева.

КАРОТКІН Сямён Міхайлавіч. Нарадзіўся 15.3.1903 г. ў в. Барсукі Аршанскага раёна. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. У 1934 г. скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі ў Мінску. З 1929 г. на адміністрацыйнай і журналісцкай рабоце. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гадоў. З 1940 г. загадчык аддзела, сакратар Сіроцінскага РК КП(б)Б. З сакавіка 1942 г. партызан, камандзір брыгады, адначасова з ліпеня 1942 г. сакратар Сіроцінскага падпольнага РК КП(б)Б. Загінуў 6.10.1942 г. ў авіякатастрофе. Яго імем названы саўгас у Шумілінскім раёне.

КАСАЛАПАЎ Якаў Ягоравіч. Нарадзіўся 1.5.1934 г. ў Оршы. Беларускі кампазітар. У 1966 г. скончыў Беларускую кансерваторыю (клас А.Багатырова). Выкладаў музычна-тэарэтычныя дысцыпліны ў Віцебскім музычным вучылішчы. Працаваў у розных жанрах. Значную ўвагу аддаваў музыцы для народных інструментаў, харавой, дзіцячай. Адметнасць яго стылю — актыўная распрацоўка музычнага фальклору Віцебшчыны. Аўтар вакальна-сімфанічнай паэмы «Белавежа» (словы Я.Пушчы, 1966), кантаты «Нараджэнне дзяржавы» (словы П.Макаля, М.Калачынскага, М.Хведаровіча, А.Бачылы, 1967), п'есы «Успенская горка» (1968) для сімфанічнага аркестра, фантазіі на тэму беларускай народнай песні для камернага аркестра (1971), «Беларускай уверцюры» для аркестра народных інструментаў (1971), цыкла апрацовак беларускіх народных песень «Аршанскі вяночак» (1979) для фартэпіяна і інш. Пісаў таксама музыку да тэатральных пастановак. Памёр 8.7.1982 г.

КОРБАН Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся 25.8.1910 г. ў г. Барань Аршанскага раёна. Беларускі паэт, сатырык, празаік. Заслужаны дзеяч культуры БССР (1970). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў на цвіковым заводзе ў Барані і суднабудаўнічым заводзе ў Ленінградзе. З 1946 г. дырэктар цвіковага завода ў Лідзе, з 1948 г. механік завода «Чырвоны Кастрычнік» у г. Барані. У 1952—71 гг. працаваў у рэдакцыі часопіса «Вожык» (з 1967 г. галоўны рэдактар). Друкаваўся з 1945 г. Аўтар баек, сатырычных і

гумарыстычных вершаў, вершаваных фельетонаў (зборнік «Мы іх ведаем», 1950; «З вецярком», 1957; «Свінні ў рэпе», 1968, і інш.). Байкі і вершы Корбана арганічна звязаны з народнай сатырай, вызначаюцца актуальнасцю тэматыкі, трапнасцю і вастрынёй, мастацкай прастатой. Пісаў гумарыстычныя апавяданні (зборнікі «Янка і санкі», 1957; «Пра жывёл і пра звяроў», 1963; «Суседні двор», 1967, і інш.). Рабіў вершаваныя подпісы да плакатаў і паштовак. На беларускую мову перакладаў творы І.Крылова, Л.Украінкі, С.Алейніка, Т.Масэнкі, А.Юшчанкі і інш. Асобныя яго творы перакладзены на рускую, украінскую і іншыя мовы. Памёр 30.11.1971 г. Яго імем названы вуліцы, а таксама ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі ў гарадах Орша і Барань.

КОСІНЕЦ Аляксандр Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1959 г. ў в. Роскі Сялец Аршанскага раёна. Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут (1976). З 1997 г. рэктар Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта. Ганаровы член Польскай акадэміі медыцыны.

КРАШАНІННІКАЎ Нічыпар Ніканавіч. Нарадзіўся 15.6.1910 г. ў в. Курманаеўка Бузулукскага павета Самарскай губерні. Даследчык Аршанскага патрыятычнага падполля.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У пачатку вайны два месяцы са спецыяльным заданнем правёў у тыле ворага, арганізоўваў дыверсіі на яго камунікацыях. Летам 1944 г. ўдзельнічаў у вызваленні Беларусі. У 1935—55 гг. у органах НКУС. У 1955—58 гг. на партыйнай рабоце ў Оршы. Каля 25 гадоў Н.Н.Крашаніннікаў даследаваў дзейнасць партыйна-камсамольскага падполля і партызанскі рух на акупіраванай Аршаншчыне, стварыў яго летапіс. Паводле яго хадайніцтва на безыменных магілах абаронцаў Радзімы з'явіліся помнікі з імёнамі загінуўшых, устаноўлены мемарыяльныя дошкі на явачных кватэрах падпольшчыкаў. Пры яго ўдзеле створаны мастацкі фільм «Гэта было ў Оршы», гісторыя падполля адлюстравана ў серыях артыкулаў «Навечна ў памяці народа», якія былі змешчаны ў мясцовай і абласной газетах.

Дакументы з архіва Н.Н.Крашаніннікава захоўваюцца ў фондах Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Віцебскага абласнога краязнаўчага музея і мемарыяльнага музея К.С.Заслонава у Оршы. Памёр 18.11.1989 г. *Г.Г.Урублеўская.*

У.І.Корбан.

Н.Н.Крашаніннікаў.

КРУКОЎСКІ Мікалай Ігнатавіч. Нарадзіўся 16.11.1923 г. ў в. Машкова Аршанскага раёна. Беларускі эстэтык і моўнавец. Кандыдат філалагічных навук (1956), дацэнт (1966). У 1950 г. скончыў БДУ. Удзельнік партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. З 1950 г. працаваў у Інстытуце моўнавнаўства АН БССР, з 1963 г. — у БДУ. Даследуе сучасную беларускую мову, займаецца праблемамі тэарэтычнай эстэтыкі. Адзін з першых выкарыстаў дыялектычную логіку і некаторыя аспекты тэорыі мностваў, тэорыі інфарматыкі і кібернетыкі да аналізу эстэтычных заканамернасцей. Аўтар прац «Рускі лексічны ўплыў на сучасную беларускую літаратурную мову» (1958), «Логіка прыгажосці» (1965), «Асноўныя эстэтычныя катэгорыі: Вопыт сістэматызацыі» (1974) і інш.

КУПАВА Мікалай Мікалаевіч. Нарадзіўся 31.1.1946 г. ў Оршы. Беларускі графік. У 1976 г. скончыў Беларускі тэатральна-мастац-



М.М.Купава.

М.К у п а в а. Вітаўт Вялікі. Акварэль.

М.К у п а в а. Партрэт В.Дуніна-Марцінкевіча. Лінагравюра. 1979.

кі інстытут. У 1976—78 гг. выкладчык, у 1990—96 гг. намеснік дырэктара Мінскага мастацкага вучылішча. У 1982—83 гг. мастацкі рэдактар часопіса «Маладосць». Удзельнік мастацкіх выставак з 1972 г. Працуе ў станковай і кніжнай графіцы, экслібрысе ў тэхніках лінарыта, акварэлі, літаграфіі.У сваіх творах распрацоўвае тэму гістарычнай і мастацкай спадчыны беларускага народа. Эмацыянальнай узнёсласцю, імкненнем да манументальнасці і эпічнасці вобразаў вызначаюцца партрэты К.Каліноўскага, Ф.Багушэвіча, Цёткі (А.Пашкевіч), К.Каганца, В.Дуніна-Марцінкевіча, Я.Купалы, Я.Коласа. Выканаў серыі работ «З вандровак па Беларусі», «Шляхамі Янкі Купалы», «Якуб Колас. Маладыя гады» і інш. Афарміў кнігі Цёткі, К.Каганца, В.Каратынскага, С.Александровіча і інш.

М.К у п а в а. Рэканструкцыя Аршанскага замка. 1987 г.

КУПАЛА Янка. Упершыню наведаў Аршаншчыну не ў 1935 г., калі ён упадабаў непаўторны куточак нашага краю — Ляўкі, а значна раней. Невядома, з якой нагоды быў пясняр 20 снежня 1918 г. ў Оршы, але менавіта тут ён напісаў верш «Спадчына». Потым наведаў Оршу ў маі 1926 г. разам з вядомымі беларускімі дзяржаўнымі дзеячамі А.Р.Чарвяковым і Я.А.Адамовічам з нагоды 20-годдзя сваёй літаратурнай дзейнасці, а таксама ў лютым 1928 г. ў час правядзення вечарыны беларускай літаратуры ў гарадскім тэатры. На вечарыне ў клубе чыгуначнікаў Я.Купала, Цішка Гартны, Міхась Зарэцкі і іншыя пісьменнікі, якія наведалі горад на Дняпры, сустрэліся з рабфакаўцамі, вучнямі і рабочымі.

Праз 7 гадоў у красавіку 1935 г. ў час творчай камандзіроўкі на чале групы пісьменнікаў Я.Купала наведаў Копыскае лясніцтва Аршанскага лясгаса, кантора якога размяшчалася ва ўрочышчы Ляўкі, пазнаёміўся і пасябраваў з ляснічым Мікалаем Ігнатавічам Шыманскім.

Ляўкі, іх прыроднае харство надзвычай спадабаліся Купалу. Паэта ўразілі непаўторныя краявіды па берагах Дняпра, карабельныя гонкія сосны, магутныя дубы. У той год адзначалася 30-годдзе творчай дзейнасці песняра, і беларускі ўрад прыняў пастанову падараваць Купалу легкавы аўтамабіль і за дзяржаўны кошт пабудаваць яму дачу. Месца выбраў сам паэт — Ляўкі. «Такі цудоўны куток, як Ляўкі, цяжка ўявіць,— успамінаў Пятрусь Броўка. — Захоплены Купала, стоячы над Дняпром, гаварыў мне:

— Ты толькі паглядзі, Петрусёк, якая веліч гэтая рака, а яна і звязвае ўсіх нас — і рускіх, і беларусаў, і ўкраінцаў».

Першае сваё ляўкоўскае лета ў 1935 г. Янка Купала жыў у хаце ляснічага Шыманскага, а на наступны год была ўжо гатова Купалава дача. Яе пабудавалі каля будынка лясніцтва, паміж чатырох велічных соснаў, якія паэт прасіў зберагчы і не пашкодзіць.

У Ляўкі абавязкова прыязджала і яго жонка Уладзіслава Францаўна, бывалі іншыя сваякі. Акрамя іх гасцямі паэта ў Ляўках былі беларускія пісьменнікі — Якуб Колас, Пятрусь Броўка, Міхась Лынькоў, Пятро Глебка, Андрэй Александровіч, літаратары з саюзных рэспублік, якія працавалі над перакладамі твораў Купалы.

Кожны год ён прыязджаў у Ляўкі на пачатку лета і заставаўся да глыбокай восені. Тут пясняр сустракаўся з блізкімі яго сэрцу людзьмі — жыхарамі вёсак Зубава, Ляўкі, Смётанка — аратымі і сейбітамі, жняямі і дояркамі, з рабочымі Копыскага кафельнага завода, вучнямі бліжэйшых школ. Гэтыя сустрэчы натхнялі песняра, тут, у Ляўках, яму асабліва плённа працавалася. Толькі за чэрвень 1935 г. Купала напісаў каля 700 паэтычных радкоў. Так званы ляўкоўскі цыкл яго паэзіі стаў з'явай не толькі беларускай, але і

Кветкі да помніка Янку Купалу ўскладае К.Я.Міхайлава, побач стаяць В.Я.Яфрэмава і К.І.Баразнова — яны помняць Купалу.

сусветнай літаратуры. Хто не ведае вершы «Лён», «Алеся», «Хлопчык і лётчык», «Вечарынка», «Госці», «Сосны» і шэраг іншых?! Гэта вершы пра шчырых і працавітых мясцовых людзей, пра захапляючыя навакольныя краявіды, і ўсе яны напісаны з якой-небудзь пэўнай нагоды. Так, верш «Лён» узнік пад уражаннем квітнеючага льнянога палетка, дзе з песнямі працавалі, палолі лён дзяўчаты. А калі аднойчы да яго завіталі калгаснікі і прынеслі на зажынкі першы сноп збожжа, дык назаўтра паэт адгукнуўся вершам «Госці»:

Ка мне ў госці з прывітаннем шчырым
І з песнямі калгаснікі прыйшлі.
Сам старшыня прыйшоў і брыгадзіры,
Настаўніца, даяркі й пастухі...
Такога гонару не меў ніколі,
Як я на гэтае зямлі жыву.
Каб так віталі мяне хлебам-солляй
І то не ў сне якім, а наяву.

Паэт любіў гуляць па беразе Дняпра, бачыў зарослыя травой акопы першай сусветнай вайны. А ў свеце зноў было неспакойна. Так нарадзіўся верш «Старыя акопы», у якім Янка Купала папярэдзіваў чалавецтва аб фашысцкай чуме, пісаў з верай, што «на іхніх землях, з іхніх генералаў знімаць пагоны будзем, шаблі і крыжы».

Апошні раз Купала прыехаў у Ляўкі 24 чэрвеня 1941 г. Палыхала вайна, і паэт збіраўся на ўсход. 30 чэрвеня ён выехаў у Маскву, развітаўшыся з Ляўкамі, як аказалася, назаўсёды.

Дача паэта згарэла 3 ліпеня 1941 г. ў час варожага артабстрэлу. Паводле ўрадавай пастановы аб увекавечанні памяці Янкі Купалы ад 2 жніўня 1945 г. дачны домік паэта быў адноўлены, у будынку былой канторы лясніцтва размясціўся філіял Літаратурнага музея Янкі Купалы. У 1962—77 гг. музей працаваў на грамадскіх пачатках, а з 1977 г. стаў дзяржаўнай установай. У 1978 г. быў створаны Купалаўскі мемарыяльны запаведнік на плошчы 19 гектараў. У 1982 г., калі адзначалася 100-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы, на дачы была адкрыта мемарыяльная экспазіцыя і пастаўлены помнік — скульптура «Восень паэта» (аўтар Анатоль Анікейчык). У склад мемарыяльна-музейнага комплексу акрамя філіяла музея і дачы ўваходзяць домік шафёра, тагачасныя гаспадарчыя пабудовы, зона масавых гулянняў, дзе як і ў Вязынцы, на радзіме Купалы, праходзяць святы паэзіі і працы.

Не зарастае сцежка ў купалаўскія пенаты. Зблізку і здалёк ідуць і едуць сюды людзі, каб дакрануцца да невычэрпнай крыніцы паэзіі песняра. Вобраз паэта назаўсёды застаўся ў памяці жыхароў Ляўкоў, Зубава, Копысі і іншых навакольных населеных пунктаў. Іх успаміны, у якіх адлюстроўваецца чалавечнасць, душэўная шчодрасць і прастата Янкі Купалы, таксама дарагія кожнаму з нас.

Успамінае Вера Якаўлеўна Яфрэмава:

«Я гатавала Купалу абеды, пакуль не прыязджала яго жонка. І мяне, кухарку, паэт садзіў разам за стол. Як карова ў нас прапала, Купала даў майму гаспадару грошай на карову. Потым, калі мы ўзбіліся на грошы, назад не ўзяў.

Хварэў наш сын. Купала спачатку прыслаў шафёра, каб завезці хлопца ў горад, а ўрэшце вырашыў паехаць сам. «Ты там не даб'ешся нічога»,— сказаў ён майму мужу...»

А вось што помніць Кацярына Емяльянаўна Міхайлава:

«Я выхавальніцай была ў дзіцячым садзе. Дык Купала падараваў нам бібліятэчку. І многа разоў, як толькі прыязджаў, прывозіў дзецям падарункі, пачастункі. Вельмі любіў дзяцей. Аднойчы быў такі выпадак. Купала з жонкай ішоў па ліпавай алеі па-над Дняпром. Побач на полі стаялі бабкі жыта. І гулялі дзеці. Купала і просіць: «Дзеці, вазьміце мяне ў гульню» (а гулялі ў хованкі). Дык Купала зняў з бабкі «шапку», сам залез унутр, і яго не знайшлі, пакуль сам не «здаўся».

Любіў Купала прыходзіць і на нашы вечарынкі (а ў нас кадрыля вельмі задорная была).

Быў такі выпадак са старшынёй калгаса. Зжалі жыта, а насоўвалася непагадзь. Як звезці жыта з поля? Старшыня пажаліўся Купалу. А той і кажа: «Хадзем на вечарынку». І што вы думаеце: звярнуўся паэт да моладзі, усе кінулі танцы і за ноч звезлі ўсё жыта...»

Помняць ляўкоўцы Купалу. Успамінаюць добрым словам, з удзячнасцю. А ўвогуле на Аршаншчыне памяць пра песняра ўвекавечана дастойна. Імем Янкі Купалы названы сярэдняя школа ў Копысі, калгас (цэнтр у Зубаве), вуліца ў Оршы.

М.Камароўскі, М.Дземідовіч.

ЛАБУНОЎ Уладзімір Архіпавіч. Нарадзіўся 16.3.1939 г. ў Оршы. Беларускі вучоны ў галіне мікраэлектронікі. Член-карэспандэнт АН БССР (1980), доктар тэхнічных навук (1975), прафесар (1977). Заслужаны вынаходнік БССР (1977). У 1961 скончыў БПІ. З 1966 г. ў Мінскім радыётэхнічным інстытуце, з 1975 г. загадчык кафедры. Навуковыя працы па пытаннях узаемадзеяння іонаў з паверхняй цвёрдага цела і яго выкарыстання для распрацоўкі тэхналагічных працэсаў у мікраэлектроніцы, па нізкатэмпературных электрахімічных і плазмавых тэхналагічных працэсах. Прэмія Прэзідыума АН СССР па мікраэлектроніцы 1978 г. У 1994 г. прызначаны надзвычайным і паўнамоцным паслом Рэспублікі Беларусь у Каралеўстве Бельгія.

ЛАСКІН Барыс Савельевіч. Нарадзіўся ў 1914 г. ў Оршы. Беларускі сцэнарыст. У 1935 г. скончыў Усесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфіі. Аўтар сцэнарыяў да кінафільмаў «Цэнтр нападзення», «Нябеснае стварэнне», «Дайце кнігу скаргаў» (з А.Галічам), «Час любіць», «Карнавальная ноч» (з У.Паляковым). Напісаў больш за 20 кніг. Многія з іх выдадзены ў Германіі, ЗША, Японіі і інш. Памёр у 1983 г. *І.К.Ігнацьева.*

МАЖЭЙКА Зінаіда Якаўлеўна. Нарадзілася 6.12.1933 г. ў Оршы. Беларускі этнамузыказнаўца. Доктар мастацтвазнаўства (1992). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1987). У 1961 г. скончыла Беларускую кансерваторыю. З 1962 г. ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Працуе ў галіне тэарэтычнай этнамузыкалогіі і практычнай фальклярыстыкі. Асноўныя даследаванні прысвечаны сістэмнай тыпалогіі беларускага песеннага фальклору, яго арэальнаму і сацыялагічнаму аспектам. Аўтар прац: «Песенная культура Беларускага Палесся» (1971), «Песні беларускага Паазер'я» (1981), «Каляндарна-песенная культура Беларусі: Вопыт сістэмна-тыпалагічнага даследавання» (1985), «Вяселле: Мелодыі» (1990, у сааўт.) і інш. Арганізатар музычна-этнаграфічных канцэртаў, падрыхтавала грампласцінкі, у т.л. «Музычны фальклор Беларускага Палесся» (Гран-пры ЮНЕСКА 1988), распрацоўвае праграмы аудыёвізуальнай антрапалогіі (сцэнарыі 6 музычна-этнаграфічных фільмаў). Дзяржаўная прэмія Беларусі 1994.

МАКСІМАЎ Ігнацій. Майстар-цаніннік 17 ст. Жыў і працаваў у г.п. Копысь (Аршанскі раён). У 1654 г. (ці 1655 г.) узяты патрыярхам Ніканам у Валдайскі Іверскі манастыр, дзе наладзіў упершыню ў Расіі выраб паліхромнай кафлі. З 1658 г. працаваў з Палубесам. З 1666 г. майстар Маскоўскай Аружэйнай палаты. Удзельнічаў у аздабленні Васкрасенскага сабора Новаіерусалімскага манастыра на Істры (у 1660—66 гг.), Пакроўскага сабора ў Ізмайлаве (да 1674 г.), царквы Грыгорыя Неакесарыйскага (да 1672 г.) у Маскве і інш.

МАЛЕНЧАНКА Рыма Фёдараўна. Нарадзілася 26.6.1935 г. ў Оршы. Беларуская актрыса, педагог. Заслужаная артыстка Беларусі (1968). У 1957 г. скончыла БДУ. З 1955 г. працуе ў Беларускім тэатры юнага гледача. Адначасова (з 1965 г.) выкладчык Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, Мінскага інстытута культуры (з 1975 г.; з 1980 г. дацэнт). Яе творчасці ўласцівы тонкі псіхалагічны аналіз вобраза, мяккая, стрыманая манера выканання, мастацкі густ, імкненне высветліць ступень маральнай чысціні сваіх герояінь, іх духоўнасць.

Акрамя роляў у дзіцячым рэпертуары яна выконвала ролі класічнага рэпертуару. Такія ролі, як Ульяна Паўлаўна («Экзамен на восень» І.Шамякіна), Марыя Антонаўна («Рэвізор» М.Гогаля), Аркадзіна («Чайка» А.Чэхава) і іншыя высока ацэнены тэатральнымі крытыкамі і прынеслі актрысе шырокае прызнанне гледача. *В.Ракіцкі.*

МАРОЗ Міхаіл Міхайлавіч. Нарадзіўся 28.11.1959 г. ў в. Беражцы Жыткавіцкага раёна. Камсамолец, які цаною свайго жыцця выратаваў людзей ад смерці. З 1974 г. вучыўся ў Аршанскім педагагічным вучылішчы. У верасні 1977 г. разам з іншымі навучэнцамі быў на ўборцы бульбы ў калгасе «Прагрэс» Дубровенскага раёна. У час работы заўважыў на транспарцёры бульбаўборачнага камбайна іржавы снарад, які рухаўся ў барабан агрэгата. Спыніць машыну было позна. Міхаіл падхапіў смяротны груз на рукі і пабег далей ад людзей. Грымнуў выбух, у выніку якога ён быў смяртэльна паранены. Урачы зрабілі ўсё, што ад іх залежала, але выратаваць Міхаіла не змаглі. Ён памёр 7.9.1977 г. За мужнасць і самаахвярнасць Мароз пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. У музеі Аршанскага педвучылішча ўстаноўлены бронза-

А.Я.Міронаў.

Б.Л.Нячаеў.

вы бюст Мароза. Яго імем названы цеплаход. Подзвігу Мароза прысвечана п'еса М.Саенка «Спытай сябе».

МІРОНАВА Кацярына Эдуардаўна. Нарадзілася 18.11.1883 г. ў Оршы. Беларуская актрыса. Заслужаная артыстка БССР (1940). Творчую дзейнасць пачала ў 1898 г. на аматарскай сцэне ў Оршы. З 1920 г. ў тэатры імя Я.Купалы. Вобразы, створаныя Міронавай, вызначаліся лірызмам, дакладнасцю і выразнасцю сцэнічнага малюнка, эмацыянальнасцю, адчуваннем індывідуальнай адметнасці характараў персанажаў. Лепшыя з іх: Паланея («Прымакі» Я.Купалы), Паўліна і маці Дрыля («Канец дружбы» і «Партызаны» К.Крапівы), пані Зямацкая, Маргарыта Лазараўна, Разалія Юльянаўна («Кастусь Каліноўскі», «Перамога», «Запяюць верацёны» Е.Міровіча), княгіня Прушынская («Панскі гайдук» Н.Бываеўскага) і інш. Памерла 15.1.1946 г.

МІРОНАЎ Аляксандр Яўгенавіч. Пісьменнік, вядомы на ўвесь свет сваімі творамі пра марскія шляхі і паходы, пра жыццё і подзвігі палярнікаў. Нарадзіўся 23.11.1910 г. ў сям'і аршанскага чыгуначніка. Але, відаць, гудкі паравозаў паклікалі будучага пісьменніка з дзяцінства ў такія неабсяжныя далі, пра якія юныя рамантыкі могуць толькі марыць.

У 1930 г. А.Міронаў як журналіст апынуўся ў Архангельску, плаваў на суднах гандлёвага флоту, бачыў не адну замежную краіну. Але самая знамянальная вяха ў жыцці Аляксандра Міронава, якая пакінула след і адбілася на яго творчасці, — удзел пісьменніка ў славутай Чэлюскінскай эпапеі 1933—34 гг. У 1932 г. ў Архангельску выйшла першая кніга А.Міронава «Марскія будні», потым «Чукоцкія навелы» (1935) і «Паход Чэлюскіна» (1935).

У Вялікую Айчынную вайну на Паўночным флоце. З 1946 г. ў Мінску. Працаваў уласным карэспандэнтам газеты «Звязда», адказным сакратаром альманаха «Советская Отчизна», начальнікам сцэнарнага аддзела кінастудыі «Беларусьфільм». Друкаваўся з 1932 г. За пасляваенны перыяд у друку выйшлі дзесяткі яго кніг (пісаў на рускай мове). Сярод іх зборнікі аповесцей і апавяданняў «Далёка на Поўначы» (1947), «Па марах, па акіянах» (1956), «Лядовая Адысея» (1966, 1978), «Праз тысячу смерцяў» (1972) і г.д. Шырока вядомы раманы пісьменніка «Караблі выходзяць у акіян» (1957), «Толькі мора наўкол» (1960, дылогія ў 1962). Нямала пісаў для дзяцей. Дзе б ні здаралася быць Андрэю Яўгенавічу, якія б моры-акіяны ён ні бараздзіў, у думках ён ніколі не пакідаў Оршу. У пісьме землякам, якое было надрукавана 25 мая 1955 г. ў газеце «Ленінскі прызыў», пісьменнік з лёгкім засмучэннем прызнаваўся, што яму вельмі хочацца пабываць у Оршы, прайсціся па родных мясцінах, сустрэцца з землякамі, да зямлі пакланіцца праху Героя Савецкага Саюза Канстанціна Заслонава. Памёр 15.12.1992 г. Узнагароджаны 3 ордэнамі, медалямі.

МЯЖЭВІЧ Уладзімір Навумавіч. Нарадзіўся 23.5.1907 г. ў пас. Якаўлевічы Аршанскага раёна. Беларускі пісьменнік, журналіст. У 1930—32 гг. вучыўся ў БДУ. У 1925—28 гг. на камсамольскай рабоце, у 1929—33 гг. — у газеце «Звязда», у 1933 г. рэдактар бягомльскай раённай газеты «Калгасны змагар», у 1934—37 гг. карэспандэнт газеты «Известия» па БССР. У 1956—67 гг. літаратурны супрацоўнік часопісаў «Вожык», «Вясёлка», «Бярозка», карэспандэнт газеты «Лесная промышленность». Друкаваўся з 1924 г. Аўтар зборнікаў апавяданняў і нарысаў: «Крок у будучыню» (1931), «Шляхам герояў» (1932), «Землякі» (1969), «Аксамітны бляск» (1971) і інш. Напісаў шмат кніг для дзяцей: «Медуначкі» (1966), «Ляcныя знаходкі» (1969), «Выдумшчыцы» (1971), «На ўсходзе сонца» (1982) і інш. Яго творчасці ўласцівы псіхалагічная дакладнасць, лірызм. Памёр 1.6.1982 г.

НЯЧАЕЎ Барыс Леанідавіч. Нарадзіўся 5.9.1945 г. У 1963 г. скончыў школу № 11 у Оршы. Працаваў у Аршанскім лакаматыў-

ным дэпо вучнем токара. Яшчэ ў час вучобы ў школе з захапленнем займаўся спортам, з'яўляўся членам добраахвотнага спартыўнага таварыства «Лакаматыў», прымаў удзел у абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы. Потым разам з бацькамі пераехаў у горад Ельск Краснадарскага краю, дзе ўладкаваўся на суднарамонтны завод. У 1964 г. быў прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў на Чарнаморскім флоце. Быў падводнікам, рыхтаваўся да паступлення ў лётнае вучылішча. У 1966 г. на падводнай лодцы, дзе ён служыў, у адным з адсекаў здарылася аварыя. Непрадбачаныя абставіны ўскладнілі сітуацыю. Патрэбен быў смелы воін, які змог бы выратаваць падводную лодку і горад. Такі чалавек знайшоўся. Ім быў Барыс Нячаеў. Лодка і горад былі выратаваны, але сам Нячаеў загінуў.

За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. У Севастопалі Барысу Нячаеву пастаўлены помнік. Яго імем названы буксір на Чорным моры. Пра подзвіг Нячаева расказваецца ў кнізе «Чарнаморцы карчагінскай загартоўкі». Штогод у Оршы праводзяцца спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы на прыз Барыса Нячаева, а ў сярэдняй школе № 11 у дзень яго нараджэння — турыстычны злёт. *Г.А.Каралёў.*

М.С.Палянкоў.

ПАЛЯНКОЎ Мікалай Сцяпанавіч. Нарадзіўся 19.12.1921 г. ў г. Барань Аршанскага раёна. Беларускі жывапісец. Член Саюза мастакоў Беларусі (1965). Працаваў на Пуцілаўскім заводзе ў Петраградзе, потым аднаўляў ліцейную вытворчасць у Оршы, Барані.

Радасць мастацкай творчасці юнак спазнаў яшчэ ў сярэдзіне 1930-х гадоў. Яго работы эк-

М.Палянкоў. У звальненні. 1965.

М.Палянкоў. Бярозавы сок. 1969.

спанаваліся на міжнароднай дзіцячай выстаўцы ў Парыжы. У 1938—41 гг. вучыўся ў Віцебскім мастацкім вучылішчы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У адным з жорсткіх баёў пада Ржэвам танк, які ён вёў, быў падбіты, а сам, цяжка паранены, трапіў у палон. Быў вязнем канцлагераў у Беларусі, Прыбалтыцы, Польшчы, Чэхаславакіі. Некалькі разоў спрабаваў уцячы, але няўдала. Пашанцавала толькі ў Чэхаславакіі. Жыццё выратавалі чэшскія патрыёты. Потым зноў былі ваенныя дарогі. Пасля вайны прыехаў у Віцебск. На месцы вучылішча ўбачыў адны руіны. Мастак успамінаў: «Я стаяў на роднай зямлі і плакаў. Я быў жывы. Я думаў пра тое, што калі лёсам мне было наканавана выжыць, то я ў вечным даўгу перад загінуўшымі». Пазней, даведаўшыся пра жудасныя страты, якія панеслі выкладчыкі і студэнцкі калектыў у гады вайны, напісаў карціну «Палотны, мадэлі і мастакі, якія ляжаць у зямлі».

У 1949 г. скончыў Растоўскае мастацкае вучылішча імя М.Грэкава. Працаваў у Віцебскіх мастацкіх майстэрнях. З 1958 г. жыве ў Гомелі. Удзельнічае ў мастацкіх выстаўках. Вядомасць мастаку прынесла карціна «У звальненні». Выпрабаванні, якія выпалі на долю Палянкова ў гады Вялікай Айчыннай вайны, прадвызначылі галоўны накірунак творчасці. Многія яго жывапісныя палотны прысвечаны мужнасці, гераізму, самаадданасці, самаахвярству прадстаўнікоў абпаленага вайной пакалення. Сярод яго твораў тэматычныя карціны «Вызваленне» (1965), «Бярозавы сок» (1969), «Франтавы сон» (1975), «На роднай зямлі» (1975), «Салдацкая песня» (1985).

М.Палянкоў — мастак шырокага дыяпазону. Ён вядомы і як аўтар лірычных пейзажаў. Творам Палянкова ўласцівы выразны колер, гармонія адценняў. Каля двух дзесяткаў работ мастак перадаў у дар г. Орша. Вынікам яго паездак у Чарнобыльскую зону сталі 90 партрэтаў супрацоўнікаў унутраных спраў, якія прынялі ўдзел у ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. *В.М.Сіднякова.*

ПЛАТОНАЎ Уладзімір Пятровіч. Нарадзіўся 1.12.1939 г. ў пас. Стайкі Аршанскага раёна. Беларускі матэматык. Акадэмік АН БССР з 1972 г. (член-карэспандэнт з 1969), акадэмік АН СССР (1987), доктар фізіка-матэматычных навук (1967), прафесар (1968). Скончыў БДУ (1961). З 1963 г. старшы выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры алгебры і тапалогіі БДУ. З 1971 г. загадчык лабараторыі Інстытута матэматыкі АН БССР, у 1977—92 гг. дырэктар гэтага інстытута. У 1987—92 гг. прэзідэнт АН Беларусі. Прэмія Ленінскага камсамола 1968, Ленінская прэмія 1978, прэмія Гумбальта (1993, ФРГ). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1979).

РАМАНОЎСКІ Пётр Міхайлавіч. Нарадзіўся 21.9.1919 г. ў Оршы. Беларускі жывапісец. У 1938 г. скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча. Як адзін з лепшых студэнтаў быў накіраваны ва Усерасійскую Акадэмію мастацтваў, але скончыць яе не давялося. Пача-

П.М.Раманоўскі.

лася Вялікая Айчынная вайна. З чэрвеня 1944 г. на фронце. У рэчавым мяшку салдата заўсёды былі алоўкі і папера. Ён шмат маляваў, перш за ўсё сваіх баявых таварышаў. У 1948 г. скончыў Ленінградскі інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І.Я.Рэпіна. У 1948—54 гг. выкладчык Мінскага мастацкага вучылішча. У мастацкіх выстаўках удзельнічаў з 1949 г. Працаваў у галіне сюжэтна-тэматычнай карціны. Яго палотны «На канікулах» (1951), «Сяброўкі» (1952), «Уборка капусты» (1958) увайшлі ў залаты фонд беларускага пасляваеннага мастацтва. Яго творчасць ішла ад рэчаіснасці, была напоўнена жыццёвай праўдай.

Мастака заўсёды захаплялі беларускія краявіды. Вынікам яго працы ў жанры пейзажа сталі цудоўныя палотны «Жыта» (1960), «Зямля кліча» (1961), «Залатая восень» (1963), «Зімовы пейзаж», «Над Нёманам», «Возера Сенеж» і інш.

П.М.Раманоўскі вядомы і як таленавіты партрэтыст. Ён аўтар такіх вядомых партрэтаў, як «Сын» (1967), «Мастак А.Шаўчэнка» (1970), «Паэт А.Русак» (1975) і інш.

У аматараў аршанскай даўніны асаблівую цікавасць выклікаюць работы мастака 1946 г.: «Орша, 1946 год», «Дняпро», «Пакроўская царква», «Ільінская царква», якія даюць уяўленне пра горад у першыя пасляваенныя гады. Шмат яго работ знаходзіцца ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Амаль паўсотні карцін прынесены ў дар г. Орша. Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Памёр 23.9.1977.

Т.Г.Ігнацьева.

САДКОВІЧ Мікалай Фёдаравіч. Нарадзіўся 21.1.1907 г. ў в. Вусце Аршанскага раёна. Кінадраматург, кінарэжысёр, беларускі пісьменнік. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1944). У 1928 г. скончыў рэжысёрскі факультэт Дзяржаўнага тэхнікума кінематаграфіі ў Маскве. Да 1945 г. рэжысёр і сцэнарыст на кінастудыях Масквы, Адэсы, Кіева, Ташкента. У 1946—47 гг. і з 1950 г. міністр кінематаграфіі БССР, у 1953—56 гг. намеснік міністра культуры БССР. Працаваў галоўным рэдактарам і рэжысёрам Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў (Масква). Рэжысёр мастацкіх і дакументальных фільмаў «Шчаслівыя кольцы» (1929), «Песня пра першую дзяўчынку» (1930 г., абодва сумесна з рэжысёрам Л.Голубам), «Шумі, гарадок» (1939), «Майская ноч» (1940), «Вызваленне Савецкай Беларусі» (1945) і інш. За пастаноўку фільма «Дэмакратычная Германія» (сумесна з «Дэфа») у 1951 г. прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. Аўтар сцэнарыяў і пастаноўшчык фільмаў «Міколка-паравоз» (з М.Лыньковым, 1957), «Так мы жывём» (1958), «Наша зямля» (1960), «Доля жаночая» (1967), «Я, Францыск Скарына» («Беларусьфільм», 1970).

П.Раманоўскі. Сын. 1967.

М.Ф.Садковіч вядомы і як празаік. Першыя творы апублікаваў у 1934 г. Напісаў раманы «Георгій Скарына» (сумесна з Я.Львовым, 1951) і «Мадам Любоў» (1966), «Аповесць аб ясным Стахоры» (1956) і інш. Яго творам уласцівы дынамізм сюжэта, арыгінальнасць кампазіцыі і каларытнасць персанажаў. Памёр 16.8.1968 г. *І.К.Ігнацьева.*

САЛАВЕЙ Ларыса Фёдараўна. Нарадзілася 22.7.1934 г. ў Оршы. Беларускі мастацтвазнавец. Заслужаны настаўнік БССР

Л.Ф.Салавей.

(1975). Член Беларускага саюза мастакоў з 1984 г. У 1968 г. скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. У 1966—81 гг. выкладчык прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча, у 1981—87 гг. сакратар праўлення Беларускага саюза мастакоў, у 1988—92 гг. намеснік дырэктара Дырэкцыі мастацкіх выставак Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, у 1992—97 гг. намеснік дырэктара многафункцыянальнага выставачнага комплексу «На ростанях». Друкуецца з 1970 г. Аўтар шэрагу артыкулаў па праблемах беларускага выяўленчага мастацтва, эстэтычнага выхавання і музеязнаўства. Ёй належаць манаграфіі пра беларускіх мастакоў Р.Кудрэвіч (1974), М.Казакевіча (1987), І.Рэя (1990), альбом «А.Гугель і Р.Кудрэвіч» (1994), творчыя партрэты мастакоў Л.Панамарэнкі, У.Кожуха, Я.Зайцава, А.Кузьміча, В.Целеша, І.Міско і іншых.

Л.Ф.Салавей — арганізатар выставак беларускіх мастакоў за мяжой, а таксама заснавальніца многіх карцінных галерэй у рэспубліцы. Аўтар каталогаў выставак: «9 мастакоў з Беларусі» (выд. ў 1993 г., Італія), «7 мастакоў з Беларусі» (выд. ў 1994 г., Мінск), «Каталог І міжнароднага пленэру па жывапісе імя Бялыніцкага-Бірулі» (1996) і інш.

СВІРЫДЗЁНАК Анатоль Іванавіч. Нарадзіўся 7.7.1936 г. ў Оршы. Беларускі вучоны ў галіне механікі металапалімерных сістэм. Акадэмік АН БССР з 1986 г. (член-карэспандэнт з 1984), доктар тэхнічных навук (1976), прафесар (1981). Скончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту (1959). З 1959 г. ў Аддзеле механікі палімераў АН БССР, з 1982 г. дырэктар. З 1990 г. дырэктар Аддзела праблем рэсурсазберажэння НАН Беларусі. Дзяржаўная прэмія Беларусі 1972 г. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1981), медалямі.

СІПАКОЎ Янка (Іван Данілавіч). Нарадзіўся 15.1.1936 г. ў в. Зубрэвічы Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Беларускі пісьменнік. Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь (1997). Скончыў Зубрэвіцкую сярэднюю школу (1954) і Беларускі дзяржаўны універсітэт (1960). Працаваў у Шклоўскай раённай газеце (1954—55), у часопісах «Вожык» (1960—73) і «Маладосць» (1973—93), у выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя» (1993—97). З 1997 г. — загадчык аддзела культуры часопіса «Беларусь».

Выдаў кнігі паэзіі «Сонечны дождж» (1960), «Лірычны вырай» (1965), «Дзень» (1968), «З вясны ў лета» (1972), «Веча славянскіх балад» (1973, дапоўненае выданне 1988), «У поўдзень, да вады» (1976), «Вочы ў вочы» (выбранае, 1978), «Усміхніся мне» (1984), «Ахвярны двор» (1991).

Аўтар кніг прозы «Па зялёную маланку» (1971), «Крыло цішыні» (1976), «Жанчына сярод мужчын» (1980), «Усе мы з хат» (1982), «Спадзяванне на радасць» (1983), «Пяць струн» (1984), «Сад людзей» (1985), «Журба ў стылі рэтра» (1990), кнігі прытчаў «Тыя, што ідуць» (1993), кнігі фантастыкі «Падары нам дрэва» (1997). Выйшлі з друку чатыры кнігі яго гумарыстычных твораў — іранесак, гумарэсак: «Лысы юбілей» (1965), «Плюс на мінус» (1973), «Ланцугі для мух» (1980), «Пятніца ў суботу» (1988). Двойчы выдаваліся «Выбраныя творы» ў двух тамах (1985 і 1995—97).

Пераклаў на беларускую мову кнігі паэзіі — «Лісце травы» Уолта Уітмена (1978), «Турэмны дзённік» Хо Шы Міна (1985), «Санеты смутку» Францэ Прэшарна (1987), «Вершы ў прозе» Івана Тургенева. Выйшла кніга выбраных перакладаў «На волю птушку выпускаю» (1989).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я.Купалы 1976 за кнігу паэзіі «Веча славянскіх балад».

СТАХОВІЧ Алесь (Аляксандр Іосіфавіч). Нарадзіўся 3.7.1907 г. ў в. Кашына Аршанскага раёна. Беларускі пісьменнік. З 1923 г. на камсамольскай і партыйнай рабоце, з 1938 г. адказны сакратар часопіса «Полымя

І.Д.Сіпакоў.

рэвалюцыі». Друкаваўся з 1928 г. У Вялікую Айчынную вайну супрацоўнічаў у армейскім друку. Аўтар зборніка апавяданняў «Маленькія героі» (1939, для дзяцей), аповесці «Пампей Шчупак» (1940), раманаў «Пад мірным небам» (1947—49) і «Шырокія гарызонты» (1952) пра жыццё беларускай вёскі даваеннага і пасляваеннага перыядаў. Тэме партызанскай барацьбы на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну прысвечана аповесць «Шумяць лясы» (1944). Пераклаў на беларускую мову «Аповесць аб сапраўдным чалавеку» Б.Палявога. Творы А.Стаховіча выдадзены на рускай і польскай мовах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, 2 ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі. Памёр 7.2.1956 г.

СЦЕПАНЕНКА Аляксандр Васілевіч. Нарадзіўся 5.10.1938 г. ў Оршы. Беларускі вучоны ў галіне апрацоўкі металаў. Акадэмік АН БССР з 1986 г. (член-карэспандэнт з 1980), доктар тэхнічных навук (1974), прафесар (1977). Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР (1988). Скончыў БПІ (1961). З 1963 г. у Беларускім політэхнічным інстытуце, з 1976 г. прарэктар. З 1987 г. віцэ-прэзідэнт, з 1992 г. загадчык аддзела Фізіка-тэхнічнага інстытута НАН Беларусі. Дзяржаўная прэмія Беларусі 1984 г. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1981).

ТКАЧОНАК Анатоль Аляксеевіч. Нарадзіўся 14.3.1922 г. ў в. Селішча Аршанскага раёна. Беларускі мастак. Вучыўся ў Віцебскім мастацкім вучылішчы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1948 г. Працаваў у станковым жывапісе і графіцы, пераважна ў жанры пейзажа. Асноўныя творы: кампазіцыі «У партызанскай зоне», «У акупіраваным Віцебску», «Сафійскі сабор у Полацку», «Лясы Полаччыны» і інш. Памёр 13.11.1994 г.

ТРУШКО Леанід Ігнатавіч. Нарадзіўся 4.3.1938 г. ў Оршы. Беларускі акцёр. Заслужаны артыст БССР (1986). У 1961—66 гг. удзельнік мастацкай самадзейнасці Аршанскага народнага тэатра Палаца культуры льнокамбіната. З 1967 г. працуе ў Беларускім тэатры імя Я.Коласа. Мастацтва акцёра адметна глыбінёй псіхалагічнай распрацоўкі, бытавой дакладнасцю, ідэйнай мэтанакіраванасцю вобразаў. Сярод лепшых роляў Дзерваед, Андрэй Буслай і Бацька («Радавыя», «Парог» А.Дударава), Сырадоеў («Трыбунал» А.Макаёнка), Салавейчык («Амністыя» М.Матукоўскага), Мікіта («Улада цемры» Л.Талстога), Эйліф («Матухна Кураж і яе дзеці» Б.Брэхта), Лагуцін («Сталявары» Г.Бокарава), Максім («Стары дом» А.Казанцава), Дарафей («Званы Віцебска» У.Караткевіча) і многія іншыя.

ЦІВА Міхаіл Дзям'янавіч. Нарадзіўся 12.9.1939 г. ў в. Смаляны Аршанскага раёна. Беларускі вучоны. Кандыдат філасофскіх навук, член Саюза журналістаў. Скончыў БДУ. Са студзеня 1978 г. галоўны рэдактар часопіса «Веснік БДУ». Памёр 9.9.1985 г. Узнагароджаны медалямі, двума Ганаровымі граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі.

ШАМАТУЛЬСКІ Барыс Іванавіч. Нарадзіўся 3.1.1935 г. ў в. Сенькава Магілёўскай вобласці. У 1937 г. сям'я пераехала ў Оршу. Скончыў Крамянчугскае ваенна-паветранае вучылішча. 22.7.1969 г. самалёт, на якім маёр Б.І.Шаматульскі выконваў свой палёт, пацярпеў аварыю. Выратоўваючы сяло Каленікі (Чаркаская вобласць), ён загінуў. На месцы гібелі адважнага лётчыка пастаўлены абеліск. Узнагароджаны пасмяротна ордэнам Чырвонай Зоркі. *В.П.Лютынскі.*

ШАСТОЎСКІ Кім Фёдаравіч. Нарадзіўся 2.10.1935 г. ў в. Ляўкі Аршанскага раёна. Беларускі жывапісец. У 1965 г. скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. У 1970—79 гг. выкладчык Мінскага мастацкага вучылішча. У мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1967 г. Асноўная тэма творчасці — стваральная праца і гераічнае мінулае беларускага народа. У яго лепшых работах вобразнае абагульненне жыццёвых з'яў, шчырасць пачуццяў, колеравая рытміка. Аўтар тэматычных карцін «На вытворчасці. Кавалі» (1967), «Выпрабавальнік» (1972), «Развітанне» (1973), «Янка Купала ў Ляўках», «Першы настаўніцкі з'езд» (прысвечана Я.Коласу, 1982), «1944. Пад Оршай» (1984) і інш. Сярод яго твораў вылучаюцца лірычныя пейзажы «Над Дняпром» (1966), «Восеньскі матыў» (1973), «Вечар. На начлег» (1974), «Лета» (1975), «Май. Бэз» і «Восень» (1976), «Летні дзень» (1979), «Браслаўскія далі» (1984), партрэты «Хлопчык каля акна» (1975), «Ян у вёсцы» (1976), Героя Сацыялістычнай Працы А.Дз.Пісаравай (1983), Героя Савецкага Саюза М.М.Зяленкіна (1985), «Косця» (1986) і інш.

Мастак С.С.Шаўроў.

ШАЎРОЎ Сямён Сцяпанавіч. Нарадзіўся 15.8.1916 г. ў Оршы. Беларускі самадзейны майстар разьбы па дрэве. Працаваў электразваршчыкам на чыгунцы, потым мастаком-афарміцелем на заводзе «Легмаш» у Оршы. Удзельнік мастацкіх выставак з 1963 г. На першай выстаўцы былі прадстаўлены 2 яго работы — «Тры багатыры» і «Канёк-гарбунок». З таго часу ніводная выстаўка разьбяроў па дрэве не абыходзіцца без работ С.С.Шаўрова. Тэматыка твораў: фальклорныя, літаратурныя, казачныя сюжэты — «Баба Яга і чорт» (1964), «Гусляр» (1970), «Лявоніха» і «Жалейка» (1972), гераічнае партызанскае мінулае рэспублікі — «Партызан» (1972), «Воргі» (1974), народны побыт — «Сакрэт» (1964), «Сельскія музыканты» (1973), прырода — «Лось і ласіха» (1972), «Барс» (1981), «Дзік» (1982) і многія іншыя. У яго творах многа гумару, любові да жыцця. Героі іх — людзі, з якімі мастак сябраваў ці бачыў у дзяцінстве. Напрыклад, у скульптурнай групе «Каляды» ён увасобіў усё, што бачыў у дзяцінстве, — і адзенне, і абутак, і манеру трымацца ў вясёлай кампаніі. Тонка і выразна перадае ён рысы кожнага героя, дакладна падмячае і адлюстроўвае адценні настрою.

Ёсць у С.С.Шаўрова і манументальныя драўляныя кампазіцыі. У 1982 г. да 100-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы ён зрабіў з дрэва стэлу вышынёй 6,5 м, якую ўстанавілі на плошчы Юнацтва ў Гродне. Яшчэ адна скульптурная група па творах Купалы была зроблена з дубу вышынёй 4 м для жыхароў Брэста. У 1992 г. ў Оршы адкрыты Дом-музей драўлянай скульптуры С.С.Шаўрова. Каля 50 яго работ захоўваюцца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. З самабытнай творчасцю разьбяра знаёмы аматары мастацтва Германіі, Канады, Францыі і іншых краін.

І.Касоўская.

ШЧАРБАКОЎ Васіль Карпавіч. Нарадзіўся 27.2.1898 г. ў в. Дубраўка Аршанскага раёна. Беларускі гісторык. Акадэмік АН БССР (1931), доктар гістарычных навук. Скончыў Харкаўскую ВПШ (1923). Удзельнік грамадзянскай вайны. З 1923 г. на партыйнай, педагагічнай, навуковай рабоце. У 1931—35 гг. віцэ-прэзідэнт АН БССР, у 1935—37 гг. неадменны (вучоны) сакратар АН БССР, з 1931 г. намеснік дырэктара, у 1936—37 гг. дырэктар Інстытута гісторыі АН БССР. У 1937 г. арыштаваны і прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957 г. Асноўныя працы: «Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі і белапольская акупацыя» (1930), «Нарыс гісторыі Беларусі» (частка 1, 1934), «Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі» (1934) і інш. Памёр 29.6.1938 г.

ШЫНКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч. Нарадзіўся 3.4.1956 г. ў Оршы. Фатограф-краязнавец. Працуе мантажнікам радыёапаратуры, рэгуліроўшчыкам радыёэлектроннай апаратуры на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» у г. Барань. З юнацкіх гадоў захапіўся фатаграфіяй, здымаў памятныя мясціны Аршаншчыны. У 1984 г. ў часопісе «Моделист-конструктор» быў апублікаваны яго артыкул пра тэхніку каляровай фатаграфіі. З 1986 г. друкуе ў мясцовай газеце матэрыялы пра помнікі

Аршаншчыны з суправаджэннем іх сваімі фатаграфіямі. Выдаў кнігу «Аршанская даўніна» (1992), буклет пра Аршанскі Куцеінскі манастыр (1988), брашуры «Аршаншчына старажытная» (1991), «Куцеінская лаўра. Старонкі гісторыі» (1992), «Орша: погляд у мінулае» (1992), «Аршаншчына ў адлюстраваннях» (1994) і інш.

ШЭВЕРАЎ Аляксандр Каністратавіч. Нарадзіўся 23.1.1938 г. ў Оршы. Беларускі мастак. Скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча (1958), Маскоўскі паліграфічны інстытут (1968). Удзельнік мастацкіх выставак з 1968 г. Выкладаў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (1971—80). Працуе ў кніжнай графіцы. Член Беларускага саюза мастакоў. Асноўныя творы: «Казкі дзядзечкі Рымуса» Дж.Харыса, «Героі Элады», «Жанчына сярод мужчын» Я.Сіпакова і інш. Жыве ў Мінску.

ЯЛУГІН Эрнест Васілевіч. Нарадзіўся 19.11.1936 г. на ст. Асінаўка Аршанскага раёна (цяпер у складзе Дубровенскага). Беларускі пісьменнік. Працаваў у крычаўскай і мсціслаўскай раённых газетах, шматтыражцы ў Салігорску. У 1962 г. скончыў БДУ. З 1961 г. літсупрацоўнік, загадчык аддзела, адказны сакратар газеты «Знамя юности», у 1969—72 гг. карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва», з 1976 г. супрацоўнік часопіса «Неман», у 1978—90 гг. намеснік, галоўны рэдактар газеты «Наша слова».

Піша на рускай і беларускай мовах. Сярод яго твораў аповесці «Мсціслаўцаў посах» (1971), «Сіндбад вяртаецца» (1988), «Апошні князь» (1986), «Толькі камяні» (1989), раманы «Астравы» (1975), «Год-другі ў Алжыры» (1986) і інш. Асноўная тэматыка творчасці — гісторыя радзімы і яе ўплыў на духоўнае развіццё асобы. Аўтар нарысаў пра дзеячаў беларускай літаратуры і культуры В.Быкава, А.Мальдзіса, А.Міронава і іншых, а таксама сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Мсціслаў: звенні часу» (1984), «Без эпітафіі» (1990).

ЯРМОЛЕНКА Мікалай Фёдаравіч. Нарадзіўся 29.1.1900 г. ў в. Клюкаўка Аршанскага раёна. Беларускі хімік. Акадэмік АН БССР з 1947 г. (член-карэспандэнт з 1936), доктар хімічных навук (1935), прафесар (1931). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1949). Скончыў 2-і Маскоўскі універсітэт (1924). У 1924—38 гг. выкладчык, загадчык кафедры неарганічнай хіміі БДУ. Адначасова ў 1932—38 гг. і з 1944 г. загадчык лабараторыі калоіднай хіміі Інстытута хіміі АН БССР, у 1959—72 гг. загадчык лабараторыі Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі АН БССР. Адначасова ў 1946—53 гг. і ў 1956—69 гг. акадэмік-сакратар Аддзялення фізіка-матэматычных і тэхнічных навук і Аддзялення хімічных і геалагічных навук АН БССР (з 1963). У 1965—72 гг. галоўны рэдактар часопіса «Весці АН БССР. Серыя хімічных навук». Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1959, 1961), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1944, 1954), медалямі. Памёр 10.6.1972 г.

Наш боль — Афганістан

АПЕКА Анатоль Пятровіч. Нарадзіўся 4.6.1960 г. ў в. Дзевіна Аршанскага раёна. У 1977 г. скончыў Клюкаўскую СШ, у 1978 г.— Высокаўскае ПТВ № 12. Восенню 1978 г. Аршанскім гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. У 1983 г. скончыў Кіеўскае вышэйшае агульнавайсковае камандное вучылішча. Служыў у Беларускай ваеннай акрузе. У 1985 г. накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 93 991, быў камандзірам разведроты. Старшы лейтэнант А.П.Апека загінуў 8.10.1986 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў в. Дзевіна. За мужнасць і гера-

А.П.Апека.

І.П.Арлоў.

Г.І.Барышаў.

Г.В.Васюковіч.



Г.В.Вярбіцкі.

ізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

АРЛОЎ Ігар Паўлавіч. Нарадзіўся 30.10.1964 г. ў пас. Ранцава Таржокскага раёна Цвярской вобласці. У 1980 г. скончыў СШ № 17, у 1983 г. — ПТВ № 122 у Оршы. Працаваў токарам на заводзе «Чырвоны барацьбіт». 25.4.1984 г. Аршанскім гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. У кастрычніку 1984 г. накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 35 919, быў вадзіцелем узвода сувязі парашутна-дэсантнага батальёна. Радавы І.П.Арлоў загінуў 23.3.1985 г. Пахаваны ў в. Савішчана. За мужнасць і гераізм узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

...У той дзень І.П.Арлоў у складзе калоны вяртаўся на базу пад Кабулам. Машына яго ішла чацвёртай, у ёй знаходзілася 6 чалавек, у тым ліку начальнік штаба батальёна. Машына падарвалася на процітанкавай міне, усе шасцёра воінаў загінулі.

БАРЫШАЎ Генадзь Іванавіч. Нарадзіўся 21.3.1956 г. ў г. Джатыгора Кустанайскай вобласці (Казахстан). У 1974 г. скончыў СШ № 14 у Оршы. 1.8.1974 г. Аршанскім аб'яднаным гарваенкаматам накіраваны ва Ульянаўскае вышэйшае ваенна-тэхнічнае вучылішча імя Багдана Хмяльніцкага. У 1978 г. пасля заканчэння вучылішча служыў у Групе савецкіх войск у Германіі ў вайсковай часці палявая пошта 77 107, быў намеснікам камандзіра мантажнай роты. У 1981—84 гг. праходзіў службу ў Кіеўскай ваеннай акрузе ў вайсковай часці 51 976, быў камандзірам мантажнай роты. У лістападзе 1984 г. накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 41 447, быў камандзірам лінейнай роты. 29.4.1985 г. капітан Г.І.Барышаў у баі быў цяжка паранены і памёр. Пахаваны ў Оршы на гарадскіх могілках. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

ВАСЮКОВІЧ Генадзь Васілевіч. Нарадзіўся 3.10.1960 г. ў в. Чарніца 2-я Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці. Вучыўся ў Бягомльскай, потым Пастаўскай школах-інтэрнатах. Працаваў лесарубам у Бярэзінскім лясніцтве. У маі 1980 г. Докшыцкім райваенкаматам Віцебскай вобласці прызваны ў рады Узброеных Сіл. Службу праходзіў у воінскай часці г. Хімкі, потым быў пераведзены на касмадром Байканур (Казахстан), пасля вучыўся ў школе прапаршчыкаў у Мінску. З 1982 г. праходзіў службу ў званні прапаршчыка ў г.п. Ветрына Полацкага раёна Віцебскай вобласці. У 1984 г. накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 53 336, быў старшыной разведвальнай роты. 13.4.1986 г. ў час баявой аперацыі прапаршчык Г.В.Васюковіч быў цяжка паранены і памёр. Пахаваны ў Оршы на могілках Ліпкі. За мужнасць і геразім пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

ВЯРБІЦКІ Генадзь Віктаравіч. Нарадзіўся 4.1.1965 г. ў в. Масюкі Аршанскага ра-

ёна. У 1980 г. скончыў Шыбекаўскую васьмігадовую школу. Працаваў у калгасе «Чырвонае аб'яднанне». 29.9.1983 г. Аршанскім гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Службу праходзіў у г. Іалатань (Туркменістан). 16.12.1983 г. накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 71 176, быў кулямётчыкам. 18.2.1984 г. радавы Г.В.Вярбіцкі загінуў пры выкананні службовых абавязкаў. Пахаваны ў в. Масюкі. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа», Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

ГЛАДКІ Канстанцін Віктаравіч. Нарадзіўся 12.2.1967 г. ў Оршы. У 1982 г. скончыў 8 класаў Аршанскай сярэдняй школы № 16, у 1985 г. — Аршанскі тэхнікум чыгуначнага транспарту. У 1985 г. Аршанскім гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Службу праходзіў у г. Батумі ў вучэбным цэнтры «Алхашэні». У лютым 1986 г. накіраваны ў Афганістан у г. Кандагар, вайсковая часць палявая пошта 96 044, быў старшым вадзіцелем. Радавы К.В.Гладкі загінуў 29.11.1986 г. пры выкананні баявога задання. Увесь экіпаж падарваўся на міне. Пахаваны ў в. Ерашэвічы. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КРАСОЎСКІ Міхаіл Аляксандравіч. Нарадзіўся 6.3.1955 г. ў в. Лучыншчына Аршанскага раёна. У 1972 г. скончыў Браздзечынскую СШ і паступіў у Ташкенцкае вышэйшае ваеннае танкавае камандное вучылішча, пасля заканчэння якога служыў у Адэскай ваеннай акрузе. 4.11.1981 г. пераведзены ў Туркестанскі ваенны округ. 18.11.1981 г. накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 77 787. Старшы лейтэнант М.А.Красоўскі загінуў у баі 3.11.1982 г. Пахаваны ў в. Браздзечына. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

З дзённікавых запісаў М.А.Красоўскага за 1982 г.

1 студзеня.

Новый 1982 год встречаю в горах при несении боевого дежурства. Вот нас четверо в палатке. Погода совсем не та, как на Родине. Это может почувствовать только тот, кто находится здесь. Ветер качает палатку так, что, кажется, вот-вот снесет. Вспомнили родных, мысленно каждый поздравил.

К.В.Гладкі.

М.А.Красоўскі.

2 студзеня.

Наступил второй день нового года. Вот уже второй месяц, как я на афганской земле. Погода удивительно изменчива — то солнце светит, то дождь. Привезли почту. Писем сегодня не получил. Жизнь идет без происшествий и новостей. Вот и наступает вечер. Снова все четверо в палатке. Слушаю радио...

4 студзеня.

17.00. Привезли почту. Слышу голос — это, наверное, доставлено и мне письмо с Родины. Как радостно получить его здесь — всей душой оказываешься дома...

5 студзеня.

День пятый. Как хорошо сегодня ранним утром. Время 6 часов. Вокруг снежные вершины гор... Ребята уезжают сопровождать колонну. И никто не может знать, что может случиться в дороге.

Дорогой были обстреляны из гранатометов.

12 студзеня.

День двенадцатый — подготовка к совершению марша. Вот и начинается новая жизнь в боевой обстановке. Первый раз придется встретиться с врагом лицо в лицо. Вот вроде бы и все, что можно предполагать заранее. То, что «наканавана» в жизни, то должно сбыться...

А.В.Круглоў.

С.С.Крыўко.

А.М.Меліхаў.

В.С.Набееў.

КРУГЛОЎ Аляксандр Віктаравіч. Нарадзіўся 20.11.1957 г. ў в. Наваселле Аршанскага раёна. У 1975 г. скончыў Балбасаўскую СШ. Працаваў слесарам у вайсковай часці 21 656. З красавіка 1976 г. вучыўся ў Віцебскім авіяцыйным цэнтры ДТСААФ. Атрымаў спецыяльнасць лётчыка верталёта. Працаваў радыёмеханікам у вайсковай часці 21 656. 28.11.1978 г. Аршанскім гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Службу праходзіў у Беларускай ваеннай акрузе. У чэрвені 1982 г. накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 22 630, быў штурманам звяна — лётчыкам-аператарам. 11.9.1982 г. старшы лейтэнант А.В.Круглоў загінуў у баі. Пахаваны ў пас. Балбасава. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

КРЫЎКО Сяргей Сяргеевіч. Нарадзіўся 18.3.1964 г. ў в. Смаляны Аршанскага раёна. У 1979 г. скончыў 8 класаў Смалянскай СШ, у 1983 г. — Смалянскі саўгас-тэхнікум. 10.5.1983 г. Аршанскім гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Службу праходзіў у г. Ашгабат (Туркменістан), пасля быў накіраваны ў Афганістан. 29.10.1984 г. падраздзяленне, у якім знаходзіўся радавы С.С.Крыўко, было накіравана на аказанне дапамогі жыхарам аднаго з населеных пунктаў, на які напала група душманаў. У баі з праціўнікам С.С.Крыўко быў цяжка паранены, памёр 29.12.1984 г. ў Ташкенцкім ваенным шпіталі. Пахаваны ў в. Смаляны. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа», Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

МЕЛІХАЎ Аляксандр Мікалаевіч. Нарадзіўся 9.12.1963 г. ў Оршы. У 1979 г. скончыў 8 класаў СШ № 8 у Оршы. З 1979 г. — выхаванец ваеннага духавога аркестра ў г. Віцебск. У 1986 г. скончыў Бакінскае вышэйшае ваеннае агульнавайсковае камандное вучылішча. У ліпені 1986 г. накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 93 991, быў камандзірам дэсантна-штурмавога ўзвода. 24.5.1987 г. лейтэнант А.М.Меліхаў пры выкананні баявога задання загінуў. Пахаваны ў в. Паддубцы. За мужнасць і гераізм узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

НАБЕЕЎ Віктар Султанавіч. Нарадзіўся 30.1.1962 г. ў Оршы. У 1979 г. скончыў СШ і ПТВ № 140 у Оршы па спецыяльнасці шліфоўшчык. Працаваў на заводзе «Легмаш». 28.10.1980 г. Аршанскім гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у вайсковай часці 11 929 у г. Каўнас (Літва). 16.5.1981 г. накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 24 742, быў намеснікам камандзіра ўзвода. Сяржант В.С.Набееў 12.9.1982 г. ў баі быў цяжка паранены і памёр. Пахаваны ў Оршы. За мужнасць і гераізм узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

ПАНЬКОЎ Алег Віктаравіч. Нарадзіўся 27.5.1963 г. ў г. Добруш Гомельскай вобл. У 1980 г. скончыў Балбасаўскую СШ, у 1981 г. — тэхнічнае вучылішча № 98 хімікаў у Магілёве. Працаваў слесарам у Віцебску. 9.11.1981 г. Чыгуначным ваенкаматам г. Віцебска прызваны ў рады Узброеных Сіл. Службу праходзіў у г. Каўнас, потым у г. Полацк у дэсантных войсках. З Полацка быў накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 48 059, быў стралком — памочнікам гранатамётчыка. Яфрэйтар А.В.Панькоў 17.8.1982 г. ў баі быў цяжка паранены, памёр ад ран па дарозе ў шпіталь. Пахаваны ў в. Балбасава. За мужнасць і гераізм узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа», Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

А.В.Панькоў.

Я.Н.Петрачэнка.

ПЕТРАЧЭНКА Яўген Ніканоравіч. Нарадзіўся 6.12.1953 г. ў Оршы. У 1971 г. скончыў СШ № 13 у Оршы. Працаваў на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» у г. Барань. У 1972 г. паступіў у Віцебскую школу ДТСААФ, пасля яе заканчэння добраахвотнікам пайшоў ва Узброеныя Сілы. У 1974 г. экстэрнам скончыў Саратаўскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў. Служыў у Забайкальскай ваеннай акрузе. У красавіку 1980 г. накіраваны ў Афганістан, служыў у вайсковай часці палявая пошта 57 723, быў камандзірам узвода. Капітан Я.Н.Петрачэнка загінуў 17.4.1981 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў Оршы на могілках па вул. Энгельса. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

М.М.Пугачоў.

М.А.Рудзенскі.

ПУГАЧОЎ Міхаіл Мікалаевіч. Нарадзіўся 9.7.1953 г. ў Оршы. У 1970 г. скончыў СШ № 8 у Оршы, працаваў рабочым на фабрыцы. У лістападзе 1971 г. Аршанскім гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Германіі. У 1976 г. скончыў Разанскае вышэйшае паветрана-дэсантнае камандзіднае вучылішча. Служыў у Беларускай ваеннай акрузе. У снежні 1979 г. накіраваны ў Афганістан, быў камандзірам парашутна-дэсантнай роты. Старшы лейтэнант М.М.Пугачоў загінуў 25.12.1979 г. Каля г. Кабул самалёт, у якім знаходзіўся М.М.Пугачоў, быў збіты ракетай. Пахаваны ў Оршы. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

РУДЗЕНСКІ Міхаіл Анатольевіч. Нарадзіўся 15.6.1961 г. ў Оршы. У 1976 г. скончыў 8 класаў СШ № 6, у 1979 г. — ПТВ № 39 у Оршы. Працаваў у г. Жлобін Гомельскай вобласці. 29.3.1981 г. Жлобінскім гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Службу праходзіў у Афганістане ў вайсковай часці палявая пошта 93 992, быў камандзірам танка. 28.4.1983 г. радавы М.А.Рудзенскі памёр ад ран, якія атрымаў пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў Оршы. За мужнасць і гераізм узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

РЫЖАНКОЎ Ігар Барысавіч. Нарадзіўся 20.10.1963 г. ў Оршы. У 1979 г. скончыў СШ № 5 у Оршы, у 1982 г. Аршанскае ПТВ № 110 па спецыяльнасці газаэлектразваршчык. Працаваў у г. Наваполацк Віцебскай вобласці. У лістападзе 1982 г. Наваполацкім гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных

І.Б.Рыжанкоў.

А.В.Сас.

Э.І.Сіўцоў.

М.С.Сласценка.

В.П.Сутула.

Сіл. У красавіку 1983 г. накіраваны ў Афганістан, быў камандзірам аддзялення. 17.5.1983 г. пры выкананні баявога задання І.Б.Рыжанкоў быў цяжка паранены. Памёр ад ран 19.5.1983 г. Пахаваны ў Оршы. За мужнасць і гераізм узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

САС Аляксандр Васілевіч. Нарадзіўся 3.10.1961 г. ў Оршы. У 1977 г. скончыў СШ № 3 у Оршы. Працаваў фрэзероўшчыкам, потым наладчыкам на заводзе «Легмаш». 28.10.1979 г. Аршанскім гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у г. Фергана (Узбекістан). Накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 53 701, быў камандзірам зенітнага аддзялення. 7.7.1980 г. малодшы сяржант А.В.Сас пры выкананні баявога задання быў цяжка паранены і памёр. Пахаваны ў в. Гародня. За мужнасць і гераізм узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

СІЎЦОЎ Эдуард Іванавіч. Нарадзіўся 16.9.1946 г. ў Оршы. У 1961 г. скончыў 7 класаў СШ № 1 у Оршы. З 1961 г. працаваў токарам на заводзе «Чырвоны барацьбіт». 19.10.1965 г. Аршанскім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Пасля абавязковай службы застаўся на звыштэрміновую. 22.2.1983 г. накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 29 761, быў начальнікам лабараторыі гаручага. 6.6.1984 г. прапаршчык Э.І.Сіўцоў загінуў у складзе экіпажа верталёта. Пахаваны ў в. Зайцава. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

СЛАСЦЕНКА Міхаіл Сямёнавіч. Нарадзіўся 7.8.1949 г. ў Оршы. Скончыў 8 класаў СШ № 3 у Оршы, у 1967 г. — Аршанскі механіка-тэхналагічны тэхнікум. Працаваў майстрам, прарабам на льнозаводзе ў Пскоўскай вобласці. У 1968 г. Бежаніцкім райваенкаматам Пскоўскай вобласці прызваны ў рады Узброеных Сіл. Пасля дэмабілізацыі працаваў слесарам у аўтакалоне № 2428 у Оршы. З лістапада 1970 г. ў органах МУС. У 1980 г. зноў звязаў свой лёс з Узброенымі Сіламі. Службу праходзіў у пас. Ветрына Полацкага раёна. У 1985 г. накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 71 351, быў начальнікам склада. 16.7.1985 г. БТР, у якім знаходзіўся прапаршчык М.С.Сласценка, падарваўся на міне. Пахаваны ў в. Прыдняпроўе. За мужнасць і гераізм узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа», Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

СУТУЛА Валерый Пятровіч. Нарадзіўся 7.6.1956 г. ў пас. Алатау Ілійскага раёна Ал-

ма-Аціпскай вобласці. У 1976 г. скончыў Васількоўскае ваеннае авіяцыйна-тэхнічнае вучылішча, служыў у Прыкарпацкай ваеннай акрузе. У 1982 г. старшы лейтэнант В.П.Сутула накіраваны ў Афганістан, дзе цяжка захварэў. Памёр 4.5.1984 г. ў Львоўскім шпіталі. Пахаваны ў пас. Багерава Крымскай вобласці. Узнагароджаны медалямі «60 гадоў Узброеных Сіл СССР», «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа» і інш. Сям'я В.П.Сутулы жыве ў Оршы.

СЯМЁНАЎ Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся 2.1.1964 г. ў Оршы. У 1979 г. скончыў 8 класаў СШ № 16 у Оршы, у 1983 г. — Аршанскае педвучылішча. Працаваў настаўнікам у Обальскай СШ Гарадоцкага раёна. 10.10.1983 г. Гарадоцкім райваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл, служыў у г. Фергана (Узбекістан). У маі 1984 г. накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 24 742, быў намеснікам камандзіра ўзвода. 18.8.1985 г. У.І.Сямёнаў загінуў пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў Оршы. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

ШАЎНЯ Аляксандр Нічыпаравіч. Нарадзіўся 13.8.1967 г. ў в. Паркавая Аршанскага раёна. У 1983 г. скончыў Смалянскую СШ, потым вучыўся ў Гарадоцкім саўгасе-тэхнікуме. 21.10.1985 г. Гарадоцкім райваенкаматам прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў ва Узбекістане. 20.4.1986 г. накіраваны ў Афганістан у вайсковую часць палявая пошта 53 701. Радавы А.Н.Шаўня загінуў 18.9.1986 г. Пахаваны ў в. Смаляны. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа»,

У.І.Сямёнаў.

А.Н.Шаўня.

Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

З пісьма камандзіра часці родным А.Н.Шаўні.

Командование части сообщает Вам обстоятельства гибели Вашего сына Александра. Саша честно и добросовестно выполнял обязанности воина-десантника, являясь орудийным номером минометного расчета. В середине сентября наша часть вела боевые действия в ущелье Панджшер. При захвате выгодного рубежа в горах подразделение вступило в бой с мятежниками. Расчет огнем из миномета поддерживал боевые действия. Бой проходил в сплошной минно-взрывной обстановке. Под воздействием огня душманов минометный расчет вынужден был менять позицию. При перемещении Александр подорвался на фугасе.

Командование части высоко оценило мужество и отвагу Александра. Он представлен к высокой правительственной награде. Приносим искреннее соболезнование. Вечная память воину-интернационалисту.

С уважением командир части Вострогин.

Ганаровыя грамадзяне горада Орша

АНДРЭЕЎ Анатоль Яўгенавіч. Нарадзіўся 14.9.1916 г. ў г. Рагачоў Гомельскай вобласці. Дзяржаўны дзеяч Беларусі. Герой Сацыялістычнай Працы (1976). Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай і Беластоцкай абласцей у Вялікую Айчынную вайну. З лістапада 1941 г. кіраваў падпольнай групай на чыгуначнай станцыі Орша. У 1942—44 гг. камісар, камандзір партызанскіх атрадаў. Скончыў Рэспубліканскую партшколу пры ЦК КП(б)Б (1950), ВПШ пры ЦК КПСС (1959). З 1961 г. начальнік Галоўнага ўпраўлення, у 1963—64 гг. міністр аўтатранспарту БССР. Старшыня Бе-

А.Я.Андрэеў.

Р.В.Куляеў.

І.Я.Лявоненка.

ларускага рэспубліканскага савета ветэранаў вайны, працы і ўзброеных сіл (1987—94), Камісіі па справах былых партызан і падпольшчыкаў пры Прэзідыуме ВС БССР (1987—92). Член ЦК КПБ (1966—86), з 1986 г. член, у 1990—91 гг. намеснік старшыні Рэвізійнай камісіі КПБ. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1963—85 гг., народны дэпутат СССР у 1989—91 гг. Узнагароджаны 4 ордэнамі Леніна, ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, Польскім крыжам Грунвальда 3-га класа, ордэнам Дружбы Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам, медалямі. Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1980 г.

ГАРАНСКАЯ Лідзія Яўгенаўна. Нарадзілася 5.12.1927 г. ў Мінску. Заслужаны работнік прамысловасці БССР. Пасля сканчэння Беларускага політэхнічнага інстытута ў 1953 г. працавала ў аб'яднанні «Оршабудматэрыялы» начальнікам аддзела тэхнічнага кантролю, начальнікам сілікатнага цэха, галоўным інжынерам сілікатнага завода. З 1969 г. дырэктар сілікатнага завода, у 1980—87 генеральны дырэктар вытворчага аб'яднання «Оршабудматэрыялы». Памерла 26.11.1996 г. Узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і «Знак Пашаны». Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1985 г.

ГРЫШЧАНКОЎ Канстанцін Васілевіч. Нарадзіўся 10.11.1915 г. ў в. Баева Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны машыніст на дарогах тылу. З 1943 г. намеснік камандзіра атрада па разведцы 1-й партызанскай брыгады імя К.С.Заслонава, члена Аршанскага падпольнага райкома камсамола. З 1944 г. працаваў памочнікам машыніста, машыністам, майстрам, намеснікам начальніка паравознага дэпо Орша па эксплуатацыі. У 1955—70 гг. старшыня калгаса «Савецкая Беларусь», старшыня мясцкома, машыніст паравознага дэпо Орша. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Ганаровы чыгуначнік СССР (1947). Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1969 г.

ЖАЛЯЗОЎСКІ Ігар Мікалаевіч. Нарадзіўся 1.7.1963 г. ў Оршы. Беларускі спартсмен (скорасны бег на каньках). Скончыў Беларускі інстытут фізічнай культуры (1984). Заслужаны майстар спорту (1985), заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі (1994). Чэмпіён свету (1985, 1986, 1989, 1991—1993) і ўладальнік Кубка свету 1992—93 гг. у спрынтарскім мнагабор'і, сярэбраны (1994) і бронзавы (1988) прызёр Алімпійскіх гульняў на дыстанцыі 1000 м, рэкардсмен СССР, пераможца Спартакіяды народаў СССР (1986, на 1000 м і 1500 м). З 1996 г. прэзідэнт Паралімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь. Ганаровы грамадзянін Оршы.

КУЛЯЕЎ Раман Васілевіч. Нарадзіўся 16.4.1921 г. ў в. Анібалева Аршанскага раёна. Заслужаны будаўнік БССР (1971). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 г. на партыйнай і гаспадарчай рабоце ў Оршы. 15 гадоў узначальваў будаўнічы трэст № 18. Памёр 22.9.1985 г. Лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР (1976). Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1981 г.

ЛЯВОНЕНКА Ісаак Яўгенавіч. Нарадзіўся ў 1892 г. ў мяст. Горы Магілёўскай вобласці. Удзельнік рэвалюцыі 1905 г., грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Пас-

ля вайны на адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце на Аршаншчыне. Памёр у 1974 г. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі. Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1969 г.

ЛЯОШКА Браніслаў Адольфавіч. Нарадзіўся 1.11.1924 г. ў в. Карумны Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 г. на камсамольскай і партыйнай рабоце. Узнагароджаны 2 ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», медалямі. Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1999 г.

НУРЫ (сапраўднае Нурутдзінаў) **Закі Шарафутдзінавіч**. Нарадзіўся 24.12. 1921 г. ў в. Татарскія Цюкі Буінаўскага раёна, Татарстан. У 1941 г. скончыў Лубянскі лясны тэхнікум. У Вялікую Айчынную вайну начальнік разведкі 1-й партызанскай брыгады імя К.С.Заслонава. У 1944—46 гг. намеснік старшыні Аршанскага гарвыканкома, потым жыў і працаваў у Татарстане. Друкавацца пачаў у 1937 г. Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1957). У 1971—76 гг. сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР, у 1974—83 гг. галоўны рэдактар часопіса «Агні Казані». Памёр 18.2.1994 г. Аўтар зборнікаў паэзіі: «Мы жывём на Волзе» (1951), «Шчырая размова» (1955), «Поглядам прамым» (1963), «Гады і дарогі» (1971), зборніка апавяданняў пра партызанскую барацьбу «І мёртвыя помсцілі» (1962). Пераклаў на татарскую мову вершы Я.Коласа, Я.Купалы, П.Броўкі і інш. Узнагароджаны ордэнамі Дружбы народаў, «Знак Пашаны», Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1975 г.

ПАВАРКОЎ Веньямін Усеваладавіч. Нарадзіўся ў 1909 г. ў в. Баршчэўка Іванаўскай вобласці. Генерал. Кандыдат ваенных навук, дацэнт. У Чырвонай Арміі з 1931 г. Удзельнік савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Скончыў Ваенную акадэмію Генштаба. Памёр у 1987 г. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1980 г.

ПАЎЛАЎ Уладзімір Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1912 г. ў Томскай вобласці. Працаваў токарам на заводзе. У Чырвонай Арміі з

З.Ш.Нуры.

В.У.Паваркоў.

У.М.Паўлаў.

Ф.Ц.Пуставіт.

1933 г. Скончыў Камуністычны універсітэт імя Свярдлова ў Маскве, Горкаўскае бранятанкавае вучылішча, Вышэйшыя курсы пры Акадэміі бранятанкавых войскаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 1-й ступені, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1980 г.

ПУСТАВІТ Фёдар Цярэнцьевіч. Нарадзіўся 29.4.1917 г. ў в. Гунча Гайсінскага раёна Вінніцкай вобласці. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай вобласці. Скончыў тэхнікум савецкага гандлю (1939). Са жніўня 1941 г. на Заходнім фронце. У верасні 1942 г. накіраваны ЦК КПБ у тыл ворага для арганізацыі партызанскага руху. У снежні 1942 г. — чэрвені 1944 г. камандзір партызанскай брыгады імя С.М.Кірава. З 1946 г. дэпутат Аршанскага гарадскога Савета. У 1948—85 гг. загадчык фінансавага аддзела Аршанскага гарвыканкома. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, Айчыннай

Г.В.Сямёнаў.

Г.Ц.Шчарбінскі.

вайны 1-й ступені. Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1980 г.

РОГАНАЎ Леанід Фёдаравіч. Нарадзіўся 29.12.1931 г. ў в. Шалягова Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў лясны тэхнікум, Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ. З 1952 г. на камсамольскай і партыйнай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны». Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1999 г.

СЯМЁНАЎ Георгій Васілевіч. Нарадзіўся 4.4.1902 г. ў в. Кочнева Вязнікаўскага раёна Уладзімірскай вобласці. Герой Сацыялістычнай Працы (1966), заслужаны работнік прамысловасці БССР (1972). З 1940 г. намеснік, у красавіку—ліпені 1941 г., 1944—55 гг. і 1956—72 гг. дырэктар Аршанскага льнокамбіната. У 1955—56 гг. намеснік міністра тэкстыльнай прамысловасці БССР. Памёр 14.5.1976 г. Член ЦК КПБ у 1966—71 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1955—63 гг. Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1972 г.

ШЧАРБІНСКІ Георгій Цярэнцьевіч. Нарадзіўся ў 1900 г. ў Оршы. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. З 1945 г. на партыйнай і гаспадарчай рабоце ў Оршы. Памёр 14.9.1992 г. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1980 г.

ЮРЧАНКА Антон Сцяпанавіч. Герой Савецкага Саюза (1945). Вызначыўся ў Беларускай аперацыі 1944 г. Званне ганаровага грамадзяніна прысвоена ў 1969 г.

Іх шляхі прайшлі праз Аршаншчыну

АБЭЦЭДАРСКІ Лаўрэнцій Сямёнавіч. Нарадзіўся 12.7.1916 г. ў г. Горкі Магілёўскай вобласці. Беларускі гісторык. Доктар гістарычных навук, прафесар (1966). Член-карэспандэнт АПН СССР (1968).У 1930-я гады жыў і вучыўся ў Оршы. У 1946 г. скончыў БДУ, дзе працаваў выкладчыкам, загадчыкам кафедры гісторы СССР (1950—58), гісторыі БССР (з 1958). Адзін з аўтараў «Гісторыі Беларускай ССР» (т. 1—2, 1954—61; т. 1—5, 1972—75). Асноўныя творы: «Белорусы в Москве XVII в.» (1957); «Барацьба ўкраінскага і беларускага народаў за ўз'яднанне з Расіяй у сярэдзіне XVII века» (1954); «Белоруссия и Россия: Очерки русско-белорусских связей второй половины XVI—XVII в.» (1978). Памёр 6.7.1975 г. *В.П.Грыцкевіч.*

АКУЛАЎ Герасім (Гераська). Нарадзіўся ў г. Дуброўна Віцебскай вобласці. Разьбяр па дрэве 17 ст. Майстэрства разьбы асвойваў у аршанскім Куцеінскім Богаяўленскім манастыры. З 1654 г. працаваў у Іверскім (пад Ноўгарадам), з 1658 г. ў Новаіерусалімскім (пад Масквой) манастырах, з 1666 г. ў Аружэйнай палаце Маскоўскага Крамля ў арцелі Міхайлава. У 1667—68 гг. удзельнічаў у аздабленні царскага Каломенскага палаца. Вядомы як адзін са стваральнікаў разьбяных іканастасаў З цэркваў у Ізмайлаўскай сядзібе цара Аляксея Міхайлавіча. У 1686 г. ўдзельнічаў у стварэнні іканастаса царквы Пятра і Паўла ў Маскве.

АНІКЕЙЧЫК Анатоль Аляксандравіч. Нарадзіўся 11.7.1932 г. ў г. Барысаў Мінскай вобласці. Беларускі скульптар, педагог. Народны мастак Беларусі (1972). Прафесар (1981). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1959), выкладаў у гэтым інстытуце. Аўтар помніка Я.Купалу ў Ляўках (1982). Дзяржаўная прэмія Беларусі 1974 г. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1967 г. Памёр 3.2.1989 г.

АРСЕНІЙ (Старац). Разьбяр па дрэве 17 ст. Майстэрству беларускай рэзі навучаўся ў аршанскім Богаяўленскім Куцеінскім манастыры, дзе быў манахам. Пасля 1655 г. працаваў у майстэрні Іверскага манастыра на Валдаі. Пазней выконваў работы для Васкрасенскага сабора Новаіерусалімскага манастыра (г. Істра Маскоўскай вобл.). У 1667 г. ўзначальваў майстэрню разьбяроў у Аружэйнай палаце Крамля. Кіраваў работай па аздабленні драўлянай разьбой палаца ў Каломенскім (зараз у межах Масквы). Стварыў «іарданскую сень» на 4 калонах для Суздаля (1668, цяпер — у саборы Раства Багародзіцы ў Суздалі). Памёр у 1681 г.

БРОВІКАЎ Уладзімір Ігнатавіч. Нарадзіўся 12.5.1931 г. ў г. Ветка Гомельскай вобласці. Беларускі партыйны і дзяржаўны дзеяч, журналіст, дыпламат. Скончыў БДУ (1955), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1969). Кандыдат філасофскіх навук (1969). З 1955 г. загадчык аддзела, намеснік рэдактара і рэдактар раённых, міжраённай і аб'яднанай газет у Віцебскай вобласці. З 1963 г. намеснік сакратара парткома Аршанскага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення. У 1965—66 гг. 2-гі сакратар Аршанскага РК КПБ. З 1969 г. рэдактар газеты «Віцебскі рабочы», з 1970 г. сакратар Віцебскага абкома КПБ. У 1972—78 гг. інспектар, памочнік сакратара, намеснік загадчыка аддзела ЦК КПСС. З 1978 г. 2-і сакратар ЦК КПБ, з 1983 г. Старшыня Савета Міністраў БССР. У 1986—90 гг. надзвычайны і паўнамоцны пасол СССР у Польшчы. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1979—86 гг., Вярхоўнага Савета СССР у 1979—89 гг. Член ЦК і Бюро ЦК КПБ у 1978—86, член ЦК КПСС у 1981—90 гг. Памёр 2.10.1992.

БУДЗІЛОВІЧ Ігнат Мартынавіч. Нарадзіўся ў 1841 г. ў Валынскай вобласці, Украіна. Скончыў Кіеўскі кадэцкі корпус (1859), служыў падпаручнікам у лейб-грэнадзёрскім Екацярынаслаўскім палку (Масква). У красавіку 1863 г. ўцёк з часці і выехаў на Магілёўшчыну. Пад псеўданімамі Каткоў і Ян Піховіч арганізаваў і ўзначаліў паўстанцкі атрад у Аршанскім павеце, з якім рушыў на Бабінавічы і Лёзна. 26.4.1863 г. атрад разбіты пад Пагосцічамі. Будзіловіч быў схоплены на полі бою і 9.9.1863 г. расстраляны ў Оршы.

БУЛЫГА Уладзімір Антонавіч. Нарадзіўся 7.9.1936 г. ў в. Канюцічы Мінскага раёна. Беларускі скульптар. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1967). Выкладчык БПА (з 1967). Працуе ў галіне станковай і манументальнай скульптуры. Аўтар мемарыяльнай дошкі І.І.Якубоўскаму ў Оршы.

ВІТКОЎСКІ Іван Антонавіч. Нарадзіўся 2.5.1888 г. ў в. Чэрчыцы Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці. Беларускі гісторык. Прафесар (1932). У 1912 г. скончыў каталіцкую духоўную семінарыю, у 1914 г. — 2 курсы духоўнай акадэміі ў Петраградзе. З канца 1916 г. вікарый Мазырскага касцёла. У 1918 г. пазбаўлены духоўнага сана. Працаваў выкладчыкам гісторыі, лацінскай мовы і псіхалогіі ў гімназіі (Растоў-на-Доне). У 1919 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, служыў у батальёне асобага прызначэння, загадваў культаддзелам палітычнага ўпраўлення Паўночна-Каўказскай ваеннай акругі. У 1921 г. ў Аршанскім павеце, загадчык школы, аддзела агітацыі і прапаганды Сенненскага павятовага камітэта РКП(б), лектар Віцебскага губкома, прарэктар і выкладчык Віцебскага ветэрынарнага інстытута. З 1925 г. ў Мінску, дырэктар архіва, выкладчык гісторыі Беларусі ў Камуністычным універсітэце імя Леніна, намеснік загадчыка польскага аддзела Інбелкульта АН Беларусі. З 1932 г. дырэктар Інстытута польскай пралетарскай культуры АН БССР, адначасова загадчык кафедры гісторыі, выкладчык гісторыі Беларусі ў Мінскім педагагічным інстытуце. Вывучаў нацыянальна-вызваленчы і рэвалюцыйна-дэмакратычны рух на Беларусі і яго сувязі з рэвалюцыйным рухам у Польшчы і Расіі. Удзельнічаў у выданні зборніка дакументаў «1863 год на Міншчыне» (1927). У 1933 г. быў арыштаваны і зняволены ў г. Марыінск (Сібір). Пасля вызвалення працаваў рахункаводам і выкладчыкам лацінскай мовы ў г. Баравічы Ленінградскай вобласці. У 1937 г. быў зноў арыштаваны па абвінавачванні ў прыналежнасці да «Польскай вайсковай арганізацыі», расстраляны ў Мінску. Рэабілітаваны ў 1959 г.

У.М.Міхнюк.

ВОРАНАВА Аляксандра Іванаўна. Нарадзілася 1.7.1908 г. ў Віцебску. Беларускі гісторык. Доктар гістарычных навук (1967). Прафесар (1968). У 1930 г. скончыла БДУ. У 1933—44 гг. выкладала гісторыю СССР у ВНУ Мінска, Оршы, Уральска. З 1944 г. загадчыца кафедры гісторыі СССР педагагічнага інстытута і партыйнай школы ў Мінску, з 1962 г. на кафедры гісторыі СССР Мінскага педагагічнага інстытута. Памерла 26.11.1978 г.

У.М.Міхнюк.

ВОЎЧАК Афанасій. Беларускі майстар залатых і сярэбраных спраў сярэдзіны 18 ст. Працаваў у Магілёве. З падпісаных яго работ вядомы гарэльефныя чаканеныя абклады да абразоў магілёўскіх цэркваў (1749, захоўваліся ў Магілёўскім гістарычным музеі, зніклі ў Вялікую Айчынную вайну) і абклады да абразоў Маці Божай (1767) і Хрыста (1769) аршанскіх храмаў.

ГАРКУНОЎ Генадзь Рыгоравіч. Нарадзіўся 27.5.1939 г. ў Мінску. Беларускі мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1969). Працуе ў галіне пластычнай дэкаратыўнай керамікі, манументальнага габелена, афармлення інтэр'ераў. Арганізатар і кіраўнік габеленавага цэха (1971—73, 1976—77), галоўны мастак (1973—76) Барысаўскага камбіната прыкладнога мастацтва. Аформіў экспазіцыі музея К.Заслонава ў Оршы (1964).

ГЕРБЕРШТЭЙН Зігмунд фон. Нарадзіўся 23.8.1486 г. ў вобласці Крайна, Славенія. Нямецкі дыпламат «Свяшчэннай Рымскай імперыі», падарожнік. Скончыў Венскі універсітэт (1502). У 1517 і 1526 гг. ўзначальваў пасольства імператара Максіміляна I і эрцгерцага Фердынанда ў Маскве, быў з даручэннямі ў Венгрыі, Польшчы, ВКЛ. Праязджаў па тэрыторыі Беларусі (Барысаў, Брэст, Віцебск, Гродна, Мінск, Орша). У яго «Запісках аб маскоўскіх справах» (Вена, 1549) ёсць звесткі пра Беларусь і Літву з апісаннямі іх крэпасцей і гарадоў, заняткаў, побыту, абрадаў і рэлігійных вераванняў насельніцтва, гандлёвых сувязей, узаемаадносін ВКЛ з іншымі дзяржавамі. Змешчаны звесткі пра генеалогію вялікіх князёў ВКЛ, пра К.Астрожскага, М.Глінскага і іншых. На падставе гэтай кнігі складзены шматлікія еўрапейскія карты ВКЛ і Расіі. Памёр 28.3.1556 г.

ГОЛУБЕЎ Ігар Уладзіміравіч. Нарадзіўся 10.6.1961 г. ў г. Віцебск. Беларускі мастак. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1990). Працуе ў галіне станковай і манументальнай скульптуры. Аўтар мемарыяльнага знака, які прысвечаны ахвярам сталінскіх рэпрэсій у Оршы.

ЗАВОДЧЫКАВА Аляксандра Рыгораўна. Нарадзілася 22.4.1895 г. ў Маскве. У 1919 г. скончыла медыцынскі факультэт Маскоўскага універсітэта. Працавала ў Оршы. Была рэпрэсіравана як жонка ворага народа, арыштавана. Вызвалена праз 11 месяцаў. Муж, Юльян Тэльтэфт, урач-неўрапатолаг Варашылаўскай бальніцы ў Оршы загінуў у лагерах. Пасмяротна рэабілітаваны. У Вялікую Айчынную вайну ў званні маёра служыла ў эвакуацыйным шпіталі № 416. Пасля вайны працавала лекавым інспектарам у гарадскім аддзеле аховы здароўя, узначальвала школу медсясцёр, загадвала дзіцячым аддзяленнем бальніцы імя М.А.Сямашкі ў Оршы. Памерла ў 1972 г.

ЗАКОННІКАЎ Сяргей Васілевіч (Ракіта Сяргей). Нарадзіўся 15.10.1909 г. ў в. Ліцвінава Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Беларускі паэт. У 1925 г. скончыў сярэднюю школу 2-й ступені ў в. Новая Тухіня Дубровенскага раёна. Калі вучыўся ў школе, пісаў допісы ў аршанскую акруговую газету «Камуністычны шлях». У 1929 г. накіраваны на працу ў гомельскую абласную газету «Палеская праўда». З 1930 г. з'яўляўся кіраўніком Гомельскай філіі БелАПП. З 1932 г. ў Чырвонай Арміі. Працаваў у Мінску ў рэдакцыях газет, на Беларускім радыё, у Дзяржаўным выдавецтве БССР, адначасова вучыўся ў Камуністычным інстытуце журналістыкі ў Мінску. Першы верш апублікаваны ў 1928 г. ў часопісе «Аршанскі маладняк». Яго вершы змешчаны ў калектыўным зборніку «Разгон» (1930, Гомель). Выдаў зборнік паэзіі «Я агітую за пяцігодку» (1934). 19.10.1936 г. быў арыштаваны і асуджаны на 10 гадоў зняволення ў лагерах. Працаваў на лесапавале ў Горкаўскай вобласці. Памёр у лагеры 23.3.1942 г. Рэабілітаваны пасмяротна.

ЗАНКОВІЧ Валянцін Паўлавіч. Нарадзіўся 5.6.1937 г. ў Мінску. Беларускі архітэктар і скульптар. Скончыў БПІ (1959), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1976). Працуе ў галіне станковай і манументальнай скульптуры. Адзін з аўтараў мемарыяльнага комплекса «Кацюша» каля Оршы, помнікаў К.Заслонаву ў Оршы (1964), падпольшчыкам Асінторфа (1966). Лаўрэат Ленінскай прэміі 1970 г., прэміі Ленінскага камсамола Беларусі 1967 г.

ІВАНОВА Аляксандра Іванаўна. Нарадзілася 12.4.1910 г. ў г. Дно Пскоўскай вобласці. У 1938 г. скончыла Ленінградскі медыцынскі інстытут. У гады Вялікай Айчыннай вайны працавала ў Маскве ў штабе партызанскага руху. Пасля вайны інспектар аршанска-

га аддзела аховы здароўя. Памерла ў 1990-я гады.

ІВАНОЎ Барыс Георгіевіч. Нарадзіўся 26.11.1952 г. ў в. Цімкавічы Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Беларускі графік і жывапісец. Скончыў Беларускую АМ (1993). Працуе ў галіне станковага жывапісу і графікі. Аўтар публікацый па сучасным мастацтве. Жыве ў Оршы.

КАТЫРЛА Васіль Ігнатавіч. Нарадзіўся ў 1838 г. ў г. Полацк. Удзельнік рэвалюцыйнага руху 1860-х гадоў. Скончыў Віцебскую гімназію. З 1859 г. ў Пецярбургскім універсітэце, удзельнік студэнцкага руху, член арганізацыі «Зямля і воля». З лютага 1863 г. на радзіме распаўсюджваў сярод салдат і жыхароў Оршы пракламацыі, вёў агітацыю за паўстанне, вербаваў людзей у атрады. 12.3.1863 г. арыштаваны. Асуджаны на 10 гадоў катаргі. У 1874 г. знаходзіўся ў Краснаярску.

КУПРЭВІЧ Васіль Феафілавіч. Нарадзіўся 24.1.1897 г. ў в. Кляннік Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці. Беларускі вучоны, дзяржаўны дзеяч. Акадэмік АН БССР (1952), член-карэспандэнт АН СССР (1953), доктар біялагічных навук (1942), прафесар (1950). Герой Сацыялістычнай Працы (1969). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1967). Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1910-х гадах вучыўся ў Смалянскай сельскагаспадарчай школе. У 1931 г. скончыў Інстытут павышэння кваліфікацыі кадраў народнай асветы ў Маскве. З 1934 г. працаваў у Інстытуце біялагічных навук АН БССР, з 1938 г. загадчык лабараторыі, дырэктар Батанічнага інстытута АН БССР. У 1952—69 гг. прэзідэнт АН БССР. Член ЦК КПБ у 1952—69 гг. Дэпутат ВС БССР у 1951—55 гг., ВС СССР у 1954—69 гг. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1967, 1969), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1957), «Знак Пашаны» (1953), медалямі. Памёр 17.3.1969 г.

ЛЕПЕШАЎ Іван Якаўлевіч. Нарадзіўся 23.10.1924 г. ў в. Іскозы Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Беларускі мовазнавец. Кандыдат філалагічных навук (1973), дацэнт. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў настаўнікам, з 1971 г. ў Гродзенскім універсітэце. Даследуе фразеалогію, мову мастацкай літаратуры. Аўтар прац: «Літаратурна-краязнаўчы гурток» (1969), сааўтар «Фразеалагічнага слоўніка» (1973).

ЛЕПЯШЫНСКАЯ Вольга Барысаўна. Нарадзілася 18.8.1871 г. ў г. Перм. Дзеяч рэвалюцыйнага руху, біёлаг. Акадэмік АМН СССР (1950). У 1915 г. скончыла Маскоўскі універсітэт. Удзельнічала ў рабоце Пецярбургскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа». У 1897 г. паехала за мужам П.М.Лепяшынскім ва Усходнюю Сібір у ссылку. У 1903—06 гг. у эміграцыі. У 1906—10 гг. у Оршы выкладала ў жаночай прагімназіі і вяла партыйную работу. У 1917—18 гг. у Наркамаце асветы РСФСР. Удзельнічала ў стварэнні і працавала ў Ліцвінавіцкай школе-камуне. З 1919 г. на выкладчыцкай і навукова-даследчай рабоце. Дзяржаўная прэмія СССР 1950 г. Памерла 2.10.1963 г.

ЛЕПЯШЫНСКІ Панцеляймон Мікалаевіч (парт. псеўд. Лапаць, Олін, Пскавіч). Нарадзіўся 12.3.1868 г. ў в. Студзянец Касцюковіцкага раёна. Дзеяч рэвалюцыйнага руху, публіцыст. Доктар гістарычных навук. У 1891 г. скончыў Кіеўскі універсітэт. У час вучобы ў Пецярбургскім універсітэце (1886—90) член нарадавольскага гуртка, узначальваў беларускае зямляцтва. За ўдзел у рэвалюцыйным руху ў 1890 г. выключаны з універсітэта і высланы. Жыў у Пінску. У 1894 г. ў Пецярбургу ўступіў у марксісцкі гурток. За рэвалюцыйную дзейнасць двойчы арыштаваны (1895, 1902) і высланы ў Енісейскую губерню, дзе сустракаўся з У.І.Леніным. У ліку 17 ссыльных падпісаў «Пратэст расійскіх сацыял-дэмакратаў» супраць «эканамістаў» (1899). З 1900 г. агент «Искры» ў Пскове. Член Аргкамітэта па скліканні II з'езда РСДРП. З 1903 г. ў Жэневе, далучыўся да бальшавікоў, сакратар Савета партыі, адзін са стваральнікаў бібліятэкі і архіва ЦК РСДРП, удзельнік падрыхтоўкі III з'езда РСДРП (1905). У 1907—09 гг. выкладаў матэматыку ў Аршанскім рэальным вучылішчы. На Аршанскім чыгуначным вузле разам з жонкай В.Б.Лепяшынскай аднавіў арганізацыю РСДРП. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. гарадскі галава ў Оршы. У час Кастрычніцкай рэвалюцыі адзін з кіраўнікоў партыйнай арганізацыі ў Оршы, ганаровы старшыня Аршанскага ВРК. У пачатку 1918 г. загадчык аддзела Наркамата асветы (Петраград). Летам 1918 г. заснаваў і ўзначаліў Ліцвінавіцкую школу-камуну ў в. Ліцвінавічы Рагачоўскага павета. У 1921—24 гг. адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Камісіі па рас-

працоўцы гісторыі РКП(б) (Гістпарта), выкладчык Маскоўскага універсітэта і Камуністычнай акадэміі, член рэдкалегій часопісаў «Молодая гвардия» і «Пролетарская революция». З 1925 г. старшыня ЦК МОПР. З 1927 г. дырэктар Гістарычнага музея, у 1935—36 гг. — Музея рэвалюцыі ў Маскве. Аўтар навуковых прац па пытаннях гісторыі, народнай асветы, пра творчасць А.Грыбаедава, М.Салтыкова-Шчадрына, аповесці «У зелянях» (1924), апавяданняў, успамінаў. Памёр 30.9.1944 г. У в. Ліцвінавічы — мемарыяльны музей Лепяшынскага. Яго імем названы вуліцы ў Бабруйску, Гомелі, Крычаве, Магілёве, Оршы. З 1967 г. ўстаноўлена Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Лепяшынскага за лепшы публіцыстычны твор.

ЛЯЎДАНСКІ Аляксандр Мікалаевіч. Нарадзіўся 10.9.1893 г. ў в. Юр'ева Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці. Беларускі савецкі гісторык, археолаг. Кандыдат гістарычных навук (1934). У 1922 г. скончыў Смаленскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. З 1927 г. ў Мінску: член гісторыка-археалагічнай камісіі Інбелкульта, з 1931 г. вучоны сакратар, загадчык секцыі археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР, дацэнт БДУ. Арганізатар першых экспедыцый па шырокім археалагічным вывучэнні Беларусі. Зрабіў класіфікацыю гарадзішчаў жалезнага веку, вызначыў іх культурна-археалагічную прыналежнасць і арэалы археалагічных культур, акрэсліў асноўныя рысы матэрыяльнай культуры, гаспадаркі і патрыярхальна-родавага ладу плямён, якія жылі на тэрыторыі Беларусі ў жалезным веку. Першы выказаў думку, што гарадзішчы культуры штрыхаванай керамікі ў Цэнтральнай Беларусі належалі балцкім плямёнам. Раскопваў курганы ў Мінскай, Полацкай і Аршанскай акругах, даследаваў старажытны Полацк, Заслаўе, Барысаў і тэрыторыю Смаленшчыны. У 1937 г. па ілжывым абвінавачванні арыштаваны і 27.8.1937 г. расстраляны ў Мінску. У 1958 г. рэабілітаваны.

МАРЫШАЎ Анатоль Ільіч. Нарадзіўся 14.12.1944 г. ў г. Новакузнецк Кемераўскай вобласці. Мастак. Скончыў Яраслаўскае мастацкае вучылішча (1968). Працуе ў галіне станковага жывапісу і графікі. Жыве ў Оршы.

МУРАМЦАЎ Генадзь Ільіч. Нарадзіўся 8.11.1931 г. ў г. Ленінград. Беларускі скульптар, педагог. Скончыў Інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна ў Ленінградзе (1958). Працуе ў галіне станковай і манументальнай скульптуры. Адзін з аўтараў помнікаў К.Заслонаву каля Оршы, падпольшчыкам Асінторфа. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1967 г.

МУХТАР-ЛАНДАРСКІ Максім Іванавіч. Нарадзіўся 31.1.1894 г. ў в. Калінаўка Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Удзельнік грамадзянскай вайны на Беларусі. З 1910 г. рабочы Пуцілаўскага завода. Удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый у Петраградзе. З 1918 г. на Беларусі, камандзір атрада, удзельнік разгрому леваэсэраўскіх паўстанняў у Оршы і Сянне, стракапытаўскага мяцяжу ў Гомелі, савецка-польскай вайны 1920 г., барацьбы з бандамі Булак-Балаховіча, з бандытызмам у Горацкім і Чавускім паветах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга (1920). Пасля грамадзянскай вайны на гаспадарчай рабоце. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

СЕЛІХАНАЎ Сяргей Іванавіч. Нарадзіўся 8.3.1917 г. ў г. Петраград. Беларускі скульптар. Народны мастак БССР (1963). Скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум (1937). Працаваў у галіне манументальнай і станковай скульптуры. Адзін з аўтараў помніка К.Заслонаву ў Оршы. Лаўрэат Ленінскай прэміі 1969 г. Памёр 28.9.1976 г.

СЛЕПАЎ Аляксандр Міхайлавіч. Нарадзіўся 4.8.1950 г. на ст. Бада Чыцінскай вобласці. Скульптар. Скончыў Віцебскі педагагічны інстытут. Працуе ў галіне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва (разьба па дрэве), а таксама скульптуры. Аўтар дэкаратыўнага пано ў Доме культуры в. Бабінічы.

СМОЛЬСКІ Бекір Міхайлавіч. Нарадзіўся 17.5.1966 г. ў Мінску. Беларускі мастак. Скончыў Беларускую АМ (1994). Працуе ў галіне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. Аўтар вітражоў для дзіцячага сада «Задняпроўскі» у Оршы.

ТАРАНДА Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся 15.8.1947 г. ў в. Вялікае Падлессе Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Беларускі мастак. Скончыў Віцебскі педагагічны інстытут. Працуе ў галіне станковага жывапісу і графікі. Аўтар палотнаў «Аршаншчына», «Рака Аршыца» і інш. Жыве ў Барані.

ЦОМПЕЛЬ Павел Аксанавіч. Нарадзіўся 5.8.1933 г. ў в. Вербка Лецічэўскага раёна Хмяльніцкай вобласці. Беларускі скульптар. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1965). Працаваў ў галіне манументальнай і станковай скульптуры. Адзін з аўтараў помніка ў гонар вызвалення Оршы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Памёр 12.2.1997 г.

ЧАЧЫН Віктар Мікалаевіч. Нарадзіўся 25.1.1930 г. ў Гомелі. Беларускі вучоны ў галіне тэхналогіі машынабудавання. Акадэмік АН БССР (1980, член-карэспандэнт 1974), доктар тэхнічных навук (1974), прафесар (1976). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1983). Скончыў БПІ (1952). З 1952 г. працаваў інжынерам на заводзе лёгкага машынабудавання ў Оршы. З 1958 г. ў Фізіка-тэхнічным інстытуце АН БССР: малодшы навуковы супрацоўнік, старшы інжынер-канструктар, з 1962 г. намеснік дырэктара, з 1970 г. дырэктар, адначасова з 1969 г. загадчык лабараторыі фізіка-хімічнай механікі. У 1983—94 гг. рэктар Беларускага політэхнічнага інстытута (з 1991 г. Беларуская політэхнічная акадэмія). Дзяржаўная прэмія БССР 1980 г.

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

Драўляная архітэктура Аршаншчыны

Аршаншчына — своеасаблівы куток беларускага Падняпроўя. Яго своеасаблівасць вызначылася геаграфічным размяшчэннем на мяжы трох гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў: Паазер'я, Смаленшчыны і Падняпроўя. Гэта абумовіла фарміраванне складанага комплексу і асаблівасцей матэрыяльнай культуры, у прыватнасці, драўлянага дойлідства. Апошняе на Аршаншчыне шырока прадстаўлена помнікамі манументальнай архітэктуры, традыцыйнай сядзібнай забудовай (народным жытлам) і традыцыйна-гістарычнай жылой драўлянай забудовай гарадоў. Вытокі сістэмы будовы форм, кампазіцыйных асаблівасцей драўлянай манументальнай архітэктуры Аршаншчыны, як і для іншых рэгіёнаў Беларусі і Усходняй Еўропы, узыходзяць да сярэдневяковых абарончых збудаванняў, старажытных замкавых пабудоў Оршы, Дуброўны. У месцы разгалінавання рэк Адроў і Аршыца, на беразе Дняпра, летапісец «Аповесці мінулых гадоў» пад 1067 годам зафіксаваў умацаванае паселішча. Аб тым, якія пры гэтым маглі быць драўляныя ўмацаванні, можна меркаваць паводле малюнкаў Радзівілаўскага летапісу іншых гарадоў Полацкай зямлі 11—12 ст.: зрубныя клецкія вежы, злучаныя драўляным тынам ці частаколам. Больш дасканалымі па формах былі муры Аршанскага замка 15—16 ст. Дарэчы, аб будове і развіцці форм драўляных абарончых збудаванняў сярэдневякоўя яскрава сведчыць «Чарцёж горада Віцебска 1664 года». Шмат'ярусныя чацвярыкі, васьмярыкі і круглікі вызначылі тыя канструкцыйныя і аб'ёмныя рашэнні і формы, якія потым знайшлі далейшае развіццё ў драўляным культавым дойлідстве.

Драўляныя ўмацаванні летапіснай Копысі (датаванай 1095 г.) атрымалі далейшае развіццё таксама ў 16—18 ст. Мысавае гарадзішча на беразе Дняпра дадаткова абаранялася водамі рэчак Сморкаўка і Страшаўка.

Сістэма запруд і валаў, пад якімі ў асобных месцах праходзіла вада (відаць, дзякуючы асобнай палевай канструкцыі), стваралі надзейную абарону. Ролю праезду ў замак адыгрывала запруда вадзянога млына. Інвентар Копысі 1651 г. паведамляе пра некаторыя абарончыя збудаванні замка. Брама, што стаяла за Дняпром, мела значныя памеры і вежападобную канструкцыю. Другая брама размяшчалася з боку горада. У дакументе згадваецца вялікі двухпавярховы дом са спецыяльнай галерэяй для верхняга бою. У інвентары называюцца Шклоўская, Гарадзецкая, Горская і Аршанская брамы. Фартыфікацыйныя збудаванні былі злучаны паміж сабой частаколам. Інвентар 1661 г. пазначае зрубы, якія стаялі на валу замка. Барон Андрэй Мейерберг, які ехаў праз Копысь у 1661 г., у дзённіку адзначаў, што горад быў абнесены драўлянаю сцяною з вежамі, меў драўляны замак пасярэдзіне высокага пагорка. Рэканструкцыя драўляных умацаванняў Копысі была выканана пасля заканчэння рускапольскай вайны «у паркане і на ізбіцах». Магчыма, так названы драўляныя зрубныя ўмацаванні накшталт гародняў ці тэрас. Даў-

жыня паркана, згодна інвентара 1684 г., раўнялася 2,2 км. У 1660 г. ў Копысі 2 брамы і 3 васьмерыкі. Драўляныя ўмацаванні замка неаднаразова абнаўляліся пасля Паўночнай вайны. Адным з найбольш значных збудаванняў у сярэдзіне 18 ст. была замкавая драўляная брама з падвойнымі варотамі. На ўзроўні 2-га паверха мелася кругавая галерэя для верхняга бою. Дранкавы дах завяршаў ветранік з бляхай у выглядзе арла. Аршанская і Шклоўская брамы былі двух'яруснымі, з 2 варотамі (на 2 бакі), мелі «істопкі», памяшканне для вартаўнікоў, якое ацяплялася. У якасці будаўнічага матэрыялу выкарыстоўваліся брус, дранка.

Ля сутоку рэчкі Дуброўны з Дняпром, на мяжы 15—16 ст. узнік комплекс драўляных умацаванняў, які займаў тэрыторыю прыкладна 125 х 45 м. Прамакутны пляц, што ўзвышаецца над берагам Дняпра, некалі падзяляўся на 2 часткі: ніжні замак (падзамачак; прыкладна 1/3 усёй плошчы) і ўласна замак. Пляцоўка апошняга была прыкладна на метр вышэй. Некалі паміж абодвума замкамі праходзіла сцяна з уязной брамай. Нямецкі пасланец С.Герберштэйн, які ехаў у Масковію ў 1517 г., пакінуў на сваёй карце выяву Дубровенскага замка ў выглядзе двух'яруснай вежы. Пасол аўстрыйскага імператара Мікалай Варкач, які праязджаў праз Дуброўна ў 1593 г., пісаў пра замак: «Гэта замак шырокі ў акружнасці, толькі ўвесь драўляны». Інвентар замка сярэдзіны 16 ст. паведамляе, што ніжні замак быў абнесены астрогам і акрамя старой брамы меў 3 новазбудаваныя вежы. Па перыметры ўласна замка даўней размяшчаліся сцены з гародняў і 2 вежы з боку ракі Дуброўны. У сярэдзіне 17 ст. замест гародняў замак абкружылі астрогам. Драўляныя крапасныя ўмацаванні Дуброўны былі спалены ў час руска-польскай вайны. У 1655 г. рускі гарнізон зноў вымушаны быў «ставіць астрог і ўсялякія крэпасці», якія былі спалены падчас Паўночнай вайны. Аднавілі замак толькі ў 1730-я гады.

Такім чынам, сярэдневяковыя драўляныя ўмацаванні замкаў Аршаншчыны мелі характэрную для тых часоў архітэктуру, якую ўтваралі пераважна двух'ярусныя вежы (чацверыкі, васьмерыкі, круглякі) з шатровым стромкім дахам, сцены з частаколу, гародняў ці ўзведзеныя накшталт астрога. Асноўныя будаўнічыя матэрыялы — абчэсаныя бярвенні (бурс), дахавая дранка, цёс. Выкарыстанне апошняга абумоўлівала ўладкаванне дахаў на «самцах», шырока распаўсюджаных у абаронным дойлідстве Усходняй Еўропы. Глыбокія гістарычныя карані такой канструкцыі на Аршаншчыне бачны ў захаваўшыхся да нашага часу дахах на «самцах» у традыцыйных вясковых жытлах (Барань), прысутнасці драўляных скляпеністых перакрыццяў у культавых збудаваннях.

Ярусна-вежавая будова аб'ёмаў, якая ўзнікла ў драўляных фартыфікацыйных збудаваннях, знайшла далейшае ўдасканаленне і развіццё ў культавым дойлідстве. Драўляныя культавыя пабудовы Аршаншчыны вызначаюцца канкрэтнымі аб'ёмна-прасторавымі і кампазіцыйнымі асаблівасцямі ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі. Галоўная з іх — выразная ярусна-цэнтрычная будова кампазіцыі планіроўкі асноўнага рытуальнага памяшкання, нефа, як правіла, значных памераў у параўнанні з алтарнай часткай, прытворам (бабінцам), бакавымі прырубамі. Сцены нефа выводзяцца на значную ў параўнанні з астатнімі памяшканнямі вышыню і ствараюць ярусную будову (васьмярык на чацвярык са светавым барабанам і цыбулістай галоўкай). Галоўны і бакавыя прытворы, як правіла, аднаяруснымі, з шатровым завяршэннем і невялічкімі глаўкамі на ліхтарах. Яркім прыкладам такога аб'ёмна-прасторавага рашэння была Ільніская царква Маркава кляштара ў Віцебску (17 ст.), а таксама драўляны Богаяўленскі сабор 17 ст. Куцеінскага манастыра ў Оршы.

Будаўніцтва Богаяўленскага сабора было завершана прыкладна ў 1635 г. У планіроўцы гэта была чатырохзрубная крыжова-цэнтрычная пабудова. Пры гэтым чатырохкутную форму меў толькі звернуты на захад уваходны бабінец (прытвор). Бакавыя прырубы і алтар мелі форму пяцікутніка. Прасторны неф плаўна пераходзіў у сутарэнне, завершанае шматкутным барабанам з купалам. Прырубы завяршаліся больш сціплымі глаўкамі. Захавалася літаграфія 19 ст. з выявай сабора. Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што шатровыя завяршэнні прырубаў злучаны з барабанам нефа. У такім разе аб'ёмна-прасторавае рашэнне сабора нагадвае храмы з папярочным нефам — трансептам. Гэта лагічна вынікае з крыжовай формы плана.

Прынцыпова новае рашэнне мае цэнтрычная кампазіцыя Спаса-Праабражэнскай царквы 1704 г. з вёскі Барань, былога мястэчка

Радзівілаў, заснаванага ў канцы 16 ст. Аснову аб'ёмна-прасторавага рашэння складае блізкі да квадрата ў плане неф. Сцены яго ўздымаюцца ўвысь і пераходзяць у зрубнае скляпенне, завершанае чатырохсхільным дахам, на якім васьмікутны барабан прымае шлемападобную главку. На ўзроўні 1-га яруса сцены нефа маюць шырокія партальныя праёмы. Верхні ярус мае аконныя праёмы для верхняга святла. З усходняга боку да нефа прымыкае пяцікутны алтар. Вакол астатніх сцен нефа па тыпу галерэі ідуць памяшканні, якія выконваюць функцыі прытвору і бакавых прыдзелаў. У гэтым прынцыповае адрозненне рашэння планіроўкі ў параўнанні з планіроўкай Богаяўленскага сабора. Зазначым, што такі прыём для дадзенага рэгіёна тыповы. Прыгадаем аб'ёмна-прасторавае рашэнне Троіцкай царквы Маркавага манастыра 17 ст. ў Віцебску, якая мела неф, абкружаны галерэйнымі прыбудовамі. Адзначанае аб'ёмна-прасторавае рашэнне назіраецца ў драўляным манументальным дойлідстве Смаленшчыны, Пскоўшчыны, Наўгародчыны, Рускай Поўначы, Левабярэжнай Украіны і нават Карпат, што сведчыць аб яго глыбокіх старажытных каранях. Аналагам баранскай з'яўляецца царква ў мястэчку Раманава пад Слуцкам (паводле малюнка мастака 19 ст. Д.Струкава).

Аналагічную кампазіцыйную будову мае і Спаса-Праабражэнская царква 2-й палавіны 18 ст. у Смалянах. Тут таксама дамінуе цэнтральны аб'ём нефа з купальным завяршэннем, абкружаны з 3 бакоў аднаяруснай галерэйнай прыбудовай. Адметная асаблівасць — чатырох'ярусныя фланкіруючыя стромкія вежы ва ўсходнім фасадзе. Яны ставяць гэты помнік драўлянага манументальнага дойлідства ў адзін рад з мураванымі абарончага тыпу 16—17 ст. Зразумела, што ў канкрэтным выпадку вежы сімвалізуюць пераемнасць больш старадаўніх уяўленняў аб развіцці форм.

Пра распаўсюджанасць цэнтрычнага рашэння кампазіцыі храмаў на Аршаншчыне сведчаць і іншыя драўляныя і мураваныя помнікі: Свята-Троіцкая царква ў Арэхаўску, рэшткі царквы ў Солаўі, галоўны аб'ём Аляксееўскай царквы ў Смалянах, Пакроўскай царквы ў Смалянах, Пакроўскай царквы ў Дуброўне, Прачысценскай у Крапіўне, царквы ў Браздзетчыне. Ва ўсіх іх аснову аб'ёмна-прасторавага рашэння складае прасторны, блізкі да квадрата ў плане неф, завершаны купалам.

Традыцыі цэнтрычна-замкнутай сістэмы назіраюцца і ў архітэктуры сядзібнай забудовы Аршаншчыны. Перыметрычна-замкнутая дваровая забудова самая старажытная на еўрапейскім кантыненце. Яна вядома ў немцаў, венграў, усіх славянскіх народаў, народаў Скандынавіі, датчан, галандцаў. Некаторыя замежныя даследчыкі бачылі ў гэтым сувязь з традыцыямі антычнасці: атрыумным дваром, рымскай вілай. Прычыны такога падабенства, на нашу думку, крыюцца ў адзінстве гаспадарча-культурнага развіцця земляробчага насельніцтва. Па меры руху з поўдня на поўнач Усходняй Еўропы перыметрычная забудова паступова змяняецца ад адкрытай (у стэпавых і лесастэпавых рэгіёнах) да закрытай (крыты двор Рускай Поўначы). Пры гэтым адзінкавыя ўзгоры крытага двара сустракаюцца і ў беларускіх Паазер'і і Падняпроўі.

У в. Волева Дубровенскага раёна у час экспедыцыі ў 1986 г. быў выяўлены двор пачатку 20 ст. з цікавымі аб'ёмна-планіровачнымі асаблівасцямі. Жылое звяно двара складаецца з 2 зрубаў (хаты і каморы), злучаных закінутымі ў шулы сценамі, якія ўтвараюць сенцы (сувязь хата—сені—камора). З сенцаў маецца непасрэдны выхад у даволі прасторны хлеў, па плошчы амаль роўны плошчы жылога дома. Прастора хлява падзелена плеценымі загародкамі на асобныя загоны (катухі). Жылое звяно і хлеў знаходзяцца пад агульным двухсхільным дахам. Схіл, які перакрывае хлеў, больш пакаты і спускаецца амаль да зямлі. Гэта рэдкі для Беларусі тып крытага двара, больш вядомы ў суседніх рэгіёнах Расіі і народным жытле латышоў (латвійская жылая рыга).

У гэтай жа вёсцы выяўлены і тып больш распаўсюджанага круглага вяночнага двара (пабудаваны ў канцы 19 ст., перавезены ў экспазіцыю Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту). Двор складаецца з жылога звяна (хаты з сенцамі) і перыметрычна збудаванага комплексу хлявоў, злучаных з хатай з боку вуліцы брамай. Асаблівасцю круглых двароў Падняпроўя, якія прысутнічаюць у дадзеным прыкладзе, з'яўляецца дамінуючая роля жылога звяна (вылучаецца памерамі ў адзіным аб'ёмна-прасторавым ансамблі забудовы) і цэласнасць ком-

плексу гаспадарчых прыбудоў зрубна-камбінаванай канструкцыі (спалучэнне зрубаў са сценамі ў шулы), сегментацыя якіх ажыццяўлялася лёгкімі плеценымі загародкамі. Такі комплексны хлеў у Падняпроўі называецца агульным тэрмінам «пуня». Традыцыйнымі элементамі абсталявання хаты з'яўляюцца печка на высокай падрубе, пол і палаці, падлога (мост) на лагах (падмостніках), стол на падоўжаных бэльках, ямнае заглыбленне пад полам (насцілам для адпачынку) для зімовага ўтрымання ў хаце авечак. Сцены жытла ўцяпляліся на зіму саламянымі матамі.

Асобна трэба спыніцца на аб'ёмна-планіровачных і кампазіцыйных асаблівасцях драўлянай традыцыйна-гістарычнай забудовы гарадоў і мястэчак Аршаншчыны. Тут таксама яскрава бачны кампактна-цэнтрычныя рысы, якія сведчаць аб канкрэтным тыпе драўлянага гарадскога дома 19 — пачатку 20 ст. Гэта зрубнае збудаванне на мураваным падмурку пад чатырохсхільным дахам, блізкае ў плане да квадрата. Пазначаны тып распаўсюджаны ў Беларусі на ўсёй тэрыторыі на ўсход ад Дняпра, а таксама ў ніжнім цячэнні Беразіны. Тры акны на вулічным фасадзе з паўарачнымі завяршэннямі — рыса, распаўсюджаная ад Оршы да Добруша.

Адметнай асаблівасцю драўлянага традыцыйнага гарадскога жытла Аршаншчыны з'яўляецца арыгінальнае дэкаратыўна-пластычнае аздабленне. Традыцыі разнога дэкору тут узыходзяць да 15—16 ст. У адным з інвентароў Копыскага замка 16 ст. адзначаецца збудаванне з адмысловым аздабленнем разьбой і размалёўкай. Майстры-разьбяры з Копысі і Оршы ў 16—17 ст. паспяхова працавалі ў Маскве пры двары, у манастырах і храмах. Асаблівасць аршанскага разнога дэкору — у адзінкавым для Беларусі ўзоры барэльефнага аздаблення ліштваў, які захаваўся на драўляным доме канца 19 — пачатку 20 ст. па вуліцы Савецкай, 78/1 у Оршы. Такі тып разьбы распаўсюджаны ў суседніх і больш аддаленых рэгіёнах Расіі, вядомы ў карабельнай рэзі Паволжа. Разьбяное аздабленне былой карчмы 19 ст. ў Оршы па вул. Пралетарскай, 12, якое было выканана напачатку 20 ст., калі будынак быў перавезены сюды са старых яўрэйскіх могілак і прыстасаваны пад жыллё, закранае ўсе элементы, што фарміруюць фасад: ганкі, вокны і аканіцы, шалёўку, надваконны фрыз, карнізы. Разьбяное аздабленне фасаду ў цэлым характэрна для драўлянай гістарычнай забудовы гарадоў беларускага Падняпроўя ад Оршы да Гомеля і Рэчыцы. Кампазіцыйныя варыяцыі і сюжэты ствараюцца спалучэннямі прапільных і накладных элементаў, што ствараюць знакі і сімвалы індаеўрапейскай і ўсходнеславянскай семантыкі.

Такім чынам, у развіцці кампазіцыйных і дэкаратыўна-пластычных асаблівасцей драўлянай архітэктуры Аршаншчыны бачны глыбокія гістарычныя карані. У іх зафіксаваны лакальныя (мясцовыя), рэгіянальныя, нацыянальныя і міжэтнічныя рысы, якія сведчаць аб высокай культуры мясцовых цесляроў, дойлідаў, разьбяроў. *А.І.Лакотка.*

Помнікі архітэктуры Оршы

МАНАСТЫР ТРЫНІТАРЫЯЎ (вул. Камсамольская, 21). Пабудаваны ў 1714 г. Уключаў мураваны касцёл і манастырскі будынак. Касцёл, пазней перабудаваны ў праваслаўны сабор, не захаваўся. У жылым будынку размешчаны архіў, склады і жыллё.

Двухпавярховы Г-падобны ў плане цагляны будынак накрыты двухскатным дахам. Сцены прарэзаны 2 радамі прамавугольных аконных праёмаў, якія чаргуюцца на ўсходнім фасадзе з плоскімі нішамі. Паўднёвы тарэц будынка падпіраюць моцныя контрфорсы. На першым паверсе ўсходняга і паўночнага фасадаў маецца падаконная цяга. Завяршае сцены будынка шырокі прафіляваны карніз. Абодва паверхі маюць галерэйную сістэму планіроўкі.

Жылы будынак — помнік архітэктуры барока.

МАНАСТЫР БЕРНАРДЗІНЦАЎ (Бальнічны зав., 1). Пабудаваны ў 1-й палавіне 17 ст. на беразе р. Аршыца. У склад комплекса ўваходзілі мураваны касцёл і двухпавярховы жылы будынак. Касцёл не захаваўся. У жылым будынку размешчана лячэбная ўстанова.

Двухпавярховы Г-падобны ў плане цагляны корпус накрыты вальмавым дахам. Сцены прарэзаны 2 радамі прамавугольных аконных

праёмаў, апрацаваных налічнікамі. Па вуглах будынка маюцца шырокія лапаткі. Завяршае сцены корпуса прафіляваны карніз.

Жылы будынак — помнік архітэктуры барока з элементамі ранняга класіцызму.

МАНАСТЫР ФРАНЦЫСКАНЦАЎ (вул. Дамініканская, 4). Пабудаваны ў 1-й палавіне 17 ст. У склад комплекса ўваходзілі мураваны касцёл і жылы будынак. Касцёл не захаваўся. Манастырскі будынак выкарыстоўваецца пад жыллё.

Двухпавярховы Г-падобны ў плане мураваны корпус накрыты вальмавым дахам. Сцены прарэзаны 2 радамі аконных праёмаў, на другім паверсе яны лучковыя, на першым — прамавугольныя. На тарцовым фасадзе маецца паўцыркульная ніша, па вуглах выступаюць плоскія лапаткі — контрфорсы. Завяршае сцены корпуса прафіляваны карніз.

Манастрыскі будынак — помнік архітэктуры барока з элементамі ранняга класіцызму.

МАНАСТЫР ЕЗУІТАЎ (вул. Леніна, 6а). Пабудаваны ў 17 ст. У склад комплекса ўваходзілі мураваны касцёл, двухпавярховы мураваны будынак для калегіума (1690 г.), аднапавярховы будынак бурсы, гаспадарчыя пабудовы. Захаваліся будынкі калегіума, бурсы, афіцыны, частка мураванай манастырскай сцяны. Да 1989 г. тут размяшчалася спецыяльная ўстанова. Цяпер комплекс знаходзіцца на кансервацыі.

Двухпавярховы першапачаткова П-падобны ў плане мураваны корпус калегіума накрыты двухсхільным дахам. Сцены прарэзаны 2 радамі прамавугольных вокнаў. На адной з тарцовых сцен маецца арачны ўваход, на другой захаваліся пілястры. Завяршае сцены корпуса шырокі карнізны пояс. Манастырская сцяна апрацавана пілястрамі.

Комплекс манастыра езуітаў — помнік архітэктуры барока.

КАСЦЁЛ ДАМІНІКАНЦАЎ (вул. Савецкая, 6). Пабудаваны ў 1819 г. з цэглы на месцы былога драўлянага. Будынак часткова страціў свой першапачатковы выгляд.

Манументальны, Т-падобны ў плане аб'ём выцягнуты ўздоўж вуліцы і павернуты да яе бакавым фасадам. Галоўны фасад меў сіметрычную кампазіцыю. Ніжняя выступаючая частка плоскасці фасада раздзелена 2 глыбокімі нішамі. Восевае рашэнне ўвахода падкрэслена паўцыркульнай фрамугай. Плоскасць сцяны па ўзроўню другога паверха прарэзана 3 лучковымі аконнымі праёмамі з палічкамі. Другі ярус вырашаны ў выглядзе шырокага атыка, дэкарыраванага пілястрамі і цыркульным дахавым акном. Завяршаў фасад трохвугольны франтон. Бакавыя фасады асноўнага аб'ёму былі дэкарыраваны неглыбокімі арачнымі нішамі.

У архітэктуры касцёла праслежваюцца рысы класіцызму.

З 1990 г. дзеючы касцёл св. Іосіфа, знаходзіцца на рэстаўрацыі.

МАНАСТЫР БАЗЫЛЬЯН (Музейны зав., 12). На правым беразе р. Аршыца. Пабудаваны ў 2-й палавіне 18 ст. Ансамбль манастыра складаўся з царквы Апекі Маці Божай у стылі барока (1758—74 гг.; трохнефавая крыжова-купальная базіліка з паніжанымі бакавымі і высокім папярочным нефамі, двухвежавым галоўным фасадам; не збераглася) і прыбудаванага да яе манастырскага жылога корпуса.

Касцёл дамініканцаў. На заднім плане — касцёл францысканцаў (не захаваўся).

З 1823 г. будынкі належалі мужчынскаму Пакроўскаму праваслаўнаму манастыру.

Уцалелы манастырскі будынак Г-падобны ў плане, двухпавярховы, накрыты двухсхільным дахам. Абодва паверхі маюць галерэйную сістэму планіроўкі. Сцены апрацаваны слаістымі пілястрамі і руставанымі лапаткамі. Першы і другі паверхі падзяляе гарызантальны пояс. Неапрацаваныя ліштвамі аконныя праёмы чаргуюцца з плоскімі нішамі. У паўднёва-ўсходняй частцы будынка размешчаны лесвічная клетка і парадныя залы. Астатнія памяшканні плошчай да 36 м^2 адводзіліся для жылля і працы. Моцныя сцены таўшчынёй да 1 м аблегчаны нішамі. Падвальнае памяшканне перакрываюць цыліндрычныя скляпенні з распалубкамі. Перакрыццё над 1-м паверхам у выглядзе крыжовых скляпенняў, над 2-м — на драўляных бэльках. Зараз на кансервацыі.

Помнік архітэктуры барока з элементамі ранняга класіцызму.

ІЛЫНСКАЯ ЦАРКВА (вул. Ільінская, 2). На левым беразе Дняпра. Пабудавана ў 1882 г. з цэглы. Храм крыжова-купальнай кампазіцыі з пяцігранай апсідай і шатровай званіцай над тамбурам. Фасады насычана дэкарыраваны разнастайнымі філёнгамі, раскрапоўкамі, карнізамі і кілепадобнымі арачкамі-какошнікамі. Інтэр'ер мае сіметрычную выцягнутую па падоўжанай восі будову: тамбур, асноўны аб'ём, апсіда. Цэнтральная частка асноўнага аб'ёму завершана купаламі. Тэрыторыя царквы абнесена мураванай агароджай, вуглы якой умацаваны контрфорсамі, дэкаратыўнымі вежачкамі. Манументальная брама знаходзіцца з боку вул. Ільінскай.

Царква — помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

ВАДЗЯНЫ МЛЫН (вул. Замкавая, 2), на штучным канале, які злучае р. Аршыца з Дняпром. Пабудаваны ў комплексе з арачным мостам у 1902 г. з чырвонай цэглы. Выкарыстоўваецца пад этнаграфічны музей «Млын».

Млын пабудаваны на бутавым падмурку. Накрыты двухсхільным бляшаным дахам. Складаецца з трохпавярховага прамавугольнага ў плане галоўнага аб'ёму і аднапавярховага рабочага памяшкання. Архітэктура вырашана ў традыцыях псеўдаготыкі, з асобнымі элементамі псеўдарускага стылю. Сцены, прарэзаныя лучковымі праёмамі, не атынкаваны, а толькі пабелены. Элементы чляненя: лапаткі, гарызантальныя паясы («плоскія» і «парэбрыкам»), антаблемент — мелі натуральны колер чырвонай цэглы. Галоўны (паўднёва-ўсходні) фасад завяршае франтон з дэкаратыўным круглым акном, па баках якога з цэглы выкладзена дата пабудовы — 1902 год.

Мост — аднапралётная арачная канструкцыя з чырвонай цэглы на бутавым падмурку. Асобныя дэталі (парапет са стральчатымі праёмамі, картушавыя шчыты па баках аркі) надаюць збудаванню псеўдагатычныя рысы.

Млын з мостам — помнік прамысловай архітэктуры Беларусі пачатку 20 ст.

РЭАЛЬНАЕ ВУЧЫЛІШЧА (вул. Леніна, 41). Пабудавана ў пачатку 20 ст. з цэглы. Цяпер тут сярэдняя школа № 1.

Двухпавярховы будынак складаецца з цэнтральнага корпуса і 2 рознавялікіх бакавых крылаў. Галоўны фасад з 3 рызалітамі, сярод якіх дамінуе цэнтральны, завершаны бельведэрам з невялікім шлемападобным купалам. Уваход вылучаны навесам на 2 слупах з балконам на 2-м ярусе. Фасад мае насычанае пластычнае і арнаментальнае вырашэнне: руставаныя лапаткі па вуглах і ў прасценках, аркатура, пінаклі, філёнгі. Усе элементы архітэктурнага дэкору вырашаны сродкамі цагляной муроўкі. У рытмічнай пабудове галоўнага фасада выкарыстаны разнастайныя па форме аконныя праёмы. Цэнтральны вузел планіроўкі — вестыбюль і лесвічная клетка, аб'ём якой выступае з боку ўнутранага дворыка эркерам за закругленымі вугламі. У вестыбюлі 4 слупы падтрымліваюць перакрыцце, абапал лесвіцы — памяшканні гардэроба. Аўдыторыі размешчаны ўздоўж калідораў.

Будынак — помнік грамадзянскай архітэктуры пачатку 20 ст., выразнасць якой дасягаецца высакаякаснай фігурнай цагляной муроўкай.

Орша. Рэальнае вучылішча (цяпер будынак СШ №1).

У вучылішчы ў 1907—09 гг. працаваў дзеяч рэвалюцыйнага руху, публіцыст П.М.Лепяшынскі. У 1966 г. на будынку школы на ўшанаванне яго памяці ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

ЖАНОЧАЯ ГІМНАЗІЯ (вул. Міру, 6). Пабудавана ў пачатку 20 ст. з цэглы. Пазней было дабудавана правае крыло. Цяпер у будынку размяшчаецца педагагічны каледж.

Двухпавярховы, прамавугольны ў плане аб'ём галоўным фасадам павернуты да вул. Міру (былой Афіцэрскай), накрыты вальмавым дахам. Цэнтральная частка фасада выдзелена рызалітам па вышыні двух паверхаў, уваход падкрэслены порцікам з 2 паўкалонамі і трохвугольным франтонам на ўзроўні перакрыцця 1-га паверха. Фасад прарэзаны 2 радамі прамавугольных аконных праёмаў. Плоскасці сцяны 1-га паверха над высокім цокалем апрацаваны прадольным рустам. На ўзроўні перакрыцця 1-га паверха — шырокая гарызантальная цяга, пад вокнамі 2-га паверха маюцца неглыбокія нішы. Міжаконныя плоскасці на 2-м паверсе дэкараваны пілястрамі. Вуглы будынка апрацаваны лапаткамі.

Будынак жаночай гімназіі — помнік грамадзянскай архітэктуры пачатку 20 ст., асаблівасцю якога з'яўляецца высокаякасная цагельная кладка.

Орша. Жаночая гімназія.

ЗАБУДОВА ВУЛІЦЫ ЛЕНІНА. Вялася ў канцы 19 — пачатку 20 ст. Уключае цагляныя дамы № 11, 26.

Дом № 11. Пабудаваны ў канцы 19 — пачатку 20 ст. Цяпер тут музей гісторыі і культуры г. Орша. Аднапавярховы, квадратны ў плане, накрыты вальмавым дахам. Архітэктурным дэкорам апрацаваны толькі галоўны фасад, які выходзіць на «чырвоную лінію» вулічнай забудовы. Плоскасна трактаваны фасад расчлянёны арачнымі вокнамі і крапаваны надаконнымі броўкамі, рустава-

Орша. Від на Пецярбургскую вуліцу(цяпер вул. Леніна).

нымі прасценкамі, філёнгамі, прафіляваным карнізам. Уваход у дом з боку двара праз стральчатую браму-арку.

Дом № 26. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. Цяпер тут музей Ул.Караткевіча. Галоўны фасад прамавугольнага ў плане аднапавярховага аб'ёму, вьщягнутага ўздоўж вуліцы, мае сіметрычна-восевае вырашэнне з лучковымі ўваходнымі і аконнымі праёмамі. Над уваходам навес на вітых арнаментальных кранштэйнах з жалеза. Пластыка і дэкор фасада ствараюцца сродкамі дэкаратыўнай цаглянай муроўкі, выкарыстаны сандрыкі, руст, лапаткі, цокаль апрацаваны філёнгамі. Прафіляваны карніз, які аддзяляе фасад ад двухсхільнага даху, у цэнтры вылучаны франтонам.

Забудова вуліцы Леніна — прыклад жыллёвага будаўніцтва з рысамі эклектычнай архітэктуры.

ЗАБУДОВА ВУЛІЦЫ МІНСКАЙ. Сфарміравана ў пачатку 20 ст. Уключае цагляныя дамы № 11, 17, 19, якія ствараюць адзіны ансамбль.

Дом № 11. Вуглавы, на скрыжаванні вуліц Мінскай і Леніна, на ўзгорку. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. Цяпер у ім размешчана адміністрацыйная ўстанова. Двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак пакрыты двухсхільным дахам. Да галоўнага фасада асіметрычна далучаецца аб'ём уваходнага тамбура з міжпаверхавай лесвіцай, да тарцовага — прыбудова. Элементы дэкору фасадаў вырашаны сродкамі цаглянай муроўкі: ліштвы акон, сандрыкі, клінападобныя аркі, філёнгі, лапаткі, міжпаверхавы фігурны пояс. Папярочнай сцяной дом падзелены на 2 палавіны, планіроўка зменена адпаведна сучаснаму выкарыстанню.

Дом № 17. Уключаны ў фрагмент забудовы вуліцы ў пачатку 20 ст. Двухпавярховы аб'ём з пакатым дахам вьщягнуты ўздоўж вуліцы і павернуты да яе галоўным фасадам. Яго рытм ствараюць рады лучковых акон і 2 дзвярныя праёмы. Фасад дэкарыраваны клінападобнымі аркамі, лапаткамі, філёнгамі, рустам, сандрыкамі, выкананымі сродкамі цаглянай муроўкі. Тарцовыя фасады глухія, без праёмаў і архітэктурнага дэкору. Дом папярочным калідорам падзелены на 2 палавіны.

Дом № 19. Вуглавы, на скрыжаванні вул. Мінскай з 2-м Мінскім завулкам. Пабудаваны ў пачатку 20 ст. Двухпавярховы, Г-падобны ў плане, будынак апрацаваны тынкоўкай. На яе фоне вылучаюцца 2 рады лучковых і прамавугольных аконных праёмаў. Плоскасна вырашаныя фасады ўпрыгожаны міжпаверхавым тонкапрафіляваным поясам, карнізам з сухарыкамі. Тарцовыя фасады пазбаўлены праёмаў і дэкору. Два крылы дома маюць розную планіроўку: па вул. Мінскай — анфіладную, па завулку — калідорную.

Забудова па вул. Мінскай — прыклад жыллёвага будаўніцтва, дзе шырока выкарыстаны дэкаратыўныя ўласцівасці фігурнай цаглянай муроўкі. *Г.Г.Урублеўская.*

Помнікі архітэктуры Аршанскага раёна

СВЯТА-ТРОІЦКАЯ ЦАРКВА. Знаходзіцца ў цэнтры г.п. Арэхаўск. Пабудавана ў 1-й палавіне 19 ст. з дрэва. Разам з двух'ярусной званіцай утварае адзіны ансамбль. Царква складаецца з квадратнага ў плане цэнтральнага аб'ёму, увенчанага сферычным купалам на нізкім круглым барабане, вузкага тамбура і паўкруглай алтарнай часткі. Будынак пастаўлены на нізкі падмурак, звонку ашаляваны, накрыты бляхай. Інтэр'ер збудавання вырашаны строга і лаканічна. Цэнтральнае памяшканне рытмічна расчлянёна 4 падпружнымі аркамі. Барабан ад сцен зруба аддзелены масіўным карнізам з нізкім атыкам. Паніжаная алтарная частка адгароджана іканастасам. Сцены ўнутры атынкаваны. Званіца складаецца з 2 чацверыковых ярусаў; увенчана 4 франтонамі і шатровым бляшаным дахам, звонку ашалявана. Царква і званіца — тыповыя помнікі драўлянага дойлідства, архітэктура якіх склалася пад уплывам класіцызму.

СЯДЗІБА (належала Макшьщкім). Знаходзіцца на паўночнай ускраіне в. Высокае. Пабудавана на мяжы 19—20 ст. Ядро сядзібнага ансамбля спланавана па сіметрычна-восевай схеме, у цэнтры якой жылы дом. Перад ім прамавугольны двор, фланкіраваны 2 флігелямі. Сядзібны дом складаецца з драўлянага аднапавярховага корпуса і пазнейшай двухпавярховай мураванай прыбудовы. Прамавугольная ў плане прыбудова вылучана ў цэнтры паўднёвага фасада пяцігранным эркерам са стральчатымі акон-

нымі праёмамі. Яе цокальны паверх расчлянёны лучковымі падвальнымі вокнамі. Першы паверх дэкарыраваны рустам, другі — руставанымі вуглавымі лапаткамі і абрамленнем аконных праёмаў у выглядзе прафіляваных ліштваў з трохвугольнымі франтончыкамі і падаконнымі філёнгамі.

Непадалёк ад сядзібнага дома знаходзіцца пабудаваны ў 1912 г. аднапавярховы мураваны флігель з мансардавым паверхам. На галоўным фасадзе выступае пяцігранны двухпавярховы эркер, у дэкоры выкарыстаны руст, меандр. Другі флігель мае традыцыйныя рысы сельскага зрубнага дома. Аднапавярховы будынак пад вальмавым дахам, у цэнтры ганак са слупамі, стылізаванымі пад калоны. Сядзіба — помнік эклектычнай архітэктуры.

У сядзібе 25.6—25.7.1928 г. адбыўся 1-ы з'езд Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.

ЦАРКВА АЛЯКСАНДРА НЕЎСКАГА. Знаходзіцца ў цэнтры в. Крапіўна. Пабудавана ў 2-й палавіне 19 ст. з цэглы. Крыжовакупальная са званіцай. Складаецца з размешчаных па падоўжнай восі прамавугольных у плане званіцы, бабінца, цэнтральнага аб'ёму, завершанага купаламі пяціграннай апсіды. Будынак адрэстаўрыраваны.

СЯДЗІБА (належала Лубінскім). Знаходзіцца ў цэнтральнай частцы в. Межава. Займае плошчу каля 12 га. Дом размешчаны паблізу вуліцы. Сядзібны дом пабудаваны ў канцы 19 ст. з цэглы ў стылі «мадэрн». У Вялікую Айчынную вайну яго ўсходняя палавіна была разбурана, у 1950 г. адноўлена з нязначнымі перабудовамі і нанава дэкарыравана ў стылі класіцызму. Будынак уяўляе сабой двухпавярховы аб'ём з паўвальмавым мансардавым

Сядзібны дом у в. Межава.

Смаляны. Капліца і Аляксееўская царква. Здымак 1988 г.

дахам і невялікімі рознымі па форме прыбудовамі. У бакавой прамавугольнай прыбудове зроблены ўваход, які вядзе ў вестыбюль з лесвіцай на другі паверх. Аконныя праёмы, балконы, коміны размешчаны асіметрычна.

Парк закладзены ў 1901 г, і адносіцца да тыпу штучна створаных пейзажных паркаў. Сядзіба — помнік архітэктуры стылю «мадэрн» і садова-паркавага мастацтва.

АЛЯКСЕЕЎСКАЯ ЦАРКВА. Знаходзіцца на ўсходняй ускраіне в. Смаляны. Узведзена ў 1864 г. з цэглы. Асноўны прамавугольны ў плане аб'ём з трохграннай апсідай завяршаецца купалам на васьмігранным светлавым барабане. Галоўны фасад вылучаецца двух'яруснай шатровай вежай-званіцай. Царква — помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

ДАМІНІКАНСКІ КАСЦЁЛ. Знаходзіцца ва ўсходняй частцы в. Смаляны. Пабудаваны ў 2-й палавіне 18 ст. з цэглы пры манастыры дамініканцаў. У 1899 г. пад кіраўніцтвам архітэктара Даўкшы праведзены рамонт касцёла і манастырскага будынка. Па яго малюнках зроблены многія дэталі інтэр'ера касцёла — алтары, вялікая люстра і інш.

Касцёл трохнефавы, двухвежавы з паўкруглай апсідай. Цэнтральны неф перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі з распалубкамі. Двух'ярусная трохвосевая кампазіцыя галоўнага фасада падкрэслена пілястрамі, якія разбіваюць яго на 3 злёгку ўвагнутыя паверхні. Невысокія вежачкі аб'ядноўваюцца на ўзроўні карнізнай цягі развітым франтонам. Адсутнасць прамежкавага гарызантальнага члянення на галоўным фасадзе надае ма-

Смаляны. Руіны замка «Белы Ковель» 17 ст.

сіўнасць і манументальнасць усяму збудаванню. Трансепт вылучаецца толькі на ўзроўні другога яруса — у першым ярусе ён выкананы ў адным аб'ёме з бакавымі капэламі, якія пераходзяць у аднаярусныя сакрысціі. Дэкаратыўнае афармленне інтэр'ера і алтароў не захавалася.

Мураваны аднапавярховы манастырскі будынак калідорнага тыпу размешчаны паралельна паўночнаму фасаду касцёла. Калідор перакрыты цыліндрычным скляпеннем, абапал яго келлі і гаспадарчыя памяшканні. Помнік — прыклад архітэктуры позняга барока.

РУІНЫ ЗАМКА «БЕЛЫ КОВЕЛЬ». Знаходзяцца на паўночна-заходняй ускраіне в. Смаляны на правым беразе р. Дзярноўка. Замак пабудаваны ў 1-й чвэрці 17 ст. князем С.Сангушкам-Ковельскім. Змураваны з буйной цэглы і невялікіх камянёў. Моцна пашкоджаны ў час Паўночнай вайны ў 1708 г., канчаткова разбураны ў 1-й палавіне 19 ст. Захаваліся рэшткі вежы.

Здзірванелая прамавугольная ў плане пляцоўка замка (100 × 200 м) толькі на 40—60 см узвышаецца над балоцістай поймай. Магчыма, у 17—18 ст. замак быў абкружаны штучным вадаёмам. Гэта пацвярджаецца яго размяшчэннем у балоцістай нізіне і адсутнасцю валоў і асабліва бастыёнаў. Прыкладна ў цэнтры прамавугольніка на невысокім узгорку знаходзяцца руіны (да 20 м вышынёй) пяціграннага вежавага выступу. Яго замкнуты аб'ём ствараецца сцяной 2—3-павярховага корпуса (магчыма, галоўнага будынка замка). З вежы быў выхад ва ўнутраны двор замка, абмежаваны трохпавярховымі карпусамі з квадратнымі вежамі па вуглах, высунутымі за лінію сцен, і ўязной брамай.

Муроўка замка па тыпу найбольш блізкая да так званай галандскай. У муроўцы трапляюцца сярэдніх памераў камяні, падчас па некалькі ў рад. Таўшчыня сцен ад 120 да 170 см. Памеры цэглы 8 × 13 × 29 см.

Уцалелыя дэталі вонкавага дэкору — ляпны картуш і абрамленні аконных праёмаў — пераклікаюцца з узорамі дэкору і архітэктуры 1-й палавіны 16 ст. Захаваліся таксама фрагменты інтэр'ера — сляды вітай лесвіцы, якая ішла па ўнутраным перыметры вежы, вялікая колькасць рознага памеру ніш па ўнутранай паверхні той жа вежы, арачны пераход з галоўнага корпуса ў вежу, дэталі камінаў. Замак быў афарбаваны ў белы колер. У пачатку 17 ст. сцены памяшканняў размаляваны фрэскамі. Замак быў адным з буйнейшых палацава-замкавых ансамбляў на тэрыторыі Беларусі ў пачатку 17 ст.

СПАСА-ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА. Знаходзіцца на поўначы в. Смаляны. Пабудавана ў 2-й палавіне 18 ст. Складаецца з двух частак: ніжняй мураванай і верхняй драўлянай. Царква — крыжова-купальны будынак.

Смаляны. Спаса-Праабражэнская царква.

Яе высокі манументальны аб'ём утварае ў плане крыж, да яго з паўднёвага і паўночнага ўваходаў прырублены чацверыкі вежаў. Пабудову з 3 бакоў абкружае нізкая глухая галерэя. Цэнтральнае сяродкрыжжа ўвенчана масіўным шлемападобным купалам на нізкім чацверыковым барабане, які падтрымліваецца аркай і 2 слупамі ў інтэр'еры. Галоўны фасад трох'ярусны. Апошні ярус складаюць шатровыя вежы «васьмярык на чацверыку». Бакавыя рамёны «крыжа» завяршаюцца трохвугольнымі франтонамі. Вокны ў сярэднім ярусе аб'ёму прамавугольныя і, за выключэннем алтарных, спараныя, а ў барабане — паўцыркульныя і лучковыя.

У інтэр'еры галоўнае памяшканне вылучаецца па вышыні купалам на барабане, з дэкаратыўнай балюстрадай. Ва ўсходнім рамяне «крыжа», над уваходам, размешчаны хоры. Алтар аддзяляе ярусны разны іканастас.

На купале размалёўкі 18 ст., якія вызначаюцца маляўнічасцю каляровай гамы і манументальнасцю кампазіцыі (зроблены тэмперай на дошках). Намаляваны 12 апосталаў на ўвесь рост. Велічныя постаці на блакітным фоне ў адзеннях вохрыста-чырвонага, балотна-зялёнага, залаціста-карычневага колераў запаўняюць амаль усе роўніцы граней купала.

Царква — прыклад перапрацоўкі форм мураванай архітэктуры стылю барока ў драўляным дойлідстве Беларусі 18 ст.

СПАСА-ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА. Знаходзілася ў цэнтры в. Барань. Пабудавана ў 1704 г. з дрэва.

Асноўны аб'ём — высокі квадратны ў плане зруб, завершаны пакатым шатровым бляшаным дахам і васьмігранная вежачкай з купалком; абкружаны з 3 бакоў невысокай абходнай галерэяй. Да яго з усходу прырублена больш нізкая алтарная гранёная апсіда з асобным вальмавым дахам. Будынак стаіць на высокім падмурку, звонку вертыкальна ашаляваны. Вокны ў ніжняй частцы прамавугольныя, у верхніх частках паўночнай і паўднёвай сцен галоўнага аб'ёму — трайныя арачныя. Галоўны ўваход афармлены чатырохслуповым ганкам. У інтэр'еры дамінуе цэнтральны аб'ём, завершаны самкнутым скляпеннем. З ім злучаюцца шырокімі праёмамі алтарнае памяшканне і галерэя.

У помніку ўвасобіліся кампазіцыйныя прыёмы, характэрныя для ярусных беларускіх культавых пабудоў 17—18 ст.

У 1987 г. царква перавезена ў Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту.

Нататкі пра аршанскі фальклор

Багатая на народнае паэтычнае слова здаўна была Аршанская зямля.

Цікавай сваёй насычанасцю фальклорна-бытавой фразеалогіяй нашага краю, назіраннямі і параўнаннямі, з выдатнымі эпітэтамі з'явілася перапіска (1574) аршанскага старосты Ф.С.Кміты-Чарнабыльскага з каралём і членамі каралеўскай рады. Кожны з лістоў меў паметкі: «Пісана на Оршы». Гэтыя лісты ўяўляюць сабой данясенні аб пагранічных справах і намерах цара Івана Грознага. Да традыцыйнафальклорных форм і прыёмаў звяртаўся аршанскі староста, калі хацеў выказаць сваю горыч і боль з-за неабгрунтаванага недаверу з боку польскіх апекуноў. «Коли утопили топор давали, а выпливши — топорище», — з крыўдай піша ён у лісце да падканцлера літоўскага Яўстафія Валовіча (1 чэрвеня 1574 г.). Разгубленасць адчуваецца і ў канцы ліста, дзе Кміта-Чарнабыльскі спрабуе змякчыць агульны тон запальчывасці надзвычай трапнай прыказкай: «Як дробило лихо, прорежутся и зубы». Асаблівую схільнасць ён праяўляў да вобразных і вострых па сваім характары прыказак і прымавак, якія надавалі яго доказам і думкам не толькі пераканальнасць, дакладнасць, эмацыянальнае адценне, а нават і пэўную мастацкую маляўнічасць: «А теж и тогды тая баба на двое ворожила»; «Был бы паном, был, а не был. Ибо от него бог избавил»; «Ожегшыся на молоце, велено на воду дуць»; «И каши не хочу, и по воду не иду»; «Люди на кашы переели кашу, а я з голоду здох на сторожы». У лістах Кміты-Чарнабыльскага можна знайсці шмат іншых прыкладаў выкарыстання народнай фразеалогіі, якая служыць раскрыццю індывідуальнасці чалавека, яго ўнутраных адчуванняў і настрояў: «Ажебы хромого волка за лисицу стало»; «Просто як овца: где их больш берет волк, там оне дольше за ним идут!». «Овса просто есмо як рыба в омуте: слепи, ве ведоми!»

У пісьме да Валовіча Ф.Кміта-Чарнабыльскі ўспамінаў пра багатыроў Ілью Му-

раўленіна і Салаўя Будзімеравіча, якія нам вядомы пераважна па рускіх былінах як Ілья Мурамец і Салавей-Разбойнік.

Прыкладам гарадскога фальклору можа быць «Збор польскіх і рускіх вершаў», або «Аршанскі зборнік», які зараз знаходзіцца ў бібліятэцы князёў Чартарыскіх у Кракаве. Дакладная дата рукапісу невядомая — прыблізна канец 17 ст. (не раней 1690 г.). Уключае «Аршанскі зборнік» творы на польскай мове і 66 беларускіх і беларуска-ўкраінскіх ананімных лірычных вершаў-песень. У іх выразна адчуваюцца рысы беларускага фальклору і паэзіі барока.

У канцы рукапісу — каліграфічны надпіс: «Мосці падчашыц Аршанскі мне вельцэ міласцівы Пане і Дабрадзей». Ды яшчэ акраверш на старонках 162—164 «Падчашанка Оршанска, пан мой мілосьцівы». Значыць, зборнік пісаўся для Оршы, для адной з аршанскіх падчашанак. У зборніку няма твораў на рэлігійныя тэмы, ён прызначаўся свецкаму асяроддзю.

Песні «Аршанскага зборніка» часцей за ўсё — аб каханні. Вось тужлівы маналог хлопца з Песні 1:

— Ой, хто ж мяне будзе у маім жалю цешыці,
Хто ж са мною будзе горкі слёзы піці,
Калі нет дзеванькі, каторую люблю,
Бо для няе жыццё маё, здароўе згублю.
Ой, глянь хто, на бога, а пацеш ты мяне,
Скажы, што дзеванька дзелае без мяне?
Чы спіць, чы начуе, чы з кім бяседуе,
Чы так цяжка, как я, горанька гаруе?

Альбо першае чатырохрадкоўе з Песні 2:

Няволенька ж мая з вамі,
З харошанькімі вочанькамі,
Што мне спаці не даеце,
Тугу сэрцу дадаеце.

Лірычны герой часта збіраецца на Украіну, на «войнаньку» з туркамі і татарамі.

У многіх песнях — тужлівыя маналогі дзяўчыны, сэнс якіх можна перадаць першымі двума радкамі Песні 18:

Шчаслівая дарожанька, куды мілы прыязджае,
Нешчаслівая гадзіначка, калі мяне пакідае.

У Песні 7 жанчына сумуе па мужу, які загінуў на вайне:

Ніхто мне не спагадае,
Хто свайго мілага мае.
Майго нету галубанька,
Бедна мая галованька.
Што дзелаці, не плакаці,
На ворага да й наракаці,
Што аднялі малойчыка,
Харошага чэлядзіна.

Радзей сустракаецца дыялог двух закаханых. Песня 11:

— Аннуся, сэрдэнька, маё ты каханне,
Дай жа мне ручонку чэраз цалаванне,
Аннуся, сэрдэнька, паліш маю душу.
Сярод ночы а поўначы да цябе прыйсці мушу.
Аннуся, сэрдэнька, харошае зелье,
Дай жа мне ручынькі, будзеш мець спасенне.
— Чэраз сад на пасад есценькі насіла.
Чаму ка мне не прыйшоў, ешчэм це прасіла.

Ад фальклорных узораў далёкай мінуўшчыны пяройдзем да 19 стагоддзя і 20 стагоддзя. Пачнем з самага яскравага і прыгожага — песень, найперш — каляндарных.

Некалькі калядных песень запісаў у 1887 г. П.В.Шэйн у с. Машкова. Яны надрукаваны ў «Сборникъ отдела русского языка и словестности императорской Академии наук» (Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Собранные П.В.Шейномъ).

«Ай ніхто там не бываў,
Гдзе зялёны ягор зацвітаў.
Ягоръ, ягор ягорычка,
Ягорычка зіляненькі!»

Альбо:

А ў чистым поли усё под йгрушою,
Охъ люли, люли, усё под йгрушою!
Говориў косю ўсе з игрушею,
Ой люли, люли ўсе з игрушею!»

Вельмі цікавыя песні, сабраныя Шэйнам у Копысі:

Поехала коляда
З конца у конец.
Ай коляда колядуючы,
Ай молода молодзица!

Часцей калядоўшчыкі спявалі вясёлыя песні, напрыклад, «Як паедзем, паедзем»:

Поедзім!
Мой муж ко сцю
Я молода к мамце,
А дзетки к бабце, —
Поедзим.
И посядзим
Мой муж на куце,
Я молода процiў печи,
А дзетки на загнеце —

И посядзим.
Напьёмся:
Мой муж винца,
Я молода пивца,
А дзетки кваску, —
Напьёмся.
Надзьмёмся
Мой муж мяшком,
Я молода торбою,
Дзетки мяшечком, —
Надзьмёмся.

Шмат было сабрана калядных песень экспедыцыяй 1965 г., праведзенай Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР: «Нам піліпаўка надакучыла» (запісана ў в. Солаўе), «Ай, калядачкі, нашы мамачкі» (запісана ў в. Солаўе, «Ой, калядыкалядачкі, бліны-ладачкі», «Ой, калядачкі, калядачкі» (запісана ў в. Зубава).

Ой, калядачкі, калядачкі,
Вы барджэй, вы барджэй,
Вы прынясіце ў бліны дражджэй.
Нам піліпаўка надакучыла,
Жываты нашы пазамучыла,
А нам жамеры зубы праелі.
Ой калядачкі, прыбліжыцеся,
А кілбасачкі паніжыцеся.
А калядачкі на двор, на двор,
А кілбасачкі на стол, на стол.

Веснавы каляндарны цыкл, бадай, самы насычаны па колькасці і разнастайнасці функцыянальна спецыялізаваных песень.

Звычай заклікаць вясну на Аршаншчыне звязвалі з Благавешчаннем (25 сакавіка па ст. ст. — 7 красавіка па н. ст.). У гэты дзень моладзь збіралася на высокіх месцах за вёскамі і спявала песні-веснянкі. Шмат вяснянак змешчана ў працы Е.Р.Раманава, у 1-м і 8-м выпусках яго «Беларускага зборніка». Напрыклад, з в. Ганчары:

Вясна-красна, што нам прынясла?
Старым бабам па кіёчкам,
Маладым жонкам па сыночку,
Красным дзеўкам па вяночку.
Малым ребяткам па яечку.
Белым малойцам — па коніку,
Маладым мужчынам ды па сошаньцы.

У першым томе «Материалов для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края» П.В.Шэйна апублікавана да сотні веснавых песень, якія даюць уяўленне пра ўсе вядомыя групы абрадавых песень: вяснянкі, юр'еўскія, валачобныя, троіцкія, карагодныя. Карыстаючыся паслугамі карэспандэнтаў, П.В.Шэйн здолеў сабраць узоры гэтага жанру і з Аршанскага павета Магілёўскай губ. Напрыклад, песня:

Вясна, вясна, вясна красна!
Што нам прынясла,
Што нам прынясла?

Гэтая ж песня была зап. М.Гваздзёвым у 1965 г. ў в. Зубава.

Вялікую групу веснавых песень складаюць валачобныя песні, якія не маюць аналагаў у фальклоры суседніх славянскіх народаў. Гэтыя абрадавыя велічальныя песні спяваюць гаспадару і ўсім членам сям'і ў час велікодных абходаў двароў групы спевакоў—валачобнікаў. Вось пачатак песні, запісанай у в. Роскі Сялец:

А з-пад лесу, лесу цёмнага,
Вясна-красна на ўвесь свет!
А з-пад гаю, з-пад зялёнага
Ці не тучка йдзець, ці не воблачка?
А йшлі ж тудой валачобнікі,
Валачобнікі — людзі добрыя.
А йшлі ж яны, шаталіся,
Вялікага сяла пыталіся.
Вялікага сяла, багатага двара.

Валачобныя песні нечым падобныя да калядных. І за тыя, і за гэтыя спевакі атрымлівалі ежу і гарэлку. Вось песня: «Валачобнікі валачыліся» (запісана ў в. Жалезнікі):

Валачобнікі валачыліся,
Ды зялёны сад вішнёвы!
Валачыліся, памачыліся,
Зайшлі ў хату, пасушыліся,
А ці дома, дома сам хазяін?
А калі дома, пакажыся.
Ды з хазяінам павіталіся,
Ды хазяіна павесялілі.
Дабра, шчасця ім нажываць.
А дарыце ж нас, не марыце ж нас,
Хоць па яечку ды па цэламу,
Хоць ды па стаканчыку ды па поўнаму.
А музычанькі горка долечка:
Чарка гарэлкі, сыр на тарэлкі.
Механошава горкая доля.
Хай нясець ён, парываецца,
Тоўстым кіем папіхаецца.
А бывай здароў ды гадуй кароў,
Каб на тваім полі зарадзіла
Жыта, пшаніца, чычыніца
І ў дадатак усякае збожжа,
Каб хазяіну жыць было можна.
Каб з хазяечкай весяліліся.
Між сабою не сварыліся,

На сваіх дзетак любаваліся,
Валачобнікаў дажыдаліся.

Значную частку веснавых песень складаюць юр'еўскія, якія спявалі на свята Юр'я (23 красавіка па ст. ст.) — абаронцы жывёлы і земляробства. П.В.Шэйн запісаў у Копысі дзве юр'еўскія песні: «Што — у теремі, што — у тереми стучиць, гручиць? Юр'я святы, Юр'я святы церемь цешыць» і «Пошли дзьяки по воду».

З прыходам вясны сяляне клапаціліся аб будучым ураджаі. Гэта чуваць у песнях: «А ехала вясна рызамі» (запісана ў 1965 г. ў в. В.Міцькаўшчына) і «А ўсе людзі жыта сеюць» (запісана у 1959 г. ў в. Сцецава).

Сярод летніх песень вызначаюцца купальскія. Маладыя дзяўчаты гадалі аб сваёй будучыні. Яны рвалі краскі, плялі вянкі і пускалі іх па рацэ: «У які бок паплыве — туды і замуж пойдзеш. Калі будзе стаяць — у гэтым годзе будзеш адна. А калі патоне — памрэш» (запісана ў 1991 г. ў в. Ляўкі).

У в. Пугляі, калі пускалі вянкі, спявалі: «Краскі рвалі, вянкі звівалі і на Дунай пускалі. Плыві, плыві, вяночак, да мілага ў дварочак» (запісана ў 1991 г.).

Вялікае месца ў паэтычным працоўным календары займалі жніўныя і дажынкавыя песні, якія спявалі ў час працы ў полі. Жніўныя песні сямейна-бытавога плана ў асноўным распрацоўваюць тэму ўзаемаадносін нявесткі і свекрыві, жняя з жалем успамінае на пожні пра «бацькаву негу». «Яке пайду я кола лесу близко» запісаў П.В.Шэйн у Копысі ў 1887 г.; «Закаціласа ды яркае сонца» запісана ў 1965 г. ў в. Солаўе; «Каля саду, саду» запісана ў 1965 г. ў в. Ляўкі:

Каля саду, саду
Красачкі цвітуць,
А мне малодзенькай
Тугі задаюць.
Туга за тугою,
Бяда за бядою,
Што не гаворыць
Свякроўка са мною.
Прадала б свякроўку
За тры шэлягі,
Купіла б я мамку
А ў трыдарагі,
Гаварыла б я з мамкай
Дзень да вечара,
Ноч да поўначы.

Надыходзіла восень, а з ёй і восеньскія песні. Гэта песні той пары года, калі земляроб збіраў плён свае працы і дары прыроды: «Лужком, беражком рэчачка цякла» (запісана ў в. Аланьцева); «Усе людзі ары аруць» (запісана ў в. Роскі Сялец), «Як я была маладая» (запісана ў 1965 г. ў в. Ляўкі); «Па бару хаджу» (запісана ў 1959 г. ў в. Сцецава), «А на двары дождык» (запісана ў 1964 г. ў в. Ляўкі).

Восеньскія песні стаяць блізка да любоўнай лірыкі: «Ой, чаму не быў» (запісана ў 1965 г. ў в. Ляўкі), «Нязрэлая макаўка» (запісана ў 1965 г. ў в. Зубава), «Хадзіла козачка па крутой гарэ» (запісана ў 1965 г. ў в. Зубава).

Талочныя песні суправаджалі розныя цяжкія тэрміновыя работы. Талокі збіралі вясной, па сканчэнні асноўных палявых работ, на вывазку гною, летам — на дажынкі, радзей на касьбу, увосень — на апрацоўку лёну, вываз лесу, малацьбу, часам на сяўбу азімых. Вось якія талочныя песні былі запісаны П.В.Шэйнам у в. Машкова: «Я ўчора ў піру была», «Кала рэчанькі хадзіла» і «Ідзе ж тая барэлачка, што была гарэлачка?»:

Ідзе ж тая барэлачка, што была гарэлачка?
Ці ў хаце пад лаўкай зарасла мураўкай?
Ці ў сенях пад суднікам зарасла трыпутнікам?
Ці ў хаце пад загнетам зацвіла жоўтым цветам?
Дайце нам зелезніцу, адкапаем п'яніцу.
Сядзем мы на лавуньцы, вып'ем мы па чаруньцы.
Сядзем мы на рацуніцы, вып'ем мы па поўніцы.
Мы людзі рабочыя, піць гарэлку ахочыя.

Вядома талочная песня «Ах вы, столікі мае», запісана ў 1920 г. ў в. Ольша.

Пасля таго, як быў сабраны ўраджай, падыходзіў час адпачынку. Гэты час, паміж Пакровамі (14 кастрычніка) і першым тыднем Піліпава паста лічыўся ў сялян самым прыдатным для шлюбу: «Ёсць за што гарэлкі купіць, можна сына жаніць». Вяселле — выключная з'ява ў беларускім фальклоры. Ні адна падзея ў сямейным жыцці селяніна не суправаджаецца такой паслядоўнай сістэмай абавязковых абрадаў і песень, як вяселле. Пачыналася вяселле са сватання, заручын і запоін. Вось якія песні спявалі на гэтым этапе вяселля: «Пойдзем, дзеўкі, на заручыны» (запісана ў 1965 г. ў в. Вялікая Міцькаўшчына), «Пайграй, скрыпанька, ад сяла да сяла» і «Пайшла Арынка ў садок» (запісана Дэмбавецкім ў Аршанскім павеце), «Знаце, табе,

Анічка, замуж хочацца» (запісана ў в. Зубава ў 1965 г.), «Цёшчухна-мамухна» (запісана ў 1965 г. ў в. Ляўкі).

Ёсць сярод песень этапу заручын песні, якія адлюстроўваюць псіхалогію дзяўчыны: «Татулечка ты мой родненькі» (запісана ў 1965 г. ў в. Ляўкі), «Спазнаць вутачку па палётачку» (запісана ў 1969 г. ў в. Панізоўе).

Асобную групу вясельных песень складаюць песні пра збор, ад'езд і дарогу маладога да сваёй нявесты: «Храбер Мішачка на коніку» (запісана ў 1977 г. ў в. Парэчча і ў в. Аланцьева), «А галоўка мая бедная» (запісана ў 1965 г. ў в. Зубава), «А ў каго ў нас кавалі на дварэ» (запісана ў в. Солаўе), «Пад борам сонейка йграець» і «Свяці мне, зоранька, да свету» (запісана Дэмбавецкім), «За лесам сонейка йграець» (запісана ў 1977 г. ў в. Смаляны), «Шагайце, коні шырока» (запісана ў 1965 г. ў в. Солаўе), «Ехаў Іванька з-пад горада» (запісана ў 1977 г. ў в. Парэчча), «На дварэ нярана, смяркаець» (запісана ў в. Запожанкі).

Дзяўчына развівалася з дзявоцкім жыццём: «А што ў новенькай святліцы» (запісана ў 1965 г. ў в. Вялікая Міцькаўшчына).

Наступны этап — пасад нявесты і жаніха. Пры гэтым пелі: «Цяпер жа нам гульня» і Божая раданька прыляцела» (запісана Дэмбавецкім у Аршанскім павеце), «Божа рада пералётала» (запісана Шлюбскім у 1915 г. ў в. Чаркасы).

Гуляць у жаніха пачыналі такімі пачынальнымі («начальнымі») песнямі, як, напрыклад, «Мір крышчон, дом свяшчон» (запісана Шлюбскім ў 1917 г. ў в. Крыкі Аршанскага павета):

Мір крышчон, дом свяшчон,
Стучалі-гручалі,
Мае песенькі ўслыхалі,
На гэты час памаўчалі.
У гэтым доміку, як у божым райку:
Ёсць бацька і матка, і сёстры, і брацця,
Дудкі-гудкі, жонкі-галубкі,
Сабраныя прыезжыя,
Бліжнія прыгожыя,
Каго бог прылучыў,
Каго кабылка вязла,
Каго мамка нясла
На гэту вясёлую бяседу.
Ціхая бяседа праляцела,
Божая раданька пераляцела
Праз тын, праз тын да на вуліцу
Праз тын, праз тын да ў бажніцу.

Пасля гэтага вясельны поезд маладога едзе да маладой: «А ў нядзельку на зарэ» (запісана ў 1977 г. ў в. Смаляны), «А ў дзевачкі на дварэ» (запісана ў 1972 г. ў в. Хлусава), «Зазвінелі калакольчыкі на дварэ» (запісана ў 1977 г. ў в. Парэчча), «Ай, не будзь, Віцечка, пышным панам» (запісана ў в. Солаўе).

Заўсёды перагароджвалі дарогу дружыне маладога. Каб праехаць, жаніх павінен быў заплаціць выкуп. Пры гэтым спявалі: «Прыехалі сваты скупыя» і «Калі ты сват, харошы, харошы» (запісана Дэмбавецкім у Аршанскім павеце), «А былі ж мы ў дарозе» (запісана ў 1975 г. ў в. Чарняўскія), «А ў нашага свата чырвоная хата» (запісана ў 1965 г. ў в. Зубава), «Не гніся, сваце, не гніся» (запісана Дэмбавецкім у Аршанскім павеце):

Не гніся, сваце, не гніся,
Кладзі чырвонцы на місе,
Наша Васечка не ўдава,
Кладзі чырвонца хоць і два.

Значную групу песень складаюць песні, прысвечаныя ўзвялічванню маладых, адносінам паміж свёкрам і нявесткай, паміж сынам і маці: «Рошча мая, рошча» (запісана ў 1965 г. ў в. Ляўкі):

Рошча мая, рошча,
Рошча зялёная,
Ах, і ў той жа рошчы
Тры двары стаяла,
А ў першым дварочку
Маць сына вітала:
Ай, сынка, мой сынка,
Скажы мне ўсю праўду,
Скажы мне ўсю праўду,
Кого лучша любіш:
Ці цёшчу, ці жонку,
Ці родную мамку?
— Ай, люблю я цёшчу,
Цёшчу для заезду,
Ай, люблю я жонку,
Жонку для прывету.
А люблю я мамку
Лучша ўсяго свету.
А як памрэ цёшча,
Гарэлкі нап'юся,
А як памрэ мамка,
Слязою зальюся.

Шмат вясельных звычаяў жыве да нашых дзён. Напрыклад, абрад абразання касы маладой яе братам: «Татарын брат сястрэ, татарын» (запісана Дэмбавецкім у в. Смаляны) і «Няма горшага ката» (запісана ў 1977 г. там сама):

Няма горшага ката,
Як роднага брата,
Сеў сабе над касою,
Як воўк над казою.
Ён за коску тармосіць,
Болей грошай просіць.
Ён гарэлкі нап'ецца,
Грошай набярэцца.

Цікавы абрад надзялення маладой і суадносныя яму песні: «Казалі, што ў возеры рыбы многа» (запісана ў 1977 г. ў в. Смаляны), «А каліниця, а маліниця ломіцца» (запісана ў 1977 г. ў в. Парэчча), «Расступіцеся, баяры» (запісана Дэмбавецкім у Аршанскім павеце):

Расступіцеся, баяры,
Пусціце мяне паглядзець,
Чым мяне мамачка даруе:
Ці хлебам-соллю, усім дабром,
А ці чысценькім серабром?
Даруе мамачка ўсім дабром,
Усім чысценькім серабром,
А вялікім дарам — пірагом.
Вечным падарункам — здароўем;
Сваточкі нашы, браточкі,
Наліце вы ёй сем чарак
За харошанькі падарак.

Асобна стаяць вясельныя прысвячэнні сіраце: «А ў нас сёння дзень нядзелечка, скрасенне» (запісана ў 1965 г. ў в. Ляўкі), «Ступіла Валечка на парог» (запісана ў 1977 г. ў в. Смаляны), «Ты не стой, божухна, за дзвярамі» (запісана Шлюбскім у 1915 г. ў в. Чаркасы).

Наступны вялікі гурт песень — сямейна-бытавыя. У некаторых з іх адлюстроўваюцца адносіны паміж сястрой і братамі: «А як выйду за вароцечкі», «Па вішнёвым саду» (запісана ў 1965 г. ў в. Ляўкі), «Сені і хата на памосце» (запісана ў 1965 г. ў в. Зубава).

Вялікая група сямейна-бытавых песень — песні ўдавы: «Удовушка, удова да трохъ сыноў радзіла» і «Быў у полі дубокъ зялёненькі (запісана ў Аршанскім павеце), «Ой, у полі каліна» (запісана ў 1963 г. ў в. Лоск), «Забалела галава, забалела» (запісана ў 1965 г. ў в. Солаўе).

Ёсць песні, у якіх жонка скардзіцца на мужа-п'яніцу: «Ах ты, рэчанька, ты быстрая!» (запісана П.В.Шэйнам у Аршанскім павеце), «Як пайду я й да лужком-бераżкom» (запісана ў 1965 г. ў в. Солаўе і ў 1973 г. ў в. Вялікая Міцькаўшчына), «Гыля-гыля, шэры гусі, дамой» (запісана ў 1969 г. ў в. Пасад.

Гыля-гыля, шэры гусі, дамой,
А ці вы шчэ не наплаваліся вадой,
А я, малада, не наплакалася слязой,
За нялюбым мужам жывучы?
У карчомку ідзе ён радусенькі,
А з карчомкі ідзе ён п'янюсенькі.
Дамой прыдзе, на пасцельку ляжа,
А мне, моладзе, разуваці вяліць,
А мне, моладзе, распаясываці,
Русы кудзеркі расчэсваючы.
А мне, моладзе, ды не хочацца
Каля п'янага ды варочацца.
Як пайшоў жа мой мілы ў бакавую клець,
Як узяў жа ён раменную плець
Ды пачаў ён мне палосы ганяць —
То сінія, то зялёныя,
Паміж імі ды чырвоныя.
— Буду, буду, мой міленькі, разуваць,
Буду, буду распаясываць,
Русыя кудзеркі расчэсваць.

Але часцей у песнях сямейная згода прыходзіць не шляхам сілы, а шляхам кахання: «Чэраз рэчаньку, чэраз быструю» (запісана ў мяст. Дубраўка ў 1911 г.), «А дуб к дубу ды галовачку клоніць» (запісана ў 1961 г. ў в. Роскі Сялец).

Да сямейна-бытавых песень можна аднесці і песні, прысвечаныя сіраце, у якіх сірата гаруе без маці, прыходзіць да яе на магілку, размаўляе з памёршай матуляй, скардзіцца на сваё сіроцкае жыццё.

Блізкія да сямейна-бытавых, але складаюць асобную групу сямейна-абрадавыя песні. Іх спявалі, калі хрысцілі дзіця і называліся такія песні хрэсьбінныя: «Чераз боръ сасна павалілася» (запісана П.В.Шэйнам у в. Машкова), «Ой чія жъ ты жина» (запісана П.В.Шэйнам у Копысі), «А кумок у кума напіўся» (запісана ў 1965 г. ў в. Зубава), «Каб я знала, ведала» (запісана ў 1965 г. ў в. Зубава), «Чарачка медавая» (запісана ў 1965 г. ў в. Солаўе):

Чарачка мёдавая
Па сталу пахадзіла,
Кумочку напаіла.
— Пі, кумок, не співайся,
На пахмеллейка спадзявайся.

Да сямейна-абрадавай паэзіі належаць творы трагедыйнага жанру — галашэнні. Імі сваякі праводзілі чалавека ў апошні шлях. 10 галашэнняў сабраў І.Л.Міткевіч-Далецкі ў в. Высокае Аршанскага раёна, якія апублікаваны ў «Могилевской старине». Напрыклад, «Причитанія (матери по ребенку)»:

А мой жа ты сынулічка! А мой жа ты лібядзюлічка!
А чаго ж ты, мой сынулічка, ат мяне уцікаеш?
А ці я ж табе надаела...

Шмат галашэнняў было запісана валаснымі пісарамі Казьмоўскім і Шамоўскім. Яны ўвайшлі ў «Сборникъ отдела русского языка и словестности императорской Академии наукъ» (Т. 41, СПб, 1887, Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Собр. П.В.Шейном). Сярод іх галашэнне маці па дзіцяці, дачкі па бацьку, сястры па брату, жонкі па мужу. Вось запіс валаснога пісара Шамоўскага ў Коханаўскай воласці Аршанскага павета Магілёўскай губ. — «Галашэнне жонкі з сіротамі па мужыку»:

А мой жа ты галубочик сизинькій!
Соколочик жа ты мой ясьнинькій!
Куды-ж ты от меня далёко отлитаишь?
Ны каго-жъты меня с дробными детками
пыкидаишь?
А ты-ж у меня быв уся рада и пырадычка.
Чым жа я цябе, мое дырогоя, пригневила?
А дзетухны-ж мое дробныя!
К кому-ж мы цеперь, прихинемся
и пригорнемся?
А хто-ж об нас пыдумаиць и пыгыдаиць?
Усякій жа цяпер ныд нами надругаицца,
Як зы нас цяпер не кыму заступацца.

Песня суправаджае чалавека на працягу ўсяго яго жыцця. У дзяцінстве — дзіцячыя песні («Ах ты, Іванька Попоў», «Петушок, петушок», «Із-пад печкі каціцца» і інш.).

Калі юнакоў забіралі ў салдаты, традыцыйна выконвалі: «А просіўся, клоніўся миленьки бацюшкъ» (запісана П.В.Шэйнам у Аршанскім павеце). У салдатаў спявалі салдацкія песні «Ой, палын ты мой, палын...» (запісана ў Аршанскім павеце):

...Ох, ты, служба мая, служба.
Служба белага цара,
Чэжалей цябе, служба,
У белым свеце няма.

Ёсць яшчэ адна значная група песень з ліра-эпічным зместам, з напружаным драматычным сюжэтам — гэта балады. Яны апавядаюць пра незвычайныя, трагічныя здарэнні ў асабістым, сямейным жыцці чалавека: «А паходзіў бел малойчык...», «Крапіўка мая стрыклівая» (запісана ў 1965 г. ў в. Ляўкі), «Аддаў мяне татка за п'янічаньку» (запісана ў 1965 г. ў в. Вялікая Міцькаўшчына), «Браткі» (запісана ў в. Ольша Любавіцкай воласці Аршанскага павета). Хлопец і дзяўчына звянчаліся, а яны — брат і сястра:

— Пойдзем, сястра, у лясок,
А склінемся травіцай.
А скінемся травіцай,
А што брацец з сястрыцай.
Будуць дзеўкі краскі рваць,
Нас з табою памінаць:
— Вот то ж тая травіца,
Што братненька й сястрыца.

Вось так выразна ў гэтай баладзе-міфе падаецца паэтычная гісторыя паходжання кветкі «браткі» (травіца «брат-сястрыца»).

На вельмі старажытнай аснове створаны балады, якія ўключаюць загадкі. Балада «Пасвіла дзеўка табун коней» (запісана ў 1965 г. ў в. Міцькаўшчына).

— Загадаем дзеўцы чатыры загадкі,
Калі адгадаеш — скажам і падкажам:
А хто чоран ды не чэрнены,
А хто белы ды не белены,
А што бяжыць без повада,
А хто іржэць без голасу,
А што расце без кораня?
— Воран чоран ды не чэрнены,
Лебедзь белы ды не белены,
Вада бяжыць ды без повада,
Конік іржэць без голасу,
Камень расцець без кораня.

У скарбніцы беларускай народнай песнятворчасці адметнае месца займаюць прыпеўкі. Гэта аднастрофныя лірычныя песенькі самага разнастайнага жанру. На старонках газеты «Звязда» у 1936 і 1938 гг. не раз з'яўляліся прыпеўкі, запісаныя ў Аршанскім раёне («Маем сала, маем масла, мяса, бульбу і муку, а раней парогі білі багацею кулаку»; «Праважала я мілога, гаварыла: «Не тужы, у разоры на граніцы пільна край ты беражы»). У прыпеўках часцей за ўсё чуўся жарт:

Ці на шчасце, ці на ліха,
Такі ўрадзіўся,
Што ўсе дзеўкі заплакалі,
Як я ажаніўся.

Вусная народная творчасць вельмі шматгранная. Значнае месца ў ёй займаюць казкі. Ёсць казкі, у якіх гаворка ідзе пра розныя моманты ў жыцці чалавека: «Пра трох сясцёр і разбойніка» (запісана ў в. Жалезнікі), «Жонка-вядзьмарка», «Асліная шкура», «Кароль і стары дзед» (запісана ў 1965 г. ў в.

Солаўе), «Цудоўная торба жорава» (запісана ў в. Жалезнікі).

Сярод жанраў вусна-паэтычнай прозы поруч з казкамі займаюць сваё месца ў беларускім фальклоры легенды і паданні. Цікавыя легенды запісаны ў вып. 4 «Беларускага зборніка» Е.Раманава: «Юрый: Мыкола і мужык», «Кузьма-Дзям'ян» (запісана ў Аршанскім павеце). Сярод паданняў вызначаюць тапанімічныя. Вось два варыянты паходжання в. Юшкава, запісаныя ў 1873 г. настаўнікам Высокаўскага народнага вучылішча П.Паслаўскім:

«У наваколлі вёскі Юшкава месцы балацяныя, як тут гавораць — юшкі хапае, а рыбы няма. Так і празвалі — Юха, Юшкі, а адсюль і Юшкава».

І другі варыянт: «Вёска называецца ад таго, што некалі ў гэтай мясцовасці толькі адзін багаты селянін, не па звычаю таго часу, меў хату чыстую, з комінам і юшкаю ў печы. Таму назвалі вёску Юшкі».

Загадкі, прыказкі і прымаўкі складаюць так званыя малыя жанры фальклору. Іх часта называюць народнай філасофіяй. Сто загадак і 205 прыказак было запісана І.Міткевічам-Далецкім у с. Высокае Аршанскага павета:

Два каты адзін ком масла ліжуць (Сані);
Не агонь, а пячэць (гарэлка).

Народная творчасць не толькі дапамагала працаваць, адпачываць, размаўляць, сябраваць, але і лячыла. Такой мэце служылі замовы. Найбольш захаваліся лекавыя замовы, а з гаспадарчых — звязаныя з аховай жывёл, з іх хваробамі . Сярод сямейна-бытавых вызначаюцца любоўныя замовы (прысушкі, адсушкі).

Шмат замоў запісаў Е.Раманаў у мяст. Мікуліна Аршанскага павета. Гэта замовы ад хвароб жывёлы, ад змей, крывацёку, «зубішча», «цемянніка», рожы, вогніку, валасня, «грызі», уроку, ляку, упуду, сцені, начніц, крыксаў і прысушкі. Вось адна з іх — замова ад вогніку: «Огнішча, огнішча, вазьмі сваё вагнішча. Як стану агню згарэць і патухнець, нічога ня быць, так і етай болі ў раба божа каб не было — абсохнуць і абсыпацца».

Нельга аддзяліць ад фальклору звычаі і абрады. У в. Есіпава доўга захоўваўся абрад гукання марозу на Хрышчэнне:

Мароз, мароз, хадзі куццю есці,
Летам не хадзі — пад мяжой спачывай,
Кажушком пашаньку накрывай.

Многія з абрадаў былі тэатралізаваныя. Цікавы юр'еўскі абрад пастухоў, зафіксаваны ў пачатку 20 ст. П.В.Шэйнам у с. Машкова: «Пад вечар, калі жываціна труху напасецца, пастухі ходзяць па вёсцы і збіраюць яйцы, малако, сала. Вярнуўшыся на поле, кладуць агонь, спякуць яечню, збяруць жываціну ў кругу. Адзін возьме яечню ў руку (вядома, са скавародкай ці гаршком) і абойдзе каля жывёлы, а за ім ідуць выбраныя: хто «зайцам», хто «крывам», хто «калодай», а хто «зязюляй». Той, што нясе яечню, пытаецца:

— Заіц, заіц, ці горка осінка?
— Горка.
Ніхай жа наша скацынка так будзіць
горка воўку!
— Крывы, крывы, ці дойдзеш ты?
— Не, не дайду, ні віжу!
— Ніхай жа воўк ня відзіць нашай скаціны!
— Калода, калода, ці гніла ты?
— Гніла.
— Няхай жа ў ваўка зубы будуць гнілыя!»

Абышоўшы вакол статка, садзіліся каля вогнішча, з'ядалі яечню, а лыжкі падкідвалі ўгару — каб скацінка ўгару скакала.

Вельмі тэатралізаваныя абрады валачобнікаў. Валачобнікаў на Аршаншчыне яшчэ называлі кукальнікамі. Вось што пісаў П.В.Шэйн: «Разам з валачобнікамі раней у Аршанскім павеце Магілёўскай губерні, як і ў некаторых мясцовасцях іншых губерняў Паўночна-Заходняга краю, хадзілі кукальнікі. Спявалі яны тыя песні і на тую ж мелодыю, што і валачобнікі, з тым толькі адрозненнем, што першыя заўсёды пачыналіся словамі: «Нуця, братцы, кукольнікі!» Вызначальным адрозненнем кукальнікаў была даволі шырокая нізкая скрыня з векам. У дно скрыні былі ўбіты вострыя калочкі, на якіх свабодна круціліся ў розныя бакі фігуркі конікаў, абшытых сукном рознага колеру. На самым большым коніку белай масці змяшчалася фігурка чалавека. Гэта быў святы Юр'я, апякун конюхаў і коней, яго стада. У час спеваў скрыня рухалася наперад і назад, з гэтай прычыны і фігуркі круціліся вакол калочкаў».

Шмат са звычкамі і абрадамі звязана прыкмет і павер'яў (аб прыродзе, надвор'і, птушках і жывёлах, чалавеку і яго жыцці).

З кожным святам звязваліся нейкія прыметы і павер'і, а ў некаторых выпадках яны пераходзілі ў рытуал. На каляды жанчыны ў

в. Зубава варажылі: «Дзяўчына выцягвала з-пад печча курыцу. Перад ёй клала: чарку, хлеб і вугаль. Ад таго, што возьме першым птушка, залежыла дзявочае будучае. Калі нап'ецца з чаркі — мужык будзе п'яніца, калі возьме хлеб — будзе хлебнік, калі вугаль — будзе добра працаваць».

У 1920-я гады ў складзе Аршанскага таварыства краязнаўства працавала этнографагістарычная секцыя, справаздача аб дзейнасці якой друкавалася ў краязнаўчым зборніку «Аршаншчына». У ёй паведамлялася аб зборы «асаблівасцяў мясцовай гутаркі і народнага фальклору» і перасылцы ў Інбелкульт 10 сшыткаў народных песень, забабонаў, запісаных членамі таварыства. Гэтыя 10 сшыткаў знойдзены.

Цяпер мы пачалі арыентавацца на адраджэнне народных, фальклорных форм творчасці, народных свят, звычаяў, рамёстваў. Пачалі шукаць старых людзей, якія памятаюць тыя песні, якія бытавалі ў нас спрадвеку. Цікавыя фальклорныя ансамблі зараз існуюць у Якаўлевічах, Міцькаўшчыне, Крапіўне, Казловічах. Яны радуюць нас роднымі аршанскімі песнямі. *А.М.Палітаў.*

Народны касцюм Аршаншчыны

Народны касцюм Аршаншчыны 19 — пачатку 20 ст. арганічна ўліваецца ў дубровенскі (аршанскі) строй, які з'яўляецца адным з адметных строяў беларускага Прыдняпроўя. Тут на стыку трох усходнеславянскіх народаў найбольш актыўна працякаў працэс узаемаўзбагачэння і ўзаемапранікнення беларускай, украінскай і рускай культур, што садзейніча-

Адзенне шляхты Аршанскага павета.

ла ўтварэнню змешаных тыпаў касцюмаў і комплексаў адзення, якія не сустракаюцца ў іншых гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі. Гэтаму ў значнай ступені спрыяла магутная рака Дняпро, па якой праходзіў вялікі водны шлях.

Вывучалі і збіралі традыцыі народнага касцюма Аршаншчыны многія этнографы, фальклярысты, пісьменнікі. У Віленскім музеі старажытнасцей (заснаваны ў 1885 г. Я.Тышкевічам) знаходзілася унікальная калекцыя 12—14 ст. са славянскім надпісам з Оршы.

Каштоўнай навуковай крыніцай па вывучэнні народнага касцюма Аршаншчыны з'яўляюцца фонды Музея этнаграфіі ў Санкт-Пецярбургу. Самая ранняя калекцыя № 292 адносіцца да канца 19 ст. Часткі адзення, галаўныя ўборы, рэчы хатняга начыння атрыманы музеем у 1895 г. ад аршанскага павятовага ісправніка. Менавіта гэтай калекцыяй карысталася вядомы рускі этнограф Г.Маслава пры падрыхтоўцы доктарскай дысертацыі, а пасля кнігі «Народнае адзенне рускіх, украінцаў і беларусаў у 19 — пачатку 20 ст.», (1956). У раздзеле, які прысвечаны верхняму адзенню, змешчаны малюнак крою «рабочага балахону» з белага палатна беларускай дзяўчыны з Аршанскага павета. Да 19 ст. адносіцца шэраг экспанатаў, перададзеных музею Санкт-Пецярбурга ў 1948 г. Цэнтральным музеем народазнаўства, які знаходзіўся ў Маскве (пазней Маскоўскі музей народаў СССР).

Зону распаўсюджвання дубровенскага строю абследавалі беларускі этнограф, фальклярыст, археолаг Е.Раманаў; адзін з заснавальнікаў беларускай краязнаўчай фатаграфіі, апантаны вандроўнік В.Костка, этнограф Я.Ляцкі, вядомы беларускі мовазнавец-лексікограф І.Насовіч, які працаваў настаўнікам, а пасля інспектарам Аршанскага духоўнага вучылішча (1813).

Даследаваў матэрыяльную і духоўную культуру Аршаншчыны і аўтар гэтых радкоў. У сувязі з падрыхтоўкай да першай выстаўкі беларускага народнага касцюма ў Мінску, Парыжы, Ліоне Дзяржаўным музеем Беларусі (цяпер Дзяржаўны нацыянальны музей Беларусі) у верасні 1979 г. была наладжана навуковая экспедыцыя з мэтай набыцця экспанатаў і выяўлення лакальных этнаграфічных рыс традыцыйнай культуры рэгіёна.

На гэтых выстаўках экспанаваўся жаночы гарнітур пачатку 20 ст., набыты ў в. Волева. Фотаздымак Т.П.Зюльковай быў змешчаны ў экспазіцыі выставак і надрукаваны ў вядомым альбоме аўтара «Беларускае народнае адзенне» (Мн., 1981).

Спрадвеку матэрыялам для адзення, абутку, галаўных убораў была мясцовая сыравіна. З лёну, воўны, радзей канапель выраблялі тканіны, лямец, са скур хатніх і дзікіх жывёл аўчыны, хром, сырамяць. Лакальная адметнасць выяўлялася ў характары ткацтва, вышыўцы, каларыце, арнаменце, у спосабах крою і нашэння, тэхналагічнай апрацоўцы і вынаходніцтве спецыфічных форм адзення і галаўных убораў.

Карункавае ажурнае ткацтва, ліхаванне (сакаленне, гафтаванне), ворсавае начэсванне андарачных тканін, бісернае пляценне, дылішкавае ткацтва — важныя мастацка-тэхналагічныя прыёмы вырабу і аздаблення тканін, прызначаных для пашыву адзення. Яны няпоўна вызначаюць лакальныя прадметы дубровенскага строю, тэрыторыя якога ахоплівае Аршанскі, Дубровенскі, Талачынскі, Горацкі і Круглянскі раёны.

Жаночае адзенне. Кашулі («сарочкі»). Характэрнай рысай касцюма беларусаў была белая льняная кашуля з прамымі плечавымі ўстаўкамі («палікамі»). Стан быў суцэльны, або меў надточку («постаўку»). Надточка краілася з больш грубага палатна, прышывалася па лініі таліі. Верх стана збіраўся ў стаячы або тыпу аблямоўкі каўнер. Полка рукава («падпалік») злучалася са станам звычайным («простым») швом. Цвіклі («падплечнік») краіліся маленькімі або зусім адсутнічалі (у рукавах з клінамі — падрукаўнікамі). Ніз рукавоў заканчваўся каўнерцамі, каўнерцамі з дэкаратыўным маршчэннем у тры рады, «брындамі» (фальбанамі з паркалю і карунак), або звычайнай калошай (без завужэння і збірання тканіны ў складкі). Рукавы зашпільвалі на ніцяныя гузікі. Каўнер завязваўся тасёмкай, якую працягвалі ў сіметрычныя петлі.

У аздабленні кашулі пераважала нашыванне крыжыкам, натыканне пераборамі, маршчэнне тканіны і зборкі. Геаметрычны або геаметрызаваны раслінны арнамент будуецца па прынцыпе ўзорыстага шляка, у двухколерным каларыце з перавагай чырвонага асноўнага і чорнага дадатковага. Матэрыялам

для арнаментацыі служылі мануфактурныя баваўняныя ніткі (горынь, забалаць). Размеркаванне геаметрычнага арнаменту на кашулі традыцыйнае і заўсёды знаходзіцца ў поўнай кампазіцыйнай залежнасці ад кроя і характара рэчы, якую аздабляюць. Мясцовая, мастацкая своеасаблівасць праяўляецца не толькі ў малюнку і размеркаванні ўзораў, але таксама ў іх маштабах, суадносінах з плоскасцю, у фактуры, тэхніцы шытва, любімай каляровай гаме.

Геаметрычны арнамент кашуль і фартухоў будуецца з невялікага набора кампанентаў малюнка — ромбаў, квадратаў, зорак, палос. Кампанаваўся арнамент на плечавых устаўках, верхняй частцы рукавоў, каўнярах. Вядомы на Аршаншчыне кашулі з гесткай і тунікападобнага крою.

Спадніцы. Па разнастайнасці відаў, кампазіцыйна-арнаментальным і каларыстычным вырашэнні спадніцы Аршаншчыны не маюць сабе роўных на Віцебшчыне. Самы беглы пералік назваў («андарак», «камлёт», «спадніца», «саян», «саматкалка», «дрылішак», «бедбка») сведчыць пра багатую разнастайнасць відаў і форм.

«Андарак» — характэрны для ўсёй Беларусі від спадніцы. На Аршаншчыне вылучаецца арнаментам і каларытам. Звычайна андарачную тканіну ткалі з чыстай, не фарбаванай белай і чорнай воўны, з арнаментам «у балонкі», г. зн. у чорныя клеткі на белым фоне, якія нагадваюць ваконныя шыбкі. Потым тканіну валялі (лямцавалі) на млыне і сінілі. Майстроў, якія займаліся фарбаваннем тканін, называлі «сінельнікамі». Пэўны мастацкі эфект андараку надаваў начос тканіны, які рабілі майстры г. Горкі. Апрача згаданага сіне-чорнага колеру сустракаюцца андаракі чырвоныя, чырвона-чорныя (клетка), зялёныя, чорныя. Прасавалі андаракі ў буйныя складкі.

«Дрылішак», «саматкалка», «спадніца» шыліся з 5—6 полак выключна з ільняной або баваўнянай тканіны. «Рабізнай» называлі пярэстую, у дробныя клеткі ці паскі тканіну, вытканую ў 2 ніты палатняным перапляценнем. Вузкія клеткі і паскі («у драбіцы», «у костачкі») ствараліся прыглушанымі фарбамі жоўта-вохрыстага, вохрыста-чырвонага каларытаў на бела-суравым фоне, або сінім па белым. Сіне-белым каларытам і дробнарапортнасцю клеткі, вертыкальнасцю вузкіх паскаў спадніцы дубровенскага строя яднаюцца з даматканымі спадніцамі Наддзвіння і Паазер'я. Па нізу спадніц нашывалася яркая стужка. Найбольш распаўсюджанымі былі спадніцы, вытканыя з нітак бела-сіняга, сіне-жоўта-белага, бела-цаглянага, зялёна-сіне-чорнага колераў.

«Камлёт» — спадніца з паўшарсцяной саматканкі ў клетку або ў папярочныя паскі. Кросны на тканіну для камлёта снавалі лёнам, на 4 ніты. У якасці вутка выкарыстоўвалі рознакаляровыя ніткі воўны. Воўна, як вядома, фарбавалася значна лепш і ярчэй, чым лён. Ткацтва на 4 панажах дазваляла ніткі ўтока выбіваць на паверхню льняной асновы і атрымліваць адмысловы ўзор шашачкі з акцэнтам сакавітых гарызантальных паскаў. Пункцірна-шашачны ўзор атрымліваўся з чаргавання бурачковых, зялёных, белых, аранжавых, вохрыстых нітак. Камлёты былі карацейшымі за спадніцы і андаракі.

«Саян» — святочная, каштоўная спадніца з тонкай выпрадзенай воўны, пераважна аднамасная, сіняга колеру. Па нізу прышывалася «шчатачка» — чорная тасёмка з махрыкамі. Саяны насілі толькі заможныя сяляне. Андаракі, «спадніцы», саяны былі доўгія, па шчыкалатку («на спадніцу ішла губка палатна»), лінія таліі завышана («пад самыя грудзі»).

Усе віды спадніц мелі доўгія (каля 120 см) вузкія паяскі (шырыня 1,2—1,5 см), на якія прызбіраліся і замацоўваліся складкі полак і пры дапамозе якіх спадніцы мацаваліся на таліі.

Фартухі. Традыцыйная частка касцюма замужняй жанчыны — ніспадаючы ад пояса фартух — з'явіўся ў беларусаў значна раней, чым паясное адзенне тыпу спадніцы. Паводле якасці тканіны, крою і аздаблення можна вылучыць 4 варыянты фартухоў.

Двухполкавы фартух шыўся з белай, вытканай у 6 нітоў даматканай тканіны. У выніку саржава-атласнага, шматнітовага ткацтва на паверхні тканіны ствараўся дынамічны, срабрыста-белы, у стылі оп-арт арнамент, пабудаваны з рознамаштабных прамавугольнікаў. Такія фартухі называлі «ліцьвяковымі», а самі ўзоры — «у ліцьвякі», «у дымкі», «у дысы».

Аднаполкавы фартух шыўся з адной полкі тканіны «балонкі», «у паскі», такой самай

якасці, якую выкарыстоўвалі для дрылішкаў ці спадніц.

Фартух з крамной тканіны — паркалю, саціны — аздабляўся набіваным рознакаляровым арнаментам. Да гэтага варыянта адносяцца палатняныя, набіваныя ў сінельнікаў аднаполкавыя даматканыя фартухі.

Аднаполкавы фартух шыўся з белага паркалю ці даматканага палатна з выбіваннем («ліхаваннем») і вышытым крыжыкам арнаментам у падоле. Ніз аздабляўся белымі карункамі з зубамі.

Паясы, вытканыя на ніту, былі вузкія, з перабіраным стракатым узорам, канцы заканчваліся махрамі або бісернымі гронкамі. Вядомы і круглыя паясы — «тасёмкі» — таўшчынёй з палец. На канцах меліся пампоны велічынёй з макавую галоўку.

Ліфы. Кароткія безрукаўкі — ліфы («кабаты»), пашытыя з парчы або шаўковай фабрычнай тканіны, з'яўляліся састаўной часткай святочнага летняга хатняга касцюма заможных жанчын. Кабаты прышываліся да саяноў або мелі круглыя тугія валікі па лініі таліі. Прыталены сілуэт з завышанай таліяй, які адпавядаў эстэтычным ідэалам мясцовых жыхароў, змушаў мясцовых краўцоў наглуха прышываць спадніцу да кароткага ліфа — кабата, або рабіць спецыяльны валік для мацавання спадніцы вышэй натуральнай лініі стану. Перад кабата меў кароткі адступаючы мысік.

Галаўныя ўборы і аздабленне галавы. Прычоска. Паводле старажытнага звычаю, дзяўчаты зачэсвалі валасы ў 1 ці 2 касы або распускалі на плячах.

У валасы ўпляталі паясы — «тасёмкі». Цікавы вясельны вянок маладой 19 ст. з Аршанскага павета (калекцыя МЭ № 292-20) захоўваецца ў Санкт-Пецярбургу. На пругкую картонную аснову, абшытую чырвоным каленкорам, нашыты рознакаляровыя папяровыя кветкі, сухазлоціца.

Традыцыйным галаўным уборам замужніх жанчын была намітка. Мяркуючы па інфармацыі старажылаў, яна была кароткай (набліжалася да двухполкавай хусткі) і драпіравалася па верху галавы.

Да нашага часу ў куфрах старых бабуль захаваліся разнастайныя даматканыя і фабрычныя хусткі. Часта ў іх назве адлюстравана тэхналогія вырабу, арнамент, назва фабрыкі, або краіна, адкуль яна прывезена. Найбольш вядомы ў побыце ў пачатку 20 ст. былі: «прахароўка», «парысська», «кумашырка», «вялікая хустка», «хустка ряба», «хустка ў дымы», «бела хустка».

Шыйныя і нагрудныя ўпрыгожанні. Яшчэ ў глыбокай старажытнасці шыю аздаблялі пацеркі і металічныя крыжыкі на каляровых тасёмках.

Абутак. Лапці, плеценыя з лыка, скураныя пасталы, вяровачныя чуні насілі на працу, чаравікі і боты — на святы.

Мужчыны як больш рухомы элемент сельскага насельніцтва (наймаліся на сезонную працу ў горад ці на сплаў лесу) увогуле хутчэй перайшлі на адзенне гарадскога тыпу. У жанчын жа назіраецца мноства пераходных форм, доўга ўтрымліваліся традыцыйныя галаўныя ўборы і спадніцы. *М.Ф.Раманюк.*

Аршанскія ручнікі

На Беларусі ручнік — абавязковы элемент народных абрадаў, з ім звязана мноства прыкмет, якія ўзыходзяць да язычніцкіх часоў. Ручнік суправаджаў чалавека ад нараджэння да смерці. Зразумела, што такая важная і разнастайная роля ручнікоў у народным побыце (практычная, дэкаратыўная, абрадавая) не магла не ўплываць на мастацкі бок гэтых вырабаў.

Сёння на Аршаншчыне ў вясковай хаце яшчэ можна ўбачыць ручнікі, а такія рэчы, як абрусы, традыцыйны народны касцюм гаспадыні ўжо вынеслі з пакоя ў камору.

Аршанскія ручнікі маюць белае поле, на якім па канцах размяшчаецца тканы ці вышываны геаметрычны ўзор чырвонага колеру, нярэдка з дабаўленнем чорнага.

Найбольш часта ў экспедыцыях мы сустракаем ручнікі-ўціральнікі і ручнікі-набожнікі, якімі аздабляюць чырвоны кут. Яны выкананы на ткацкім стане з белых ці шэрых і белых ільняных нітак. Ручнікі-ўціральнікі сатканы ў 2 або 4 ніты, сустракаюцца па ўсёй Аршаншчыне. У в. Пасудзева набыты ручнік, сатканы ў 4 ніты, узор якога мясцовыя жыхары называюць «у елачку». Канцы ўціральні-

каў упрыгожваліся некалькімі вытканымі сціплымі чырвонымі палоскамі ці вузкімі палоскамі карункаў, або зусім не ўпрыгожваліся.

Ткацтва і аздабленне набожнікаў і вясельных ручнікоў вельмі багатае, з яркім дэкорам. Найчасцей такія ручнікі ткаліся спосабам шматнітовага ткацтва (у 4, 5, 6, 8 нітоў). Дэкор такіх ручнікоў паласаты, клятчасты, узорысты. Узор, які атрымліваўся, калі ткалі ў 4 ніты, мясцовыя жыхары называлі па-рознаму: «у дымкі з дысамі» (вёскі Ляўкі, Сцяпкова), «у дысы» (Копысь, вёскі Ленкавічы, Хадулы, Шэнберава), «у разрэзы» (вёскі Наваселле, Шанькава, Забалацце), «у ліцьвякі» (в. Аляксейкі). У вёсках Наваселле і Пугляі ўзор, які складаецца з невялікіх вытканых ромбічкаў, называюць «узор у жаб'і глазкі», у в. Ласі Талачынскага раёна (былы Аршанскі пав.) узор у 4 ніты, які ўяўляе сабой дробныя квадраты, згрупаваныя па 12 штук, і ўтварае на ручніку буйны гарох, называюць узорам «у балдэсікі». Узор атрымліваўся за кошт спалучэння дробных і буйных квадратаў і прамавугольнікаў. У вёсках Есіпава, Панізоўе, Баяры вядомы ручнікі, сатканыя ў 5 нітоў (мясцовая назва «у пяцерні»). Вытканы ўзор на такіх ручніках уяўляе сабой ромбы розных памераў.

У вёсках Зубава Аршанскага раёна, Ланенка і Пасудзева Дубровенскага раёна (былы Аршанскі павет) вядомы ручнікі, сатканыя ў 6 нітоў (мясцовая назва «у шасцярні», «у гарошак»). Узор уяўляе сабой буйныя ромбы, унутры якіх вытканы авалы.

Самыя складаныя па вырабе ручнікі ткаліся ў 8 нітоў (мясцовая назва «у васьмярні»). Такія ручнікі вядомы ў вёсках Усходы, Панявічы, Масліна Дубровенскага раёна (былы Аршанскі павет).

Сатканыя ў 1 ці 2 ніты набожнікі адрозніваюцца ад уціральнікаў больш складаным упрыгажэннем. Ручнікі аздаблялі вытканым узорам. Узор выконваўся баваўнянымі ніткамі чырвонага колеру, у некаторых выпадках шарсцянымі з дабаўленнем чорнага. На пытанне, хто першы склаў узор, майстрыхі найчасцей адказвалі, што не памятаюць, бо пераняліяго са старога вырабу.

Тыповы арнамент ручнікоў на Аршаншчыне — геаметрычны, вядомы і раслінна-геаметрызаваныя формы. Дэкор падпарадкоўваецца некалькім устойлівым кампазіцыйным вырашэнням.

Найбольш пашыраныя кампазіцыі з некалькіх сатканых палос спосабам закладання, якія ўтвараюць адзінае цэлае; адна з палос (як правіла, ніжняя) — вядучая па шырыні, складанасці і маляўнічасці арнаменту. Сустракаюцца шмат'яруснyя кампазіцыі з некалькіх роўных па дэкаратыўнай значнасці палос на канцах ручніка.

У ручніках, сатканых спосабам шматнітовага ткацтва, узор пакрывае ўсю плошчу ручніка, гэты ўзор на канцах выдзяляюць другім колерам (чырвоным), тым самым упрыгожваючы яго. Сустракаюцца ручнікі, дзе спалучаецца шматнітовае ткацтва з перабіраннем і вышыўкай.

Ручнікі ўпрыгожвалі таксама і вышыўкай. У вышыўцы выкарыстоўвалася баваўняная пража натуральнага белага колеру (мясцовая назва «бель»), а таксама афарбаваная ў чырвоны, сіні, чорны колеры, для абазначэння якіх ужываецца назва «забалаць». Асабліва папулярным было шво простым крыжыкам, сустракаюцца вышыўкі двайным крыжам («балгарскі крыж») і гладдзю.

Асноўнымі фігурамі вышывак былі ромбы, крыжы, разеткі, зоркі, трохвугольнікі, прамыя і ламаныя лініі, вазоны з кветкамі, элементы архітэктурных пабудоў, увенчаных крыжамі. Цэнтральнае месца ў арнаменце займаў ромб. Ён з'яўляецца стрыжнем кампазіцыі, вакол якога згрупіраваны астатнія фігуры. Значнае месца займаюць васьміканцовыя зоркі і крыжы, яны могуць быць упісаны ў іншыя фігуры, або складаюць самастойны рапорт.

Самабытная вышыўка ручнікоў Дубровенскага раёна (былы Аршанскі павет). Кампазіцыя іх складаная, шмат'ярусная, багатая інфармацыяй, дзе ўдала спалучаюцца рамбічныя, крыжападобныя і раслінна-геаметрызаваныя матывы; шчыльным сетчатым дэкорам ніжняга бардзюра і лёгкім разрэджаным малюнкам верхняга, які зрокава накіраваны на паступовае зліццё з белай чысцінёй палатна.

Сёння ў вёсках сустракаюцца вырабы пачатку 20 ст., у якіх перапляліся ўзоры спрадвечна народныя з бракаражскімі. Рост цікавасці да ўзораў выкарыстоўвалі фірмы «Брокар і К°», «Рале і К°» і іншыя, якія выпускалі невялікія альбомы, розныя дадаткі, абгортачную паперу для мыла з рознымі ўзорамі для вышыўкі. Некалькі ручнікоў з такімі ўзорамі выяўлены ў в. Есіпава Аршанскага раёна.

Сустракаюцца ручнікі, упрыгожаныя ажурнай вышыўкай, якую выконваюць па сетцы, утворанай выцягваннем пэўнай колькасці нітак асновы і ўтку. Сетку абшывалі (перавівалі) белымі ці чырвонымі ніткамі. На Аршаншчыне гэты спосаб аздаблення называюць ляхаваннем, ён адметны ювелірным выкананнем арнаменту. Ручнікі з «ляхаваннем» выяўлены ў вёсках Каўрова, Ланенка Дубровенскага раёна (былы Аршанскі павет).

Ручнікі, упрыгожаныя палоскамі фабрычнай тканіны чырвонага колеру, знойдзены ў вёсках Тарлаі і Зубава Аршанскага раёна.

Канцы ручнікоў аздаблялі вязанымі карункамі, якія выкананы з вялікай разнастайнасцю і вынаходлівасцю. Вельмі часта жанчыны яшчэ вязалі прошвы і ўстаўлялі ў ручнікі. Карункі з белых нітак па колеры гарманіруюць з тканінаю і разам з прошвай складаюць адзіны ансамбль. Краі карункаў часцей за ўсё зубчатыя або ўпрыгожаны махрамі.

Вырабы аршанскіх майстрых здзіўляюць разнастайнасцю дэкору, каларыту, кампазіцыйнага строю, тэхнікі выканання.

Н.Л.Жолудзева.

Музеі

Музей гісторыі і культуры горада Орша

Заснаваны 1.3.1989 г. Мае 4 экспазіцыйныя залы (плошча экспазіцыі 170 м^2), 4200 экспанатаў асноўнага фонду (1998). Раздзелы экспазіцыі: «Орша старажытная, «Орша ў складзе ВКЛ і Рэчы Паспалітай», «Орша ў складзе Расіі», «Орша ў 19 стагоддзі». У раздзеле археалогіі — знаходкі з Аршанскіх стаянак (каменны век), комплекса археалагічных помнікаў каля в. Чаркасава, гарадзішча жалезнага веку каля в. Вусце, Аршанскага гарадзішча (12—18 ст., шматлікія вырабы са шкла, керамікі, жалеза, каляровых металаў, косці), Аршанскага Куцеінскага Богаяўленскага манастыра (17—18 ст., кафля, ювелірныя вырабы) і інш. У раздзеле гісторыі экспануюцца дакументы і матэрыялы пра дзейнасць Куцеінскай друкарні (17 ст.), вайну 1812 года, нумізматычныя калекцыі (манеты Расіі 15 — пач. 20 ст., ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Швецыі 16—18 ст.), зброя 16 — пач. 20 ст., старадрукі і рукапісныя кнігі 17—19 ст., макеты паселішча 12 ст., Аршанскага замка 16 ст., цэнтра Оршы пач. 20 ст. У раздзеле «Орша ў 20 ст.» адлюстравана палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё горада ў пачатку 20 ст., падзеі рэвалюцыі 1905—07 гг., 1-й сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г., грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі, аднаўленне гаспадаркі і сацыялістычнае будаўніцтва ў 1920—30 гг., палітычныя рэпрэсіі, аднаўленне народнай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд. Экспануюцца дакументы і матэрыялы пра вядучыя аршанскія прадпрыемствы, пра жыццё і дзейнасць выдатных людзей Аршаншчыны: дзеяча рэвалюцыйнага руху і педагога П.М.Лепяшынскага, Герояў Савецкага Саюза А.Д.Салянікава, М.Д.Сіяніна, Герояў Сацыялістычнай Працы Б.А.Бароўскага, У.П.Пакроўскага, Г.В.Сямёнава, дзяржаўных і гаспадарчых дзеячаў Л.Я.Гаранскую, А.К.Міласерднага, пісьменнікаў Я.Купалу, У.Караткевіча, Закі Нуры, мастака П.Раманоўскага, спартсмена І.Жалязоўскага і інш. Сярод экспанатаў матэрыялы пра сувязь Оршы з гарадамі-пабрацімамі ў Італіі і Францыі. Экспазіцыю дапаўняюць мастацкія творы скульптара Я.Лансерэ, мастакоў М.Басалыгі, С.Шарая і інш. Музей мае выставачную залу, экспазіцыю пад адкрытым небам «Культавыя камяні Аршаншчыны».

В.П.Лютынскі.

Этнаграфічны музей «Млын» у Оршы

Размешчаны ў гістарычным цэнтры горада, паміж Дняпром і Аршыцай, у будынку вадзянога млына (помнік прамысловай архітэктуры пачатку 20 ст.). Адчынены ў 1991 г. Размяшчаецца на 2 паверхах. На 1-м знаходзіцца экспазіцыя «Хлеб наш надзённы», на 2-м — выстава традыцыйных рамёстваў Аршаншчыны. У экспазіцыі прылады працы земляроба, прылады для апрацоўкі лёну, шматлікія ўзоры ткацтва, ручнікі, народнае адзенне, ганчарныя вырабы, копыская кафля, пляценне з лазы. Ствараецца калекцыя сучаснага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Музей славы настаўніка ў Оршы

Створаны ў 1984 г. на грамадскіх пачатках. Размешчаны ў СШ № 3. Стваральнік і кіраўнік музея — настаўніца рускай мовы і літаратуры Л.Дз.Радомская. У музеі 2 залы: «Настаўніцкая слава», «Памяць пісьменніка-земляка Уладзіміра Караткевіча». У фондзе больш за 5 тыс. экспанатаў. На базе музея праводзяцца літаратурна-музычныя вечарыны, гасцёўні, конкурсы, радыёперадачы і іншыя мерапрыемствы. Музей — удзельнік і пераможца гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх злётаў краязнаўцаў. У 1991 г. за дасягненне па набыцці і захаванні гістарычнай і культурнай спадчыны музею прысвоена званне народнага.

Літаратурна-краязнаўчы музей «Аршаншчына літаратурная» ў Оршы

Створаны ў 1987 г. на грамадскіх пачатках. Размешчаны ў СШ № 15. У музеі сабраны звесткі пра ўзнікненне пісьменства на Аршаншчыне, пра беларускіх пісьменнікаў-землякоў У.Караткевіча, У.Корбана, Я.Сіпакова, і інш.

Музей «Героі і подзвігі» ў Оршы

Створаны ў 1964 г. на грамадскіх пачатках. Размешчаны ў СШ № 12. Стваральнік і кіраўнік музея — настаўніца гісторыі Э.С.Хаяк. У музеі сабраны багаты матэрыял пра ўдзельнікаў вызвалення Оршы ў Вялікую Айчынную вайну, устаноўлена каля тысячы іх імён. У фондзе каля 3 тыс. экспанатаў.

Краязнаўчы музей у Оршы

Створаны ў 1974 г. на грамадскіх пачатках. Размешчаны ў СШ № 17. Шматлікія экспанаты апавядаюць пра прыроду, эканоміку і мінулае горада. Самая вялікая экспазіцыя прысвечана гісторыі вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сабраны матэрыялы пра воінаў 192-й стралковай Аршанскай Чырванасцяжнай Хінганскай дывізіі, 621-га Аршанскага ордэна Суворава Чырванасцяжнага штурмавога авіяцыйнага палка.

Музей працоўнай славы ў Оршы

Створаны ў 1986 г. на грамадскіх пачатках. Размешчаны ў СШ № 19. Значнае месца ў музеі займае экспазіцыя, прысвечаная Герою Сацыялістычнай Працы Г.В.Сямёнаву, ганаровым грамадзянам Оршы. Адзін з аддзелаў музея прысвечаны гораду-пабраціму Возан-Влену (Францыя).

Музей баявой славы аршанскіх дывізій у Оршы

Створаны ў 1988 г. на грамадскіх пачатках. Размешчаны ў ПТВ № 101. Стваральнік і кіраўнік музея — выкладчыца вучылішча Н.Н.Дзегцярэнка. Экспазіцыя апавядае пра 22 воінскія часці, якія вызначыліся пры вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Фонд налічвае каля 8 тыс. экспанатаў. Пры музеі працуе гісторыка-краязнаўчы клуб «Пошук».

Музей гісторыі вызвалення Оршы і маладзёжна-пошукавага клуба «Русічы» ў Оршы

Створаны ў 1992 г. на грамадскіх пачатках. Размешчаны ў ПТВ № 110. Экспазіцыя апавядае пра мужную барацьбу аршанцаў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, вызваленне горада і раёна ў 1944 г., дзейнасць клуба «Русічы», створанага на базе вучылішча ў 1988 г.

Музей рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы аршанскага лакаматыўнага дэпо ў Оршы

Створаны ў 1986 г. на грамадскіх пачатках. Кіраўнік музея — былы чыгуначнік У.І.Блюм. У музеі афармлены экспазіцыі, якія апавядаюць пра гісторыю будаўніцтва Маскоўска-Брэсцкай і Рыга-Арлоўскай чыгунак, гісторыю дэпо ў паслярэвалюцыйны перыяд. Сабраны багаты матэрыял пра вядомых чыгуначнікаў К.Заслонава, Я.Андрэева, К.Грышчанкова, А.Барташэвіча, і інш. Музей прызнаны лепшым грамадскім музеем на Беларускай чыгунцы. *В.П.Лютынскі.*

Мемарыяльны музей К.С.Заслонава ў Оршы

Адкрыты 1.8.1948 г. Мае 5 экспазіцыйных залаў (плошча экспазіцыі 348 м^2), 8716 экспанатаў, у т.л. 6258 асноўнага фонду (1999). Сярод экспанатаў — фотаздымкі і дакументальныя матэрыялы пра дзіцячыя і юнацкія гады К.С.Заслонава, працоўную дзейнасць у даваенны перыяд, пра падпольную і дыверсійную работу на Аршанскім чыгуначным вузле, арганізацыю партызанскага атрада і брыгады, асабістыя рэчы, узнагароды, вытрымкі з дзённіка, успаміны яго паплечнікаў і

Будынак музея К.С.Заслонава ў Оршы.

інш. Экспануюцца таксама матэрыялы пра дзейнасць Аршанскага падпольнага РК КП(б)Б, пра партызан-заслонаўцаў і аршанскіх падпольшчыкаў (макеты партызанскіх зямлянак, абсталяванне партызанскай друкарні, зброя, абмундзіраванне, падпольныя газеты, лістоўкі і баявыя лісткі, асабістыя рэчы, дзённікі і лісты народных мсціўцаў і інш.), пра вызваленне Оршы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод твораў жывапісу і скульптуры — макет апошняга бою Заслонава (мастак А.Салаўёў), праекты помнікаў бюст Заслонава (скульптар С.Вакар).

У.С.Багамазаў.

Музей У.Караткевіча ў Оршы

У 1994 г. аддзел культуры гарвыканкома прыняў рашэнне аб стварэнні ў Оршы музея У.Караткевіча. З таго часу сабрана шмат цікавых экспанатаў: дакументы, якія характарызуюць розныя этапы жыцця пісьменніка, надрукаваныя творы і рукапісы, асабістыя рэчы, успаміны сваякоў і сяброў У.Караткевіча. У музеі таксама мяркуецца стварыць выставачную залу, дзе будуць праводзіцца часовыя выстаўкі, прысвечаныя славутым людзям Аршаншчыны.

Дом-музей драўлянай скульптуры разьбяра С.С.Шаўрова ў Оршы

Створаны 24.2.1992 г. Плошча экспазіцыі 34 м^2. У музеі захоўваецца каля 200 скульптур (1998) народнага майстра С.С.Шаўрова. Скульптурным кампазіцыям майстра ўласцівы дасціпнасць, гратэск, гумар. Тэматыка твораў: фальклорныя, літаратурныя, казачныя сюжэты, гераічнае партызанскае мінулае рэспублікі, народны побыт і інш. Пры музеі працуе майстэрня драўлянай скульптуры.

Гісторыка-краязнаўчы музей у в. Вусце

Адкрыты 9.5.1982 г. на грамадскіх пачатках. Мае каля 3 тыс. экспанатаў. Экспазіцыя музея ўключае раздзелы: быт нашых продкаў, рэвалюцыйны, ваенны, навуковыя дасягненні вучоных Жодзінскага інстытута земляробства, спартыўныя дасягненні, культура, нумізматыка, дары мораў і акіянаў.

Музей роднай вёскі ў в. Барздоўка

Адкрыты на грамадскіх пачатках. Размешчаны ў сярэдняй школе. Кіруе работай музея В.Г.Пячонкін. Каля 1200 экспанатаў. Сярод іх: драўляная саха, калекцыя самавараў, гліняны посуд, лыжкі, ступы, бітлашкі, ручнікі, абрусы. Музей мае копіі дакументаў, звязаных з гісторыяй вёскі 18—20 стагоддзяў, якія ўзяты з архіваў Вільні і Санкт-Пецярбурга, відэатэку фільмаў па гісторыі Беларусі, касеты з запісамі фальклорных песень, паданняў і інш. Экспазіцыя музея ўключае 8 раздзелаў: «Вёска ў канцы 19 — пачатку 20 стагоддзя», «Калектывізацыя», «Аднавяскоўцы ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «Яго імя носіць наш калгас» (В.У.Куйбышаў), «П.Д.Варанкоўскі» (старшыня калгаса), «М.Я.Шарсёў» (Герой Сацыялістычнай Працы, былы вучань школы), «Летапіс школы», «Свет нашых захапленняў» (нумізматыка, філатэлія і інш.).

Краязнаўчы музей У В. Крапіўна

Адкрыты 22.2.1989 г. на грамадскіх пачатках. Размешчаны ў сярэдняй школе. Кіруе работай музея Л.В.Шарай. Каля 500 экспанатаў. Экспазіцыя музея ўключае раздзелы: «Куток роднага краю», «Куток сялянскай хаты», «Землякі, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «Землякі — воіны-афганцы», «Землякі-ардэнаносцы», «Гісторыя школы», «Куток падарожжаў і экскурсій».

Музей баявой і працоўнай славы ў в. Вусце

Адкрыты 4.11.1987 г. на грамадскіх пачатках. Размешчаны ў сярэдняй школе. 115 экспанатаў. Сярод іх пісьмы салдат, якія загінулі на тэрыторыі в. Вусце, пахаронкі, перапіска з ветэранамі вайны, партызанамі. Экспазіцыя музея ўключае 4 раздзелы: «Вялікая Айчынная вайна на тэрыторыі Беларусі», «Удзельнікі вайны — нашы земля-

кі», «Гісторыя эксперыментальнай базы «Вусце», «Гісторыя школы».

Музей Ю.В.Смірнова ў г.п. Арэхаўск

Адкрыты ў чэрвені 1983 г. на грамадскіх пачатках. Размешчаны ў сярэдняй школе. 1128 экспанатаў. Экспазіцыя музея ўключае 3 раздзелы: «Дзіцячыя і юнацкія гады Ю.В.Смірнова», «Баявы шлях 26-й гвардзейскай дывізіі», «Смірноўскі рух».

Музей працоўнай і баявой славы ў пас. Высокае

Адкрыты ў маі 1990 г. на грамадскіх пачатках. Размешчаны ў ПТВ № 166. Мае 2 залы. У першай размешчаны матэрыялы, якія адлюстроўваюць гісторыю стварэння вучылішча, пасёлка Высокае. У другой зале прадстаўлена тэма Вялікай Айчыннай вайны. Дакументы і фотаздымкі расказваюць пра барацьбу насельніцтва з нямецка-фашысцкімі акупантамі. Электрыфікаваны стэнд-карта расказвае пра аперацыю «Баграціён» на тэрыторыі Аршаншчыны і Дубровеншчыны. У музеі працуе група экскурсаводаў з ліку навучэнцаў вучылішча.

Мастацкі калектыў

Зубаўскі народны хор. Створаны ў 1967 г. Званне народнага прысвоена ў 1981 г. Кіраўнікі: М.Лугаўцоў (з 1967), М.Някрасаў (з 1972). Хор мяшаны, шматгалосы, манера выканання блізкая да народнай. У аснове рэпертуару апрацоўкі беларускіх і іншых народных песень, творы беларускіх, рускіх і замежных кампазітараў. Дыпламант Рэспубліканскага агляду сельскай мастацкай самадзейнасці 1980 г.

З ГІСТОРЫІ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ АРШАНШЧЫНЫ

ОРША, горад абласнога падпарадкавання, цэнтр раёна. Вузел чыгуначных ліній на Віцебск, Крычаў, Лепель, Магілёў, Мінск, Смаленск і аўтамабільных дарог. Размешчана на Дняпры.

Як адзначалася раней, Орша ўпершыню ўпамінаецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 1067 г. як горад Ръша Полацкага княства. Першаасновай гарадской планіровачнай структуры было паселішча 11 ст., якое размяшчалася на мысе пры ўпадзенні р. Аршыца ў р. Дняпро. Яно знаходзілася ў цэнтральнай частцы сучаснага горада. На яго месцы ў пачатку 12 ст., як паказалі археалагічныя раскопкі, праведзеныя ў 1988 г. (В.М.Ляўко), быў узведзены земляны вал з драўлянай сцяной. Ён апаясваў пляцоўку паселішча і ператвараў яе ў крэпасць. Побач з умацаваным паселішчам і на процілеглым беразе р. Аршыца пачаў фарміравацца гарадскі пасад. Ён быў аддзелены ад крэпасці штучным ровам, які злучаў рэкі Аршыцу і Дняпро. Воднае кола ператварала крэпасць у астраўную. Даследаванні на ўмацаванай пляцоўцы (гарадзішчы) паказалі, што магутнасць культурнага пласта дасягае 1,6—3,6 м. Вылучаюцца 3 стратыграфічныя пласты (11—12 ст., 14—16 ст. і больш позняга часу).

У раскопках 1965—68 гг. (Ю.І.Драгун) зафіксаваны 11 будаўнічых ярусаў драўлянай забудовы. Гэта наземныя зрубы без фундаментаў. Іншы раз пад вуглы падкладвалі камяні. Печы былі глінабітнымі, двары масцілі драўлянымі насцілами і агароджвалі частаколам. У раскопках 1988 г. (В.М.Ляўко) выяўлены фрагмент насыпу вала, а таксама каменная вымастка 16 ст. з вапнавай рошчынай, якая размяшчалася з унутранага боку пляцоўкі. Магчыма, яна звязана з каменнымі ўмацаваннямі таго часу, якія былі пабудаваны вялікім князем ВКЛ Альгердам. Унутрывальных канструкцый не выяўлена, але праслойкі вуголля на розных узроўнях сведчаць пра неаднаразовыя пажары і падсыпкі. Матэрыялы 2-й палавіны 17 ст. перакрываюць насып вала.

На прылеглай да гарадзішча тэрыторыі выяўлены матэрыялы 12—18 ст. (В.М.Ляўко, 1990—91). Да 18 ст. адносяцца кавалкі фундаментаў каменных пабудоў. Магчыма, некаторыя з іх былі больш раннімі. У 14 ст. пачалося будаўніцтва каменнага замка, у межы пляцоўкі якога ўваходзіла і тэрыторыя гарадзішча. Пашырэнне ўмацаванай тэрыторыі выклікала неабходнасць пракапаць новы роў, які праходзіў паралельна першаму, што быў засыпаны. Такім чынам, новая цытадэль

таксама была абведзена водным колам. Земляныя ўмацаванні на гарадзішчы не разбураліся, а былі далучаны да каменнай сцяны, якая праходзіла ўздоўж новай часткі ўмацаванай пляцоўкі. Археалагічнымі раскопкамі (В.М.Ляўко, 1989—91) устаноўлена, што земляны вал быў знішчаны ў 17 ст. і больш не аднаўляўся. Не выключана, што і рэшткі каменных умацаванняў былі выкарыстаны ў больш позні час пры ўзвядзенні на месцы былога замка каменных пабудоў. Матэрыялы раскопак сведчаць, што Орша ў сярэдневяковуі была развітым гандлёва-рамесным і культурным цэнтрам. За замкавым ровам у Надняпроўі (сучасная вул. Леніна) быў яшчэ адзін пасад, які датуецца 12—17 ст. (В.М.Ляўко, 1990—95). У 12—13 ст. гэта тэрыторыя была заселена слаба. З пабудовай каменнага замка пад яго сценамі пачаў развівацца торг. На гэтым жа месцы ў 16 ст. быў пабудаваны кальвінскі збор, пляцоўка якога ў пачатку стагоддзя была выкуплена езуітамі пад калегіум. З узвядзеннем касцёла і пабудовай шматлікіх памяшканняў езуіцкага калегіума, а таксама іншых каталіцкіх манастыроў гэта тэрыторыя стала цэнтральнай у гарадской планіроўцы і ў 17 ст. была абнесена земляным валам. Гэты вал не захаваўся, але прыблізныя межы гарадскога пасада, які быў ім апаясаны, прасочваюцца па характары культурных напластаванняў.

Другая частка гарадской тэрыторыі фарміравалася ў Зааршынні насупраць старажытнага гарадзішча. Археалагічнымі раскопкамі і назіраннямі прасочаны верагодныя межы Зааршыннага пасада. На тэрыторыі сквера на правым беразе р. Аршыца археалагічнымі раскопкамі ўстаноўлена наяўнасць у раннім сярэдневякоўі невялікага ўзвышша, на якім, верагодна, была размешчана царква. У 12—16 ст. каля яе знаходзіліся могілкі. У 2-й палавіне 17 ст. на месцы могілак была пабудавана каменная царква Раства Багародзіцы (раскопкі В.М.Ляўко, 1995—96). На тэрыторыі Зааршыння ў раннім сярэдневякоўі знаходзіўся торг. Ён працягваў існаваць і тады, калі быў пабудаваны замак. Цераз р. Аршыца ад праязной брамы замка да торга быў перакінуты мост. Насупраць Надняпроўскага пасада на правым беразе р. Аршыца выяўлена гаць, зробленая з дубовых бярвён і хмызу.

Пасад на правабярэжжы р. Аршыца развіваўся ў паўночным напрамку ўздоўж сучаснай вул. Энгельса да яе скрыжавання з вул. Народнай. На гэтым жа беразе Аршыцы за гарадской мяжой на пустыры пабудаваны мужчынскі манастыр базыльян. Археалагічныя даследаванні паказалі, што культурны пласт у гэтым месцы датуецца не раней 18 ст. (В.М.Ляўко, 1989). Пра выразную гарадскую сярэдневяковую матэрыяльную культуру Оршы сведчаць разнастайныя рэчы, што былі знойдзены падчас раскопак: шматлікія шкляныя бранзалеты, пярсцёнкі віцебскай, кіеўскай, візантыйскай вытворчасці, фрагменты шклянога посуду з каляровым еўрапейскім роспісам, упрыгожанні з каляровых металаў, касцяныя грабяні, маёлікавы посуд, пячная кафля і інш.

У 1320-я гады Орша ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага. З 1560-х г., з 1560-х гадоў дзяржаўнае ўладанне, у 1387 г. згадваецца ў «Спісе рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх» пад назвай Рша, у 1392 г. стала цэнтрам Аршанскага (Ршанскага) намесніцтва з падпарадкаваннем вялікаму князю літоўскаму Вітаўту. Паводле «Хронікі Літоўскай і Жамойцкай» зімой 1397 г. горад быў абложаны войскам смаленскага князя Святаслава, якому аднак не ўдалося ўзяць горад. У 1398—1407 гг. у Оршы пабудаваны пяцівежавы мураваны замак. Аршанскія харугвы прымалі ўдзел у Грунвальдскай бітве (1410) у складзе аб'яднаных войск Вялікага княства Літоўскага і Польшчы супраць войск Тэўтонскага ордэна. У 1460 г. пры вялікім літоўскім князю Казіміры пабудавана з дрэва Ільінская царква (у 1505 на месцы згарэўшага храма княгіня Софія Юр'еўна пабудавала драўляную царкву святога Ільі Прарока). Праводзілася таксама перабудова гарадскіх умацаванняў. У 1500 г. вялікі князь літоўскі Аляксандр (сын Казіміра) узвёў вакол Оршы драўляную сцяну. У 1506 г. на горад зрабілі набег крымскія татары, а ў 1507—08 гг. Орша была абложана маскоўскім войскам.

У 1560 г. быў складзены інвентар Аршанскага замка, паводле якога замак меў 5 вежаў, у яго гарнізоне было 300 воінаў. У замку знаходзілася драўляная царква, некалькі дзесяткаў жылых дамоў, шмат гаспадарскіх пабудоў, налічвалася больш за 200 «дымоў». З 2-й палавіны 16 ст. горад — цэнтр Аршанскага павета. У 1565 г. Оршу наведаў і зрабіў яе апісанне Рафаэле Барберыні з Венецыі. Дакументы сведчаць, што ў Оршы пабывалі



Орша. Схема плана сярэдзіны 17 ст. (па І.Слюнькавай). Праваслаўныя храмы і манастыры: 1 — царква св. Тройцы; 2 — царква св. Мікалая; 3 — царква Пятніцы; 4 — царква уваскрэсення; 5 — царква Архангела Міхаіла; 6 — манастыр Благавешчання; 7 — царква Ільі Прарока; 8 — Куцеінскі манастыр; 9 — царква Багародзіцы Раства Хрыстова.

таксама канстанцінопальскі патрыярх (1588), аўстрыйскі пасол М.Варкач і рускі дзяк Т.Карабейнікаў (1593). У 16—17 ст. Орша была арэнай шматлікіх баёў, у выніку якіх неднаразова разбуралася і спусташалася.

У 1590 г. літоўскі канцлер Леў Сапега заснаваў у горадзе езуіцкі касцёл. У 1592 г. створана праваслаўнае брацтва, якое змагалася супраць пашырэння ўплыву каталіцызму, уніяцтва і пратэстанства, дамагалася раўнапраўя ўсіх хрысціянскіх канфесій, вяло культурна-асветніцкую дзейнасць. У 1601 г. Оршу і яе ваколіцы спасціг вялікі неўраджай, ад голаду памерла шмат людзей, а зімой 1603 г. здарыўся вялікі мор.

У 1604 г. канцлер Вялікага княства Літоўскага Леў Сапега заснаваў тут езуіцкі калегіум (дзейнічаў да 1820). Пры калегіуме існавала вучылішча, працаваў школьны тэатр.

Праездам са Смаленска ў Оршы пабываў (1611) кароль Жыгімонт III Ваза. З-за цяжкага эканамічнага становішча горада ён выдаў прывілей аб вызваленні насельніцтва на 4 гады ад падаткаў. У 1620 г. Орша атрымала магдэбургскае права і герб з выявамі крыжа і паўмесяца на блакітным полі. У тым жа годзе горад наведаў з мэтай абароны праваслаўных ад уціску уніятаў полацкі архіепіскап Мялецій Сматрыцкі.

Па няпоўных даных у Оршы ў 16 ст. існавалі 23 віды рамёстваў, у 17 ст. — 26, у пачатку 18 ст. — 49, у 2-й палавіне 18 ст. — 52 віды. Значнае развіццё атрымаў гандаль. Орша мела гандлёвыя сувязі з Расіяй, Польшчай, Прыбалтыкай, Украінай, з'яўлялася транзітным цэнтрам, пачатковым пунктам вялікага гандлёвага шляху — «гасцінца купецкага», які праходзіў па тэрыторыі Беларусі з усходу на захад. У 17 ст. Орша з'яўлялася адным з буйнейшых мастацкіх цэнтраў на Беларусі. Вядомы імёны аршанскіх разьбяроў таго часу Іпаліта і Арсенія, цесляроў — Восіпа Андрэева і Андрэя Фёдарава, якія працавалі пры царскім двары ў Маскве.

У 16—18 ст. у Оршы дзейнічалі цэрквы Ільі Прарока, Раства Багародзіцы, Ушэсця, Святадухаўская, Богаяўленская, Іаана Багас-

Пакроўскі манастыр. Будынак царквы не захаваўся.

лова; касцёлы — трынітарыяў, місіянераў, марыявітак. Існавалі манастыры (бернардзінцаў, базыльянак, францысканцаў, дамініканцаў, Куцеінскія жаночы Успенскі і Богаяўленскі мужчынскі), езуіцкі калегіум і інш. У Куцеінскім Богаяўленскім манастыры працавала шмат мастакоў. У 1-й палавіне 17 ст. манастыр з'яўляўся таксама адным з буйнейшых цэнтраў беларускага кірылічнага кнігадрукавання. У 1630 г. беларускі асветнік і кнігадрукар Спірыдон Собаль заснаваў пры манастыры друкарню, якая існавала каля 25 гадоў. Да 1654 г. тут было выдадзена каля 20 найменняў розных кніг. Сярод іх — «Буквар» С.Собаля (1631), «Малітваслоў» (1631), «Псалтыр» (1642) і інш. Выданні Куцеінскай друкарні былі шырока вядомы і мелі вялікае значэнне для пашырэння асветы не толькі на Беларусі, але і на Украіне, у Расіі і Літве.

У сярэдзіне 17—18 ст. ў сувязі з войнамі (руска-польскай 1654—67, Паўночнай 1700—21) і агульным эканамічным крызісам Рэчы Паспалітай Оршы былі нанесены вялікія страты, спусташэнні, і яна заняпала. Рэзка скараціласа колькасць насельніцтва.

У час Паўночнай вайны з 4 па 27 лютага 1706 г. ў Оршы знаходзіўся рускі цар Пётр I. Яго знаходжанне ў горадзе было звязана з узвядзеннем тут абарончых умацаванняў. Тут, у царкве Ільі Прарока, Пётр I маліўся аб дараванні перамогі над шведамі.

З 1772 г. паводле 1-га падзелу Рэчы Паспалітай Орша ў складзе Расійскай імперыі, з 1796 г. цэнтр павета Беларускай, з 1802 г. — Магілёўскай губерняў. У 1777 г. ў Оршы 309 будынкаў і 1757 жыхароў. Рускі сатырык Дз.І.Фанвізін, які пабываў у Оршы ў той час, назваў яе «даволі вялікім мястэчкам». У 1778 г. быў зацверджаны план забудовы горада. У 1781 г. горад атрымаў новы герб — на блакітным полі выявы 5 залатых стрэлаў. Двойчы, у 1778 г. і 1785 г., Оршу наведаў англійскі гісторык-асветнік і падарожнік Вільям Кокс. У 1791 г. ў горадзе адкрыта народнае вучылішча. Паводле звестак вядомага рускага вучонага, мінералога і хіміка, акадэміка Санкт-Пецярбургскай Акадэміі навук В.М.Севяргіна, які наведаў Оршу ў 1802 г., тут налічвалася 1570 жыхароў мужчынскага полу (з іх 62 былі рамеснікі), 347 драўляных дамоў, 36 крамаў, 1 мураваны будынак і млын.

У Айчынную вайну 1812 г. ў ваколіцах Оршы дзейнічалі партызанскія злучэнні Д.В.Давыдава і А.М.Сяславіна. Горад і яго наваколле былі арэнай баявых дзеянняў. У лістападзе 1812 г. Напалеон Банапарт правёў у Оршы перагрупоўку сваіх часцей. Перад адступленнем напалеонаўскія войскі разрабавалі і спалілі горад.

З 2-й палавіны 19 ст. Орша — буйны чыгуначны вузел. Чыгунка спрыяла эканамічнаму развіццю горада. Значным транзітным пунктам з'яўлялася рачная прыстань, ад якой штогод адпраўлялася каля 100 суднаў. Працавала паромная пераправа. На 1854 г. налічвалася 1528 мужчын і 1518 жанчын, 10 мураваных, 389 драўляных дамоў, 5 цэркваў, больш за 80 крам. У 1880 г. было 5 навучальных устаноў, на месцы драўлянай Ільінскай царквы пабудавана мураваная. Дзейнічалі лёнатрапальная і тытунёвая фабрыкі, вапнавы, піваварны заводы, гарбарныя, крухмальныя, цагельныя і інш. прадпрыемствы. Існавала шмат рамесных майстэрняў. У 1894 г. ў горадзе каля 10 навучальных устаноў (657 навучэнцаў), бальніца, 2 друкарні, 2 кнігарні, 2 аптэкі, 6 урачоў, 3 бібліятэкі (у тым ліку публічная імя А.С.Пушкіна, адкрыта ў 1899).

Паводле перапісу 1897 г. ў Оршы 13 161 жыхар (дваранскага саслоўя — 607, духавенства — 142, купецтва — 302 жыхары). Мяшчане складалі больш за 9 тыс. чалавек, сяляне каля 2,5 тыс. чалавек. Праваслаўных у той час было каля 5 тыс., католікаў — каля 550, пратэстантаў — 125, магаметан — 15 чалавек. У 1900 г. створаны рабочы гурток, а ў 1904 г. — Аршанская арганізацыя РСДРП. Працоўныя Оршы актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыі 1905—07 гг. Вясной 1905 г. ў горадзе адбыліся масавыя забастоўкі, мітынгі і дэманстрацыі, якія суправаджаліся сутычкамі з паліцыяй. Працоўныя Оршы прымалі ўдзел і ў Кастрычніцкай Усерасійскай палітычнай стачцы і Снежаньскім узброеным паўстанні 1905.

На 1.1.1909 г. ў Оршы было 17 248 жыхароў, 1339 драўляных і 84 мураваныя жылыя пабудовы, з іх 84 крытыя жалезам, 1209 — дрэвам, 130 — саломай. Плошча горада складала 2665 дзесяцін. Працавала некалькі фабрык і заводаў (1663 рабочыя). У горадзе было 96 рамесных устаноў (490 рамеснікаў), 7 цэркваў, 2 касцёлы, 2 капліцы, 13 яўрэйскіх малітоўных школ, 10 навучальных устаноў (у тым ліку рэальнае вучылішча), чытальня, 2 бібліятэкі, 2 бальніцы, 2 аптэкі, 9 аптэчных магазінаў, 14 гасцініц, 40 тракціраў і харчэўняў, 2 друкарні, 2 фотаатэлье, турма. На-



Орша. Тэатр «Мадэрн». Пачатак 20 ст.

сельніцтва абслугоўвалі 8 урачоў, 16 акушэрак, 10 фельчараў, 3 ветэрынары, 111 рамізнікаў. Плата за наёмную кватэру складала 200—400 рублёў у год. Рознічны кошт 1 фунта жытняга хлеба складаў 3—4 кап., пшанічнага — 5—6 кап., солі — 1,4 кап., мяса — 9—20 кап., цукру — 13 кап., газы — 3—5 кап., сажні дроў — 12—16 рублёў. У 1911 г. адкрыта жаночая настаўніцкая семінарыя.

У 1917 г. ў Оршы 19 844 жыхары. 28.10 (10.11) 1917 г. ў горадзе ўстаноўлена Савецкая ўлада. У лютым—кастрычніку 1918 г. горад быў часткова акупіраваны нямецкімі войскамі, праз Оршу праходзіла дэмаркацыйная лінія. Летам 1918 г. камісар станцыі Орша-Цэнтральная Д.Івашчанка разам з іншымі бальшавікамі Оршы, нягледзячы на перашкоды з боку немцаў і эсэраў, забяспечылі пропуск 36 вагонаў збожжа, якое выдзеліў савецкі ўрад для галадаючых рускіх ваеннапалонных у Германіі. 1.5.1920 г. ў горадзе праведзены камуністычны суботнік.

З 1924 г. Орша — цэнтр акругі (да 1930) і раёна ў складзе БССР, з 1938 г. — горад абласнога падпарадкавання. За гады першых пяцігодак у горадзе пабудаваны льнокамбінат, лесапільны, механічны заводы, мясакамбінат і інш. Былі адкрыты настаўніцкі інстытут, тэхнікумы педагагічны і чыгуначнага транспарту, некалькі бібліятэк, краязнаўчы музей і шэраг іншых устаноў культуры і быту. У 1939 г. 37,6 тыс. жыхароў.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў баях пад Оршай 14.7.1941 г. ўпершыню былі выкарыстаны рэактыўныя ўстаноўкі («Кацюшы»). З 16.7.1941 г. горад быў акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У горадзе дзейнічала аршанскае камуністычнае падполле, у тым ліку групы К.С.Заслонава, братоў А. і В.Рыбаковых, К.Грачыхі, В.Бахматава, А.Нікалаева, В.Марчука, а на тэрыторыі раёна — падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ, партызанскія брыгады «Дзядзькі Косці», 1-я і 2-я імя К.С.Заслонава, Багушэўская і інш.

За гады акупацыі горад быў зруйнаваны, разбураны прамысловыя прадпрыемствы, культурныя і медыцынскія ўстановы, больш за 75% жыллёвага фонду горада. На чыгуначным вузле была поўнасцю знішчана станцыйная гаспадарка. Гітлераўцы загубілі ў Оршы тысячы савецкіх грамадзян.

Орша была вызвалена 27 чэрвеня 1944 г. ў выніку Віцебска-Аршанскай аперацыі войскамі 11-й гвардзейскай і 31-й армій 3-га Беларускага фронту. 41-й вайсковай часці і злучэнню, што вызначыліся пры вызваленні горада, нададзена ганаровае найменне «Аршанскіх».

За пасляваенны перыяд горад аднавіўся, значна пашырыў свае межы. У 1959 г. было

Орша. Будынак гарадской управы. Не захаваўся.

Орша. Гарадское вучылішча і сабор па Магілёўскай вул. (сабор не захаваўся).

64,6 тыс., у 1970 г. — 100,6 тыс., у 1997 г. — каля 130 тыс., у 1999 г. — 124,3 тыс. жыхароў.

У 1978 г. і 1980 г. распрацаваны новыя генеральныя планы забудовы Оршы. Сучасны горад уключае цэнтральны, прывакзальны, паўночны, паўднёвы, льнокамбіната і Задняпроўя раёны. Адміністрацыйна-грамадскі цэнтр Оршы размешчаны на правым беразе Дняпра. Вылучаюцца жылы масіў Задняпроўя і жылы комплекс па вул. Леніна.

Орша — буйны прамысловы і культурны цэнтр. Прамысловасць сканцэнтравана ў асноўным у паўночным і паўднёвым раёнах. Тут працуюць заводы: станкабудаўнічы, інструментальны, будаўнічых дэталей, лёгкага машынабудавання, трактарарамонтны, форм і тэхналагічнай аснасткі; камбінаты: зборных, жалезабетонных і сілікатных вырабаў, мясаканервавы, кансервава-агароднінасушыльны, малочны, хлебапрадуктаў, льняны; фабрыкі: швейная, мастацкіх вырабаў і птушыная.

У Оршы знаходзяцца механіка-тэхналагічны і чыгуначнага транспарту тэхнікумы, медыцынскае вучылішча, педагагічны каледж, 6 прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, 3 музычныя, 4 дзіцячыя і юнацкія спартыўныя школы, шмат сярэдніх школ, дашкольных устаноў, магазінаў і іншых гандлёвых кропак, гасцініца, кінатэатр, Палац культуры тэкстыльшчыкаў і шэраг іншых клубных і медыцынскіх устаноў. Працуюць музеі — гісторыі і культуры горада, мемарыяльны імя К.С.Заслонава, У.Караткевіча і этнаграфічны «Млын», філіял дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці. Выдаецца «Аршанская газета».

Ва ўрочышчы Замчышча пры ўпадзенні р. Аршыца ў Дняпро археалагічны помнік—гарадзішча 10—12 ст.; архітэктурныя помнікі — Ільінская царква, комплекс Куцеінскага Богаяўленскага манастыра (жылы корпус і Святадухаўская царква) і будынкі манастыра базыльян, млына, чыгуначнага вакзала; помнікі: У.І.Леніну, С.М.Кіраву, Героям Савецкага Саюза К.С.Заслонаву, М.А.Карначонку, савецкім воінам, якія загінулі пры вызваленні Оршы ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, на брацкай магіле падпольшчыкаў, ахвяр фашызму і ваеннапалонных, на магіле камандзіра партызанскага атрада 1-й партызанскай брыгады імя К.С.Заслонава У.Я.Сарнова, перад будынкам бальніцы — М.А.Сямашку, воінам-аршанцам, якія загінулі ў Афганістане, пісьменніку У.Караткевічу, мемарыяльны комплекс «Кацюша», мемарыяльны парк Герояў і Курган Славы і інш. На многіх дамах устаноўлены мемарыяльныя дошкі ў памяць аб падпольшчыках, славутых людзях.

Орша — радзіма беларускіх пісьменнікаў Я.Васілёнка, У.Караткевіча, рускіх пісьменнікаў — А.Міронава, Юрыя (Георгія) Багушэвіча, Герояў Савецкага Саюза — Б.Хігрына, М.Часныка, Героя Сацыялістычнай Працы І.А.Юркова, дзяржаўнага дзеяча БССР М.В.Дарашэвіча, спартсмена І.Жалязоўскага.

У 1984 г. Орша за гераізм і мужнасць, якія праявілі яе жыхары ў гады Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

Г.І.Дулеба, В.М.Ляўко
(сярэдневяковая гісторыя).

АБУХАВА, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 39 двароў, 267 жыхароў. Вёсцы належалі 303 дзесяціны зямлі. У 1923 г. 257 жыхароў. Існавала працоўная школа 1-й ступені, у якой настаўніца М.К.Мартусевіч вучыла 20 дзяцей. Пры школе была бібліятэка з 47 кніг. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны меліяратар». Працавала кузня. У 1969 г. 72 двары, 320 жыхароў. На 1.1.1998 г. 138 двароў, 348 жыхароў. Дом культуры, бібліятэка, магазін.

АГРАНАМІЧНАЯ, вёска ў Смалянскім сельсавеце. У 1969 г. 112 двароў, 302 жыхары. На 1.1.1998 г. 216 двароў, 899 жыхароў. На тэрыторыі вёскі размешчаны будынак Смалянскага саўгаса-тэхнікума падрыхтоўкі спецыялістаў для сельскай гаспадаркі (заснаваны ў 1930), клуб, сталовая, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў, партызан і ахвяр фашызму, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

АЗЯРОК, вёска ў Запольскім сельсавеце. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 38 двароў, 280 жыхароў. Вёсцы належала 298 дзесяцін зямлі. У 1932 г. ў Азярок былі сселены вёска Прахожбы і хутар Чуватава. У 1929 г. створаны калгас «Ноў». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 61 двор, 111 жыхароў. Магазін.

АЛАНЦЬЕВА, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, у калгасе «Рассвет». У 1871 г. 15 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 40 двароў, каля 330 жыхароў. Вёсцы належалі 232 дзесяціны зямлі. У 1929 г. створаны калгас «Пралетарый». Працавала кузня. На 11.1.1998 г. 38 двароў, 74 жыхары.

АНДРЭЕЎШЧЫНА, вёска, цэнтр сельсавета (з 1985). У 1871 г. 10 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 23 двары, каля 160 жыхароў. Вёсцы належала 150 дзесяцін зямлі. У 1923 г. 207 жыхароў. У 1930 г. пасля перасялення ў Андрэеўшчыну вёскі Буднікі створаны калгас «Бальшавік». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 1030 двароў, 3085 жыхароў. Камбінат будаўнічых матэрыялаў, завод жалезабетонных вырабаў, газаразмеркавальнік, райсельгасэнерга, аграрна-прамысловае аб'яднанне «Белая Русь», сярэдняя школа, спецыяльная школа-інтэрнат, дзіцячыя яслі-сад, музычная школа, Дом культуры, бібліятэка, амбулаторыя, ветэрынарная аптэка і станцыя, аддзяленне сувязі, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

АНІБАЛЕВА, вёска ў Андрэеўшчынскім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева. У 1871 г. ўпамінаецца як фальварак Анібалева. У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 22 двары, каля 130 жыхароў. 500 дзесяцін зямлі, у тым ліку 138 дзесяцін лесу. У 1923 г. 239 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Шлях Саветаў». У 1940 г. 33 двары, 101 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну ў наваколлі вёскі дзейнічалі партызаны 1-й брыгады імя К.С.Заслонава. У чэрвені 1944 г. гітлераўцы спалілі вёску. На 1.1.1998 г. 23 двары, 42 жыхары. Магіла савецкага лётчыка, старшага лейтэнанта І.Я.Клімава, які загінуў у паветраным баі ў 1944 г.

АНТАВІЛЬ, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева. У 1855 г. маёнтак і ўладанне памешчыкаў Хлюдзінскіх. У пачатку 20 ст. таксама маёнтак Хлюдзінскіх Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 1 двор, 2 жыхары. Маёнтку належала 1555 дзесяцін зямлі, у тым ліку 843 дзесяціны лесу. У Вялікую Айчынную вайну ў наваколлі дзейнічалі партызаны 2-га атрада імя К.Я.Варашылава Багушэўскай брыгады. На 1.1.1998 г. 11 двароў, 14 жыхароў.

АНТОНАЎКА, вёска ў Панізоўскім сельсавеце, у саўгасе «Бабінічы». У 1871 г. 5 двароў. У пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета, 45 двароў, каля 320 жыхароў. Вёсцы належала 369 дзесяцін зямлі, у тым ліку 20 дзесяцін лесу. У 1923 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой настаўніца Н.Чахоўская вучыла 37 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоная ніва», працавала кузня. У 1930 г. ў Антонаўку сселены пасёлкі Аляксандраўка і Антонаўка. На 1.1.1998 г. 148 двароў, 392 жыхары.

АРАШКІ, вёска ў Клюкаўскім сельсавеце, у аграфірме «Дзевіна». У 1940 г. 25 гаспадарак, 81 жыхар. На 1.1.1998 г. 14 двароў, 23 жыхары.

АРЛОЎШЧЫНА, вёска ў Забалоцкім сельсавеце, у саўгасе «Забалацце». У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 2 двары, 22 жыхары. Вёсцы належала 18 дзесяцін зямлі. У 1923 г. 107 жыхароў. У 1933 г. быў створаны калгас «1 Мая». Працавала кузня. У 1939 г. ў Арлоўшчыну сселены хутар Лісічына. На 1.1.1998 г. 20 двароў, 30 жыхароў.

АРЭХАЎСК, гарадскі пасёлак, цэнтр пасялковага Савета. Вядомы з 18 ст. як вёска Арэхі, якая належала князям Сапегам, потым Пацёмкіным, а з канца 18 ст. Любамірскім. У 1647 г. пабудавана драўляная царква. У 1792 г. вёска ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ, уладанне Любамірскіх, 6 двароў. Паводле падання ў час вайны 1812 г. тут спыняўся і маліўся ў мясцовай царкве М.І.Кутузаў. У 1830-х гадах 13 двароў, каля 120 жыхароў, пабудавана Троіцкая праваслаўная царква са званіцай з дрэва. На будаўніцтве царквы працавала каля 70 цесляроў. У пачатку 20 ст. 29 двароў, каля 110 жыхароў. Каля в. Арэхі працаваў завод сухой перагонкі драўніны (150 рабочых), вакол якога ў 1910 г. ўзнік пас. Выдрыца (19 двароў, 417 жыхароў). У 1917 г. пасля закрыцця завода пасёлак сельскага тыпу. З 1924 г. ў Аршанскім раёне. З пачаткам будаўніцтва ў 1927 г. БелДРЭС (1-я чарга пабудавана ў 1930) пасёлак вырас, зліўся з в. Арэхі і 25.7.1929 г. пераўтвораны ў рабочы пасёлак пад назвай Арэхі-Выдрыца. Электрастанцыя спачатку называлася Асінаўская ДРЭС. У 1940 г. 193 двары, 5,5 тыс. жыхароў. З сярэдзіны ліпеня 1941 г. да 25 чэрвеня 1944 г. Арэхі-Выдрыца акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія вывезлі абсталяванне і ўзарвалі будынкі электрастанцыі. З 11.7.1946 г. рабочы пасёлак Арэхі-Выдрыца пераўтвораны ў гарадскі пасёлак і перайменаваны ў Арэхаўск. У 1946—56 гг. цэнтр раёна Віцебскай вобласці. Пасля вайны да 1956 г. тут існаваў дзіцячы дом. У 1969 г. ў Арэхаўску 5,3 тыс., на 1.1.1998 г. — 3,6

тыс. жыхароў. Завод кандэнсатараў «Лантан», ільнозавод, цяплічны камбінат, участкі Лукомскага будаўнічага ўпраўлення і «Белэнергарамналадка», сярэдняя і дзіцячая музычная школы, 2 дзіцячыя яслі-сады, Дом культуры, 2 бібліятэкі, бальніца, Дом быту, аптэка, аддзяленне сувязі, 10 магазінаў. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941 і 1944 гг. (у 1965 г. пастаўлены помнік) і магіла Героя Савецкага Саюза Ю.В.Смірнова (у 1956 на магіле ўстаноўлены бюст). Помнік драўлянага дойлідства 1-й палавіны 19 ст. — Спаская царква. Паблізу пасёлка, на беразе Арэхаўскага возера, археалагічны помнік — курганны могільнік (26 насыпаў; выявіў у 1926 Д.Васілеўскі, абследаваў у 1981 М.І.Лашанкоў).

АСІНАЎКА, вёска ў калгасе імя Свярдлова і чыгуначная станцыя на лініі Орша—Смаленск у Пішчалаўскім сельсавеце. У 1792 г. 6 двароў. Уваходзіла ў склад маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 10 двароў, каля 90 жыхароў. На вёсцы належалі 84 дзесяціны зямлі. У 1923 г. 99 жыхароў. На 1.1.1998 г. 6 двароў, 11 жыхароў. Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы Ц.Е.Салтановіча.

БАБІНІЧЫ, вёска ў Панізоўскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Бабінічы». У 1795 г. 144 мужчыны і 163 жанчыны. У 19—пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета. У 1886 г. 30 двароў, 226 жыхароў, праваслаўная царква, царкоўнапрыходская школа (адкрыта ў 1883), хлебазапасны магазін, вадзяны млын. Побач з сялом знаходзіўся фальварак Бабінічы, дзе працаваў гарбарны завод, заснаваны ў 1850 г. Жыхарам сяла належала 449 дзесяцін зямлі, у тым ліку 28 дзесяцін лесу. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. настаўніцы М.І.Бандарук і Е.С.Ганчарова вучылі 75 хлопчыкаў і дзяўчынак. У той час у вёсцы было 547 жыхароў. У пачатку 1930-х гадоў арганізаваны саўгас «Бабінічы» і калгас «XVI партз'езд». Працавалі 2 кузні. У 1928—39 гг. Бабінічы — цэнтр сельсавета. У 1970 г. 199 гаспадарак, 538 жыхароў. У 1979 г. з вёскай зліўся пасёлак Бабінічы. На 1.1.1998 г. 1026 двароў, 3304 жыхары. Аддзяленне Аршанскай сельгастэхнікі, механічныя майстэрні, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, дзіцячая музычная школа, клуб, бібліятэка, тэлефонная станцыя, амбулаторыя, ветэрынарны пункт, аптэка, аддзяленне сувязі, 3 магазіны, кафэ. Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

БАБІЧЫ, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 4 двары. У 19—пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета. У 1871 г. 10 двароў, у 1910 г. 15 двароў, 115 жыхароў. Вёсцы належала 276 дзесяцін зямлі, у тым ліку 10 дзесяцін лесу. Млын. У 1923 г. 271 жыхар. На 1.1.1998 г. 8 двароў, 12 жыхароў.

БАБРАМЫНІЧЫ, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у складзе саўгаса-тэхнікума «Смаляны». У пачатку 20 ст. ў Раснянскай воласці Сенненскага павета, 25 двароў, 190 жыхароў. За вёскай была замацавана 271 дзесяціна зямлі, у тым ліку 15 дзесяцін лесу. У 1936 г. ў вёску сселены хутар Белікі. На 1.1.1998 г. 18 двароў, 37 жыхароў. Брацкая магіла партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

БАГРЫНАВА, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Свярдлова. У сярэдзіне 19 ст. маёнтак, уласнасць Сушынскіх. У пачатку 20 ст. вёска Машкоўскай воласці Аршанскага пав., 22 двары, 150 жыхароў. За вёскай было замацавана 140 дзесяцін зямлі. У 1931 г. ў Багрынава сселены хутар Скрабоўшчына, у 1962 г. далучана вёска Васкрасеншчына. На 1.1.1998 г. 25 двароў, 41 жыхар.

БАЛБАСАВА, вёска, цэнтр сельсавета (з 26.10.1996), да 29 мая 1996 г. ваенны гарадок Балбасава. Рамонтны завод, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, бібліятэка, Дом культуры, дзіцячая музычная школа, 5 прадуктовых, 3 прамтаварныя магазіны, бальніца, аптэка, аддзяленне сувязі. На 1.1.1998 г. 1746 двароў, 4458 жыхароў. Помнік двойчы Герою Савецкага Саюза С.І.Грьщаўцу, які загінуў каля Балбасава 16.9.1939 г. пры выкананні службовых абавязкаў. Помнік-абеліск і стэла на ўшанаванне памяці 63 савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну і пры выкананні службовых абавязкаў у пасляваенны час.

БАЛОТАВІЧЫ, вёска ў Першамайскім сельсавеце, у саўгасе «Ударнік». У 1867 г. ўласнасць Любамірскіх. У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 14 двароў, каля 90 жыхароў. Вёсцы належала 91 дзесяціна зямлі. У 1940 г. 24 двары, 78 жыхароў. У чэрвені 1944 г. гітлераўскія карнікі спалілі Балотавічы і загубілі 7 жыхароў. На 1.1.1998 г. 8 двароў, 9 жыхароў.

БАРАДЗІНО, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. Вядома з 19 ст. як маёнтак, уласнасць Растоўскіх. Карчма. У пачатку 20 ст. вёска Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 23 двары, 173 жыхары. За вёскай была замацавана 181 дзесяціна зямлі. У 1923 г. 253 жыхары. На 1.1.1998 г. 39 двароў, 67 жыхароў. Каля вёскі, ва ўрочышчы Гарадок, археалагічны помнік — гарадзішча (выявіў і даследаваў у 1971 Л.Д.Побаль). Знойдзены рэшткі ляпных гладкасценных пасудзін днепрадзвінскай культуры.

БАРАДУЛІНА, вёска ў Крапівенскім сельсавеце, у саўгасе «Дняпро». У канцы 19—пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета. У 1898 г. каля 100 жыхароў. У 1910 г. 19 двароў, 138 жыхароў. Вёсцы належала 248 дзесяцін зямлі. У 1923 г. 140 жыхароў. У 1933 г. існаваў калгас «Барэц». Кузня. На 1.1.1998 г. 18 двароў, 26 жыхароў.

БАРАНЬ, вёска ў Вусценскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». Вядома з 1518 г. Належала князям Астрожскім. З 1594 г. ўласнасць М.К.Радзівіла як прыданае яго жонкі Кацярыны Астрожскай. У 1597 г. заснавана майстэрня па вырабе ядраў і куль для гармат і гакаўніц (пішчаляў). Спачатку ў ёй працавалі Ходар Бяляк і Панцялей Абрамовіч, у 1598 г. яшчэ 11 мясцовых жыхароў. Работнікі майстэрні атрымалі па адной валоцы зямлі. За гэта яны абавязаны былі здабываць жалезную руду, вырабляць драўнінны вугаль, плавіць руду, каваць жалеза, адліваць ядры і кулі, а таксама выконваць іншыя павіннасці на карысць свайго гаспадара. Майстэрня павінна была забяспечыць ядрамі і кулямі радзівілаўскія замкі ў Копысі і Біржы (цяпер горад Біркай у Літве). У 1597 г. цэнтр Баранскай воласці.

У 16—17 ст. у час войнаў Барань неаднаразова спусташалася. У 1-й чвэрці 17 ст. пабудавана праваслаўная Святога Спаса царква з дрэва, у якой з 1630 г. свяшчэннікам быў Фёдар Парфяновіч. У 1704 г. на месцы старой была ўзведзена новая драўляная Спаса-Праабражэнская царква (захавалася). У тым жа годзе ў сяле 14 двароў.

З 1772 г. цэнтр воласці Аршанскага павета. Паколькі князь Радзівіл адмовіўся прысягаць на вернасць Расіі, сяло Барань, горад Барань і ўвесь яго маёнтак былі канфіскаваны і перададзены казне. У пачатку 19 ст. сялом валодаў памешчык, адстаўны маёр Пётр Барзоў. У Айчынную вайну 1812 г. праз сяло прайшлі французскія войскі. 8.11.1812 г. Напалеон адступаў са старой гвардыяй з Оршы па Маскоўскім тракце да сяла Барань. Ёсць звесткі, што ён начаваў тут і 9 лістапада сустракаўся з маршалам Неем. Каля сяла дабылася сутычка казакаў Платава з адступаўшымі французскімі войскамі. Барань была разрабавана і спалена.

У 1850 г. сяло — уласнасць Дабрышынай, праз 5 гадоў перайшло да Мянжынскага. У 1875 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, у 1883 г. ў ім вучыліся 60 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі (настаўнік Іван Кудраўцаў). У 1884 г. 38 двароў, 277 жыхароў, хлебазапасны магазін, царква, земскае народнае вучылішча. У 1893 г. адкрыта багадзельня (прытулак для інвалідаў), на ўтрыманне адпушчана 168 рублёў.

У пачатку 20 ст. 72 двары, каля 470 жыхароў. Сялу належала 478 дзесяцін зямлі, у тым ліку 442 дзесяціны прыдатнай. Існавала казённая вінная лаўка. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе земскага народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені, пры школе — бібліятэка (у 1923 каля 300 кніг). У той час у вёсцы былі 642 жыхары. У 1929 г. арганізаваны калгасы «Верны шлях» і «Чырвоны Кастрычнік». Працавалі 2 кузні. У 1924—60 гг. цэнтр сельсавета. На 1.1.1998 г. 175 двароў, 386 жыхароў, ветэрынарны ўчастак, аддзяленне сувязі, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1941 і 1944 гг., помнік архітэктуры пачатку 18 ст.— Спаса-Праабражэнская царква.

БАРАНЬ, горад, падпарадкоўваецца Аршанскаму гарадскому Савету. Назва ад суседняй вёскі Барань. Горад заснаваны 30.10.1598 г. на гасцінцы Барысаў—Орша, каля сяла

Памятны знак у гонар заснавання Барані.

Палац культуры ў г. Барань.

Барань, князем М.К.Радзівілам. Пазней Барань упамінаецца як мястэчка (слабада), двор ці маёнтак (фальварак). Згодна інвентароў 16 ст. войтам заснаванага паселішча быў жыхар сяла Барань Сямён Кавезь, які атрымаў за службу ад князя 2 гарадскія валокі зямлі.

Паводле інвентара 1652 г. ў Барані былі гандлёвая плошча і 6 вуліц: Копыская, Віленская, Карпацкая, Бранцоўская, Клімавіцкая і Смалянская, якія былі невялікімі (ад 4 да 19 двароў, 80 участкаў пад забудову). Мяшчанам належалі 40 валок ворыўнай зямлі.

У 1724 г. фальварак Барань: двор з белай хатай, вазоўняй, лазняй, броварам (вінакурняй), турмой, пякарняй і стайняй (канюшняй), стадоламі і гумнамі; мястэчка Барань — 26 дамоў, рынак, млын, царква, карчма.

З 1772 г. ў складзе Расійскай імперыі. Паколькі Радзівіл адмовіўся прысягнуць на вернасць Расіі, яго маёнтак Копысь з 50 населенымі пунктамі, у тым ліку і мяст. Барань, былі канфіскаваны і перададзены казне.

Помнік у гонар вызваліцеляў Барані.

У пачатку 19 ст. Барань — уласнасць памешчыка Пятра Барзова, у сярэдзіне 1850-х гадоў — Мянжынскіх. У 1872 г. заснаваны крухмальны завод, які перапрацоўваў штодзённа 600 пудоў бульбы. У 1873 г. працаваў драцяна-цвіковы завод, які выпускаў цвікі, дрот, мэблевую пружыну. З 1882 г. маёнткам Барань валодаў стацкі саветнік М.Папоў. Млын і карчма.

У пачатку 20 ст. маёнтак Баранскай воласці Аршанскага павета, 12 двароў, 350 жыхароў. Маёнтку належала 470 дзесяцін зямлі, у тым ліку 30 дзесяцін лесу.

У студзені 1905 г. рабочыя драцяна-цвіковага завода правялі стачку (40 рабочых ланцуговага аддзялення), але іх патрабаванні палепшыць умовы працы, павысіць заработную плату не былі задаволены. Удзельнікаў стачкі звольнілі. У перыяд з 12 па 20 кастрычніка 1905 г. ў знак салідарнасці з Кастрычніцкай Усерасійскай палітычнай стачкай баставалі ўсе рабочыя завода (каля 200 чалавек).

У 1906 г. ў Барані адкрыта заводскае вучылішча, у якім вучыліся 28 хлопчыкаў і 18 дзяўчынак. У 1910 г. на драцяна-цвіковым заводзе працавалі 169 рабочых. У лістападзе 1917 г. ў горадзе ўстаноўлена Савецкая ўлада. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіраваны войскамі кайзераўскай Германіі. У 1924—60 гг. цэнтр сельсавета ў Аршанскім раёне. У 1935 г. пераўтвораны ў рабочы пасёлак. З 16.7.1941 г. да 27.6.1944 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У красавіку 1942 г. гітлераўцы расстралялі каля 40 мірных жыхароў Барані. У 1969 г. 10,1 тыс. жыхароў. З 1972 г. горад. На 1.1.1998 г. каля 14,2 тыс. жыхароў. Аграрна-прамысловы завод «Лёс», камбінат бытавога абслугоўвання, 3 сярэднія школы, музычная і дзіцяча-юнацкая спартыўная школы, 5 дзіцячых дашкольных устаноў, Палац культуры, бібліятэка, паліклініка, бальніца, аптэка, аддзяленне сувязі, магазіны, сталовая. Магіла ахвяр фашызму (каля горада), брацкая магіла савецкіх воінаў і партызана, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Помнікі: у гонар заснавання Барані, Леніну, Працоўнай Славы. Радзіма беларускага пісьменніка У.І.Корбана.

БАРАЎЦЫ, вёска ў Вусценскім сельсавеце. У 1940 г. 9 двароў, 27 жыхароў. На 1.1.1998 г. 3 двары, 5 жыхароў.

БАРЗДОЎКА, вёска, цэнтр сельсавета (з 12.8.1974) і калгаса імя Куйбышава. У 18 ст.

належала памешчыкам Пацеевым, з 1707 г. Бародзічам. У 1-й палавіне 18 ст. ўладанне князёў Сапегаў, уваходзіла ў склад іх «Дубровенскага графства» Аршанскага павета. У 1897 г. 48 двароў, 311 жыхароў, хлебазапасны магазін, школа царкоўнай граматы, вінная лаўка, капліца. У пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета, 55 двароў, 390 жыхароў. Вёсцы належала 626 дзесяцін зямлі, у тым ліку 45 дзесяцін лесу.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені. У 1929 г. створаны калгас «Вызваленне жанчын». Працавала кузня. У 1970 г. 88 двароў, 247 жыхароў. На 1.1.1998 г. 112 двароў, 288 жыхароў. Механічныя майстэрні, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, аддзяленне сувязі. Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

БАРСУКІ, вёска ў Балбасаўскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». У 1871 г. 24 двары. У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 44 двары, 306 жыхароў. За вёскай былі замацаваны 409 дзесяцін зямлі, у тым ліку 5 дзесяцін лесу. У 1923 г. 392 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Новае жыццё». 25.6.1944 г. каля Барсукоў старшы лейтэнант, намеснік камандзіра эскадрыллі гвардзейскага штурмавога авіяпалка Р.П.Віктараў знішчыў 12 варожых аўтамашын, зенітную батарэю, паравоз, 4 вагоны, склад боепрыпасаў гітлераўцаў. На 1.1.1998 г. 134 двары, 253 жыхары. Магазін.

БАРСУКІ, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 44 двары, 300 жыхароў. У 1940 г. 93 гаспадаркі, 337 жыхароў. На 1.1.1998 г. 60 двароў, 91 жыхар.

БАРЭЙШАВА, вёска ў Першамайскім сельсавеце, у саўгасе «Ударнік». Назва дадзена ад наймення ракі Барэйшаўка. У 1871 г. 20 двароў. У 1880 г. 25 двароў, 168 жыхароў. У пачатку 20 ст. ў Коханаўскай воласці Аршанскага павета, 28 двароў, 266 жыхароў. Жыхарам вёскі належала 240 дзесяцін зямлі. У 1909 г. адкрыта земскае народнае вучылішча (пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі працоўная школа 1-й ступені). У 1923 г. настаўніца С.Колб вучыла тут 16 хлопчыкаў і 16 дзяўчынак. У той час у вёсцы былі 244 жыхары. На 1.1.1998 г. 28 двароў, 32 жыхары. Археалагічны помнік — гарадзішча. Абследавалі ў 1959 г. Л.В.Аляксееў, у 1971 г. — Л.Д.Побаль. Знойдзена ляпная гладкасценная кераміка.

БАЯКОЎШЧЫНА, вёска ў Запольскім сельсавеце, у калгасе «Спартак». У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 13 двароў, 108 жыхароў. Вёсцы належала 80 дзесяцін зямлі. У 1930 г. створаны калгас «Авангард». На 1.1.1998 г. 11 двароў, 21 жыхар.

БАЯРЫ, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе імя Куйбышава. У 1940 г. 80 двароў, 240 жыхароў. На 1.1.1998 г. 35 двароў, 54 жыхары.

БЕЛЕВА, вёска, цэнтр Першамайскага сельсавета (з 1963) і калгаса «1 Мая». Вядома з 19 ст. як маёнтак Белева, які належаў Сіпайлам-Рудніцкім. У 1879 г. дзейнічалі карчма і млын. У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 26 двароў, 216 жыхароў. Вёсцы належала 175 дзесяцін зямлі. У 1930 г. аб'яднана з пасёлкам Белеўшчына, былымі маёнткамі Белева-1 і Белева-2. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны Усход». Працавала кузня. У 1970 г. 86 гаспадарак, 222 жыхары. На 1.1.1998 г. 119 двароў, 302 жыхары. Майстэрні, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, магазін, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

БЕРАСЦЕНАВА, вёска ў Андрэеўшчынскім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева. У сярэдзіне 19 ст. маёнтак Берасценава (Кудаева), уласнасць Любамірскіх. Дзейнічалі млын і карчма. У пачатку 20 ст. ў складзе Высоцкай воласці Аршанскага павета, 8 двароў, 120 жыхароў. Маёнтку належалі 1040

Сядзіба ў в. Берасценава. З малюнка Н.Орды. 1877 г.

дзесяцін зямлі, у тым ліку 200 дзесяцін лесу. Дзейнічаў завод сухой перагонкі драўніны, на якім у 1900 г. працавалі 160 рабочых. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створаны саўгас «Берасценава». У 1923 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой настаўнік Г.Гонак вучыў 36 хлопчыкаў і 9 дзяўчынак. На 1.1.1998 г. 34 двары і 42 жыхары. Помнік Герою Савецкага Саюза Ю.Смірнову.

БОРТНІКАВА, былая вёска Запольскага сельсавета. У 1858 г. ўласнасць памешчыка Дзеражынскага, 37 мужчын і 33 жанчыны. У 1940 г. 21 двор, 41 жыхар. У жніўні 1943 г. спалена нямецка-фашысцкімі акупантамі. Пасля вайны не адрадзілася. На месцы спаленай вёскі ў 1990 г. пастаўлены помнік. Радзіма Д.Я.Касачова (загінуў у лістападзе 1942), аднаго з арганізатараў партызанскага руху на Віцебшчыне, камандзіра партызанскага атрада «Знішчальнік» 1-й партызанскай брыгады імя К.С.Заслонава.

БРАЗДЗЕЧЫНА, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Ленінскі шлях». У 1738 г. сяло Пшадзечына, уласнасць князёў Сапегаў. У 19—20 ст. у Пугляёўскай воласці Горацкага павета. У 1886 г. 35 двароў, 220 жыхароў, хлебазапасны магазін, мураваная праваслаўная царква. У 1894 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. У пачатку 20 ст. 59 двароў, каля 350 жыхароў. Сялу належала 588 дзесяцін зямлі, у тым ліку 15 дзесяцін лесу. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе земскага народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені, адкрыты хатачытальня, бібліятэка. У 1923 г. ў школе вучылася каля 80 хлопчыкаў і дзяўчынак. У 1924—74 гг. цэнтр сельсавета. У 1980 г. да Браздзечына далучана в. Лучыншчына. На 1.1.1998 г. 108 двароў, 151 жыхар. Механічныя майстэрні, сярэдняя школа (ёсць музей), дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі і ветэрынарны пункты, магазін, аддзяленне сувязі, тэлефонная станцыя. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1944 г.

БРАНЦАВА, вёска ў Першамайскім сельсавеце. У 1871 г. 18 двароў, уласнасць Сіпайлаў-Рудніцкіх. У 1879 г. працавалі млын і кузня. У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 42 двары, 323 жыхары. Вёсцы належалі 282 дзесяціны зямлі. На 1.1.1998 г. 23 двары і 27 жыхароў.

БРУХАВА, вёска ў Арэхаўскім пасялковым Савеце. Вядома з сярэдзіны 16 ст. як сяло Брухава, шляхецкая ўласнасць. У 1792 г. вёска ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, каля 20 двароў. З 2-й палавіны 19 ст. на месцы сучаснага паселішча былі 2 вёскі — Старое Брухава і Новае Брухава. У 1879 г. ў Старым Брухаве 17 двароў, 80 жыхароў, 18 чалавек займаліся калёсным промыслам, 4 жыхары — бандарным; у Новым Брухаве 5 двароў, 35 жыхароў, 10 мужчын займаліся калёсным промыслам, 3 жыхары — бандарным.

У пачатку 20 ст. ў в.Старое Брухава 30 двароў, каля 200 жыхароў. Вёсцы належала 255 дзесяцін зямлі, у тым ліку 10 дзесяцін лесу. У в.Новае Брухава 13 двароў, каля 80 жыхароў, якія мелі 130 дзесяцін зямлі, у тым ліку 5 дзесяцін лесу. Абодва паселішчы ўваходзілі ў склад Высоцкай воласці Аршанскага павета, пазней аб'ядналіся ў адну вёску, якая стала называцца Брухава. У пачатку 1930-х гадоў створаны калгас імя Леніна. Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 217 двароў, 702 жыхары. Магазін.

БРЫЛІ, вёска ў Крапівенскім сельсавеце, у калгасе «Камінтэрн». У канцы 19—пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета. У 1897 г. 32 мужчыны, 36 жанчын. У пачатку 20 ст. 22 двары, каля 160 жыхароў. За вёскай былі замацаваны 274 дзесяціны зямлі. У 1923 г. 214 жыхароў. У 1934 г. ў вёску сселены хутар Вожбішча. На 1.1.1998 г. 43 двары, 76 жыхароў.

БУДЗІШЧА, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях». У пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета, 38 двароў, 320 жыхароў. Вёсцы належалі 743 дзесяціны зямлі, у тым ліку 80 дзесяцін лесу. У 1923 г. 475 жыхароў. У 1939 г. ў вёску сселены пасёлак Пчэльнікі. На 1.1.1998 г. 23 двары і 36 жыхароў.

ВАСНЕВА, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Чырвонае аб'яднанне». У пачатку 20 ст. ў Раснянскай воласці Сенненскага павета, 21 двор, 161 жыхар. Вёсцы належалі 192 дзесяціны зямлі. На 1.1.1998 г. 7 двароў, 11 жыхароў.

ВЕРАЦЕЯ, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк Камуны». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 18 двароў. У 19—пачатку 20 ст. ў Нова-Тухінскай воласці Аршанскага павета. У 1910

г. 32 двары, 258 жыхароў. За вёскай было замацавана 300 дзесяцін зямлі. У 1940 г. 73 двары, 438 жыхароў. У кастрычніку 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску і загубілі 12 яе жыхароў. На 1.1.1998 г. 16 двароў, 22 жыхары.

ВУСЦЕ, вёска, цэнтр сельсавета і эксперыментальнай базы «Вусце». У 19 ст. маёнтак, належаў Курчам. У пачатку 20 ст. вёска Баранскай воласці Аршанскага павета, 88 двароў, каля 280 жыхароў. Вёсцы належала 261 дзесяціна зямлі. Побач з ёй знаходзіўся фальварак Вусце Курчаў, 8 двароў, 94 жыхары. За фальваркам было замацавана 587 дзесяцін зямлі, у тым ліку 200 дзесяцін лесу. У 1919 г. створаны саўгас «Вусце» і адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. настаўніца Л.Маеўская вучыла каля 30 хлопчыкаў і дзяўчынак. На 1.1.1998 г. 364 двары, 934 жыхары. Механічныя майстэрні, сярэдняя і дзіцячая музычная школы, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, ашчадная каса, аддзяленне сувязі, ветэрынарны ўчастак, урачэбная амбулаторыя, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Помнікі Леніну, землякам. Паблізу вёскі, ва ўрочышчы Гарадзец, на правым беразе Дняпра археалагічны помнік — гарадзішча. Радзіма беларускага пісьменніка і кінарэжысёра М.Ф.Садковіча.

ВУСЫ, вёска ў Высокаўскім сельсавеце. На 1.1.1998 г. 8 двароў, 13 жыхароў. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ВЫСОКАЕ, вёска, цэнтр сельсавета (з 1924) і калгаса «Маяк камуны». Паселішча было заснавана на ўзвышанай мясцовасці, адсюль назва. У 19—пачатку 20 ст. цэнтр воласці Аршанскага павета. Побач знаходзіўся фальварак Высокае, які належаў Ранікерам. Дзейнічалі папяровая фабрыка, цукровы, медзеплавільны, вапнавы, шкляны, вінакурны і сіропны заводы; млын, карчма; існавалі бальніца, хлебазапасны магазін, праваслаўная царква. У 1867 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. У 1883 г. ў ім вучыліся 40 хлопчыкаў і 2 дзяўчынкі (настаўніца Ганна Пётух). У пачатку 20 ст. тут пабудавана панская сядзіба. У цэнтры сядзібы быў размешчаны аднапавярховы драўляны жылы дом з двухпавярховай мураванай прыбудовай. Паблізу дома знаходзіліся два аднапавярховыя флігелі — адзін мураваны, другі драўляны. Вакол дома і флігеляў быў разбіты пейзажны парк з сажалкай. Яго заснавальнік Макшыцкі прывёз з розных краін і пасадзіў тут шмат дрэў і кустоў. Да нашага часу захавалася каля 150 іх відаў. У 1910 г. 92 двары, 623 жыхары. Сялу належала 813 дзесяцін зямлі, у тым ліку 20 дзесяцін лесу. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створаны саўгас «Высокае», адкрыты народны дом, хата-чытальня, бібліятэка, земскае народнае вучылішча, якое пазней пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені. У 1923 г. ў школе вучылася каля 80 дзяцей (настаўнікі Г.Зянькова і Г.Жукоўская). У 1928 г. ў былой панскай сядзібе адбыўся І з'езд Кампартыі Заходняй Беларусі. У Вялікую Айчынную вайну ў наваколлі вёскі дзейнічалі партызаны брыгады «Граза», у Высокім — падпольная група (кіраўнік П.А.Пахомчык). У 1970 г. 220 двароў, 1190 жыхароў. На 1.1.1998 г. 112 двароў, 234 жыхары. Механічныя майстэрні, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, сельскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча, сталовая, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Помнік К.С.Заслонаву. Помнік архітэктуры канца 19—пачатку 20 ст. — сядзіба.

ВЯЗАВАЯ, вёска ў Вусценскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». У пачатку 20 ст. ферма Вязавая ў Баранскай воласці Аршанскага павета, належала Курчам, 4 двары, 38 жыхароў. Ферма валодала 100 дзесяцінамі зямлі. У 1940 г. 9 двароў, 32 жыхары. На 1.1.1998 г. 2 двары, 4 жыхары.

ВЯЗЬМІЧЫ, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у складзе саўгаса-тэхнікума «Смаляны». У 19—пачатку 20 ст. вёска Алёнавіцкай воласці Аршанскага павета. У 1871 г. 36 двароў, у 1879 г. 46 двароў, 238 жыхароў. Кравецкі промысел. У 1910 г. 57 двароў, 421 жыхар. Вёсцы належала 506 дзесяцін зямлі. У 1917 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені. У 1924 г. 612 жыхароў, у школе 57 вучняў, якіх вучылі настаўнікі Дзмітрый Гаеўскі і Сяргей Шымковіч. У 1929 г. створаны калгас «Перамога». Працаваля кузня. На 1.1.1998 г. 40 двароў, 64 жыхары.

ВЯЛІКАЕ БАБІНА, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». Вядома з сярэдзіны 16 ст. як сяло Бабіна, уласнасць Корсакаў, у складзе іх маёнтка Аршан-

скі Замак, 30 дымоў, існаваў бабровы промысел. З 1569 г. дзяржаўная ўласнасць. У 1792 г. 2 вёскі з назвай Бабіна ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, у абедзвюх каля 20 двароў. На пачатку 1880-х гадоў сяло Бабіна Высоцкай воласці Аршанскага павета, 7 двароў, 54 жыхары, праваслаўная царква, хлебазапасны магазін. У 1898 г. 148 мужчын. У 1910 г. 15 двароў, 85 жыхароў. За сялом былі замацаваны 111 дзесяцін зямлі, за царквой — 60 (у тым ліку 5 дзесяцін лесу). Пазней вёска Вялікае Бабіна. У 1930 г. створаны калгас імя Варашылава. Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 39 двароў, 62 жыхары. Паблізу вёскі, ва ўрочышчы Гарадзец, археалагічны помнік — гарадзішча. Абследавалі ў 1971 г. Л.Д.Побаль, у 1981 г. М.І.Лашанкоў. Выяўлена ляпная гладкасценная кераміка 6—9 ст.

ВЯЛІКАЯ МІЦЬКАЎШЧЫНА, вёска ў Андрэеўшчынскім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева. У 19 ст. ўласнасць Любамірскіх. У 1867 г. 54 жыхары. У 1879 г. існаваў хлебазапасны магазін. У 1900 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 33 двары, 234 жыхары. Вёсцы належалі 364 дзесяціны зямлі, у тым ліку 15 дзесяцін лесу. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі заснавана працоўная школа 1-й ступені. У 1923 г. 320 жыхароў, у школе вучылася каля 70 хлопчыкаў і дзяўчынак. У 1929 г. створаны калгас «Прамень асветы Леніна». Брацкая магіла 147 савецкіх ваеннапалонных, якіх у 1944 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі жывымі. На 1.1.1998 г. 20 двароў, 37 жыхароў. На заходняй ускраіне вёскі археалагічны помнік — замчышча (вядома з 1873), адносіцца да 14—18 ст.

ВЯРХОЎЕ, вёска ў Першамайскім сельсавеце, у саўгасе «Ударнік». Назва ад урочышча. У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 35 двароў, каля 200 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Беларусь». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 41 двор, 58 жыхароў. Паблізу вёскі археалагічныя помнікі — курганны могільнік (2 насыпы) і селішча. Курганны могільнік выявіў у 1955 г. Л.В.Аляксееў, абследавалі ў 1972 г. Л.Д.Побаль, у 1981 г. М.І.Лашанкоў. Селішча адкрыў і абследаваў у 1972 г. Л.Д.Побаль, у 1981 г. абследаваў М.Э.Лашанкоў. Знойдзены фрагменты ляпных і ганчарных пасудзін.

ГАДАВІЧЫ, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. У 1871 г. 4 двары. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 6 двароў, каля 40 жыхароў. Вёсцы належала 40 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 35 двароў, 67 жыхароў.

ГАНЬШАВА (Г а н ы ш а в а), вёска ў Смалянскім сельсавеце. У пачатку 20 ст. ў Алёнавіцкай воласці Аршанскага павета, 10 двароў, 105 жыхароў. Вёсцы належала 80 дзесяцін зямлі. У 1918 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1924 вучыліся 52 хлопчыкі і 20 дзяўчынак; настаўніца Вера Махнач). У 1998 г. ніхто не жыў, але вёска з уліку не знята.

ГАРАВЫЯ ПАРШНІ, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Чырвонае аб'яднанне». У пачатку 20 ст. вядомы як вёска Паршні Алёнавіцкай воласці Аршанскага павета, 13 двароў, каля 100 жыхароў. Вёсцы належала 110 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 12 двароў, 16 жыхароў.

ГАРАНЫ, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе імя Куйбышава. У 1789 г. ўласнасць князёў Сапегаў, 13 двароў, каля 100 жыхароў. У 1871 г. 16 двароў. У пачатку 20 ст. ў Коханаўскай воласці Аршанскага павета, 30 двароў, каля 190 жыхароў. Вёсцы належалі 202 дзесяціны зямлі. У 1930 г. створаны калгасы «Ленінскі прыклад» і «Чырвоны ўдарнік». Працавалі 2 кузні. У 1938 г. ў Гараны сселены хутар Андрэеўшчына. На 1.1.1998 г. 28 двароў, 44 жыхары. Паблізу вёскі, ва ўрочышчы Гарадзішча, археалагічныя помнікі — гарадзішча і селішча. Гарадзішча вядома з канца 19 ст. Адносіцца да банцараўскай культуры. Датуецца 6—8 ст. Селішча адкрыў у 1969 г. Л.В.Аляксееў, абследаваў у 1972 г. Л.Д.Побаль. Знойдзены абломкі ляпных гладкасценных пасудзін і ганчарная кераміка 10—12 ст.

ГАРОДНЯ, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. У 2-й палавіне 19 — пачатку 20 ст. маёнтак Машкоўскай воласці Аршанскага павета, уласнаць Храстоўскіх. У 1880-я гады працавалі млын і карчма. У 1910 г. 1 двор, 3 жыхары, пабудаваны спіртзавод. Маёнтку належалі 593 дзесяціны зямлі, у тым ліку 75 дзесяцін лесу. На 1.1.1998 г. 14 двароў, 26 жыхароў. Паблізу вёскі археалагічныя помнікі — селішча і курганны могільнік (10 насыпаў). Выявіў і абследаваў у

1981 г. М.І.Лашанкоў. Знойдзена ганчарная кераміка 15—17 ст.

ГАЦЬКАЎШЧЫНА, вёска ў Крапівенскім сельсавеце, у саўгасе «Дняпро». У канцы 19 — пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета. У 1898 г. каля 100 жыхароў. На 1.1.1998 г. 30 двароў, 51 жыхар.

ГЛІНІШЧА, вёска ў Запольскім сельсавеце, у калгасе «Спартак». Назва ад урочышча Глінішча. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 14 двароў, 92 жыхары. Вёсцы належала 80 дзесяцін зямлі. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны партызан». Працавала кузня. Летам 1941 г. ў вёсцы пачала дзейнічаць антыфашысцкая падпольная група, у склад якой уваходзілі каля 20 чалавек. Актыўнымі яе членамі былі С.І.Ягораў, яго жонка М.Е.Ягорава, сыны — Васіль, Мікалай, Міхаіл, Пётр, Уладзімір. Дом Ягоравых з'яўляўся явачнай кватэрай падпольшчыкаў. Падпольшчыкі збіралі разведданыя аб праціўніку, зброю і боепрыпасы для партызан, рабілі дыверсіі. 15 снежня 1942 г. гітлераўцы зачынілі С.Ягорава, яго жонку і сына Уладзіміра ў хаце і спалілі жывымі. На ўшанаванне памяці патрыётаў на месцы іх гібелі пастаўлены помнік. На 1.1.1998 г. 34 двары, 78 жыхароў.

ГОРНАЯ ВЕРАВОЙША, вёска ў Забалацкім сельсавеце, у саўгасе «Забалацкі». У 19—пачатку 20 ст. вядома як вёска Веравойша Баранскай воласці Аршанскага павета. У 1879 г. працаваў хлебазапасны магазін. У 1910 г. 69 двароў, 570 жыхароў. За вёскай было замацавана 647 дзесяцін зямлі. У 1923 г. вёска Горная Веравойша, 257 жыхароў. У 1924—28 гг. цэнтр сельсавета. На 1.1.1998 г. 30 двароў, 40 жыхароў.

ГРАБЯНЁВА, вёска ў Забалацкім сельсавеце, у калгасе «Новая зара». У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 18 двароў, 154 жыхары. Вёсцы належала 189 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 26 двароў, 59 жыхароў.

ГРАЗІНА, вёска ў Запольскім сельсавеце, у калгасе «Спартак». У 19 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, уласнасць Равенскіх. У 1879 г. 12 двароў, 82 жыхары. Дзейнічалі вадзяны млын, крупадзёрны завод. Жыхары займаліся саматужнымі промысламі — кузнечным, слясарным, сталярным, кравецкім, шавецкім. Побач знаходзіўся фальварак Гразіна, 1 двор, 10 жыхароў. У

Старыя вясковыя могілкі ў в. Гацькаўшчына. Крыж з распяццем (разьба па дрэву).

пачатку 20 ст. 43 двары, 313 жыхароў, драўляная праваслаўная царква, крупадзёрка, карчма, царкоўнапрыходская школа. Вёсцы належала 460 дзесяцін зямлі, у тым ліку 10 дзесяцін лесу. Паблізу вёскі знаходзілася аднайменная ферма, 10 двароў, 29 жыхароў. Ферме належала 276 дзесяцін зямлі. У 1930 г. створаны калгас «Спартак». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 28 двароў, 51 жыхар. Сярэдняя школа, магазін. Брацкая магіла партызан, якія загінулі ў 1942 г. ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Помнік у гонар дзейнасці Аршанскага падпольнага партыйнага цэнтра і Аршанскага падпольнага райкома КП(б)Б.

ГРАЗІЎКА, вёска ў Крапівенскім сельсавеце, у саўгасе «Дняпро». У 1907 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені. У 1923 г. ў ёй вучыліся 52 хлопчыкі і дзяўчынкі. На 1.1.1998 г. 39 двароў, 53 жыхары.

Паштовая станцыя ў в. Грышаны.

ГРЫШАНЫ, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У 19 — пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, паштовая станцыя (будынак захаваўся) і заезны дом. У 1910 г. 20 двароў, 128 жыхароў. Вёсцы належала 150 дзесяцін зямлі. Побач з вёскай знаходзілася сядзіба Грышаны Макржыцкіх, 1 двор, 5 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Зорка». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 60 двароў, 157 жыхароў.

ДАЎЖАНІЦЫ, вёска ў Забалацкім сельсавеце, у калгасе «Новая зара». У 1871 г. 11 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 21 двор, каля 150 жыхароў. Вёсцы належала 159 дзесяцін зямлі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені. На 1.1.1998 г. 12 двароў, 28 жыхароў.

ДАЧНАЯ, вёска ў Забалацкім сельсавеце, у калгасе імя К.С.Заслонава. На 1.1.1998 г. 340 двароў, 973 жыхары. Аграпрамтэхніка, бібліятэка, дзіцячыя яслі-сад, урачэбны ўчастак, магазін, пажарная частка.

ДЗЕВІНА, вёска ў Клюкаўскім сельсавеце, у аграфірме «Дзевіна». У 1789 г. 2 двары, 20 жыхароў, уласнасць Любамірскіх. У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 38 двароў, 301 жыхар. За вёскай былі замацаваны 383 дзесяціны зямлі, у тым ліку 3 дзесяціны лесу. У 1979 г. з Дзевіна злілася вёска Івашня. На 1.1.1998 г. 77 двароў, 132 жыхары. Бібліятэка, клуб, магазін.

ДЗЯТЛАВА, вёска ў Першамайскім сельсавеце, у саўгасе «Ударнік». Чыгуначны прыпынак на лініі Мінск—Орша. У 1871 г. 26 двароў. У пачатку 20 ст. ў Коханаўскай воласці Аршанскага павета, 38 двароў, 262 жыхары. Вёсцы належала 370 дзесяцін зямлі. У 1923 г. 332 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны меліяратар». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 24 двары, 39 жыхароў. Археалагічныя помнікі — курганны могільнік (2 насыпы) і курган.

ДРОЗДАВА, вёска ў Задроўеўскім сельсавеце, у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». У 1871 г. 15 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 21 двор, 165 жыхароў. Вёсцы належала 177 дзесяцін зямлі. У 1936 г. ў вёску сселены хутар Дроздава. На 1.1.1998 г. 13 двароў, 30 жыхароў.

ДРЫБІНА, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. У 1871 г. 7 двароў. У пачатку 20 ст. ў Высачанскай воласці Аршанскага павета, 13 двароў, 89 жыхароў. Вёсцы належала 99 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 5 двароў, 6 жыхароў.

ДУБАВОЕ, вёска ў Задроўеўскім сельсавеце, у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». У 1871 г. 15 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 20 двароў, 180 жыхароў. Вёсцы належала 190 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 47 двароў, 82 жыхары.

ДУБНІЦЫ, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Рассвет». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 17 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 39 двароў, 275 жыхароў. За вёскай была замацавана 381 дзесяціна зямлі. У 1929 г. створаны калгас «Праўда», працавала кузня. У 1939 г. ў вёску сселены хутар Сяргейкава. На 1.1.1998 г. 86 двароў, 220 жыхароў. Дзіцячыя яслі-сад, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін. Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ДУБРАЎКА, вёска ў Дубраўскім сельсавеце, у калгасе «Дубраўка». У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 35 двароў, 297 жыхароў. У 1924—63 гг. цэнтр сельсавета. У 1930 г. створаны калгас імя Варашылава. На 1.1.1998 г. 49 двароў, 78 жыхароў. Магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Радзіма беларускага гісторыка, акадэміка АН БССР В.К.Шчарбакова.

ДУБРАЎКА, вёска ў Межаўскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Межава». У 2-й палавіне 19 — пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, належала

Васілеўскім. Млын і карчма. У 1910 г. 8 двароў, 57 жыхароў. За вёскай было замацавана 85 дзесяцін зямлі. У 1923 г. 72 жыхары. На 1.1.1998 г. 21 двор, 31 жыхар.

ЕЛІНА, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, цэнтр калгаса імя Кірава. У 1871 г. 16 двароў. У 1900 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 30 двароў, 230 жыхароў. Вёсцы належалі 244 дзесяціны зямлі, у тым ліку 14 дзесяцін лесу. Пасля 1917 г. створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. вучыліся 17 хлопчыкаў і 10 дзяўчынак. У 1923 г. 237 жыхароў. На 1.1.1998 г. 43 двары, 76 жыхароў. Магіла Героя Сацыялістычнай Працы Ц.Е.Салтановіча.

ЕРАШЭВІЧЫ, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Свярдлова. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 15 двароў, каля 120 жыхароў. Вёсцы належала 100 дзесяцін зямлі. У 1939 г. ў вёску сселены хутар Ерашэвічы. На 1.1.1998 г. 33 двары, 79 жыхароў.

ЕСІПАВА, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях». У 1940 г. 110 двароў, 320 жыхароў. На 1.1.1998 г. 66 двароў, 100 жыхароў.

ЖАЛЕЗНЯКІ, вёска ў Задроўеўскім сельсавеце, у калгасе «Барацьбіт». У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 37 двароў, 233 жыхары. Вёсцы належала 295 дзесяцін зямлі. У 1923 г. 298 жыхароў. У 1929 г. створаны калгас «Бальшавік». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 21 двор, 30 жыхароў. Ва ўрочышчы Курганы курганны могільнік. Выявіў і абследаваў у 1981 г. М.І.Лашанкоў.

ЖВІКАВА, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Чырвонае аб'яднанне». У 1910 г. ў Раснянскай воласці Сенненскага павета, 24 двары, 180 жыхароў. У 1912 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля 1917 г. пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені. У 1940 г. 19 двароў, 73 жыхары. На 1.1.1998 г. 6 двароў, 9 жыхароў.

ЗАБАЛАЦЦЕ, вёска ў Забалацкім сельсавеце, цэнтр калгаса імя К.С.Заслонава. У 19 ст. ў Аршанскім павеце, належала Дышлеўскім. У 1880-я гады працавалі вадзяны млын, крупадзёрка (заснавана ў 1835), карчма. У 1898 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 32 двары, 247 жыхароў. Вёсцы належала 351 дзесяціна зямлі. Побач знаходзіўся маёнтак Забалацце Лазаравай і Макржыцкага, 12 двароў, 350 жыхароў. За маёнткам было замацавана 470 дзесяцін зямлі, у тым ліку 30 дзесяцін лесу. Пасля 1917 г. створана працоўная школа 1-й ступені. У 1923 г. 14 жыхароў, у школе 36 вучняў. З 1928 г. была цэнтрам сельсавета. У пачатку 1930-х гадоў існавалі калгас «Перамога» і саўгас «Забалацце», працавалі 2 кузні. У 1959 г. ў вёску сселены хутар Мельніца Ламачынская. На 1.1.1998 г. 147 двароў, 344 жыхары. Сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, бібліятэка, Дом культуры, аддзяленне сувязі, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў і аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партызанскага руху ў Аршанскім раёне Л.Н.Анкіновіча, помнікі К.С.Заслонаву, воінам-землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Паблізу вёскі, ва ўрочышчы Гарадкі, на левым беразе р. Адроў археалагічны помнік — гарадзішча. Выявіў і абследаваў у 1971 г. Л.Д.Побаль, абследаваў у 1981 г. М.І.Лашанкоў. Радзіма Героя Савецкага Саюза М.Д.Сіяніна.

ЗАГАРАДНАЯ, вёска ў Крапівенскім сельсавеце, у саўгасе «Дняпро». У 1940 г. 31 двор, 270 жыхароў. На 1.1.1998 г. 102 двары, 264 жыхары. Магазін.

ЗАГАРЭЛЬСКІЯ, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях». У канцы 19 — пачатку 20 ст. хутар Загарэльскі Пугляёўскай воласці Горацкага павета. У 1898 г. 21 мужчына, 25 жанчын. У 1910 г. 2 двары, 15 жыхароў. Хутару належала 18 дзесяцін зямлі, у тым ліку 1 дзесяціна лесу. Побач з ім знаходзіўся засценак Загарэльскі, 16 двароў, 100 жыхароў. Засценку былі прыпісаны 207 дзесяцін зямлі, у тым ліку 10 дзесяцін лесу. З 1923 г. вёска, 269 жыхароў. У 1939 г. ў вёску сселены хутар Буднік. На 1.1.1998 г. 12 двароў, 20 жыхароў.

ЗАДРОЎЕ, вёска, цэнтр сельсавета (з 1965) і калгаса «Барацьбіт». Назва ад наймення р. Адроў. У пачатку 20 ст. ў Коханаўскай воласці Аршанскага павета, 30 двароў, каля 250 жыхароў. У 1879 г. працаваў хлебазапасны магазін. Вёсцы належала 285 дзесяцін зямлі. У 1929 г. створаны калгас «Задроўе». Дзейнічала кузня. У 1941 г. больш за палавіну Задроўя было спалена нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 1971 г. 87 двароў, 229 жыхароў. На 1.1.1998 г. 132 двары, 326

жыхароў. Майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, пачатковая школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі. Магіла савецкага воіна, які загінуў у 1944 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Два археалагічныя помнікі — селішча і курганны могільнік (9 насыпаў). Селішча адносіцца да позняга этапу зарубінецкай культуры (2—5 ст.), банцараўскай культуры (6—8 ст.) і перыяду Кіеўскай Русі (9—12 ст.).

ЗАЙЦАВА, вёска ў Забалацкім сельсавеце, у калгасе «Новая зара». У Айчынную вайну 1812 г. разбурана. У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 30 двароў, каля 200 жыхароў. Вёсцы належала 196 дзесяцін зямлі. У 1930 г. створаны калгас «Парыжская камуна». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 51 двор, 115 жыхароў. Паблізу вёскі археалагічныя помнікі — курган і курганны могільнік (2 насыпы).

ЗАЙЦАВА, вёска ў Задроўеўскім сельсавеце, у калгасе «Барацьбіт». У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 20 двароў, 150 жыхароў. Вёсцы належалі 134 дзесяціны зямлі. У 1923 г. 163 жыхары. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны сцяг». На 1.1.1998 г. 20 двароў, 30 жыхароў.

ЗАМАСТОЧЧА, вёска ў Клюкаўскім сельсавеце, у аграфірме «Дзевіна». У 1940 г. 27 двароў, 150 жыхароў. У ліпені 1944 г. спалена нямецка-фашысцкімі акупантамі. На 1.1.1998 г. 22 двары, 39 жыхароў.

ЗАПОЛЛЕ, вёска, цэнтр сельсавета (з 1939) і калгаса «Спартак». У 19 ст. ўласнасць Флёсаў. У 1879 г. працавалі хлебазапасны магазін, карчма. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 8 двароў, 72 жыхары. На 1.1.1998 г. 70 двароў, 196 жыхароў. Майстэрні, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, тэлефонная станцыя, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЗАРЭЧЧА, вёска ў Межаўскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Межава». У 1940 г. 25 двароў, 69 жыхароў. На 1.1.1998 г. 25 двароў, 37 жыхароў.

ЗАСЕКЛІ, вёска ў Задроўеўскім сельсавеце, у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». У 19 ст. ўласнасць Хлюдзінскіх. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 21 двор, 165 жыхароў. Вёсцы належала 177 дзесяцін зямлі. У 1940 г. 26 двароў, 109 жыхароў. У ліпені 1944 г. гітлераўцы спалілі вёску і загубілі 3 жыхароў. На 1.1.1998 г. 22 двары, 50 жыхароў.

ЗАСЛОНАЎКА, вёска, цэнтр Забалацкага сельсавета (з 1971) і саўгаса «Забалацце». Назва ў гонар К.С.Заслонава. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў былым памешчыцкім маёнтку Забалацце быў створаны саўгас «Забалацце». У 1923 г. 208 жыхароў. У 1971 г. вёска Заслонаўка, 127 двароў, 432 жыхары. На 1.1.1998 г. 223 двары, 674 жыхары. Майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, амбулаторыя, магазін. Помнік 123 землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЗАСЦЕНКІ, вёска ў Якаўлевіцкім сельсавеце, у калгасе «Запаветы Ільіча». У 1930 г. створаны калгас «XIII з'езд ВКП(б)Б». Працавалі кузня і ваўначоска. На 1.1.1998 г. 44 двары, 81 жыхар.

ЗГАРДА, вёска ў Крапівенскім сельсавеце, у калгасе «Камінтэрн». У 19 — пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета, уласнасць Мянжынскіх. У 1879 г. працаваў хлебазапасны магазін. У 1898 г. каля 140 жыхароў. У 1905 г. сяляне падавалі скаргу царскім уладам на эксплуатацыю іх памешчыкамі. У 1910 г. 43 двары, 313 жыхароў. Вёсцы належала 551 дзесяціна зямлі, у тым ліку 22 дзесяціны лесу. У 1940 г. 41 двор, 172 жыхары. У чэрвені 1944 г. гітлераўцы спалілі вёску і загубілі 8 яе жыхароў. На 1.1.1998 г. 40 двароў, 64 жыхары. Магіла палкоўніка В.А. Курмінскага, які загінуў у ліпені 1941 г. ў баі з нямецка-фашысцкімі акупантамі.

ЗОРНАЯ, вёска ў Панізоўскім сельсавеце, у саўгасе «Бабінічы». У 1940 г. 20 двароў, 83 жыхары. На 1.1.1998 г. 100 двароў, 567 жыхароў. Магазін, дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў.

ЗОСЬКАВА, вёска ў Запольскім сельсавеце, у калгасе «Спартак». У 1789 г. 5 двароў, каля 40 жыхароў, уласнасць князёў Сапегаў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 6 двароў, 29 жыхароў. Вёсцы належала 60 дзесяцін зямлі. У 1940 г. ў Зоськава сселена вёска Прысмышчына, у 1959 г. — вёска Паўшчына. На 1.1.1998 г. 25 двароў, 40 жыхароў.

Помнік Герою Савецкага Саюза К.Я.Анохіну ў в. Зубава.

ЗУБАВА, вёска, цэнтр сельсавета (з 1924) і калгаса імя Я.Купалы. У пачатку 20 ст. ў Любаніцкай воласці Горацкага павета, 67 двароў, 463 жыхары. Вёсцы належалі 652 дзесяціны зямлі. У 1971 г. 169 двароў, 435 жыхароў. На 1.1.1998 г. 219 двароў, 484 жыхары. Майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, тэлефонная станцыя, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў (сярод пахаваных Герой Савецкага Саюза К.Я.Анохін). Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЗУБРЭВІЧЫ, вёска, цэнтр Дубраўскага сельсавета (з 1963) і калгаса «Дубраўка». Вядомы з 16 ст., шляхецкая ўласнасць. З канца 18 ст. ўласнасць Любамірскіх. У 1879 г. 30 двароў, 64 жыхары, праваслаўная царква, хлебазапасны магазін, карчма, млын, кузня. У 1881 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. У 1898 г. 157 мужчын. 7 сялян сяла хадайнічалі перад Магілёўскім губернатарам аб перасяленні іх разам з сем'ямі ў Сібір на свабодныя дзяржаўныя землі (Алімпій, Дзямід і Тарас Сідаровічы, Іван Сіпакоў, Захар Шапавалаў, Васіль Ласкоўскі, Макей Чарнышоў). У 1910 г. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета, 46 двароў, 255 жыхароў. За сялом былі замацаваны 362 дзесяціны зямлі, 36 дзесяцін — за царквой. Прыёмны пакой на 1 месца, царква, земскае народнае вучылішча, царкоўнапрыходская школа, карчма, вінная лаўка. Пасля 1917 г. земскае народнае вучылішча пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені (у 1924 вучылася каля 100 дзяцей). У 1924 г. 394 жыхары. У 1929 г. створаны калгас «Хваля рэвалюцыі», у які ўступілі 16 сялян. Першым старшынёй калгаса быў У.Ф.Станавы. На 1.1.1998 г. 275 двароў, 598 жыхароў. Сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін. Радзіма беларускага пісьменніка Янкі (Івана Данілавіча) Сіпакова.

ІВАНЬКАВА, вёска ў Клюкаўскім сельсавеце, у аграфірме «Дзевіна». У 1879 г. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 6 двароў, 30 жыхароў. Існаваў калёсны саматужны промысел. У пачатку 20 ст. 9 двароў, 85 жыхароў. За вёскай было замацавана 118 дзесяцін зямлі, у тым ліку 1 дзесяціна лесу. На 1.1.1998 г. 10 двароў, 14 жыхароў.

ІВАШКАВА, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У пачатку 20

Дом культуры ў в. Зубава.

ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 15 двароў, 127 жыхароў. Вёсцы належалі 124 дзесяціны зямлі. У 1923 г. 93 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны ўдарнік». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 7 двароў, 9 жыхароў.

ІЗМАЙЛАВА, вёска ў Запольскім сельсавеце, у калгасе «Спартак». У сярэдзіне 19 ст. маёнтак, належаў Кадыграбавым. У пачатку 20 ст. засценак Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 23 двары, 176 жыхароў. У 1929 г. створаны калгас «Будаўнік». Працавала кузня. У 1932 г. з Ізмайлавам аб'яднана вёска Васіленкі. На 1.1.1998 г. 11 двароў, 14 жыхароў.

КАЗЕКІ, вёска ў Дубраўскім сельсавеце, у калгасе «Дубраўка». У 1910 г. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 12 двароў, 110 жыхароў. Вёсцы належалі 104 дзесяціны зямлі. У 1930 г. створаны калгас «Іскра». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 45 двароў, 94 жыхары. Радзіма поўнага кавалера ордэна Славы П.І.Касцюковіча, які вызначыўся ў Вялікую Айчынную вайну.

КАЗЕЧКІ, вёска ў Межаўскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Межава». У 19 ст. маёнтак Васілеўскіх. У пачатку 20 ст. маёнтак Машкоўскай воласці Аршанскага павета, уласнасць Лабкоўскай і Дзеражынскага, 1 двор, 2 жыхары. Маёнтку належалі 1324 дзесяціны зямлі, у тым ліку 674 дзесяціны лесу. Працавалі вадзяны млын і праваслаўная царква. На 1.1.1998 г. 31 двор, 61 жыхар.

КАЗЕЧЫНА, вёска ў Межаўскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Межава». У 1879 г. працаваў хлебазапасны магазін. У 1910 г. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 37 двароў, 296 жыхароў. За вёскай было замацавана 260 дзесяцін зямлі. Побач з вёскай знаходзіўся выселак Казечына, 2 двары, 9 жыхароў. Выселак меў 15 дзесяцін зямлі. У 1923 г. ў вёсцы 346 жыхароў. На 1.1.1998 г. 29 двароў, 44 жыхары.

КАЗЁННЫЯ ПАРШНІ, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Чырвонае аб'яднанне». У пачатку 20 ст. ў Раснянскай воласці Сенненскага павета, 20 двароў, 131 жыхар. Вёсцы належала 210 дзсяцін зямлі. Побач з вёскай знаходзіўся фальварак Паршні, 1 двор, 6 жыхароў, 33 дзесяціны зямлі. На 1.1.1998 г. 18 двароў, 28 жыхароў. Радзіма Героя Савецкага Саюза П.А.Дудчыка, які вызначыўся ў Вялікую Айчынную вайну.

КАЗЛОВА, вёска ў Задроўеўскім сельсавеце, у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 18 двароў, 138 жыхароў. Жыхарам вёскі належала 140 дзесяцін зямлі. У 1932 г. ў Казлова сселена вёска Антаполле. На 1.1.1998 г. 10 двароў, 19 жыхароў.

КАЗЛОВІЧЫ 1-я, вёска ў Якаўлевіцкім сельсавеце, у калгасе «Запаветы Ільіча». У пачатку 20 ст. ў Маслакоўскай воласці Горацкага павета, 169 двароў, 1130 жыхароў, праваслаўная царква, царкоўнапрыходская школа, вадзяны млын, хлебазапасны магазін. У 1930 г. створаны калгас імя Сталіна. Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 53 двары, 95 жыхароў.

КАЗЛОВІЧЫ 2-я, вёска ў Якаўлевіцкім сельсавеце, цэнтр калгаса «Запаветы Ільіча». У пачатку 1930-х гадоў былі вядомы як хутар Казловічы, у якім у тыя ж гады створаны калгас «Чырвоны сцяг». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 118 двароў, 250 жыхароў. Майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, школа, дзіцячыя яслі-сад, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін.

КАЛАТОЎКІ, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх. 12 двароў. У 1910 г. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 14 двароў, 76 жыхароў. За вёскай было замацавана 212 дзесяцін зямлі. У 1939 г. да яе далучаны хутар Янаўка. На 1.1.1998 г. 5 двароў, 6 жыхароў.

КАМЕНКА, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, у калгасе «Рассвет». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ, належала Любамірскім, каля 90 двароў. У 1923 г. 322 жыхары. На 1.1.1998 г. 27 двароў, 52 жыхары.

КАМЯКІ, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Чырвонае аб'яднанне». У пачатку 20 ст. ў Раснянскай воласці Сенненскага павета, 16 двароў, 128 жыхароў. Вёсцы належала 175 дзесяцін зямлі. У 1929 г. створаны калгас «XIV з'езд ВКП(б)Б». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 5 двароў, 7 жыхароў.

КАНАВАЛАВА, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, у аграфірме «Ніва». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 4 двары. У 1940 г. 17 двароў, 68 жыхароў. На 1.1.1998 г. 5 двароў, 10 жыхароў.

КАРАБІШЧЫ, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамір-

скіх, 17 двароў. У 1910 г. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 32 двары, 248 жыхароў. Вёсцы належалі 303 дзесяціны зямлі, у тым ліку 7 дзесяцін лесу. У 1929 г. створаны калгас «Ленінскі прызыў». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 8 двароў, 11 жыхароў.

КАРПАЎШЧЫНА, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у саўгасе-тэхнікуме «Смаляны». У пачатку 20 ст. ў Алёнавіцкай воласці Аршанскага павета, 12 двароў, 79 жыхароў. Вёсцы належала 115 дзесяцін зямлі. У 1929 г. створаны калгас «Барацьбіт». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 15 двароў, 23 жыхары.

КАШЫНА, вёска ў Межаўскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Межава». У 1866 г. ўласнасць памешчыкаў Радушкевічаў. У 1923 г. 127 жыхароў. На 1.1.1998 г. 17 двароў, 27 жыхароў. Радзіма беларускага пісьменніка А.І.Стаховіча і аднаго з кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху ў Аршанскім раёне ў Вялікую Айчынную вайну Л.Н.Анкіновіча.

КЛЮКАЎКА, вёска, цэнтр сельсавета (з 1926) і аграфірмы «Дзевіна». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ, які належаў Любамірскім, 2 двары. Першымі пасяленцамі былі Ярмалёнкі (пазней прозвішча пераўтворана ў Ярмоленка). У 1879 г. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 7 двароў, 30 жыхароў. Працавала кузня. У 1910 г. 16 двароў, 48 жыхароў. Вёсцы належала 137 дзесяцін зямлі. Побач з вёскай знаходзілася аднайменная сядзіба, 3 двары, 10 жыхароў, 2 дзесяціны зямлі. Працавалі карчма, заезны двор, вінная лаўка. Насельніцтва займалася кавальскім, смалярным і дзягцярным промысламі, зборам ягад, грыбоў, лекавых траў, арэхаў, пляценнем лапцей, лоўляй рыбы і ракаў. У 1930 г. створаны калгас «13-годдзе Кастрычніка», які лічыўся лепшым у раёне, быў удзельнікам ВДНГ СССР. Першым старшынёй калгаса быў І.Ф.Шкацёнак. У Клюкаўку сселены вёска Лісуны ў 1932 г. і пасёлак Смолзавода ў 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну ў чэрвені 1944 г. вёска спалена гітлераўцамі. У навакольных лясах дзейнічалі Багушэўская і 1-я імя К.С.Заслонава партызанскія брыгады. У 1972 г. 65 двароў, 195 жыхароў. На 1.1.1998 г. 122 двары, 314 жыхароў. Майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, лясніцтва, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, тэлефонная станцыя, Дом быту, магазін. Брацкая

Памятны знак у гонар заснавання Копысі.

магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941 і 1944 гг. Радзіма беларускага хіміка акадэміка АН БССР М.Ф.Ярмоленкі.

КЛЮШНІКАВА, вёска ў Першамайскім сельсавеце, у калгасе «1 Мая». У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 21 двор, каля 150 жыхароў. Вёсцы належала 267 дзесяцін зямлі. У 1979 г. з вёскай Клюшнікава зліліся вёска Балбасава. На 1.1.1998 г. 71 двор, 94 жыхары. Магазін.

КОПЫСЬ, гарадскі пасёлак, цэнтр пасялковага Савета (з 1938) і прыстань на р. Дняпро. Упамінаецца ў 1059 г. ў Ніканаўскім лета-

Свята-Праабражэнская царква ў Копысі.

пісе як горад Копысь ў складзе Полацкага княства. У 1116 г. захоплены смаленскім князем Вячаславам. У сярэдзіне 12 ст. тут быў пункт збору гандлёвай пошліны смаленскіх князёў з тавараў, якія правозілі па Дняпры, карчмарскай даніны з заезных дамоў. З 2-й палавіны 14 ст. ў складзе Вялікага княства Літоўскага, з 1569 г. — Рэчы Паспалітай. У пачатку 16 ст. ўласнасць князёў Астрожскіх, з 1594 г. — Радзівілаў. У 1695—1744 гг. уладанне прынцэс Нейбургскіх, потым зноў належаў Радзівілам. Паводле некаторых звестак, горад меў магдэбургскае права.

З 1772 г. ў складзе Расіі, казённая ўласнасць. З 1777 г. цэнтр павета. У 1778 г. зацверджаны 1-ы генплан горада, у 1781 г. — герб: выява чорнага зайца ў зялёным полі. Паходжанне гэтага герба тлумачыцца тым, што ў наваколлі Копысі вадзілася даўней шмат чорных зайцоў. З 1796 г. заштатны горад, у 1802 — 61 гг. зноў цэнтр павета, потым заштатны горад Горацкага павета. У Айчынную вайну 1812 г. разрабаваны французскімі войскамі. 12 лістапада 1812 г. тут перапраўіўся з рускай арміяй цераз Дняпро М.І.Кутузаў. У 1821 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. У 1825 г. 253 жылыя дамы (адзін цагляны, астатнія драўляныя), 2265 жыхароў, 6 цэркваў, 2 богаўгодныя ўстановы, 13 піцейных дамоў, 9 лавак, земскае народнае вучылішча. У 1829 г. 330 драўляных жылых дамоў і 1 цагляны, у 1842 г. — 355 драўляных, 1 цагляны, 5 цэркваў. У 1848 г. заснаваны піваварны завод, у 1874 г., 1876 і 1877 гг. — кафляныя заводы. У 1879 г. 384 жылыя дамы (з іх 2 мураваныя), 3164 жыхары (большасць насельніцтва складалі мяшчане і рамеснікі). Гораду належала 2281 дзесяціна зямлі, у тым ліку 843 дзесяціны лесу, 1150 — ворыва, 24 — сенакосу, 264 — пашавых угоддзяў. У горадзе было 7 праваслаўных цэркваў (адна мураваная і 6 драўляных), 2 каталіцкія касцёлы (цагляны і драўляны), 2 земскія народныя вучылішчы (жаночае і мужчынскае), паштовая станцыя, 3 заезныя дамы, тракцір, 7 кабакоў. Жыхары Копысі мелі 234 кані, 245 галоў буйной рагатай жывёлы. З 1871 па 1881 г. ў Копысі былі ўзяты 183 шлюбы. У 1883 г. ў земскім (мужчынскім) народным вучылішчы вучыліся 48 хлопчыкаў (настаўнік З.Аўсянкін). Вучылішча знаходзілася ва ўласным будынку. Паводле перапісу 1897 г. ў горадзе 3384 жыхары, у тым ліку мяшчан 2475, сялян 731, дваран 64, духавенства 18, купцоў 41 чалавек. Пісьменных сярод насельніцтва было 39,6 працэнта.

З даўніх часоў Копысь — адзін з найбольш старажытных цэнтраў мастацкага керамічнага рамяства, так званай «копыскай кафлі». Тут вырабляліся ўсе віды дэталей для абліцоўкі печаў. У канцы 15—17 ст. копыскія майстры рабілі кафлю з рэльефным геаметрычным, раслінным і геральдычным (выявы конніка, арол з гербам Радзівілаў) арнаментамі. Шмат кафлі вывозілі на продаж за межы Беларусі. Вядома, што ў 2-й палавіне 17 ст. копыскія майстры Я.Андрэеў, С.Аляксееў, П.Будкееў, С.Грыгор'еў, В.Дарафееў, І.Максімаў, П.Фёдараў вырабляліі шматколерную мастацкую кафлю і аздаблялі ёю палацы і храмы ў Маскоўскай дзяржаве. У канцы 19— пачатку 20 ст. ў Копысі працавала каля 20 заводаў.

У 1900 г. адкрыта Копыскае гарадское вучылішча, якое ў 1913 г. было пераўтворана ў вышэйшае пачатковае вучылішча. З дзяржаўнай казны на ўтрыманне вучылішча адпускалася каля 9 тыс. рублёў у год. У 1904 г. 3950 жыхароў. Дзейнічала Копыская арганізацыя РСДРП, якая ўваходзіла ў склад Палескага камітэта РСДРП. 11 ліпеня 1905 г. пад яе кіраўніцтвам у Копысі адбыліся палітычныя забастоўка і дэманстрацыя, у якіх удзельнічала каля 1500 рабочых горада і сялян навакольных вёсак.

У 1911 г. 5924 жыхары, 15 кафляных заводаў, 4 паравыя млыны, піваварны, крухмальны і вінакурны заводы, бальніца, аптэка, 7 праваслаўных цэркваў, сінагога, 3 яўрэйскія малітоўныя дамы, 2 земскія народныя вучылішчы, царкоўнапрыходская школа. У чэрвені 1911 г. адбылася забастоўка рабочых кафляных заводаў, якія патрабавалі павышэння зарплаты, паляпшэння ўмоў працы і быту.

У лістападзе 1917 г. ўстаноўлена Савецкая ўлада. У 1924—31 гг. цэнтр раёна, з 1931 г. ў Аршанскім раёне, з 1938 г. гарадскі пасёлак. У 1940 г. каля 1200 двароў, каля 10 тыс. жыхароў, ільнозавод, 2 чарапічныя заводы, мэблевая фабрыка, машынна-трактарная станцыя, 2 млыны, сярэдняя, 2 пачатковыя і калгасная школы, кінатэатр, 3 клубы, бальніца, 3 сталовыя, 6 магазінаў.

З ліпеня 1941 г. да 27.6.1944 г. Копысь акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У студзені 1942 г. гітлераўцы расстралялі

каля 250 мірных жыхароў пасёлка. Супраць акупантаў дзейнічалі 3 падпольныя групы (кіраўнікі — камсамолкі сёстры А.М. і З.М. Шавень, камуністы Я.А.Точын і Ц.Р.Марозаў).

На 1.1.1998 г. у Копысі 498 двароў, 957 жыхароў. Працуюць кафляны цэх Аршанскага вытворчага аб'яднання «Оршабудматэрыялы», хлебазавод, філіял Аршанскага завода лёгкага машынабудавання, філіял раённага камбіната бытавога абслугоўвання, сярэдняя школа, дзіцячая музычная і спартыўная школы, 2 бібліятэкі, клуб, амбулаторыя, бальніца, аптэка, дзіцячыя яслі-сад, аддзяленне сувязі, тэлефонная станцыя, паромная пераправа. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1944 г. ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Магіла ахвяр фашызму. Помнік Герою Савецкага Саюза падпалкоўніку М.М.Трасцінскаму, пад камандаваннем якога 1152-і стралковы полк 344-й стралковай дывізіі вызваліў Копысь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 2 археалагічныя помнікі — замчышча Пятроўскі вал і селішча Пасадскае. Радзіма першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі.

КОРАВА, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, цэнтр калгаса імя Свярдлова. У сярэдзіне 19 ст. ўласнасць Васілеўскіх. У 1880-я гады дзейнічалі карчма, вадзяны млын, сукнавальня. У 1910 г. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 19 двароў, 147 жыхароў. Насельніцтву вёскі належала 97 дзесяцін зямлі. У 1972 г. 45 двароў, 164 жыхары. На 1.1.1998 г. 71 двор, 212 жыхароў. Майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін.

КРАПІЎНА, вёска, цэнтр сельсавета (з 1924) і саўгаса «Дняпро». Назва ўтворана ад ракі Крапівенка. 8 верасня 1514 г. на р. Крапіўна (Крапівенка) адбылася адна з буйнейшых бітваў вайны маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1512—1522 гг. У 19 — пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета, уласнасць Любамірскіх. У 1886 г. 27 двароў, 162 жыхары, праваслаўная царква, вадзяны млын, хлебазапасны магазін. У 1898 г. 68 мужчын і 71 жанчына. У 1910 г. 41 двор, 256 жыхароў. У канцы 19 ст. адкрыта царкоўнапрыходская школа. Працавалі 2 драўляныя млыны на р. Крапівенка. За сялом было замацавана 596 дзесяцін зямлі. Побач знаходзіўся аднайменны фальварак, 1 гаспадарка, 7 жыхароў. Фальварку належала 1501 дзесяціна зямлі, у тым ліку 350 дзесяцін лесу.

Пасля 1917 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені. У 1923 г. 355 жыхароў, у школе 78 дзяцей, якіх вучылі 2 настаўнікі. У 1929 г. створаны калгас «Прамень». У 1979 г. з Крапіўнай аб'яднаны вёскі Вялікае Крапіўна, Горнае Крапіўна і Малое Крапіўна. На 1.1.1998 г. 271 двор, 782 жыхары. Механічныя майстэрні, сярэдняя школа (ёсць краязнаўчы музей), дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў 1944 г. ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Помнік архітэктуры 2-й палавіны 19 ст. — Прачысценская царква.

КРАСНАБЕЛЬ, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, некалькі двароў. У 1864 г. 16 жыхароў. У 1910 г. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 10 двароў, 58 жыхароў. Вёсцы належала 115 дзесяцін зямлі, у тым ліку 10 дзесяцін лесу. На 1.1.1998 г. 6 двароў, 13 жыхароў.

КРАСНАПОЛЬЦЫ (да 1964 г. называлася А м е р ы к а), вёска ў Зубаўскім сельсавеце, у калгасе імя Я.Купалы. У пачатку 1930-х гадоў створаны калгас «Праца». Працавала кузня. У 1940 г. 76 двароў, 240 жыхароў. На 1.1.1998 г. 33 двары, 59 жыхароў.

КРАШЫНА, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях». У канцы 19 — пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета. У 1898 г. 64 мужчыны і 79 жанчын. У 1910 г. 37 двароў, 271 жыхар. За вёскай былі замацаваны 524 дзесяціны зямлі, у тым ліку 32 дзесяціны лесу. На 1.1.1998 г. 33 двары, 62 жыхары.

КУДАЕВА, вёска ў Андрэеўшчынскім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева. У 1738 г. вёска, уласнасць князёў Сапегаў. Паводле інвентара 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 30 двароў. Побач размяшчаўся засценак Кудаеўскі, 4 двары. У 1879 г. працавалі млын і карчма. У 1910 г. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 44 двары, 331 жыхар. За вёскай было замацавана 478 дзесяцін зямлі, у тым ліку 20 дзесяцін лесу. У 1923 г. 520 жыхароў. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны партызан». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 11 двароў, 16 жыхароў.

КУПЕЛКА, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 17 двароў, 153 жыхары. Вёсцы належала 261 дзесяціна зямлі, у тым ліку 10 дзесяцін лесу. На 1.1.1998 г. 10 двароў, 13 жыхароў.

КУЧЫНА, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Новае жыццё». У 1910 г. ў Алёнавіцкай воласці Аршанскага павета, 8 двароў, 73 жыхары. Вёсцы належала 61 дзесяціна зямлі. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны гарадок». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 7 двароў, 10 жыхароў. Археалагічны помнік — гарадзішча, якое было ўмацавана 2 валамі і ровам. Вядома з 1873 г. Абследавалі ў 1971 г. Л.Д.Побаль, у 1981 г. М.І.Лашанкоў. Знойдзены фрагменты ляпных гладкасценных пасудзін.

КУШЭЎКА, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях». У пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета, 18 двароў, 125 жыхароў. Вёсцы належала 249 дзесяцін зямлі, у тым ліку 32 дзесяціны лесу. На 1.1.1998 г. 19 двароў, 38 жыхароў.

ЛАГІ, вёска ў Запольскім сельсавеце, у калгасе «Спартак». Назва ад наймення ўрочышча. У 1792 г. вёска Вялікія Лагі ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх. Побач з ёй знаходзілася вёска Малыя Лагі, у абедзвюх 12 двароў. У 1879 г. вёска Лагі, 33 двары, 274 жыхары, існавалі шавецкія і кравецкія промыслы. У 1910 г. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 13 двароў, 97 жыхароў. За вёскай было замацавана 128 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 29 двароў, 57 жыхароў.

ЛАМАЧЫНА, вёска ў Забалацкім сельсавеце, у саўгасе «Забалацце». Чыгуначны прыпынак на лініі Мінск—Орша. У Айчынную вайну 1812 г. разбурана. У 19 — пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета. У 1879 г. 24 двары, 40 жыхароў, існаваў кавальскі промысел. У 1910 г. 54 двары, 399 жыхароў. За вёскай былі замацаваны 582 дзесяціны зямлі. У 1937 г. ў Ламачыну сселены пасёлкі Валніты і Лазовы. На 1.1.1998 г. 49 двароў, 72 жыхары. Магазін.

ЛАРЫНАЎКА вёска ў Крапівенскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Камінтэрн». У 1940 г. 63 двары, 254 жыхары. У 1972 г. 131 двор, 438 жыхароў. На 1.1.1998 г. 131 двор, 277 жыхароў. Механічныя майстэрні, школа, Дом культуры, бібліятэка, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі, магазін. Помнік Леніну.

ЛЕНЬКАВІЧЫ, вёска ў Першамайскім сельсавеце, у калгасе «1 Мая». У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 37 двароў, 288 жыхароў. За вёскай было замацавана 315 дзесяцін зямлі. У 1930 г. створаны калгас «Ленінскі ўсход». Працавала кузня. У 1937 г. ў Ленькавічы сселены пасёлак Лістны. У 1979 г. з Ленькавічамі злілася вёска Зямцы. На 1.1.1998 г. 141 жыхар. Магазін.

ЛЕШЧА, вёска ў Зубаўскім сельсавеце, у калгасе імя Я.Купалы. Назва ад наймення ракі Лешча. У 1940 г. 37 двароў, 159 жыхароў. У 1939 г. ў вёску сселены пасёлак Лешча. На 1.1.1998 г. 20 двароў, 30 жыхароў.

ЛЕШЧА, вёска ў Якаўлевіцкім сельсавеце, у калгасе імя Дзяржынскага. Назва дадзена ад наймення р. Лешча. У 19 ст. ў Маслакоўскай воласці Горацкага павета. У 1865 г. заснаваны крупадзёрны завод. У 1879 г. 30 двароў, 142 жыхары, цэнтр кустарных дрэваапрацоўчых промыслаў, якімі займаліся 40 чалавек з 27 двароў. Выраблялі начоўкі, лыжкі, конаўкі, ступы, кублы, цэбры, граблі, кадушкі і інш. Хлебазапасны магазін, млын. У пачатку 20 ст. ў Раснянскай воласці Горацкага павета, 39 двароў, 293 жыхары. Вёсцы належала 328 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 6 двароў, 5 жыхароў.

ЛІПКІ, вёска ў Вусценскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». Назва ад наймення ўрочышча. У 1924—54 гг. цэнтр сельсавета. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоныя Ліпкі». Працавала кузня. У 1979 г. з Ліпкамі аб'яднана вёска Новае Тарчылава. На 1.1.1998 г. 80 двароў, 142 жыхары. Магазін.

ЛІПКІ, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. Назва ад наймення ўрочышча. У 1910 г. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 16 двароў, 130 жыхароў. За вёскай было замацавана 66 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 24 двары, 52 жыхары.

ЛІСОЎСКІЯ, вёска ў Клюкаўскім сельсавеце, у аграфірме «Дзевіна». У 1879 г. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 5 двароў, 29 жыхароў. 4 чалавекі займаліся калёсным промыслам. Побач з вёскай размяшчаўся засценак Лісоўскі, каля 30 жыхароў, з якіх 3 займаліся калёсным промыслам. У пачатку 20 ст. 8 двароў, каля 50 жыхароў, у засценку

8 двароў, 56 жыхароў. Вёсцы належала 47 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 10 двароў, 17 жыхароў.

ЛІСУНЫ, вёска ў Першамайскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Ударнік». У 19 ст. ўласнасць Любамірскіх. У 1864 г. 14 жыхароў. У 1879 г. 5 двароў, 27 жыхароў. Хлебазапасны магазін. 5 жыхароў вёскі займаліся калёсным промыслам. У пачатку 20 ст. ў Коханаўскай воласці Аршанскага павета, 47 двароў, 334 жыхары. Вёсцы належала 427 дзесяцін зямлі. У 1917 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, пазней пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені. У 1923 г. 350 жыхароў, у школе 48 хлопчыкаў і 36 дзяўчынак, якіх вучылі настаўнікі І.Казлоўскі і В.Каровікава. У 1928—63 гг. цэнтр сельсавета. У 1930 г. створаны калгас «Ударнік». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 234 двары, 638 жыхароў. Майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЛУЖКІ, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, у калгасе «Рассвет». У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 23 двары, 193 жыхары. У 1923 г. 247 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны рассвет». Працавала кузня. У 1940 г. 26 двароў, 102 жыхары. У 1977 г. з Лужкамі злілася вёска Пясчанка. На 1.1.1998 г. 32 двары, 60 жыхароў.

ЛЮДКАЎШЧЫНА, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У 1940 г. 8 двароў, 22 жыхары. На 1.1.1998 г. 1 двор, 1 жыхар. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЛЮЦІНЫ, вёска ў Якаўлевіцкім сельсавеце, у калгасе імя Дзяржынскага. У 19 ст. ў Маслакоўскай воласці Горацкага павета. У 1879 г. 30 двароў, 142 жыхары. 40 чалавек займаліся дрэваапрацоўчымі і лубянымі промысламі. У 1910 г. 39 двароў, 269 жыхароў. Вёсцы належала 186 дзесяцін зямлі. У 1930 г. створаны калгас «Красуліна». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 33 двары, 61 жыхар.

ЛЯВОНАЎКА, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях». У 1910 г. ў Маслакаўскай воласці Горацкага павета, 69 двароў, 447 жыхароў. За вёскай было замацавана 411 дзесяцін зямлі. У 1940 г. 70 двароў, 280 жыхароў. На 1.1.1998 г. 21 двор, 24 жыхары.

ЛЯМНА, вёска ў Якаўлевіцкім сельсавеце, у калгасе «Запаветы Ільіча». У пачатку 20 ст. ў Маслакоўскай воласці Горацкага павета, хутар пры р. Лямна, 6 двароў, 26 жыхароў. Сялянам хутара належала 65 дзесяцін зямлі, у тым ліку 3 дзесяціны лесу. У 1929 г. створаны калгас «Запаветы Ільіча». Працавала кузня. У 1938 г. ў Лямну сселены пасёлкі Слава і Праца. На 1.1.1998 г. 25 двароў, 46 жыхароў.

ЛЯСНІЧЫЯ, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, у калгасе «Рассвет». У 19 ст. маёнтак, уласнасць Грабоўскіх. У 1820 г. заснаваны вінакурны завод. У пачатку 20 ст. маёнтак Машкоўскай воласці Аршанскага павета, належаў Шыманскім, 1 гаспадарка, 2 жыхары. Маёнтак меў больш за 5 тыс. дзесяцін зямлі, у тым ліку каля 3,5 тыс. дзесяцін лесу. На 1.1.1998 г. 15 двароў, 25 жыхароў.

ЛЯЎКІ, вёска ў Зубаўскім сельсавеце, у калгасе імя Я.Купалы. Назва ад ўрочышча Ляўкі. У канцы 19 — пачатку 20 ст. пад такой назвай былі вядомы вёска і маёнтак у Любаніцкай воласці Горацкага павета, уласнасць Мянжынскіх. У 1871 г. заснаваны дражджавы завод. У 1879 г. 19 двароў, 115 жыхароў, 7 чалавек займаліся дрэваапрацоўчымі промысламі. Хлебазапасны магазін. У маёнтку Ляўкі існавала прыватная школа. У 1910 г. ў вёсцы было 39 двароў, 241 жыхар. Вёсцы належалі 224 дзесяціны зямлі. У маёнтку 1 гаспадарка, каля 100 жыхароў. Маёнткам валодаў памешчык Чачкоў, які меў 750 дзесяцін зямлі, у тым ліку 550 дзесяцін лесу. У 1905 г. ў маёнтку адбылося хваляванне сялян. У 1930 г. створаны калгас «Х з'езд Саветаў». Працавала кузня. У 1938 г. ў вёску Ляўкі сселены суседнія пасёлкі Першамайскі і Масцішчы. На 1.1.1998 г. 80 двароў, 153 жыхары. Бібліятэка, магазін.

З вёскай звязаны жыццё і творчасць народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. У лясным урочышчы Ляўкі, на дачы, у 1935—41 гг. паэт жыў і працаваў. Адна з лепшых старонак яго творчасці — Ляўкоўскі цыкл лірычных вершаў («Сонцу», «Алеся», «Лён», «Сосны», «Госці», «Вечарынка», «Сыны» і іншыя). У пачатку Вялікай Айчыннай вайны (3 ліпеня 1941 г.) дача згарэла. У 1962 г. на яе месцы створаны філіял Літаратурнага музея Я.Купалы, на будынку яго на ўшанаванне

памяці паэта ўстаноўлена мемарыяльная дошка, у 1982 г. ва ўрочышчы Ляўкі пастаўлены помнік — скульптурная фігура Я.Купалы (скульптар А.Анікейчык). Каля вёскі археалагічны помнік — гарадзішча. Даследаваў у 1969 г. Г.В.Штыхаў. Знойдзены ляпны посуд 6—8 ст. банцараўскай культуры і ганчарная кераміка 13—14 ст.

МАГЕРАЎКА, вёска ў Якаўлевіцкім сельсавеце, цэнтр калгаса імя Дзяржынскага. У 1881 г. маёнтак, уласнасць Вольгі Лапато. У пачатку 20 ст. ў Маслакоўскай воласці Горацкага павета, 39 двароў, 293 жыхары. За вёскай было замацавана 328 дзесяцін зямлі. Побач з вёскай знаходзіўся маёнтак Магераўка, які належаў Лапато, 2 двары, 4 жыхары. Маёнтак меў 252 дзесяціны зямлі, у тым ліку 69 дзесяцін лесу. На 1.1.1998 г. 124 двары, 326 жыхароў. Майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, пачатковая школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін.

МАЖЭЕЎКА, чыгуначная станцыя на лініі Орша — Віцебск у Пішчалаўскім сельсавеце. У 1923 г. 53 жыхары. У 1940 г. 7 двароў, 50 жыхароў. На 1.1.1998 г. 40 двароў, 74 жыхары.

МАКАРАЎКА, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях». У 1738 г. ў складзе «Дубровенскага графства», якое належала князям Сапегам. Макараўка пазначана ў Атласе Магілёўскага намесніцтва, які быў складзены ў 1784 г. ў Магілёве. У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 21 двор. У 1897 г. 27 двароў, 174 жыхары, царква, хлебазапасны магазін. У пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета, 30 двароў, 107 жыхароў. У 1908 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. За сялом былі замацаваны 502 дзесяціны зямлі, у тым ліку 72 дзесяціны лесу. Побач з сялом знаходзіўся аднайменны хутар, 3 двары, 12 жыхароў. Хутару належала 12 дзесяцін зямлі, у тым ліку 1 дзесяціна лесу. Пасля 1917 г. земскае народнае вучылішча пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені (у 1923 каля 60 вучняў). У 1947 г. ў Макараўку сселены пасёлак Ліпы. На 1.1.1998 г. 23 двары, 31 жыхар.

МАЛІНАЎКА, вёска ў Вусценскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». У 1940 г. 20 двароў, 85 жыхароў. На 1.1.1998 г. 13 двароў, 22 жыхары.

МАЛОЕ БАБІНА, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У пачатку 20 ст. вёска Бабіна Высоцкай воласці Аршанскага павета, 39 двароў, 295 жыхароў. За вёскай было замацавана 426 дзесяцін зямлі. У 1929 г. створаны калгас «Новы свет». Працавала кузня. У 1940 г. 48 двароў, 161 жыхар. На 1.1.1998 г. 69 двароў, 167 жыхароў. Пачатковая школа, Дом культуры, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін. Помнік лётчыкам Л.П.Царцвадзе і В.В.Былініцу, якія загінулі ў 1944 г.

МАЛОТЫНЬ, вёска ў Запольскім сельсавеце, у калгасе «Спартак». У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 26 двароў, 174 жыхары. Вёсцы належала 220 дзесяцін зямлі. У 1927—39 гг. цэнтр сельсавета. На 1.1.1998 г. 25 двароў, 37 жыхароў.

МАЛЫЯ ЛІПКІ, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. У 1940 г. 15 двароў, 64 жыхары. На 1.1.1998 г. 21 двор, 32 жыхары.

МАЛЬЖОНКАВА, вёска ў Межаўскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Межава». У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 14 двароў, 149 жыхароў. Вёсцы належалі 102 дзесяціны зямлі. У 1930 г. створаны калгас «Чырвонае Мальжонкава». Працавала кузня. У 1940 г. 34 двары, 222 жыхары. У студзені 1944 г. гітлераўцы спалілі вёску. На 1.1.1998 г. 30 двароў, 37 жыхароў.

МАРКАВІЧЫ, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе імя Куйбышава. У 1940 г. 40 двароў, 145 жыхароў. На 1.1.1998 г. 21 двор, 33 жыхары.

МАРОЗАВА, вёска ў Панізоўскім сельсавеце, у саўгасе «Бабінічы». У пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета, 24 двары, 190 жыхароў. Вёсцы належала 191 дзесяціна зямлі, у тым ліку 5 дзесяцін лесу. У 1923 г. каля 280 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «1 Мая». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 42 двары, 72 жыхары.

МАРОЗАЎКА, вёска ў Вусценскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». У 2-й палавіне 19 ст. фальварак Аршанскага павета, належаў Бірулям. У 1873 г. заснаваны скураны завод, у 1880 г. — таўчыльня для лазовай кары. У 1880-я гады працавалі суконная фабрыка, карчма, млын. На 1.1.1998 г. 3 двары, 4 жыхары.

МАСЕЕЎКА, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Свярдлова. У 1940 г. 11 двароў, 39 жыхароў. На 1.1.1998 г. 7 двароў, 11 жыхароў.

МАСЮКІ, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Чырвонае аб'яднанне». У пачатку 20 ст. ў Раснянскай воласці Сенненскага павета, 16 двароў, 128 жыхароў. За вёскай было замацавана 175 дзесяцін зямлі. Каля вёскі размяшчаўся фальварак Масюкі Корсакаў, 1 двор, 28 жыхароў, меў 95 дзесяцін зямлі. У 1929 г. створаны калгас «Ударнік палёў». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 24 двары, 41 жыхар.

МАЦНОВА, вёска ў Першамайскім сельсавеце, у саўгасе «Ударнік». У пачатку 20 ст. фальварак Коханаўскай воласці Аршанскага павета, належаў Гаеўскаму, 3 двары, 22 жыхары. Фальварак меў 566 дзесяцін зямлі, у тым ліку 130 дзесяцін лесу. На 1.1.1998 г. 8 двароў, 9 жыхароў.

МАШКОВА, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Свярдлова. У 19 — пачатку 20 ст. цэнтр воласці Аршанскага павета, належала Васілеўскім. У 1867 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. У 1880-я гады былі вадзяны млын, праваслаўная драўляная царква, земскае народнае вучылішча, карчма. У 1910 г. 12 двароў, 99 жыхароў. Сяло валодала 103 дзесяцінамі зямлі. 53 дзесяціны мела мясцовая царква. Побач з сялом знаходзіўся аднайменны фальварак Тамашэвіча, 1 гаспадарка, 3 жыхары. За фальваркам было замацавана 130 дзесяцін зямлі, у тым ліку 60 дзесяцін лесу. Пасля 1917 г. земскае народнае вучылішча было пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені, у якой у 1923 г. вучылася каля 160 хлопчыкаў і дзяўчынак, працавалі 4 настаўнікі. У 1923 г. 165 жыхароў, існаваў Народны дом. У 1924 — 61 гг. — цэнтр сельсавета. У 1935 г. ў Машкова сселены суседні хутар Ліпкі. На 1.1.1998 г. 30 двароў, 36 жыхароў. Сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

МЕЖАВА, вёска, цэнтр сельсавета (з 1924) і эксперыментальнай базы «Межава» Віцебскай абласной доследнай станцыі. Старажылы сцвярджаюць, што паселішча даўней называлася Канстанцінава. Назва Межава ўпамінаецца ў 1501 г. Паселішча знаходзілася на мяжы розных уладанняў. У 1792 г. мястэчка ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 22 двары. У 1830 г. заснаваны вінакурны завод. У 2-й палавіне 19 — пачатку 20 ст. сяло Машкоўскай воласці Аршанскага павета. У 1879 г. 23 двары, 150 жыхароў. Побач знаходзіўся фальварак Межава Лубянскіх. Вадзяны млын, смалакурны завод (1 майстар, 5 рабочых), хлебазапасны магазін, праваслаўная царква, існаваў скураны промысел. У 1889 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1910 г. 51 двор, 347 жыхароў. Сялу належалі 384 дзесяціны зямлі (у тым ліку 40 дзесяцін лесу), царкве — 45. Каля сяла знаходзіўся аднайменны маёнтак, уласнасць Лубянскіх, 1 гаспадарка, 4 жыхары. За маёнткам была замацавана 2641 дзесяціна зямлі, у тым ліку 1677 дзесяцін лесу. У канцы 19 — пачатку 20 ст. ў маёнтку пабудавана панская сядзіба, якая займала плошчу каля 12 га. У цэнтры сядзібы размяшчаўся двухпавярховы мураваны дом, які акружалі пладовы сад і пейзажны парк (разбіты ў 1901). У парку былі пасаджаны дрэвы і кусты розных парод — лістоўніца еўрапейская, піхта сібірская, хвоя звычайная, мурэя і інш. Летам 1905 г. ў маёнтку адбылося хваляванне сялян. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створаны саўгас «Межава» (у былым маёнтку), адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. вучыліся 82 хлопчыкі і 28 дзяўчынак (настаўнікі Р.Глыбоўскі і А.Глыбоўская). У 1967 г. з вёскай зліўся пасёлак эксперыментальнай базы «Межава». На 1.1.1998 г. 487 двароў, 990 жыхароў. Майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, сярэдняя школа, дзіцячая музычная школа, дзіцячыя яслі-сад, Дом культуры, бібліятэка, тэлефонная станцыя, бальніца, аптэка, ветэрынарны пункт, ашчадная каса, аддзяленне сувязі, 2 магазіны, сталовая. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў 1941—44 гг. Сярод пахаваных — камандзір атрада «Знішчальнік» 1-й партызанскай брыгады імя К.С.Заслонава Д.Я.Касачоў. Помнік Леніну. Сядзіба — помнік архітэктуры і садова-паркавага мастацтва канца 19 — пачатку 20 ст. Радзіма Героя Савецкага Саюза М.І.Альхоўскага, які вызначыўся ў Вялікую Айчынную вайну.

МЕЗІНАВА, вёска ў Першамайскім сельсавеце, у саўгасе «Ударнік». У 1871 г. 22 двары. У пачатку 20 ст. ў Коханаўскай воласці Аршанскага павета, 22 двары, каля 250 жыхароў. У 1929 г. створаны калгас «Прабойны

шлях». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 29 двароў, 39 жыхароў.

МІЦЬКАЎШЧЫНА, вёска ў Андрэеўшчынскім сельсавеце, цэнтр калгаса імя Чапаева. У сярэдзіне 19 ст. ўласнасць Любамірскіх. У 1867 г. 21 мужчына. У пачатку 20 ст. вёска Малая Міцькаўшчына ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 19 двароў, каля 120 жыхароў. За вёскай былі замацаваны 163 дзесяціны зямлі, у тым ліку 20 дзесяцін лесу. Хлебазапасны магазін. У 1923 г. 243 жыхары. У 1930 г. створаны калгас імя Молатава. Працавала кузня. У 1990 г. з Міцькаўшчынай злілася вёска Малая Міцькаўшчына. На 1.1.1998 г. 166 двароў, 408 жыхароў. Механічныя майстэрні, музычная і пачатковая школы, дзіцячыя яслі-сад, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі і ветэрынарны пункты, аддзяленне сувязі, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941—44 гг. Помнік Чапаеву.

МОНЬКАВА, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, у калгасе «Рассвет». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, каля 10 двароў. У 1910 г. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 12 двароў, 83 жыхары. За вёскай былі замацаваны 103 дзесяціны зямлі. У 1929 г. створаны калгас «Ясная паляна». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 17 двароў, 33 жыхары.

МУХАНАВА, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. У пачатку 20 ст. хутар Машкоўскай воласці Аршанскага павета, належаў Лубянскім, 1 двор, 20 жыхароў. Меў 450 дзесяцін зямлі, у тым ліку 400 дзесяцін лесу. У 1940 г. 28 двароў, 86 жыхароў. На 1.1.1998 г. 19 двароў, 34 жыхары.

НАВАСЕЛЛЕ, вёска ў Першамайскім сельсавеце, у калгасе «1 Мая». На 1.1.1998 г. 56 двароў, 97 жыхароў. Магазін.

НАВАСЁЛКІ, вёска ў Вусценскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». У 1871 г. вёска, 10 двароў. У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 15 двароў, каля 150 жыхароў. За Навасёлкамі была замацавана 141 дзесяціна зямлі. Побач з вёскай размяшчаўся аднайменны маёнтак, які належаў Цяханскім, 1 двор, 14 жыхароў. Маёнтак меў 106 дзесяцін зямлі, у тым ліку 20 дзесяцін лесу. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоныя Навасёлкі». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 27 двароў, 59 жыхароў.

НАРЭЙКАВА, вёска ў Панізоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінская іскра». У 2-й палавіне 19 — пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета. У 1910 г. 45 двароў, 339 жыхароў. Вёсцы належала 347 дзесяцін зямлі. Хлебазапасны магазін. У 1939 г. ў Нарэйкава сселены пасёлак Прысекі. На 1.1.1998 г. 58 двароў, 91 жыхар. Магазін.

НЕМЕРАВА, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Свярдлова. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 8 двароў, каля 60 жыхароў. Вёсцы належалі 82 дзесяціны зямлі. Хлебазапасны магазін. У 1923 г. 62 жыхары. На 1.1.1998 г. 23 двары, 53 жыхары.

НІЖНЯЯ ВЕРАВОЙША, вёска ў Забалацкім сельсавеце, у саўгасе «Забалацце». Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені. У школе вучыліся 43 хлопчыкі і 15 дзяўчынак (настаўнік М.А.Градзюшка). У 1923 г. 283 жыхары. На 1.1.1998 г. 89 двароў, 167 жыхароў. Магазін.

НОВАЕ СЯЛО, вёска ў Межаўскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Межава». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ, уласнасць Любамірскіх, 24 двары. У канцы 19 — пачатку 20 ст. вёска ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета. У 1879 г. 52 двары, 290 жыхароў. 7 двароў займаліся калёсным промыслам. У 1910 г. 80 двароў, 626 жыхароў. Вёсцы належала 620 дзесяцін зямлі, у тым ліку 15 дзесяцін лесу. У 1923 г. 484 жыхары. У 1929 г. створаны калгас «Новае сяло». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 112 двароў, 228 жыхароў. Магазін.

НОВАЕ ХОРАБРАВА, вёска ў Забалацкім сельсавеце, у калгасе імя К.С.Заслонава. У пачатку 20 ст. фальварак Машкоўскай воласці Аршанскага павета, належаў Хлюдзінскім. Фальварак меў 198 дзесяцін зямлі. Млын і карчма. У 1923 г. хутар Новае Хорабрава, 25 жыхароў. На 1.1.1998 г. 82 двары, 176 жыхароў. Магазін.

ПАГОСТ, вёска ў Задроўеўскім сельсавеце, у калгасе «Барацьбіт». Чыгуначны прыпынак на лініі Мінск — Орша. У 19 — пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета. У Айчынную вайну 1812 г. разбурана. У 1871 г. 32 двары. У пачатку 20 ст. 68 двароў, каля 440 жыхароў. За вёскай былі замацаваны 634 дзесяціны зямлі. Хлебазапасны магазін. У 1907 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля 1917 г. пераўтворана ў

працоўную школу 1-й ступені (у 1923—90 вучняў). У 1929 г. створаны калгас «Барацьбіт». На 1.1.1998 г. 72 двары, 130 жыхароў. Магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Паблізу вёскі археалагічныя помнікі — гарадзішча і 2 курганныя могільнікі (2 і 3 насыпы).

ПАГОСЦІК, вёска ў Задроўеўскім сельсавеце, у калгасе «Барацьбіт». У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 11 двароў, 87 жыхароў. За вёскай былі замацаваны 123 дзесяціны зямлі. У 1940 г. 40 двароў, 136 жыхароў. На 1.1.1998 г. 24 двары, 38 жыхароў.

ПАДГАЙШЧЫНА, вёска ў Забалацкім сельсавеце, у калгасе «Новая зара». У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 13 двароў, 116 жыхароў. Вёсцы належала 87 дзесяцін зямлі. У 1923 г. 119 жыхароў. У 1934 г. ў Падгайшчыну сселена вёска Казлоўшчына. На 1.1.1998 г. 16 двароў, 21 жыхар.

ПАНІЗОЎЕ, вёска ў Задроўеўскім сельсавеце, у калгасе «Барацьбіт». У 1871 г. 10 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 19 двароў, каля 160 жыхароў. Вёсцы належала 136 дзесяцін зямлі. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоныя ўсходы» (першы старшыня М.А.Ляўковіч). Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 25 двароў, 49 жыхароў.

ПАНІЗОЎЕ, вёска, цэнтр сельсавета (у 1924 — 28 і з 1939) і калгаса «Ленінская іскра». У 1867 г. ўласнасць Любамірскіх. У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 45 двароў, каля 350 жыхароў. Вёсцы належала 420 дзесяцін зямлі. У 1909 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля 1917 г. пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені. У 1923 г. ў ёй вучылася каля 50 хлопчыкаў і дзяўчынак (настаўнік М.Чахоўскі). У 1979 г. з Панізоўем злілася вёска Падубцы. На 1.1.1998 г. 197 двароў, 411 жыхароў. Механічныя майстэрні, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, ашчадная каса, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Каля вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік (2 насыпы).

ПАПОЎКА, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Свярдлова. У 1939 г. ў Папоўку сселены хутар Жалёва. У 1940 г. 16 двароў, 46 жыхароў. На 1.1.1998 г. 10 двароў, 15 жыхароў.

ПАРКАВАЯ, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у складзе саўгаса-тэхнікума «Смаляны». На 1.1.1998 г. 81 двор, 221 жыхар. Магазін.

ПАРЭЧЧА, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Новае жыццё». У 1871 г. 12 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 26 двароў, 162 жыхары. За вёскай было замацавана 205 дзесяцін зямлі. Побач знаходзіўся аднайменны фальварак, які належаў Гардзялкоўскім, 1 двор, 4 жыхары. Фальварак меў 136 дзесяцін зямлі, у тым ліку 50 дзесяцін лесу. У 1936 г. да Парэчча далучана вёска Вікторын Сялец. У 1940 г. 52 двары, 217 жыхароў. На 1.1.1998 г. 31 двор, 47 жыхароў.

ПАШЫНА, вёска ў Крапівенскім сельсавеце, у калгасе «Камінтэрн». У сярэдзіне 19 ст. вёска, уласнасць Любамірскіх. У 1864 г. 46 жыхароў. У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 31 двор, 202 жыхары. Вёсцы належала 379 дзесяцін зямлі. Побач з вёскай знаходзіўся аднайменны маёнтак, які меў 60 дзесяцін зямлі, у тым ліку 15 дзесяцін лесу. На 1.1.1998 г. 42 двары, 71 жыхар.

ПЕЧЫШЧА, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях». У 1940 г. 27 двароў, 70 жыхароў. На 1.1.1998 г. 22 двары, 47 жыхароў.

ПІСАРШЧЫНА, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 11 двароў, 84 жыхары. За вёскай былі замацаваны 63 дзесяціны зямлі. У 1940 г. 21 двор, 72 жыхары. На 1.1.1998 г. 22 двары, 32 жыхары.

ПІШЧАЛАВА, вёска, цэнтр сельсавета (з 1924) і калгаса імя Кірава. У сярэдзіне 19 ст. ўласнасць Васілеўскіх. Хлебазапасны магазін, вадзяны млын, карчма. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 31 двор, 226 жыхароў. Жыхарам вёскі належала 175 дзесяцін зямлі. У 1903 г. існавала царкоўнапрыходская школа. Пасля 1917 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені. У 1923 г. ў вёсцы 246 жыхароў, у школе вучыліся 43 хлопчыкі і дзяўчынкі (настаўніца А.Бранцава). У 1934 г. ў вёску сселены хутар Гаркаўшчына, у 1939 г. — пасёлак Пішчалава. Механічныя майстэрні, сярэдняя школа, дзіця-

чыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі і ветэрынарны пункты, аддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Каля вёскі, на месцы, дзе 14.7.1941 г. па ворагу быў дадзены першы залп рэактыўных мінамётаў «Кацюша», пастаўлены абеліск.

ПРАЦОЎНАЯ (да 1967 г. называлася Смалянскі цагляны завод), вёска ў Смалянскім сельсавеце, у складзе саўгаса-тэхнікума «Смаляны». У 1940 г. 13 двароў, 52 жыхары. На 1.1.1998 г. 18 двароў, 32 жыхары.

ПРОКШЫНА, вёска ў Дубраўскім сельсавеце, у калгасе «Дубраўка». У пачатку 20 ст. ў Аршанскім павеце Магілёўскай губерні, 11 двароў, 86 жыхароў. Вёсцы належалі 103 дзесяціны зямлі. На 1.1.1998 г. 64 двары, 110 жыхароў. Магазін.

ПРЫГУЗКІ, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе імя Куйбышава. У пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета, 43 двары, каля 300 жыхароў. Вёсцы было прыпісана 486 дзесяцін зямлі, у тым ліку 30 дзесяцін лесу. Пасля 1917 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоныя Прыгузкі». Працавала кузня. У 1931 г. з вёскай аб'яднаны пас. Прыгузкі. На 1.1.1998 г. 112 двароў, 288 жыхароў. Магазін.

ПРЫДНЯПРОЎЕ, вёска ў Андрэеўшчынскім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева. У 1940 г. 20 двароў, 82 жыхары. У 1965 г. ў Прыдняпроўе сселена вёска Кабылякі. На 1.1.1998 г. 44 двары, 73 жыхары.

ПУГЛЯІ, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у саўгасе «Аршанскі». У 19 — пачатку 20 ст. цэнтр воласці Горацкага павета. У 1867 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. У 1886 г. 29 двароў, 190 жыхароў, хлебазапасны магазін, земскае народнае вучылішча, праваслаўная царква, каталіцкі касцёл, вінная лаўка. Сялу належала 578 дзесяцін зямлі, у тым ліку 56 дзесяцін лесу. Пасля 1917 г. земскае народнае вучылішча пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені. У 1923 г. 387 жыхароў, у школе 2 настаўнікі вучылі каля 100 дзяцей, існавала хата-чытальня. У 1924—61 гг. цэнтр сельсавета. У 1929 г. створаны калгас «Авангард». Дзейнічалі ваўначоска і кузня. У 1933 г. ў сяло сселены хутар Пугляі. На 1.1.1998 г. 142 двары, 477 жыхароў. Механічныя майстэрні, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, ветэрынарны ўчастак, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1944 г.

ПУЗЫРОВА, вёска ў Забалацкім сельсавеце, у саўгасе «Забалацце». У 1871 г. 4 двары. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 12 двароў, 79 жыхароў. Вёсцы належала 78 дзесяцін зямлі. У 1938 г. ў Пузырова сселены хутар Сакалова. На 1.1.1998 г. 32 двары, 64 жыхары.

РАГАЗІНА, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 22 двары. У 1871 г. 16 двароў. У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 28 двароў, каля 200 жыхароў. Вёсцы належала 317 дзесяцін зямлі. У 1938 г. ў Рагазіна сселены хутар Ганусін. На 1.1.1998 г. 23 двары, 43 жыхары.

РАГАЗІНА, вёска ў Задроўеўскім сельсавеце, у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». У 1855 г. маёнтак, належаў Ваньковічам. У пачатку 20 ст. вёска ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 198 жыхароў. За вёскай было замацавана 160 дзесяцін зямлі. Хлебазапасны магазін. У 1908 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені. У 1923 г. 216 жыхароў, у школе вучылася каля 40 хлопчыкаў і дзяўчынак. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны Кастрычнік». На 1.1.1998 г. 30 двароў, 84 жыхары. Клуб, бібліятэка. Ва ўрочышчы Гарадок археалагічныя помнікі — гарадзішча і селішча.

РАМАЛЬДАВА, вёска ў Клюкаўскім сельсавеце, у аграфірме «Дзевіна». У 1930 г. створаны калгас «Піянер». Працавала кузня. У 1940 г. 30 двароў, 112 жыхароў. У Рамальдава сселена вёска Карпіцкія. На 1.1.1998 г. 42 двары, 91 жыхар.

РАМАНАЎКА, вёска ў Якаўлевіцкім сельсавеце, у калгасе «Запаветы Ільіча». У 1871 г. вёска, 5 двароў. У 1919 г. ў вёсцы створана камуна «Раманаўка», у пачатку 1930-х гадоў — калгас імя Леніна. Працавала кузня. У 1938 г. ў Раманаўку былі сселены аднайменны хутар, пасёлкі Новае жыццё і Сакалоўскі. На 1.1.1998 г. 40 двароў, 82 жыхары.

РОСКІ СЯЛЕЦ, вёска ў Задроўеўскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Чырвоны Кастрычнік». У 19 — пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, уласнасць Ляпкоўскіх. У 1910 г. 20 двароў, 204 жыхары, карчма. Вёсцы належала 198 дзесяцін зямлі. У 1933 г. ў Роскі Сялец сселена вёска Малы Сялец. У 1930 г. створаны калгасы «Перамога» і «Чырвонае Адроўе». Працавалі 2 кузні. На 1.1.1998 г. 111 двароў, 327 жыхароў. Сярэдняя школа імя С.М.Міта (ёсць музей), клуб, бібліятэка, магазін. Брацкія магілы чырвонаармейцаў грамадзянскай вайны і савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

РУБАШЫНА, вёска ў Запольскім сельсавеце, у калгасе «Спартак». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 12 двароў. У 1871 г. 9 двароў. У 1910 г. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 16 двароў, 108 жыхароў. Вёска валодала 150 дзесяцінамі зямлі. На 1.1.1998 г. 13 двароў, 16 жыхароў.

РУКЛІ, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Новае жыццё». У 1865 г. ўласнасць Навіцкіх. У 1871 г. 9 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 15 двароў, 112 жыхароў. Вёсцы належала 120 дзесяцін зямлі. 26 чэрвеня 1944 г. каля Рукляў вызначыўся ў баі за пераправу цераз р. Адроў гвардыі лейтэнант, камандзір танкавага ўзвода С.М.Міт. За гераізм і мужнасць Міту пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (24.3.1945). Пахаваны ў суседняй вёсцы Смаляны. На 1.1.1998 г. 4 двары, 5 жыхароў.

РУМІНА, вёска ў Панізоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінская іскра». Чыгуначная станцыя на лініі Орша—Крычаў. У пачатку 20 ст. хутар Маслакоўскай воласці Горацкага павета, 2 двары, 9 жыхароў. Належаў адстаўному генерал-маёру Рэйну, меў 59 дзесяцін зямлі, у тым ліку 12 дзесяцін лесу. У 1923 г. пасёлак, 166 жыхароў. На 1.1.1998 г. 131 двор, 301 жыхар. Клуб, бібліятэка, магазін.

РЫМКІ, вёска ў Крапівенскім сельсавеце, у саўгасе «Дняпро». У 19 — пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета. У 1880-я гады 14 двароў, каля 80 жыхароў, праваслаўная царква. У 1910 г. 30 двароў, 183 жыхары. За сялом былі замацаваны 333 дзесяціны зямлі, у тым ліку 20 дзесяцін лесу. На 1.1.1998 г. 23 двары, 34 жыхары.

РЭПУХАВА, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Новае жыццё». У 1855 г. маёнтак памешчыкаў Міхайлавых. У пачатку 20 ст. ў Алёнавіцкай воласці Аршанскага павета, 21 двор, 176 жыхароў. Сялу належала 213 дзесяцін зямлі, у тым ліку 15 дзесяцін лесу. Каля сяла знаходзіўся фальварак Рэпухава памешчыцы Клачковай, які займаў 300 дзесяцін зямлі. Земскае народнае вучылішча пасля 1917 г. пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені. У 1926 г. працавалі шавецкая і аўчынна-валёначная майстэрні. У 1930 г. створаны калгас «Саюз працы». Была кузня. На 1.1.1998 г. 23 двары, 32 жыхары. Магіла двух невядомых лётчыкаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (у 1965 пастаўлены помнік). Ва ўрочышчы Гарадзішча археалагічны помнік — гарадзішча. Выявіў і абследаваў у 1971 г. Л.Д.Побаль.

САВІШЧАНА, вёска ў Крапівенскім сельсавеце, у саўгасе «Дняпро». У пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета, 34 двары, каля 230 жыхароў. За вёскай была замацавана 341 дзесяціна зямлі, у тым ліку 4 дзесяціны лесу. На 1.1.1998 г. 74 двары, 205 жыхароў. Магазін.

САДОВАЯ, вёска ў Зубаўскім сельсавеце, у калгасе імя Я.Купалы. У 1940 г. 38 двароў, 130 жыхароў. На 1.1.1998 г. 9 двароў, 12 жыхароў.

САРМАЦК, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, у калгасе «Рассвет». У пачатку 20 ст. фальварак (вядомы пад назвай Дворышча) Высоцкай воласці Аршанскага павета, уласнасць графіні Лубянской, 2 двары, 12 жыхароў. Фальварак меў 4195 дзесяцін зямлі. Карчма. На 1.1.1998 г. 28 двароў, 53 жыхары.

САСНОЎКА, вёска ў Вусценскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». У 1940 г. 5 двароў, 20 жыхароў. На 1.1.1998 г. 6 двароў, 13 жыхароў.

САФІЁЎКА, вёска ў Клюкаўскім сельсавеце, у аграфірме «Дзевіна». У пачатку 20 ст. засценак Сенненскага павета, 1 двор, 5 жыхароў. Засценак меў 90 дзесяцін зямлі, у тым ліку 26 дзесяцін лесу. На 1.1.1998 г. 73 двары, 143 жыхары. Магазін. Два помнікі партызанам.

СВЕТАЧАЎКА, вёска ў Зубаўскім сельсавеце, у калгасе імя Я.Купалы. У пачатку 20 ст. вядома як сядзіба селяніна Каліноўскага ў Маслакоўскай воласці Горацкага павета, 8

жыхароў. Сядзібе належала 30 дзесяцін зямлі, у тым ліку 3 дзесяціны лесу. На 1.1.1998 г. 54 двары, 98 жыхароў. Магазін.

СВІСТУНЫ, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, у аграфірме «Ніва». У 1781 г. 17 двароў. У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 16 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 40 двароў, 287 жыхароў. Вёсцы належалі 232 дзесяціны зямлі. У 1923 г. 332 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Прагрэс». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 46 двароў, 96 жыхароў.

СВІСЦЁЛКІ, вёска ў Панізоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінская іскра». У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 36 двароў, каля 230 жыхароў. За вёскай было замацавана 330 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 100 двароў, 266 жыхароў. Магазін. Радзіма Героя Савецкага Саюза С.С.Пустэльнікава.

СЕЛІШЧА, вёска ў Вусценскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 62 двары, каля 220 жыхароў. У 1940 г. 18 двароў, 65 жыхароў. На 1.1.1998 г. 18 двароў, 22 жыхары.

СЕЛІШЧА, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 37 двароў. У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 62 двары, 217 жыхароў. Вёсцы належалі 574 дзесяціны зямлі, у тым ліку 30 дзесяцін лесу. У 1929 г. створаны калгас «Маяк камунізму». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 56 двароў, 101 жыхар.

СЕЛЯКТА, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У 19 — пачатку 20 ст. фальварак Высоцкай воласці Аршанскага павета, уласнасць Васілеўскіх. У 1865 г. заснаваны вінакурны завод (у 1879 працавалі 7 рабочых, 1 майстар). У 1910 г. фальварак, 4 двары, 17 жыхароў, земскае народнае вучылішча. Фальварку належала 408 дзесяцін зямлі, у тым ліку 120 дзесяцін лесу. Пасля 1917 г. земскае народнае вучылішча пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені (у 1923 20 вучняў). У пачатку 1930-х гадоў створаны калгас «Чырвоная Беларусь». Дзейнічала кузня. На 1.1.1998 г. 57 двароў, 100 жыхароў.

СІДАРАЎКА, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях». У 1858 г. ўласнасць памешчыка Барташэвіча. У пачатку 20 ст. ў Маслакоўскай воласці Горацкага павета, 68 двароў, каля 510 жыхароў. Вёсцы належалі 584 дзесяціны зямлі, у тым ліку 8 дзесяцін лесу. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны сцяг». Кузня і ваўначоска. У 1940 г. ў Сідараўку сселены пасёлак Рубцова. На 1.1.1998 г. 35 двароў, 86 жыхароў.

СЕМАХІ, вёска ў Клюкаўскім сельсавеце, у аграфірме «Дзевіна». У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 15 двароў, 100 жыхароў. У 1940 г. 26 двароў, 139 жыхароў. На 1.1.1998 г. 16 двароў, 22 жыхары.

СЛАБАДА, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Свярдлова. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 7 двароў, 52 жыхары. Вёсцы належала 40 дзесяцін зямлі. У 1923 г. 119 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас імя ЦВК БССР. Працавала кузня. У 1935 г. ў Слабаду сселены хутар Адамава. На 1.1.1998 г. 10 двароў, 11 жыхароў. Паблізу вёскі археалагічны помнік — курган.

СЛАБАДА, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, у аграфірме «Ніва». У пачатку 1930-х гадоў створаны калгас «Чырвоная Слабада». Працавала кузня. У 1939 г. ў вёску сселены хутар Лагаўцы. На 1.1.1998 г. 27 двароў, 45 жыхароў.

СМАЛЯНЫ, вёска, цэнтр сельсавета (з 1924) і калгаса «Новае жыццё». Паводле легенды, даўней тут былі майстэрні, дзе выраблялі смалу. Упамінаюцца ў 1487 г., уласнасць князя С.Бельскага. З 1522 г. належалі князям Астрожскім, потым — князю Курбскаму. Курбскі баяўся жыць паблізу рускай граніцы, таму прамяняў Смаляны на Ковель на Валыні, які належаў князям Сангушкам-Ковельскім. У першай чвэрці 17 ст. тут, на левым беразе р. Дзярноўка, князь С.Сангушка-Ковельскі пабудаваў мураваны замак, вядомы пад назвай «Белы Ковель» ці «Малы Ковель». У 1678 г. Смалянам быў нададзены статус мястэчка. У 1680 г. пры манастыры дамініканцаў узведзены мураваны касцёл Святой Марыі. У час Паўночнай вайны ў 1708 г. ў Смалянах і наваколлі адбыліся баі. Рускія войскі захапілі ў палон ад'ютанта шведскага караля Карла генерала Каніфера. У выніку ваенных дзеянняў замак быў пашкоджаны. У

18 ст. мястэчка з гандлёвай плошчай і ратушай (узведзена ў 1772). У 2-й палавіне 18 ст. пабудавана Спаса-Праабражэнская царква. У 19 — пачатку 20 ст. мястэчка Алёнавіцкай воласці Аршанскага павета.

У Айчынную вайну 1812 г. Смаляны акупіраваны і разбураны французскімі войскамі. У сярэдзіне 19 ст. Смаляны належалі калежскаму асэсару Васілю Сямёнаву, з 1847 г. — яго сыну, сенатару і тайнаму саветніку Аляксею. У 1861 г. ў Смалянах адбылося хваляванне сялян. У 1864 г. пабудавана Аляксееўская царква з цэглы, у 1870-я гады — 3 скураныя фабрыкі і цагляны завод. У 1879 г. адкрыты земскае народнае вучылішча і фельчарскі прыёмны пакой.

У 1-й палавіне 1880-х гадоў каля 180 двароў, 2,5 тыс. жыхароў, 4 скураныя, цагляны і піваварны заводы, заезны дом, 40 лавак, млын, паштовае аддзяленне, земскае народнае вучылішча, 3 праваслаўныя царквы, каталіцкі касцёл, сінагога, 3 яўрэйскія малітоўныя школы. Насельніцтва займалася шавецкімі, кравецкімі, дрэваапрацоўчымі, ганчарнымі, слясарнымі промысламі. У пачатку 20 ст. ў мястэчку 265 двароў, 6365 жыхароў. За мястэчкам было замацавана 470 дзесяцін зямлі. Апрача гэтага, праваслаўнай прыходскай царкве належала 137, каталіцкаму касцёлу — 69 дзесяцін зямлі. Побач з мястэчкам знаходзіўся аднайменны маёнтак, уласнасць Цітовых, 1 двор, 200 жыхароў. Маёнтак меў каля 5 тыс. дзесяцін зямлі, у тым ліку 2,5 тыс. дзесяцін лесу. У 1901 г. памешчык Цітоў адкрыў сельскагаспадарчую школу.

Пасля 1917 г. земскае народнае вучылішча пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені, створаны саўгас «Смаляны», адкрыты Народны дом, хата-чытальня, масавая бібліятэка. У 1926 г. працавалі кузні, шавецкія, кравецкія і сталярныя майстэрні. У 1930 г. арганізаваны калгас «Шэсць умоў Сталіна». З ліпеня 1941 г. да 26 чэрвеня 1944 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У красавіку 1942 г. гітлераўцы загубілі каля 600 жыхароў Смалян. У вёсцы супраць акупантаў дзейнічала падпольная група, якую ўзначальваў камуніст Л.І.Красноўскі. У склад групы ўваходзіла больш за 10 чалавек, у тым ліку — У.М.Аўтухоў, Л.П.Дзятлоўскі, З.І.Красноўская, Ф.І.Кунцэвіч. Падпольшчыкі рабілі дыверсіі на варожых камунікацыях, збіралі звесткі аб праціўніку і перадавалі іх партызанам, распаўсюджвалі сярод насельніцтва антыфашысцкія лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, вялі вусную прапаганду. Гітлераўцы загубілі У.М.Аўтухова, Л.П. Дзятлоўскага, Л.І.Красноўскага, Ф.І.Кунцэвіч і іншых патрыётаў. Пасля вайны тут да 1955 г. існаваў дзіцячы дом. На 1.1.1998 г. 319 двароў, 698 жыхароў. Механічныя майстэрні, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, бальніца, аптэка, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, 2 магазіны. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, сярод пахаваных Герой Савецкага Саюза С.М.Міт. Помнік-скульптура «Маці, якая смуткуе» (пастаўлены ў 1965), на каталіцкіх могілках помнік польскаму пісьменніку Т.Зану. Каля вёскі магіла ахвяр фашызму. На будынку сельсавета ў 1977 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка падпольшчыкам. Архітэктурныя помнікі — Аляксееўская і Спаса-Праабражэнская цэрквы, касцёл, рэшткі замка.

СМАЛЯНЫ, чыгуначная станцыя на лініі Орша—Лепель у Запольскім сельсавеце. У 1940 г. 5 двароў, 29 жыхароў. На 1.1.1998 г. 9 двароў, 14 жыхароў. Магазін.

СМЁТАНКА, вёска ў Зубаўскім сельсавеце, у калгасе імя Я.Купалы. У 19 — пачатку 20 ст. з такой назвай былі вядомы вёска і маёнтак ў Горацкім павеце. У 1850 г. ў маёнтку заснаваны крухмальны і кафляны заводы. У вёсцы ў 1879 г. 30 двароў, 157 жыхароў, хлебазапасны магазін, існаваў лубяны промысел. У пачатку 20 ст. ў вёсцы 63 двары, каля 420 жыхароў. За вёскай былі замацаваны 352 дзесяціны зямлі. Маёнтак належаў Чачковым, меў 1 тыс. дзесяцін зямлі, у тым ліку 780 дзесяцін лесу. Дзейнічаў кафляны завод, на якім у 1905 г. адбылася забастоўка рабочых. У красавіку 1905 г. ў маёнтку адбылася забастоўка батракоў і сялян-падзёншчыкаў. Для падаўлення яе ў Смётанку і суседнія населеныя пункты ўлады накіравалі 2 роты салдат. Многія актыўныя ўдзельнікі выступлення былі арыштаваны і аддадзены пад суд. Калі земскі начальнік выклікаў на суд 18 сялян з вёсак Смётанка і Ляўкі для прыцягнення іх да адказнасці, у суд прыйшлі ўсе сяляне з гэтых вёсак. Адміністрацыя маёнтка вымушана была пайсці на некаторыя ўступкі — павялічыць заработную плату, зменшыць плату за пашу. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны

сад». У 1938 г. ў вёску сселены пасёлкі Новая Смётанка і Беларусь. На 1.1.1998 г. 50 двароў, 86 жыхароў. Радзіма беларускай пісьменніцы М.К.Філіповіч.

СОЛАЎЁ, вёска ў Андрэеўшчынскім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева. У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 34 двары. Побач знаходзілася в. Малое Солаўе, якая таксама ўваходзіла ў склад таго ж маёнтка, 25 двароў. У 2-й палавіне 19 ст. сяло, 2 праваслаўныя царквы (мураваная і драўляная), хлебазапасны магазін. У пачатку 20 ст. на месцы сучаснай вёскі былі 2 паселішчы — с. Солаўе (58 двароў, 450 жыхароў, сялу належалі 523 дзесяціны зямлі, у тым ліку 40 дзесяцін лесу) і в. Солаўе (33 двары, 448 жыхароў, за вёскай было замацавана 305 дзесяцін зямлі, у тым ліку 5 дзесяцін лесу). Абодва паселішчы ўваходзілі ў склад Высоцкай воласці Аршанскага павета. У 1923 г. побач з імі знаходзіліся с. Вялікае Солаўе (565 жыхароў) і в. Малое Солаўе (331 жыхар). У 1934 г. яны былі аб'яднаны. На 1.1.1998 г. 35 двароў, 61 жыхар. Архітэктурны помнік 2-й палавіны 19 ст. — мураваная царква. Радзіма беларускага пісьменніка Л.Т.Калодзежнага.

СОМАНАВА, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Новае жыццё». У 1871 г. 10 двароў. У пачатку 20 ст. ў Алёнавіцкай воласці Аршанскага павета, 16 двароў, 120 жыхароў. Вёсцы належала 100 дзесяцін зямлі. У 1929 г. створаны калгас «Новае жыццё». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 26 двароў, 54 жыхары.

СПАСКАЕ, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Новае жыццё». У пачатку 20 ст. вёска Спаск Алёнавіцкай воласці Аршанскага павета, 28 двароў, 204 жыхары. Вёсцы належала 287 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 20 двароў, 30 жыхароў.

СТАЙКІ, вёска, цэнтр сельсавета (з 1924) і аграфірмы «Ніва», а таксама чыгуначная станцыя на лініі Орша—Віцебск. У 1560 г. ў складзе маёнтка Аршанскі Замак Корсакаў, 8 дымоў. У 1792 г. ў маёнтку Межаўскі Ключ Любамірскіх, 29 двароў. У 1871 г. 29 двароў. У 1903 г. заснавана чыг. ст. Стайкі. Каля станцыі ўзнік пасёлак. У 1905 г. пабудавана запалкавая фабрыка, якая неўзабаве згарэла. У 1907 г. адкрыта царкоўнаприходская школа. У 1910 г. пасёлак і вёска Стайкі Машкоўскай воласці Аршанскага павета. У вёсцы 51 двор, 348 жыхароў. Вёсцы належала 349 дзесяцін зямлі. У 1912 г. купец Бабін пабудаваў пры станцыі лесапільны завод, піламатэрыялы якога адпраўляліся ў многія краіны. Пасля 1917 г. створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1923 г. вучыліся 45 дзяцей, з іх 12 дзяўчынак (настаўніца К.Лебедзева). У 1929 г. арганізаваны калгас «1 Мая». Працавала кузня. У 1939 г. ў Стайкі быў сселены хутар Раскі.

У ліпені 1941 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1942 г. ў раёне станцыі Стайкі партызаны пусцілі пад адхон 2 эшалоны ворага з ваеннай тэхнікай, боепрыпасамі, прадуктамі харчавання і жывой сілай, у кастрычніку — эшалон з палівам (17 цыстэрнаў і 2 паравозы). У лютым 1942 г. акупанты расстралялі 16 мірных жыхароў пасёлка. 26 чэрвеня 1944 г. ў баі за чыг. ст. Стайкі вызначыўся малодшы сяржант, камандзір аддзялення гвардзейскага стралковага палка М.П.Ніканаў, якому прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (24.3.1945). У 1979 г. са Стайкамі злілася в. Кураўшчына. На 1.1.1998 г. 236 двароў, 525 жыхароў. Механічныя майстэрні, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі і ветэрынарны пункты, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, Дом быту, 2 магазіны. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, і магіла невядомага партызана.

СТАПУРЭВА, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, у калгасе «Рассвет». У 1792 г. ў складзе маёнтка Аршанскі Ключ Любамірскіх, 6 двароў. У 1871 г. 9 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 25 двароў, 210 жыхароў. За вёскай былі замацаваны 184 дзесяціны зямлі. У 1902 г. было адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля 1917 г. пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені. У 1923 г. 266 жыхароў, у школе вучыліся 77 дзяцей, з іх 12 дзяўчынак (настаўнікі Р.Рыжыкаў і Г.Рыжыкава). У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны Кастрычнік». Працавала кузня. У 1939 г. ў вёску сселены хутар Юшкава. На 1.1.1998 г. 28 двароў, 57 жыхароў.

СТАР, вёска ў Забалацкім сельсавеце, цэнтр калгаса «Новая зара». У 1871 г. 7 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 8 двароў, 55 жыхароў. За вёскай было замацавана 55 дзесяцін зямлі. У 1930 г. створаны калгас «12 гадоў рабоча-ся-

лянскай Чырвонай Арміі». Працавала кузня. У 1932 г. ў вёску быў сселены хутар Камары, у 1939 г. — хутар Чыкаўшчына. На 1.1.1998 г. 87 двароў, 220 жыхароў. Механічныя майстэрні, пачатковая школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі. Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

СТАРОЕ ХОРАБРАВА, вёска ў Забалацкім сельсавеце, у калгасе імя К.С.Заслонава. Прыпыначны пункт на чыгуначнай лініі Мінск—Орша. У 18 ст. вёска Хорабрава, уласнасць Хлюдзінскіх. У 1795 г. 82 мужчыны і 90 жанчын. У пачатку 20 ст. вёска Хорабрава Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 40 двароў, каля 260 жыхароў, млын, карчма. За вёскай было замацавана 177 дзесяцін зямлі. Побач з вёскай знаходзіўся аднайменны фальварак Хлюдзінскіх, меў 198 дзесяцін зямлі. У 1939 г. ў вёску сселены хутар Хорабрава. На 1.1.1998 г. 88 двароў, 176 жыхароў. Магазін, клуб, бібліятэка.

СТАРЫНА, вёска ў Клюкаўскім сельсавеце, у аграфірме «Дзевіна». У 1940 г. 17 двароў, 50 жыхароў. На 1.1.1998 г. 9 двароў, 11 жыхароў.

СТАЎБУНЫ, вёска ў Межаўскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Межава». У 1871 г. 6 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 13 двароў, 37 жыхароў. Вёсцы належалі 94 дзесяціны зямлі. У 1936 г. ў Стаўбуны сселены хутар Пчэльня. На 1.1.1998 г. 35 двароў, 51 жыхар.

СТАЎРЫ, вёска ў Панізоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінская іскра». У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 25 двароў, каля 200 жыхароў. За вёскай было замацавана 238 дзесяцін зямлі. У 1947 г. са Стаўрамі злілася вёска Пуцяціна. На 1.1.1998 г. 67 двароў, 107 жыхароў. Магазін.

СТАХОЎКА, вёска ў Крапівенскім сельсавеце, у калгасе «Камінтэрн». У пачатку 20 ст. ўрочышча Баранскай воласці Аршанскага павета, 1 двор, 5 жыхароў. За ўрочышчам было замацавана 40 дзесяцін зямлі, у тым ліку 20 дзесяцін лесу. На 1.1.1998 г. 61 двор, 143 жыхары. Магазін.

СТУПАВОЕ, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Новае жыццё». У пачатку 20 ст. ў Раснянскай воласці Сенненскага павета, 11 двароў, 86 жыхароў. Вёсцы належала 140 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 4 двары, 4 жыхары.

СУБАЧАВА, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Чырвонае аб'яднанне». У пачатку 20 ст. ў Алёнавіцкай воласці Аршанскага павета, 17 двароў, 120 жыхароў. Вёсцы належала 167 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 9 двароў, 12 жыхароў.

СУДНІКІ, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у саўгасе «Аршанскі». У 1940 г. 40 двароў, 122 жыхары. На 1.1.1998 г. 22 двары, 33 жыхары.

СЦЯПКОВА, вёска ў Панізоўскім сельсавеце, у саўгасе «Бабінічы». У пачатку 20 ст. ў Маслакоўскай воласці Горацкага павета, 39 двароў, 269 жыхароў. Вёсцы належала 186 дзесяцін зямлі. Побач з вёскай знаходзіўся аднайменны маёнтак, уласнасць Казекаў, 3 двары, 10 жыхароў. Маёнтак меў 445 дзесяцін зямлі, у тым ліку 144 дзесяціны лесу. На 1.1.1998 г. 17 двароў, 19 жыхароў.

СЯГЛАВА, вёска ў Крапівенскім сельсавеце, у калгасе «Камінтэрн». У 1898 г. 33 мужчыны і 45 жанчын. У пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета, 21 двор, 170 жыхароў. Вёсцы належала 376 дзесяцін зямлі, у тым ліку 8 дзесяцін лесу. У 1929 г. створаны калгас «Вясёлы бераг». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 28 двароў, 45 жыхароў.

СЯДРЫЧЫНА, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 31 двор. У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 40 двароў, 307 жыхароў. За вёскай было замацавана 512 дзесяцін зямлі, у тым ліку 7 дзесяцін лесу. У 1940 г. 44 двары, 118 жыхароў. У чэрвені 1944 г. гітлераўцы спалілі Сядрычына і загубілі 4 яго жыхароў. На 1.1.1998 г. 12 двароў, 19 жыхароў.

СЯЛЕЦ, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Новае жыццё». У пачатку 20 ст. вёска Малы Сялец Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 6 двароў, каля 70 жыхароў. За вёскай было замацавана 45 дзесяцін зямлі. Каля вёскі знаходзіўся фальварак Малы Сялец, уласнасць Вайніловічаў, 1 двор, 5 жыхароў. Фальварак меў 77 дзесяцін зямлі, у тым ліку 7 дзесяцін лесу. У 1924—39 гг. цэнтр сельсавета. На 1.1.1998 г. 17 двароў, 24 жыхары.

ТАРЧЫЛАВА, вёска ў Вусценскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». У 1898 г. 141 мужчына. Вядома прашэнне селя-

ніна Лявона Іванавіча Савіцкага таго часу Магілёўскаму губернатару аб перасяленні яго разам з сям'ёй (11 чалавек) у Томскую вобласць. У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 43 двары, 343 жыхары. Вёсцы належалі 302 дзесяціны зямлі. У 1923 г. 334 жыхары. У 1939—54 гг. цэнтр сельсавета. У 1995 г. з Тарчылавам аб'яднана вёска Гарбацэвічы. На 1.1.1998 г. 126 двароў, 236 жыхароў. Магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ТАТАРСК, вёска ў Забалацкім сельсавеце, у калгасе імя К.С.Заслонава. У пачатку 20 ст. маёнтак у складзе Баранскай воласці Аршанскага павета, 1 двор, 19 жыхароў. У 1940 г. 87 двароў, 317 жыхароў. На 1.1.1998 г. 79 двароў, 172 жыхары. Магазін.

ТУМІНІЧЫ, вёска ў Першамайскім сельсавеце, у саўгасе «Ударнік». У пачатку 20 ст. ў Коханаўскай воласці Аршанскага павета, 28 двароў, 246 жыхароў. Вёсцы належала 207 дзесяцін зямлі. У 1923 г. 420 жыхароў. У 1924—28 гг. цэнтр сельсавета. У 1938 г. ў вёску сселены хутар Русанаў. У 1979 г. з Тумінічамі злілася вёска Аляксандрава. На 1.1.1998 г. 80 двароў, 147 жыхароў. Магазін. Каля вёскі археалагічныя помнікі — 2 курганныя могільнікі (па 2 насыпы). Выявіў і абследаваў у 1981 г. М.І.Лашанкоў.

ТУРАВІЧЫ, вёска ў Забалацкім сельсавеце, у саўгасе «Забалацце». У 1871 г. 14 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 39 двароў, каля 240 жыхароў. Вёсцы належала 269 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 30 двароў, 44 жыхары.

ТУРЛАІ, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях». У 1879 г. 52 двары, 258 жыхароў, існавалі дрэваапрацоўчыя і лубяныя промыслы. У 19 — пачатку 20 ст. ў Маслакоўскай воласці Горацкага павета. У 1910 г. 90 двароў, 506 жыхароў. За вёскай былі замацаваны 503 дзесяціны зямлі. У 1929 г. створаны калгас «Перамога». Працавала кузня. У 1939 г. ў вёску сселены хутар Турлаі. На 1.1.1998 г. 45 двароў, 91 жыхар.

ФЕРМА, вёска ў Запольскім сельсавеце, у калгасе «Спартак». У 1940 г. 25 двароў, 105 жыхароў. На 1.1.1998 г. 25 двароў, 50 жыхароў.

ХАДУЛЫ, вёска ў Першамайскім сельсавеце, у саўгасе «Ударнік». У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 45 двароў, 359 жыхароў. Вёсцы належала 420 дзесяцін зямлі, у 1929 г. створаны калгас «Актывіст». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 20 двароў, 23 жыхары.

ХАЛМЫ, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У 1940 г. 57 двароў, 311 жыхароў. На 1.1.1998 г. 19 двароў, 28 жыхароў.

ХАРКАЎКА, вёска ў Панізоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінская іскра». У 19 — пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета. У 1910 г. 48 двароў, 313 жыхароў. За вёскай было замацавана 298 дзесяцін зямлі. У 1930 г. створаны калгас «Харкаўка». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 74 двары, 127 жыхароў. Магазін.

ХІМІНІЧЫ, вёска ў Першамайскім сельсавеце, у калгасе «1 Мая». У 1923 г. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 30 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Шлях сацыялізму». Працавала кузня. У 1940 г. 37 двароў, 135 жыхароў. На 1.1.1998 г. 13 двароў, 18 жыхароў.

ХІМЫ, вёска ў Дубраўскім сельсавеце, у калгасе «Дубраўка». У 19 — пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета. У 1910 г. 39 двароў, 274 жыхары, хлебазапасны магазін, земскае народнае вучылішча (адкрыта ў 1909, пасля 1917 пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені). У 1923 г. 384 жыхары, у школе вучылася каля 60 дзяцей (настаўнік М.Захаранка). На 1.1.1998 г. 32 двары, 38 жыхароў.

ХЛУСАВА, вёска ў Задроўеўскім сельсавеце, у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». У 1795 г. вёска Хлусаў (Хлусава) належала Пашынскім. У 1858 г. 43 мужчыны, 55 жанчын, таксама ўласнасць Пашынскіх. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 34 двары, каля 250 жыхароў. За вёскай было замацавана 320 дзесяцін зямлі. Карчма. Побач з вёскай размяшчаўся аднайменны маёнтак памешчыка Кітаеўскага, 4 двары, 27 жыхароў. Маёнтак меў 352 дзесяціны зямлі, у тым ліку 200 дзесяцін лесу. У 1920 г. ў былым маёнтку створана сельскагаспадарчая арцель «Яднанне». На 1.1.1998 г. 17 двароў, 45 жыхароў.

ХЛУСАВА, вёска ў Пішчалаўскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 19 двароў, каля 170 жыхароў. 21 верасня 1942 г. ў раёне чыг. ст. Хлусава партызаны пусцілі пад

адхон эшалон (23 вагоны) ворага з танкамі і іншай ваеннай тэхнікай. На 1.1.1998 г. 23 двары, 43 жыхары.

ЦЕЛЯНЦЕЕВА, вёска ў Вусценскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». У 2-й палавіне 19 — пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета. У 1910 г. 15 двароў, 145 жыхароў, хлебазапасны магазін. Вёсцы належалі 122 дзесяціны зямлі. На 1.1.1998 г. 31 двор, 50 жыхароў.

ЦІХАНЫ (да 1931 называлася Юраўшчына), вёска ў Смалянскім сельсавеце. У 1940 г. 14 двароў, 92 жыхары. На 1.1.1998 г. 14 двароў, 20 жыхароў.

ЦЮЛЬПІН, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у складзе саўгаса-тэхнікума «Смаляны». У пачатку 20 ст. ў Алёнавіцкай воласці Аршанскага павета, 35 двароў, 257 жыхароў. За вёскай замацаваны 322 дзесяціны зямлі. У 1930 г. створаны калгас «Ленінскі шлях». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 6 двароў, 7 жыхароў.

ЧАПЕЛІНА, вёска ў Высокаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». У пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета, 39 двароў, каля 280 жыхароў. На 1.1.1998 г. 12 двароў, 19 жыхароў.

ЧАРКАСАВА, вёска ў Межаўскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Межава». У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 26 двароў, 174 жыхары. Вёсцы належала 176 дзесяцін зямлі. У 1923 г. 216 жыхароў. У 1956 г. ў Чаркасава сселены пасёлак Паддубцы. На 1.1.1998 г. 7 двароў, 9 жыхароў. Ахеалагічныя помнікі — гарадзішча (ва ўрочышчы Замчышча, вядома з 1873) і курганны могільнік (з 80 насыпаў) дрыгавічоў (11 — пачатак 12 ст.). Радзіма Героя Савецкага Саюза У.Г.Завадскага, які вызначыўся ў Вялікую Айчынную вайну.

ЧАРНОЕ, вёска ў Панізоўскім сельсавеце, у саўгасе «Бабінічы»». У сярэдзіне 19 ст. ўласнасць адстаўнога палкоўніка Барзова. У 1879 г. 33 двары, 207 жыхароў, 60 чалавек займаліся саматужнымі промысламі (вырабамі з лыка і кары). У пачатку 20 ст. ў Маслакоўскай воласці Горацкага павета, 54 двары, каля 370 жыхароў. Вёсцы належала 349 дзесяцін зямлі. Каля вёскі знаходзіўся маёнтак Чарное, уласнасць Барковых, 2 двары, 11 жыхароў. Маёнтак меў 500 дзесяцін зямлі, у тым ліку 140 дзесяцін лесу. У 1930 г. створаны калгас «Свядомасць». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 41 двор, 53 жыхары.

ЧАРНЯЎСКІЯ, вёска ў Стайкаўскім сельсавеце, у аграфірме «Ніва». У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 51 двор, 348 жыхароў. За вёскай было замацавана 349 дзесяцін зямлі. У 1929 г. створаны калгас «Шлях да сацыялізму». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 12 двароў, 14 жыхароў.

ЧУРЫЛАВА, вёска ў Барздоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях». У 1879 г. 25 двароў, 197 жыхароў, існавалі скураны, кравецкі і сталярны промыслы. У 19 — пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета. У 1910 г. 30 двароў, 209 жыхароў. Вёсцы належалі 343 дзесяціны зямлі, у тым ліку 10 дзесяцін лесу. Побач з вёскай размяшчаліся аднайменныя маёнтак памешчыкаў Бараноўскіх (7 жыхароў, 170 дзесяцін зямлі, у тым ліку 70 дзесяцін лесу) і хутар селяніна Івашкевіча (13 жыхароў, 95 дзесяцін зямлі, у тым ліку 25 дзесяцін лесу). У 1923 г. ў вёсцы 505 жыхароў. У 1939 г. ў Чурылава сселены аднайменны хутар. На 1.1.1998 г. 31 двор, 65 жыхароў. Радзіма Героя Савецкага Саюза А.Д.Салянікава, які вызначыўся ў Вялікую Айчынную вайну.

ЧЫРВОНАЯ ХАРКАЎКА, вёска ў Панізоўскім сельсавеце, у калгасе «Ленінская іскра». У пачатку 20 ст. маёнтак Харкаўка Пугляёўскай воласці Горацкага павета, 1 двор, 4 жыхары. Маёнтку належала 829 дзесяцін зямлі, у тым ліку 530 дзесяцін лесу. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоная Харкаўка». Працавала кузня. У 1940 г. 31 двор, 84 жыхары. На 1.1.1998 г. 36 двароў, 61 жыхар.

ЧЫРВОНЫ БЕРАГ, вёска ў Вусценскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». У 1940 г. 17 двароў, 59 жыхароў. На 1.1.1998 г. 21 двор, 45 жыхароў.

ЧЭРВІНА, вёска ў Вусценскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». У пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 11 двароў, каля 80 жыхароў. Вёсцы належала 79 дзесяцін зямлі. На 1.1.1998 г. 37 двароў, 60 жыхароў.

ЧЭРВІНА, чыгуначная станцыя на лініі Орша—Магілёў у Вусценскім сельсавеце. У 1940 г. 3 двары, 85 жыхароў. На 1.1.1998 г. 22 двары, 43 жыхары. Магазін.

ШАНЬКАВА, вёска ў Смалянскім сельсавеце, у калгасе «Чырвонае аб'яднанне». У па-

чатку 20 ст. ў Алёнавіцкай воласці Аршанскага павета, 23 двары, каля 230 жыхароў. Вёсцы належала 167 дзесяцін зямлі. У 1929 г. створаны калгас «Чырвонае Шанькава». Працавала кузня. На 1.1.1998 г. 13 двароў, 18 жыхароў.

ШАТРАВІНА, вёска ў Крапівенскім сельсавеце, у калгасе «Камінтэрн». У пачатку 20 ст. ў Пугляёўскай воласці Горацкага павета, 20 двароў, каля 130 жыхароў. За вёскай было замацавана 188 дзесяцін зямлі, у тым ліку 5 дзесяцін лесу. На 1.1.1998 г. 21 двор, 39 жыхароў.

ШУГАЙЛАВА, вёска ў Крапівенскім сельсавеце, у калгасе «Камінтэрн». У 1935 г. ў Шугайлава сселена вёска Гуры. У 1940 г. 38 двароў, 141 жыхар. На 1.1.1998 г. 35 двароў, 94 жыхары. Каля вёскі на старых могілках пахаваны генерал-маёр, удзельнік Айчыннай вайны 1812 г. М.М.Трухачоў.

ШЫБЕКІ, вёска ў Смалянскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Чырвонае аб'яднанне». У 1879 г. 10 двароў, 82 жыхары. У канцы 19 — пачатку 20 ст. ў Алёнавіцкай воласці Аршанскага павета, існаваў хлебазапасны магазін. У 1910 г. 16 двароў, 135 жыхароў. Вёсцы належала 300 дзесяцін зямлі, у тым ліку 2 дзесяціны лесу. У 1929 г. створаны калгас «Чырвонае аб'яднанне». Працавала кузня. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы дзейнічала падпольная група, якую ўзначальваў А.М.Гурын. На 1.1.1998 г. 84 двары, 221 жыхар. Механічныя майстэрні, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі і ветэрынарны пункты, аддзяленне сувязі, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ШЭМБЕРАВА, вёска ў Межаўскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Межава». У 1792 г. ў складзе маёнтка Межаўскі Ключ Любамірскіх, 19 двароў. У пачатку 20 ст. ў Машкоўскай воласці Аршанскага павета, 27 двароў, 287 жыхароў. Вёсцы належала 180 дзесяцін зямлі. У 1908 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, пасля 1917 г. пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені. У 1923 г. 359 жыхароў, у школе вучылася каля 90 дзяцей. У 1930 г. створаны калгас «Серп і молат». У 1936 г. ў вёску сселены хутар Турава. На 1.1.1998 г. 33 двары, 64 жыхары.

ЮРЦАВА, вёска ў Межаўскім сельсавеце, у калгасе «Маяк камуны». Названа па прозвішчу былой уладальніцы графіні Юрцавай. У 19 — пачатку 20 ст. ў Высоцкай воласці Аршанскага павета. Быў пабудаваны двухпавярховы мураваны сядзібны дом і закладзены пейзажны парк (малюнак сядзібы ў 1877 зрабіў вядомы мастак Н.Орда). У 1-й палавіне 1880-х гадоў 22 двары, каля 180 жыхароў, млын на р. Скупея, хлебазапасны магазін, праваслаўная царква, касцёл. У 1910 г. 40 двароў, 315 жыхароў. За сялом было замацавана 358 дзесяцін зямлі. У 1925—31 і 1939—60 гг. цэнтр сельсавета. У 1929 г. створаны калгас «Актывіст». Працавала кузня. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы дзейнічалі падпольныя камсамольская і партыйная арганізацыі (каля 30 чалавек), якімі кіравалі М.С. і І.Ф. Сіўцовы. Патрыёты вялі антыфашысцкую прапаганду сярод насельніцтва, здабывалі зброю, боепрыпасы, звесткі пра ворага, медыкаменты для партызан, рабілі дыверсіі на камунікацыях гітлераўцаў. У барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў загінулі А.П. і М.П.Жураўлёвы, С.У.Лісоўскі, Л.Н.Пахоменка, М.С.Сіўцоў і іншыя падпольшчыкі. У 1976 г. на ўшанаванне памяці падпольшчыкаў на будынку сярэдняй школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка. У навакаллі Юрцава 18 верасня 1942 г. партызаны ўзарвалі варожы эшалон. На 1.1.1998 г. 284 двары, 795 жыхароў. Сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аптэка, аддзяленне сувязі, рэстаран. У былым панскім доме знаходзіцца Рэспубліканскі шпіталь інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На ўсходняй ускраіне Юрцава, на правым беразе р. Скупея, археалагічны помнік — замчышча. Захаваўся помнік мураванай архітэктуры 1-й палавіны 19 ст. — сядзібны дом і частка сядзібнага пейзажнага парку.

ЯКАЎЛЕВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета (з 1924) і калгаса імя Леніна. У 19 ст. належалі Быкоўскім, Паздзеевым, Цукатам. У 1886 г. 46 двароў, 286 жыхароў, хлебазапасны магазін, праваслаўная царква. У 1910 г. ў Маслакоўскай воласці Горацкага павета. Назву Якаўлевічы мелі 4 населеныя пункты: сяло, вёска, маёнтак, фальварак, усяго каля 120 двароў, 800 жыхароў. Працавала суконная фабрыка барона Корфа. У 1916 г. на фабрыцы адбылася забастоўка рабочых. У 1929—30 гг. былі створаны калгасы: «Каму-

нар», «Молат», «Працаўнік». Працавалі 3 кузні. З 1935 г. Якаўлевічы — рабочы пасёлак. У 1938 г. пераўтвораны ў вёску. У Вялікую Айчынную вайну тут дзейнічала падпольная група, якую ўзначальваў Яцко. У 1979 г. з вёскай зліліся Якаўлевічы 1-я і Якаўлевічы 2-я. На 1.1.1998 г. 201 двор, 498 жыхароў. Механічныя майстэрні, дзіцячыя яслі-сад, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі і ветэрынарны пункты, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, сталовая, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазін. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Магіла актыўнага ўдзельніка Аршанскага партыйнага падполля І.К.Петрачэнкі, які загінуў у 1943 г. Радзіма Герояў Савецкага Саюза І.Я.Сяржантава і Л.П.Кірпічова, беларускага пісьменніка У.Н.Мяжэвіча.

ЯРОМКАВІЧЫ, вёска ў Вусценскім сельсавеце, у эксперыментальнай базе «Вусце». У 2-й палавіне 19 — пачатку 20 ст. ў Баранскай воласці Аршанскага павета, 53 двары, 400 жыхароў. За вёскай былі замацаваны 393 дзесяціны зямлі. Хлебазапасны магазін. У 1923 г. 343 жыхары. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоныя Яромкавічы». Дзейнічала кузня. На 1.1.1998 г. 22 двары, 33 жыхары. Паблізу ад вёскі, ва ўрочышчы Гарадок, археалагічны помнік — гарадзішча. Выявіў ў 1971 г. Л.Д.Побль, абследаваў М.І.Лашанкоў. Знойдзена кераміка мілаградскай і днепра-дзвінскай культур і перыяду Кіеўскай Русі (9—11 ст.). *Г.І.Дулеба.*

Асноўныя скарачэнні, прынятыя ў кнізе

А — армія
ааўтб (оавтб) — асобны аўтатранспартны батальён
аб (об) — агнямётная батарэя
абб (осб) — асобны будаўнічы батальён
абр — артылерыйская брыгада
абс (обс) — асобны батальён сувязі
авб — авіяцыйны батальён
авд — авіяцыйная дывізія
авп — авіяцыйны полк
авпдд — авіяцыйны полк далёкага дзеяння
ад — артылерыйская дывізія
аддз. — аддзяленне
адэб (одэб) — асобны дарожна-эксплуатацыйны батальён
азкр (озпр) — асобная зенітна-кулямётная рота
азсп (озсп) — асобны запасны стралковы полк
азптд (оипд) — асобная знішчальная процітанкавая дывізія
азэчп (озэжп) — асобны запасны эксплуатацыйна-чыгуначны полк
акулб (опулб) — асобны кулямётны батальён
алб (олб) — асобны лыжны батальён
амб (омб) — асобны матарызаваны батальён
амбр (омбр) — асобная марская брыгада
амінбр (оминбр) — асобная мінамётная брыгада
амсб (омсб) — асобны мотастралковы батальён
ап — артылерыйскі полк
апс (опс) — асобны полк сувязі
арачс (орвжс) — асобная рота аднаўлення чыгуначнай сувязі
арб (орб) — асобны разведвальны батальён
арр (орр) — асобная разведвальная рота
арс (орс) — асобная рота сувязі
артмінп — артылерыйска-мінамётны полк
арш (орш) — асобны разведвальны штаб
асад (осад) — асобны самаходна-артылерыйскі дывізіён
асанавп (осанавп) — асобны санітарны авіяцыйны полк
асапб (осапб) — асобны сапёрны батальён
асб (осб) — асобны стралковы батальён
асбр (осбр) — асобная стралковая брыгада
асбрмп (осбрмп) — асобная стралковая брыгада марской пяхоты
атб (отб) — асобны танкавы батальён
атбр (отбр) — асобная танкавая брыгада
аўтб (автб) — аўтатранспартны батальён
ачбр (ожбр) — асобная чыгуначная брыгада
ашр (ошр) — асобная штрафная рота
аэ — авіяцыйная эскадрылля
баа (бао) — батальён аэрадромнага абслугоўвання
бавд — бамбардзіровачная авіяцыйная дывізія
бавп — бамбардзіровачны авіяцыйны полк
бавпдд — бамбардзіровачны авіяцыйны полк далёкага дзеяння
БФ — Беларускі фронт
в. — вёска
ваяв. — ваяводства
вобл. — вобласць
воп. — вопіс
ВПС (ВВС) — ваенна-паветраныя сілы
г. — горад, год (пры лічбе)
габ — гаўбічны артылерыйскі батальён
гап — гаўбічны артылерыйскі полк
гв. — гвардзейскі
г.п. — гарадскі пасёлак
забр — знішчальная артылерыйская брыгада
завп (иавп) — знішчальны авіяцыйны полк
зап (иап) — знішчальны артылерыйскі полк
зенад — зенітна-артылерыйская дывізія
зенап — зенітна-артылерыйскі полк
зптад (иптад) — знішчальны процітанкавы артылерыйскі дывізіён
зптап (иптап) — знішчальны процітанкавы артылерыйскі полк
зсп — запасны стралковы полк
ісапб — інжынерна-сапёрны батальён
ісапбр — інжынерна-сапёрная брыгада
кап. — капітан
кбр — кавалерыйская брыгада
кд — кавалерыйская дывізія
кк — кавалерыйскі корпус
кп — кавалерыйскі полк

лейт. — лейтэнант
мал. — малодшы
мап — механізаваны артылерыйскі полк
мба — матарызаваны батальён аўтаматчыкаў
мбр — механізаваная брыгада
мд — механізаваная дывізія
медсанб — медыка-санітарны батальён
мібр — мотаінжынерная брыгада
мсп — механізаваны стралковы полк
мінб — мінамётная батарэя
мінбр — мінамётная брыгада
мінп — мінамётны полк
мк — механізаваны корпус
мсб — мотастралковы батальён
мсбр — мотастралковая брыгада
мсд — мотастралковая дывізія
мсп — мотастралковы полк
мяст. — мястэчка
н. — нарадзіўся
пам. — памочнік
панбр — пантонная брыгада
пас. — пасёлак
ПА (ВА) — паветраная армія
ПВА (ПВО) — проціпаветраная абарона
пдд (вдд) — паветрана-дэсантная дывізія
пдп (вдп) — паветрана-дэсантны полк
пп — пяхотны полк
п/п — палявая пошта
пс — полк сувязі
рад. — радавы
РГК — рэзерв Галоўнакамандуючага
рр — разведвальная рота
рсп — рэзервны стралковы полк
сабр — самаходная артылерыйская брыгада
сап — самаходны артылерыйскі полк
сб — стралковы батальён
сбр — стралковая брыгада
сд — стралковая дывізія
ск — стралковы корпус
сп — стралковы полк
ст. — старшы; стагоддзе, стагоддзі
старш. — старшына
сяржс. — сяржант
тб — танкавы батальён
тбавп — транспартна-бамбардзіровачны авіяцыйны полк
тбр — танкавая брыгада
тбразенбат — танкавая брыгада асобнай зенітнай батарэі
тк — танкавы корпус
тп — танкавы полк
тпп — танкавы полк прарыву
уаб (уос) — упраўленне абароннага будаўніцтва
ур — умацаваны раён
цбавп (тбавп) — цяжкі бамбардзіровачны авіяцыйны полк
цмінбр (тминбр) — цяжкая мінамётная брыгада
чбр (жбр) — чыгуначная брыгада
ЧБФ (КБФ) — Чырванасцяжны Балтыйскі флот
ЧФ — Чарнаморскі флот
шавп — штурмавы авіяцыйны полк
шб — штрафны батальён
шісапб — штурмавы інжынерна-сапёрны батальён
шсапбр — штурмавая сапёрная брыгада
яфр. — яфрэйтар.

ЗМЕСТ

Воіны Чырвонай Арміі і партызаны, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны пры абароне і вызваленні Аршанскага раёна і пахаваны на яго тэрыторыі 6

Воіны-землякі і воіны, якія прызываліся Аршанскім ваенкаматам і загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны 30

Загінуўшыя ўдзельнікі Аршанскага партыйна-камсамольскага падполля 322

Воіны, партызаны, падпольшчыкі — жыхары г. Барань, рабочыя завода «Чырвоны кастрычнік», якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны 343

Загінуўшыя партызаны-землякі 353

Загінуўшыя партызаны 1-й і 2-й партызанскіх брыгад імя К.С.Заслонава 357

Мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору 363

Пасля вызвалення Айчыны 367

Орша. Саракавыя 375
У мірнай працы 377
Першынец беларускага тэкстылю 387
Аршанскі педагагічны каледж 387
Аршанскае медыцынскае вучылішча 388
Аршанскі механіка-тэхналагічны тэхнікум 388
Аршанскі тэхнікум чыгуначнага транспарту 388
Эксперыментальная база «Вусце» 388
«Дняпроўскія галасы» 389
Аршаншчына спартыўная 390
Маладзёжна-пошукавы клуб «Русічы» 395

Вызначыліся працай 396

Героі Сацыялістычнай Працы 396
Лаўрэаты прэміі 397
Заслужаныя работнікі Беларусі 398
Ардэнаносцы 410

Імі ганарыцца Аршаншчына 417
Наш боль — Афганістан 443
Ганаровыя грамадзяне горада Орша 449
Іх шляхі прайшлі праз Аршаншчыну 452
З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны 457
Драўляная архітэктура Аршаншчыны 457
Помнікі архітэктуры Оршы 460
Помнікі архітэктуры Аршанскага раёна 464
Нататкі пра аршанскі фальклор 467
Народны касцюм Аршаншчыны 475
Аршанскія ручнікі 478
Музеі 480
З гісторыі населеных пунктаў Аршаншчыны 483
Асноўныя скарачэнні, прынятыя ў кнізе 522

СУПРАЦОЎНІКІ РЭДАКЦЫЙ І СЛУЖБАЎ ВЫДАВЕЦТВА, ЯКІЯ ПРАЦАВАЛІ НАД КНІГАЙ

Група картаграфіі: В.Ф. Надзененка, Г.Р. Шыкунова.

Рэдакцыя мастацка-тэхнічнага афармлення выданняў:
У.М. Жук, В.Г. Загародні.

Рэдакцыя навуковага і літаратурнага кантролю:
І.П. Хаўратовіч (заг. рэдакцыі), А.А. Федасеева.

Рэдакцыя фотаздымак і фотаілюстрацый:
Г.М. Бажанкоў (заг. рэдакцыі), А.П. Дрыбас, С.А. Жукавень, І.У. Каваленка, В.У. Харчанка.

У кнізе выкарыстаны здымкі з музеяў Оршы і Аршанскага раёна, архіва БелЭн, асабістых архіваў, а таксама С.М. Асіноўскага.

У пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі «Памяць. Орша. Аршанскі раён» прымалі ўдзел:

Л.П. Аляксеева, В.А. Безенсон, У.С. Багамазаў, В.В. Барысава, Т.М. Вадзянская, Т.А.Валодкіна, М.М. Дземідовіч, Г.І. Дулеба, Н.Л. Жолудзева, А.В. Зількоў, І.К. Ігнацьева, Т.Г. Ігнацьева, Г.А. Каралёў, Ю.А. Копцік, А.М. Кудзін, Л.У.Кудзіна, А.І. Лакотка, М.А. Лугавіер, В.П.Лютынскі, Р.П. Лясота, В.М. Ляўко, А.С. Нічыпарук, А.М. Палітаў, Г.П.Пырыкава, В.Г. Пячонкін, А.Г. Рабушаў, Л.Дз. Радомская, М.Ф. Раманюк, Г.Т. Распопава, В.М. Самуйлава, В.М. Сцяпанаў, А.І. Ціханскі, Б.Ф. Шалуха, Р.С. Шарай, А.П. Шаўцоў, Л.І. Шыдлоўскі, А.М. Шынкевіч, І.А. Яршоў, Л.В. Яршова.

Навукова-папулярнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Оршы і Аршанскага раёна
У 2 кнігах. Кніга 2-я

Мастацкі рэдактар:
В.Г. Загародні.

Тэхнічныя рэдактары:
М.І. Грыневіч,
Н.М. Шэвель.

Карэктары:
Ж.С. Берасневіч,
Н.У. Бохан,
Л.А. Варабей,
В.М. Лапцева,
А.В. Семенчукова,
Т.У. Люковіч,
В.М. Чудакова.

Машынапісныя работы:
Г.Л. Анісімава.

Набор і камп'ютэрная падрыхтоўка арыгінала-макета:
С.А. Макаёнак
(загадчык рэдакцыі камп'ютэрнай падрыхтоўкі рукапісаў);
інжынер
І.М. Кузьмянкова;
аператары:
Н.М. Бабіцкая,
Р.У. Дзявочка,
Дз.Г. Лабунец,
Н.У. Мітраховіч,
Н.А. Стасевіч,
С.М. Хаўстовіч.

ISBN 985-11-0170-2

9 789851 101708

Падпісана да друку з арыгінала-макета 29.03.2000. Фармат 70×100 1/16. Гарнітура Кудрашэўская. Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 42,9. Ум. фарб.-адб. 49,4. Ул.-выд. арк. 66,29. Тыраж 3000 экз. Заказ 421.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 10 ад 31.12.97. Рэспубліка Беларусь. 220072, г.Мінск, вул. Акадэмічная, 15а.

Надрукавана з арыгінала-макета на ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінаце ВПП імя Я. Коласа. Рэспубліка Беларусь. 220005, г. Мінск, вул. Чырвоная, 23.

Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Оршы і Аршанскага раёна: У 2 кн.
П 15 Кн. 2. / Рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э.Э. Жакевіч. — Мн.: БелЭн, 2000. —528 с.: іл.

ISBN 985-11-0170-2

Кніга — гісторыка-дакументальная хроніка, у якой на падставе архіўных даных, замалёвак, артыкулаў, успамінаў непасрэдных удзельнікаў падзей расказваецца пра гісторыю Оршы і Аршаншчыны, яе знакамітых людзей, герояў ратнай і працоўнай славы. Асаблівая ўвага ўдзелена падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Прыводзяцца спісы воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі і пахаваны на тэрыторыі Оршы і Аршанскага раёна, воінаў-землякоў, партызан, падпольшчыкаў, мірных жыхароў, якія аддалі жыццё ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ці сталі ахвярамі фашысцкага тэрору. Змешчаны таксама спіс жыхароў Оршы і Аршанскага раёна, якія былі беспадстаўна рэпрэсіраваны і рэабілітаваны. Кніга багата ілюстравана. Для масавага чытача.

УДК 947.62
ББК 63.3 (4 Беи)